МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Установа адукацыі
“БРЭСЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ імя А.С. Пушкіна”

Кафедра гісторыі славянскіх народаў

А.А. Савіч

Электронны вучэбна-метадычны комплекс

па спецкурсе **“Сацыяльна-эканамічнае і грамадска-палітычнае становішча ў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг.”**

для студэнтаў 4 курса гістарычнага факультэта спецыяльнасці “Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны”

БРЭСТ – 2023

УДК ‘930.(476)
ББК 63(4Беи)

*Рэкамендавана рэдакцыйна-выдавецкім саветам Установы адукацыі “Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна”*

*Рэцэнзенты:*

кандыдат гістарычных навук, дацэнт
**А.В. Машчук**

кандыдат гістарычных навук
**Т.П. Саўчук**

Кафедра гуманітарных дысцыплін Брэсцкага дзяржаўнага політэхнічнага ўніверсітэта

**Савіч, А.А.**

Сацыяльна-эканамічнае і грамадска-палітычнае становішча ў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. / А.А. Савіч / Электронны вучэбна-метадычны комплекс для студэнтаў 4 курса гістарычнага факультэта. – Брэст : БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2023. – 159 с.

У вучэбна-метадычным комплексе прадстаўлены праграма курса, лекцыі, планы семінарскіх заняткаў, літаратура для самападрыхтоўкі, пытанні да самакантролю.

Выданне прызначана для студэнтаў 4 курса гістарычнага факультэта спецыяльнасці “Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны” Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна, якія вывучаюць спецкурс “Сацыяльна-эканамічнае і грамадска-палітычнае становішча Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг.”

УДК ‘930.(476)
ББК 63(4Беи)

# ЗМЕСТ

УВОДЗІНЫ …………………………………………………………….. 4
ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ ……………………………..... 6
ТЭМАТЫЧНАЕ ПЛАНАВАННЕ ……………………………......... 10
ЛЕКЦЫЙНЫ КУРС …………………………………………………… 11
Тэма 1. Прадмет, задачы і вучэбна-пазнавальная значнасць курса…12
Тэма 2. Гістарыяграфія Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. …………14
Тэма 3. Рыжскі мір і Беларусь……………………………………….. .37
Тэма 4. Праблемы тэрыторыі і насельніцтва Заходняй Беларусі …..41
Тэма 5. Палітыка польскіх уладаў у дачыненні да Заходняй Беларусі…....................................................................... 43
Тэма 6. Мясцовыя органы ўлады і самакіравання…………………...46
Тэма 7. Сельская гаспадарка і аграрныя рэформы…………... ……..70
Тэма 8. Прамысловасць і рамяство…………………………..……… 87
Тэма 9. Гандаль ……………………………………………………....108
Тэма 10. Нацыянальна-вызваленчая барацьба ў Заходняй Беларусі ……………………………………….. 116
СПІС ВЫДАННЯЎ ДА ЎСІХ ТЭМ ................................................144
СПІС ВЫДАННЯЎ ДАКУМЕНТАЎ І МАТЭРЫЯЛАЎ …………145
ПЛАНЫ СЕМІНАРСКІХ ЗАНЯТКАЎ………………..…………....148
ПЫТАННІ ДЛЯ САМАКАНТРОЛЮ……………...……………....159

# УВОДЗІНЫ

Спецкурс "Сацыяльна-эканамічнае і грамадска-палітычнае становішча ў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг." распрацаваны для студэнтаў гістарычнага факультэта спецыяльнасці 1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны. На яго вывучэнне ў восьмым семестры запланавана 58 гадзін (2 заліковыя адзінкі), з іх аўдыторных – 34 (20 лекцыйных гадзін і 14 практычных заняткаў).

*Прадметам* вывучэння дысцыпліны з'яўляецца гісторыя Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. *Мэта* спецкурса – фарміраванне ў студэнтаў трывалых ведаў па пытаннях дзяржаўна-палітычнай, сацыяльна-эканамічнай і грамадска-палітычнай гісторыі заходнебеларускіх зямель у складзе міжваеннай Польшчы.

Для рэалізацыі пастаўленай мэты неабходна вырашыць наступныя задачы:

– высетліць прычынна-выніковыя сувязі і заканамернасці развіцця заходнебеларускага насельніцтва ў кантэксце еўрапейскай і сусветнай гісторыі;

– вызначыць асноўныя этапы гістарычнага развіцця Заходняй Беларусі;

– садзейнічаць выпрацоўцы ў студэнтаў навыкаў пошукавай працы з інфармацыяй першакрыніц, вучэбнай і манаграфічнай літаратурай, умення аналізаваць падзеі і факты гісторыі і рабіць на гэтай падставе адпаведныя высновы і абагульненні.

Студэнт павінен ведаць:

– асноўныя этапы і заканамернасці гістарычнага развіцця беларускага народа ў складзе міжваеннай Польшчы;

– агульнае і адметнае ў развіцці Заходняй Беларусі, БССР і Польшчы;

– гісторыю Заходняй Беларусі ў кантэксце еўрапейскай і сусветнай гісторыі.

умець:

– высвятляць сутнаснае і асаблівае праз параўнанне і тыпалогію ў гісторыі Заходняй Беларусі;

–свабодна аперыраваць фактамі заходнебеларускай рэчаіснасці;

– паспяхова выкарыстоўваць атрыманыя веды ў працэсе выкладання гісторыі ў сярэдняй агульнаадукацыйнай школе.

У працэсе вывучэння кожнай тэмы студэнты павінны навучыцца карыстацца як канкрэтна-гістарычнымі метадамі (гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-тыпалагічны, гісторыка-сістэмны і інш.), так і агульнанавуковымі гістарычнага пазнання (аналізу і сінтэзу, індукцыі і дэдукцыі, мадэлявання, ідэалізацыі, аналогіі і інш.).

Адным з патрабаванняў адукацыйных стандартаў па спецыяльнасці вышэйшай адукацыі з'яўляецца распрацоўка вучэбна-метадычных комплексаў (ВМК) па вучэбных дысцыплінах, прызначаных для рэалізацыі патрабаванняў адукацыйных праграм і адукацыйных стандартаў вышэйшай адукацыі.

Змест вучэбна-метадычнага комплекса “Сацыяльна-эканамічнае і грамадска-палітычнае становішча Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг.”, распрацаванага на кафедры гісторыі славянскіх народаў УА “Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна”, накіраваны на рэалізацыю патрабаванняў адукацыйнага стандарта і вучэбнай праграмы. *Мэта* вучэбна-метадычнага комплекса – садзейнічанне арганізацыі і ўпарадкаванню самастойнай працы студэнтаў па авалодванні ведамі ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай. У ім падаюцца неабходныя структурныя часткі вучэбна-метадычнага характару, а менавіта тэарэтычная, практычная, кантролю ведаў і дапаможная.

*Тэарэтычная частка* ўяўляе канспектыўнае паслядоўнае выкладанне асноўных пытанняў гісторыі Заходняй Беларусі ў складзе міжваеннай Польшчы. У ёй на высокім навукова-метадычным узроўні прадстаўлены асноўныя падзеі дзяржаўна-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, грамадска-палітычнага характару заходнебеларускай гісторыі. Выкладанне іх ажыццяўляецца на падставе выкарыстання навейшых дасягненняў айчыннай гістарычнай навукі.

*Практычная частка* вучэбна-метадычнага комплекса прадстаўлена тэматыкай семінарскіх заняткаў і спісам літаратуры. Яны накіраваны на самастойную падрыхтоўку і засваенне студэнтамі вучэбнага матэрыялу на паглыбленым узроўні. Гэтаму павінна садзейнічаць наяўнасць у гістарыяграфічным раздзеле выдання бібліяграфічных звестак пра навуковыя публікацыі і зборнікі дакументаў і матэрыялаў.

*Дапаможная частка* накіравана на забеспячэнне самастойнай работы студэнтаў, утрымлівае спіс вучэбных і абагульняльных выданняў і дакументаў і матэрыялаў для самастойнай падрыхтоўкі да заняткаў, а таксама бібліяграфічныя звесткі пра навуковыя публікацыі і зборнікі дакументаў і матэрыялаў, змешчаныя ў гістарыяграфічным раздзеле выдання.

*Частка кантролю ведаў* прадстаўлена пытаннямі для самакантролю, якія складае аснову пераліку пытанняў да заліку.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

**Тэма 1. Прадмет, задачы і вучэбна-пазнавальная значнасць курса**

Задачы, навукова-пазнавальная значнасць і характар курса, яго структура. Гісторыя Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. – неад’емная і найважнейшая старонка беларускай гісторыі. Неабходнасць асэнсавання і выкарыстання вопыту заходнебеларускага сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітынага жыцця.

**Тэма 2. Гістарыяграфія Заходняй Беларусі 1921–1939 гг.**

Вывучэнне гісторыі Заходняй Беларусі ў 1920–1930-я гады як важная дзяржаўна-палітычная задача. Навуковыя цэнтры па вывучэнні заходнебеларускай праблематыкі і іх дзейнасць. Палітычныя рэпрэсіі і заняпад гістарыяграфіі гісторыі Заходняй Беларусі ў сярэдзіне 1930-х – першай палове 1950-х гадоў. Актывізацыя, асноўныя накірункі і вынікі вывучэння гісторыі Заходняй Беларусі ў другой палове 1950-х – 1980-я гады. Здабыткі вывучэння заходнебеларускай праблематыкі ў перыяд Рэспублікі Беларусь. Перыядызацыя гістарыяграфіі гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. Польская гістарыяграфія.

**Тэма 3. Рыжскі мір і Беларусь**

Беларускія землі ў часы грамадзянскай вайны і іншаземнай інтэрвенцыі. Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва. Паміж Польшчай і Савецкай Расіяй. Савецка-польская вайна. Праблемы беларускага нацыянальна-вызваленчага руху. Падрыхтоўка і падпісанне Рыжскага мірнага дагавора і яго вынікі ў адносінах да Беларусі.

**Тэма 4. Тэрыторыя і насельніцтва Заходняй Беларусі**

Тэрыторыя Заходняй Беларусі. Адміністратыўна-тэрытарыяльны падзел. Сацыяльны і нацыянальны склад насельніцтва. Пытанні вызначэння плошчы тэрыторыі і колькасці насельніцтва Заходняй Беларусі ў айчыннай і польскай гістарыяграфіі.

**Тэма 5. Палітыка польскай улады ў дачыненні да Заходняй Беларусі**

Міжнародныя абавязацельствы Польшчы ў адносінах да нацыянальных меншасцей. Гарантыі нацыянальна-культурнага жыцця паводле Версальскага і Рыжскага пагадненняў. Канстытуцыя Польшчы 1921 г. Адносіны польскіх урадавых колаў да Заходняй Беларусі.

Санацыйны рэжым. Нацыянальная і канфесіянальная палітыка польскіх улад у адносінах да беларускага насельніцтва Заходняй Беларусі.

**Тэма 6. Мясцовыя органы ўлады і самакіравання**

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Заходняй Беларусі. Сістэма мясцовых органаў дзяржаўнай улады і самакіравання як элемент польскай асіміляцыйнай палітыкі. Ваяводскія органы ўлады. Павятовая адміністрацыя. Гарадское і сельскае самакіраванне.

**Тэма 7. Сельская гаспадарка і аграрныя рэформы**

Становішча сельскай гаспадаркі. Палітыка польскіх урадаў у аграрнай сферы. Аграрныя рэформы і іх вынікі. Парцэляцыя. Насаджэнне асадніцтва. Камасацыя. Ліквідацыя сервітутаў. Працоўныя павіннасці (шарваркі). Сялянскі рух.

**Тэма 8. Прамысловасць і рамяство.**

Эканамічная палітыка Польшчы ў Заходняй Беларусі. Стан прамысловасці. Лясная прамысловасць – асноўная галіна прамысловай вытворчасці. Тэкстыльная прамысловасць. Харча-смакавая прамысловасць. Вытворчасць будаўнічых матэрыялаў. Умовы жыцця і працы рабочых. Рамяство як сродак існавання асноўнай масы гарадскога і местачковага насельніцтва. Віды рамяства. Рабочы рух.

**Тэма 9. Гандаль**

Дэмаграфічная спецыфіка Заходняй Беларусі. Гандлёвыя адносіны як элемент эканамічнай дзейнасці і сродак грамадскай кансалідацыі. Структура гандлю. Заходняя Беларусь у сістэме міжнароднага гандлю. Агульнапольскі, ваяводскі, павятовы (гарадскі) і гмінны (мястэчка, вёска) узроўні гандлёвых адносін.

Тэма 10. **Нацыянальна-вызваленчая барацьба ў Заходняй Беларусі**

Прычыны і характар нацыянальна-вызваленчага руху. Рэвалюцыйная і нацыянальна-дэмакратычная плынь у заходнебеларускім нацыянальна-вызваленчым руху. Беларускі нацыянальны камітэт. Таварыства беларускай школы. Беларускі пасольскі клуб. Камуністычная партыя (КПЗБ) і камсамол Заходняй Беларусі (КСМЗБ). Міжнародная арганізацыя дапамогі рэвалюцыянерам (МОПР). Рабочы рух. Забастовачная барацьба рабочых Заходняй Беларусі. Сялянскі рух, яго характар.

**Тэма 11. Партызанскі рух у Заходняй Беларусі ў 1921–1925 гг.**

Прычыны і характар партызанскай барацьбы. Рухаючыя сілы. Мэты і задачы. Палітычныя партыі і арганізацыі Заходняй Беларусі і партызанскі рух (Беларуская партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў (БПС-Р, беларускія эсэры), Беларуская рэвалюцыйная арганізацыя (БРА), Саюз сялянскай самаабароны, КПЗБ). Баявыя дзеянні партызан. Барацьба польскіх улад з заходнебеларускай партызанскай. Згортванне партызанскага руху.

**Тэма 12. Камуністычная партыя Заходняй Беларусі**

Камуністычныя арганізацыі ў Заходняй Беларусі ў пачатку 1920-х гадоў. Прычыны стварэння КПЗБ. Праграмныя ўстаноўкі і практычная дзейнасць. Удзел у арганізацыі забастовачнага, сялянскага і партызанскага руху. Стратэгія і тактыка партыі на розных этапах свайго існавання. Дыскусіі ў КПЗБ па пытаннях разгортвання рэвалюцыйнай барацьбы. КПЗБ і прафсаюзны рух Заходняй Беларусі. “Сэцэсія”. Роля КПЗБ у стварэнні Беларускай сялянска-работніцкай Грамады (БСРГ). Адносіны КПЗБ з нацыянальна-дэмакратычнымі партыямі і арганізацыямі. КПЗБ і Таварыства беларускай школы (ТБШ). Клуб “Змаганне”. Праблема ўзаемаадносін КПЗБ з КП(б)Б, УКП(б), Камінтэрна. Роспуск КПЗБ.

**Тэма 13. Беларуская сялянска-работніцкая Грамада**

Беларускі пасольскі клуб і стварэнне фракцыі ў польскім сейме. “Беларуская сялянска-работніцкая Грамада”. Б.А. Тарашкевіч, С.А. Рак-Міхайлоўскі, П.В. Мятла і інш. Роля КПЗБ у стварэнні арганізацыі. Пераўтварэнне БСРГ у масавую легальную рэвалюцыйна-дэмакратычную нацыянальна-вызваленчую арганізацыю. Мэты і праграма партыі. БСРГ і дзеячы нацыянальна-дэмакратычнага крыла. Роля БСРГ у пераўтварэнні ТБШ у масавую культурна-асветніцкую арганізацыю. Уздым нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі ў сярэдзіне 1920-х гадоў. Ліквідацыя Грамады, судовыя працэсы над яе ўдзельнікамі. Акцыі пратэсту насельніцтва Заходняй Беларусі супраць ліквідацыі БСРГ.

**Тэма 14. Нацыянальна-дэмакратычныя партыі і арганізацыі**

Нацыянальна-дэмакратычныя партыі і арганізацы Заходняй Беларусі ў першай палове 1920-х гадоў. Беларуская партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў, Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя, Беларуская партыя незалежных сацыялістаў. Беларуская Хрысціянская дэмакратыя (БХД). Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры (БІГіК). Беларускі сялянскі саюз. “Беларуская санацыя”, Цэнтрасаюз. Праблема ўзаемаадносін палітычных партый. Паланафільская плынь. Беларуская нацыянал-сацыялістычная партыя.

### Тэма 15. Заходняя Беларусь у гады сусветнага эканамічнага крызісу

Эканоміка Заходняй Беларусі ў 1929–1939 гг. Крызісныя з’явы ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы. Мерапрыемствы польскіх улад па іх пераадоленні. Рост апазіцыйных настрояў у заходнебеларускім грамадстве. Пышырэнне забастовачнай барацьбы. Антыўрадавыя сялянскія выступленні. КПЗБ як праваднік лініі Камінтэрна ў нацыянальна-вызваленчым руху. Тэорыя “сацыял-фашызму”. Ажыўленне паўстанцкага руху. Рэпрэсіі ў Польшчы і СССР у адносінах да ўдзельнікаў нацыянальна-вызваленчага руху з Заходняй Беларусі.

### Тэма 16. Заходняя Беларусь у 1934–1939 гг.

Сацыяльна-эканамічнае становішча Заходняй Беларусі ў 1934–1939 гг. Прамысловасць і сельская гаспадарка. Узмацненне санацыйнага рэжыму. Бяроза-Картузскі канцэнтрацыйны лагер. Рабочы і сялянскі рух. Праблема стварэння антыфашысцкага народнага фронту. Узаемаадносіны КПЗБ з нацыянальна-дэмакратычнымі арганізацыямі Заходняй Беларусі. Барацьба з “нацыянал-дэмакратызмам” і рэпрэсіі ў БССР, іх уплыў на стан заходнебеларускага нацыянальна-вызваленчага руху. Уплыў Камінтэрна на развіццё вызваленчага руху.

### Тэма 17. Уз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР

Еўропа напярэдадні ІІ сусветнай вайны. Польшча ў планах СССР і Германіі. Савецка-германскі дагавор аб ненападзенні, дадатковы сакрэтны пратакол. Пачатак ІІ сусветнай вайны. Уступленне Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь. Уз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР. Стварэнне органаў савецкай улады. Народны сход Заходняй Беларусі. Мерапрыемствы савецкай улады ў Заходняй Беларусі. 1939 год у гісторыі Беларусі. Асобы заходнебеларускай гісторыі.

## ТЭМАТЫЧНАЕ ПЛАНАВАННЕ

Дзённае навучанне

| Тэма | Лекцыі | Семінары |
|---|---|---|
| Тэма 1. Прадмет, задачы і вучэбна-пазнавальная значнасць курса | 2 | |
| Тэма 2. Гістарыяграфія гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. | 2 | |
| Тэма 3. Рыжскі мір і Беларусь | 2 | |
| Тэма 4. Тэрыторыя і насельніцтва Заходняй Беларусі | 2 | |
| Тэма 5. Палітыка польскай улады ў дачыненні да Заходняй Беларусі | 2 | |
| Тэма 6. Мясцовыя органы ўлады і самакіравання | 2 | |
| Тэма 7. Сельская гаспадарка і аграрныя рэформы | 2 | |
| Тэма 8. Прамысловасць і рамяство | 2 | |
| Тэма 9. Гандаль | 2 | |
| Тэма 10. Нацыянальна-вызваленчая барацьба ў Заходняй Беларусі | 2 | |
| Тэма 11. Партызанскі рух у Заходняй Беларусі ў 1921–1925 гг. | | 2 |
| Тэма 12. Камуністычная партыя Заходняй Беларусі | | 2 |
| Тэма 13. Беларуская сялянска-работніцкая Грамада | | 2 |
| Тэма 14. Нацыянальна-дэмакратычныя партыі і арганізацыі | | 2 |
| Тэма 15. Заходняя Беларусь у гады сусветнага эканамічнага крызісу | | 2 |
| Тэма 16. Заходняя Беларусь у 1934–1939 гг. | | 2 |
| Тэма 17. Уз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР | | 2 |
| Усяго | 20 | 14 |

# ТЭМАТЫЧНАЕ ПЛАНАВАННЕ

Завочнае навучанне

| Тэма | Лекцыі | Семінары |
|---|---|---|
| Тэма 1. Прадмет, задачы і вучэбна-пазнавальная значнасць курса. Гістарыяграфія гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. | 2 | |
| Тэма 2. Рыжскі мір і Беларусь. Тэрыторыя і насельніцтва Заходняй Беларусі | 2 | |
| Тэма 3. Палітыка польскай улады ў дачыненні да Заходняй Беларусі | 2 | |
| Тэма 4. Сельская гаспадарка і аграрныя рэформы. Прамысловасць і рамяство | 2 | |
| Тэма 5. Партызанскі рух у Заходняй Беларусі ў 1921–1925 гг. | | 2 |
| Тэма 6. Нацыянальна-вызваленчая барацьба ў Заходняй Беларусі. Уз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР | | 2 |
| Усяго | 8 | 4 |

# ЛЕКЦЫЙНЫ КУРС

## Тэма 1. Прадмет, задачы і вучэбна-пазнавальная значнасць курса

Гісторыя Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. – неад’емная і найважнейшая старонка айчыннай гісторыі. Яе значэнне актуалізуецца надзённасцю і запатрабаванасцю вопыта заходнебеларускай гісторыі і спецыфічных яе праяваў адміністратыўна-палітычнага, гаспадарча-эканамічнага і грамадска-палітычнага жыцця. У прыватнасці, выклікае цікавасць вопыт арганізацыі органаў мясцовай улады і самакіравання, якія, нягледзячы на агульную акупацыйна-асіміляцыйную скіраванасць польскіх улад, працягваў усталяваную яшчэ ў часы Расійскай імперыі лінію на актывізацыю актыўных народных сіл, накіраваных на забеспячэнне сваіх палітычных, гаспадарчых і культурных патрэб. Складаныя ўзаемаадносін паміж рознымі сацыяльнымі, эканамічнымі і палітычнымі групоўкамі і асобнымі іх прадстаўнікамі ва ўмовах абмежаванай польскай дэмакратыі ілюструюць працэс паступовага грамадскага сталення і ўзмацненне адказнасці за ўласныя і агульназначныя справы.

Выключна значнай, разнастайнай і ўнікальнай ў сваіх праявах з’явай айчыннай гісторыі бачыцца гаспадарча-эканамічнае жыццё Заходняй Беларусі. Велізарны масіў архіўных матэрыялаў і навуковых публікацый больш адэкватна прэзентуюць сацыяльна-эканамічныя адносіны Заходняй Беларусі, чым гэта было ў выяўленні савецкай гістарыяграфіі, негатыўныя фармулёўкі якой былі абумоўлены эканамічнымі і ідэйна-класавымі прыярытэтамі савецкай гістарыяграфіі, якая ва ўмовах тагачаснага грамадска-палітычнага рэжыму зыходзіла з думкі аб безумоўнай каштоўнасці і вартасці савецкай сацыялістычнай мадэлі гаспадаркі. Сёння неабходна мець на ўвазе станоўчыя аспекты экономікі Заходняй Беларусі, у тым ліку рынкавую збалансаванасць, высокую ступень эканамічнай самаарганізацыі, сыравінна-энергетычнай самадастатковасці гаспадаркі Заходняй Беларусі, якія нягледзячы на вядомыя складанасці і крызісна-дэпрэсіўныя праявы забяспечвалі дастатковы дабрабыт насельніцтва.

Асабліва трэба адзначыць відавочную суб’ектнасць заходнебеларускага насельніцтва як сукупнасці ўдзельнікаў эканамічных парцэсаў, іх актыўны і свядомы ўдзел у гаспадарча-эканамічным жыцці, з разлікам на свае сродкі і рэсурсы, без ілюзій і спадзяванняў на падтрымку “сацыяльна арыентаванай дзяржавы”. У прыватнасці, сёння, у час трансфармацыі сацыяльна-эканамічных адносін, неабходнасці вырашэння разнастайных гаспадарчых і сацыяльна-культурных праблем у рэгіёнах, выклікае цікавасць гістарычны вопыт выкарыстання на тэрыторыі Заходняй Беларусі натуральных працоўных павіннасцей (шарваркаў), якімі заідэалагізаваная і палітычна абумоўленая савецкая перыёдыка і

навуковыя публікацыі ілюстравалі “антынародную прыгонніцкую” сутнасць польскай улады ў дачыненні да заходнебеларускага сялянства. Ва ўмовах замацавання ў беларускім грамадстве прадпрымальніцка-рынкавых прыярытэтаў, на фоне зніжэння ўзроўню кансалідацыі насельніцтва вакол грамадска значных каштоўнасцей і праектаў, шарваркавая тэматыка набывае відавочную актуальнасць стваральным, адказным стаўленнем да грамадска значных задач.

На фоне гэтага не губляюць сваёй актуальнасці падзеі грамадска-палітычнага характару і найперш беларускі нацыянальны-вызваленчы рух Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гадах, які з’яўляецца адной з яркіх і драматычных старонак у гістарычным летапісе барацьбы беларускага народа за незалежнасць і нацыянальную кансалідацыю. Дэталізацыя і канкрэтыка гэтай праблемы разнапланавымі праявамі істотна выходзіць за рамкі тэмы, дазваляе пашырыць і ўдакладніць уяўленні адносна многіх аспектаў палітыкі польскіх улад, міжэтнічных і міжканфесійных узаемаадносін, гаспадарча-эканамічных і сацыяльна-культурных камунікацый. Гэта тычыцца пытанняў партызанскага руху, беларускага прадстаўніцтва ў польскім сейме, дзейнасці разнастайных палітычных партый і арганізацый, кааператыўнага руху, а таксама актыўнай дзейнасці беларускіх нацыянальных дзеячаў і іншаэтнічных палітыкаў як ідэолагаў і ўдзельнікаў адпаведных працэсаў. Асэнсаванне гісторыі нацыянальна-вызваленчага руху выяўляе высокую ступень палітычнай адказнасці і ініцыятыўнасці беларускага насельніцтва, накіраваных на арганізацыю грамадска значных мерапрыемстваў, накіраваных на ўдасканаленне гаспадарчага і грамадска-культурнага жыцця.

Зыходзячы з вышэйадзначанага вызначаюцца задачы, навукова-пазнавальная значнасць і характар курса, яго структура. У час азнаямлення з вучэбным матэрыялам студэнты павінны засвоіць асноўныя праблемы гістарыяграфіі гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гг., крыніцазнаўства і метадалогіі заходнебеларускай праблематыкі, азнаёміцца з найбольш важнымі і значнымі пытаннямі сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага жыцця Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. Пры гэтым вялікая ўвага надаецца знаёмству з гістарычнымі падзеямі на падставе дакументаў і матэрыялаў, якія змяшчаюцца ў зборніках, а таксама новых матэрыялаў айчынных і замежных архіваў, што вызначаюць навізну сучаснай гістарыяграфіі праблемы.

## Тэма 2. Айчынная гістарыяграфія гісторыі Заходняй Беларусі

Савецкая гістарыяграфія гісторыі Заходняй Беларусі 1920–1930-х гадоў была абумоўлена ваенна-стратэгічнымі і грамадска-палітычнымі прыярытэтамі савецкага ўрада. Савецкае кіраўніцтва не магло пагадзіцца з вынікамі польска-савецкай вайны і разглядала знаходжанне заходняй частцы Беларусі ў складзе Польшчы як часовае становішча, будучыня Заходняй Беларусі звязвалася з развіццём рэвалюцыйнай барацьбы, рэалізацыяй на практыцы ідэі сусветнай рэвалюцыі. Для забеспячэння поспеху масавага антыпольскага руху ў Заходняй Беларусі, узнікала неабходнасць ідэалагічнай падтрымкі згаданых мерапрыемстваў. Важнейшым ў гэтым сэнсе было выкрыццё мерапрыемстваў польскіх уладаў у Заходняй Беларусі як акупацына-захопніцкіх, асіміляцыйна-паланізатарскіх. У пачатку 1920-х гг. у перыядычным друку БССР публікаваліся матэрыялы па заходнебеларускай праблематыцы, якія павінны былі спрыяць уздыму рэвалюцыйнага руху ў краі, аказаць маральна-палітычную падтрымку яго ўдзельнікам. Такога роду публікацыі разам з рэзалюцыямі партыйных з’ездаў, канферэнцый і пленумаў УКП(б), КП(б)Б, Кампартыі Польшчы (КПП) і КПЗБ з’яўляліся кіраўніцтвам да дзеянняў для камуністаў, выконвалі палітыка-ідэалагічныя задачы, накіраваныя на ўмацаванне адмоўных адносін да палітыкі Польшчы ў дачыненні да беларускага насельніцтва, сцвярджалі справядлівасць і неабходнасць разгортвання рэвалюцыйнай барацьбы ў Заходняй Беларусі за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне і ўз’яднанне з БССР.

Больш грунтоўная распрацоўка гісторыі Заходняй Беларусі пачалася пасля згортвання партызанскага руху у 1925 г., калі былі арганізаваны ўстановы, якія вывучалі сітуацыю ў Заходняй Беларусі, забяспечваючы патрэбнай інфармацыяй савецкае ваенна-палітычнае кіраўніцтва. Такімі навуковымі і выдавецкімі цэнтрамі ў 20–30-я гады XX ст. былі Інстытут польскай пралетарскай культуры (ІППК) і Камісія па вывучэнні Заходняй Беларусі (КЗБ) пры Інстытуце беларускай культуры – Беларускай Акадэміі Навук, заходні сектар Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КП(б)Б (ЗС), а таксама Цэнтральная рэдакцыя КПЗБ. Менавіта іх супрацоўнікі, сярод якіх была вялікая колькасць удзельнікаў камуністычнага падполля ў Польшчы і Заходняй Беларусі, членаў Кампартыі Польшчы і Кампартыі Заходняй Беларусі, з’яўляліся аўтарамі навуковых публікацый па заходнебеларускай праблематыцы. Аднак, працуючы фактычна ў напаўсакрэтных установах, навуковыя работнікі не мелі магчымасці публікаваць усе свае даследаванні ў адкрытым друку. Апублікаваныя матэрыялы з’яўляюцца толькі часткай аб’ёмнай навукова-даследчай і аналітычнай працы, іх выніковая навуковая інфармацыя была двух відаў: адкрытая, якая друкавалася ў адкрытым

друку, і закрытая – толькі для службовага карыстання, а то і з грыфам “зусім сакрэтна”. Акрамя афіцыйнага кіраўніцтва, супрацоўнікі КЗБ, ІППК, ЗС падпарадкоўваліся структурам, якія наўпрост займаліся арганізацыяй рэвалюцыйнага падполля ў Польшчы і Заходняй Беларусі, а менавіта Прадстаўніцтву ЦК КПЗБ і Прадстаўніцтву ЦК КПП, якія размяшчаліся адпаведна ў Мінску і Маскве і кантраляваліся Камінтэрнам. Фактычна Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ пры ЦК КП(б)Б было падраздзяленнем ДПУ-НКУС і непасрэдна кіравала школай КПЗБ і Цэнтральнай рэдакцыяй КПЗБ, накіроўвала дзейнасць камісіі па вывучэнні Заходняй Беларусі пры Акадэміі навук БССР і заходняга сектара Гістпарта.

Даследаванне заходнебеларускай тэматыкі праводзілі супрацоўнікі Аддзела прыроды і народнай гаспадаркі Інбелкульта. Так, дзякуючы грунтоўным работ А. Смоліча і Г. Гарэцкага, на высокім навуковым узроўні распрацаваны пытанні тэрыторыі і насельніцтва Заходняй Беларусі[1]. Падзеі ў Заходняй Беларусі ў агітацыйна-прапагандысцкім рэчышчы атрымалі ў 1920–1930-я гг. адлюстраванне ў шматлікіх перыядычных выданнях КПП, КПЗБ, Беларускай сялянска-работніцкай грамады (БСРГ), арганізацыі “Змаганне” і Таварыства беларускай школы (ТБШ)[2]. Асаблівую ўвагу прыцягваюць матэрыялы часопіса “Бальшавік Беларусі”, на старонках якога ў 1920–1930-я гг. надрукаваны матэрыялы і артыкулы, у тым ліку дзеячаў КПП і КПЗБ, прысвечаных пытанням эканамічнага і палітычнага становішча ў Заходняй Беларусі, унутрыпартыйнага жыцця КПЗБ, яе ўдзелу і ролі ў рэвалюцыйным руху[3].

---

[1] Смоліч Аркадзь. Кароткі курс географіі Беларусі. Менск : Дзярж. выд-ва Беларусі, 1925. 352 с. ; Гарэцкі Г. Межы Заходняй Беларусі ў Польшчы (Нацыянальны склад насельніцтва Заходняй Беларусі) // Матар’ялы да геаграфіі і статыстыкі Беларусі. Т. 1 / пад рэд. А. Смоліча ; Ін-т беларус. культуры, Аддз. прыроды і нар. гасп-кі. Менск, 1928. С. 1–169.

[2] Говін С. В. Друк Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.). Мінск : БДУ, 1974. 95 с. ; Зелинский П. И., Ракевич Н. А. Печать КПЗБ в борьбе за свободу. Минск : БГУ, 1977. 144 с.

[3] Аб кіраўніцтве эканамічнымі баямі і задачы партыі ў прафруху : рэзалюцыя V пленума ЦК КПЗБ // Бальшавік Беларусі. 1931. № 8/9. С. 74–78 ; Задачы партыі ў галіне вызваленчай барацьбы прыгнечаных народаў : рэзалюцыя V пленума ЦК КПЗБ // Тамсама. С. 64–73 ; Корчык П. Вузлавы пункт нашай працы на вёсцы // Тамсама. № 4. С. 22–33 ; Корчык П. Вынікі фашысцкай выбарчай кампаніі ў Заходняй Беларусі // Тамсама. № 1–2. С. 7–18 ; Корчык П. Нацыянал-апартунізм у КПЗБ і ідэалагічная спадчына “Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі” // Тамсама. 1934. № 7. С. 35–43 ; Крэвіч П. Заходняя Беларусь на парозе рэвалюцыйных баёў // Тамсама. 1931. № 1–2. С. 8–18 ; Лясоцкі Я. Эканамічнае становішча рабочае моладзі ў Польшчы і барацьба КСМП // Тамсама. 1928. № 11. С. 6–15 ; Матэлевіч М. Другі пленум ЦК КПЗБ // Тамсама. 1929. № 4. С. 20–27 ; Некрашэвіч А. Беларускі нацыянал-фашызм і яго сабрат беларускі нацыянал-дэмакратызм // Тамсама. 1929. № 10–12. С. 83–90 ; Праткоўскі У. Змаганне супраць нацыянальнага прыгнёту // Тамсама. 1932. № 1–2. С. 20–33 ; Сталевіч А. Заявы III пленума ЦК КПЗБ // Тамсама. 1929. № 10–12. С. 104 ; Сталевіч А. Напярэдадні баёў за ўладу // Тамсама. 1931. № 8/9. С. 14–19 ; Сталевіч А. Сялянскія партыі ў Заходняй Беларусі // Тамсама. 1928. № 9. С. 13–27 ; № 10. С. 7–19 ; № 12. С. 28–37 ; Сянкевіч А. Палітычныя групоўкі ў Заходняй Беларусі перад выбарамі ў Польскі сейм // Тамсама. 1928. № 1. С. 15–19 ; Шнарскі С. Эканамічнае становішча Заходняй Беларусі // Тамсама. 1928. № 2. С. 24–35 ; Шнейдэр Я. Заходняя Беларусь пад ярмом польскага імперыялізму // Тамсама. 1935. № 10–11. С. 169–178.

Некаторую выдавецкую дзейнасць па асвятленні пытанняў заходнебеларускай праблематыкі праводзіла выдавецтва МОПР[4].

Намаганнямі даследчыкаў 1920-х – сярэдзіны 1930-х гг. была створана вялікая колькасць навукова-даследчых работ у выглядзе манаграфій, брашур, часопісных артыкулаў. І калі публікацыі па пытаннях грамадска-палітычнага становішча і нацыянальна-вызвольнага руху ў Заходняй Беларусі мелі ярка выражаны агітацыйна-прапагандысцкі характар, то апублікаваныя даследаванні па гісторыі сацыяльна-эканамічных адносін адрозніваліся больш высокім навуковым узроўнем, мелі пад сабой трывалую крыніцавую базу ў выглядзе матэрыялаў афіцыйнай статыстыкі розных ведамстваў, ваяводскіх дзённікаў, прамысловых і гандлёвых даведнікаў, справаздач інспекцыі працы і інш. Навуковую цікавасць выклікаюць шматлікія неапублікаваныя матэрыялы ў выглядзе аналітычных запісак і абагульняльных матэрыялаў, прызначаныя для рознага роду ваенна-палітычных і партыйна-дзяржаўных органаў. Некаторыя з іх прадстаўляюць сабой шматстаронкавыя даведнікі з інфармацыяй пра тэрыторыю і насельніцтва Заходняй Беларусі, сацыяльна-эканамічныя, грамадска-палітычныя, рэлігійна-канфесійныя асаблівасці краю. Гэтыя працы былі падставай для выпрацоўкі і карэкціроўкі камінтэрнаўскім кіраўніцтвам курсу палітычных кампаній у Заходняй Беларусі, утрымлівалі і непрыемныя для камуністаў звесткі пра тэндэнцыі стабілізацыі сацыяльна-эканамічнага жыцця ў Заходняй Беларусі, несуцяшальную інфармацыю аб нездавальняючым стане партыйнага жыцця КПЗБ, адыходзе насельніцтва ад актыўнага супрацьстаяння мерапрыемствам польскай улады, пасіўнасці, абыякавасці рабочых і сялян у дачыненні да заклікаў кампартыі. Аднак такая інфармацыя “для ўнутранага карыстання” не агучвалася на старонках выданняў, была засакрэчанай, бо разбурыла б штучна створаныя для ўкаранення патрэбных ідэалягемаў вобразы заходнебеларускай рэчаіснасці.

Асаблівасцю ідэйна-палітычнага зместу, сацыяльна-эканамічнай накіраванасці ў адрозненне ад вышэйзгаданых адрозніваюцца выданні дзеячаў беларускіх нацыянальна-дэмакратычных партый і арганізацый, якія былі апанентамі пракамуністычнай арганізацый і праз публікацыі ажыццяўлялі прапаганду беларускіх нацыянальна-дзяржаўных і культурных каштоўнасцяў, на іх падставе праводзілі работу сярод беларускага насельніцтва. Навукова-публіцыстычныя працы А. Луцкевіча, А. Станкевіча, В. Гадлеўскага і іншых дзеячаў беларускага руху,

[4] Белазеўскі А. Заходняя Беларусь пад пятой польскіх акупантаў (За што Пілсудзкі разграміў Грамаду). Менск : Выд-ва ЦК МОПР БССР, 1928. 45 с. ; Рядом с нами. Польская комсомолка. М. : Изд-во ЦК МОПР, 1932 ; Сталевіч А. Заходняя Беларусь – калёнія Польшчы. Менск : ЦК МОПР у БССР, 1930. 48 с. ; Шабсин И. Как живут в Польше украинские и белорусские крестьяне. М. : Изд-во ЦК МОПР, 1926. 15 с.

неангажыраванага камінтэрнаўскімі сіламі, адлюстроўвалі памкненні адпаведных грамадска-палітычных колаў. Найбольшай увагі заслугоўваюць нататкі А. Луцкевіча і А. Станкевіча, у працах якіх адлюстраваны важнейшыя падзеі беларускага руху, пазіцыі і паводзіны яго правадыроў, пададзена іх ацэнка. Варта адзначыць, што публікацыі, якія адлюстроўвалі пытанні грамадска-палітычнага становішча і нацыянальна-вызваленчай барацьбы ў Заходняй Беларусі, не мелі выключна навуковага характару і сёння ўяўляюць цікавасць як гістарыяграфічныя крыніцы[5].

У выніку ажыццяўлення даследавання Заходняй Беларусі ў 1920–1930-я гг. былі сфармуляваны асноўныя напрамкі і падыходы да вывучэння заходнебеларускай праблематыкі. Аднадушна акцэнтуючы ўвагу на нацыянальным, сацыяльна-эканамічным уціску з боку польскіх уладаў, палітыка-прававаым бяспраўі беларускага народа ў Польшчы, у прапагандысцкім духу беларускія савецкія аўтары падкрэслівалі каланіяльны, аграрна-сыравінны характар эканомікі Заходняй Беларусі, які дапаўняўся малазямеллем сялян, асадніцтвам, камасацыяй, закрыццём беларускіх школ[6]. Такім чынам гістарыяграфічна ствараўся вобраз беларускага народа, які пакутуе пад “непасільным ярмом польскіх паноў” у той час, калі людзі ў БССР жывуць нашмат лепш, чым іх адзінакроўныя браты ў Заходняй Беларусі.

Грунтоўную навуковую распрацоўку атрымалі стратэгічна важныя пытанні сацыяльна-эканамічнага становішча Заходняй Беларусі, а менавіта, прыроды і насельніцтва, стану прамысловасці, сельскай гаспадаркі, камунікацый. Гэта тлумачыцца тым, што дадзенага роду інфармацыя мела асаблівую актуальнасць у сувязі з падрыхтоўкай СССР да ваеннага канфлікту з Польшчай. Прамое сведчанне гэтаму знаходзім, у прыватнасці, у грунтоўных шматстаронкавых статыстыка-эканамічных матэрыялах па Заходняй Беларусі, падрыхтаваных у 1928 г., дзе сказана: “У выпадку прыняцця аператыўнага вырашэння, вышэйшае камандаванне павінна будзе ўлічыць сацыяльную абстаноўку ў раёне аперацый, улічыць яе станоўчыя і адмоўныя бакі як для нас, так і для праціўніка... Мэта нашай працы складаецца ў тым, каб служыць даведнікам для работніка Чырвонай

---

[5] Савіч А. А. Нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі (1921–1939 гады): гістарыяграфія праблемы : манаграфія / навук. рэд. А. А. Каваленя ; Брэсц. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна. Брэст : БрДУ, 2012. С. 34.

[6] Шабсин И. Как живут в Польше украинские и белорусские крестьяне ; Вонсовский Б. Куда Пилсудский ведет Польшу: Политико-экономический очерк современной Польши. Минск : Белгосиздат, 1927. 103 с. ; Яго ж. Куды вядзе Пілсудзкі Польшчу: Палітыка-эканамічны нарыс сучаснай Польшчы. Мінск : Белдзяржвыд, 1927. 100 с. ; Пад польскім ярмом. Менск : Беларус. дзярж. выд-ва, 1929. 23 с. ; Боген Д. Заходняя Беларусь пад крывавым бізуном польскіх акупантаў. Менск : Белдзяржвыд-ва, 1931. 15 с. ; Гарбацэвіч П. Полёнізацыя Заходняй Беларусі. Менск : Беларус. акад. навук, Каміс. Заход. Беларусі, 1932. 25 с.

Арміі"[7]. У такога кшталту даследаваннях па ваяводствах і паветах адлюстраваны пытанні тэрыторыі, сельскай гаспадаркі (віды і тыпы гаспадарак, іх памер, этнічная прыналежнасць уладальнікаў, забяспечанасць інвентаром, жывёлай, інтэнсіўнасць і ўраджайнасць сельскай гаспадаркі, склад наёмных рабочых, размеркаванне зямлі па угоддзях, харчовы баланс па раслінаводстве, жывёлагадоўлі і ў цэлым па рэгіёне), прамысловасці (галіны, колькасць прадпрыемстваў і рабочых, аб'ёмы выпуску прадукцыі, спіс прадпрыемстваў з колькасцю рабочых больш за 20 і г.д.), насельніцтва (колькасць і шчыльнасць, палавой і узроставай склад, пісьменнасць, нацыянальны, канфесійны, прафесійны і класавы склад сельскага і гарадскога насельніцтва, рэпатрыянты і інш.), зроблены аргументаваныя высновы аб ваенна-стратэгічным значэнні Заходняй Беларусі.

Аналагічнага характару, узроўню і накіраванасці даследаванні па сацыяльна-эканамічнай гісторыі пачалі публікавацца толькі пачынаючы з 1930-х гадоў.[8] У іх, у прыватнасці, адлюстраваны прыродна-геаграфічныя ўмовы Заходняй Беларусі, размяшчэнне і ўдзельная вага яе прамысловасці, колькасць, узровень капіталізацыі і пералік прадпрыемстваў, забяспечанасць сыравінай і абсталяваннем, дынаміка колькасці рабочых, узровень іх зарплаты па тыднях, месяцах і гадах, узроставыя і палавыя характарыстыкі, колькасць беспрацоўных, няшчасных выпадкаў, колькасць і кошт прадукцыі па асобных галінах прамысловасці, пазначаны фабрычныя вёскі, колькасць і размяшчэнне рамеснай вытворчасці па прафесіях і паветах, яго асноўныя паказчыкі.

У агітацыйна-прапагандысцкім жанры падаваліся пытанні рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху як нарастальнага працэсу, што ахопліваў усё больш шырокія колы насельніцтва Заходняй Беларусі, нягледзячы на яго відавочную цыклічнасць. Значная ўвага надавалася асвятленню розных бакоў дзейнасці КПЗБ, як галоўнай сілы, якая ўзначальвала рэвалюцыйную барацьбу ў Заходняй Беларусі[9]. У

[7] НАРБ. Ф. 242п. Оп. 2. Д. 164. Материалы к I съезду Компартии Западной Белоруссии: годовая смета ЦК КПЗБ на 1927–1928 гг. и сведения об экономическом положении в Западной Белоруссии. Л. 7, 29.

[8] Гак Л. Аграрная палітыка польскай буржуазіі ў Заходняй Беларусі / Ін-т гісторыі партыі і Кастрычн. рэвалюцыі пры ЦК КП(б)Б. Менск : Дзярж. выд-ва Беларусі. Партмассэктар, 1933. 95 с. ; Фришман В. Промышленность Западной Белоруссии : стат.-экон. описание / Белорус. акад. наук, Комис. по изучению Зап. Белоруссии. Минск : Изд-во Белорус. акад. наук, 1934. 133 с. ; Шнейдэр Я. Абнішчанне сялянства на Заходняй Беларусі і шлях да заможнага жыцця ў БССР / Каміс. Заход. Беларусі. Менск : Выд-ва Беларус. акад. навук, 1934. 53 с. ; Шнейдер Я. Очерк размещения промышленности Западной Белоруссии. Минск : Изд-во Акад. наук, 1936. 104 с.

[9] Багданскі Я., Бабровіч Л. Аб клясавай барацьбе ў Заходняй Беларусі ў часы Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады. Менск : Беларус. акад. навук, Каміс. Заход. Беларусі, 1932. 67 с. ; Валевіч І. Р. Першыя гады Кампартыі Заходняй Беларусі. Успаміны падпольшчыка. 1921–1925 гг. Менск : Дзярж. выд-ва Беларусі, 1935. 48 с. ; Политические партии в Польше, Западной Белоруссии и Западной Украине / Белорус. акад. наук, Комис. по изучению Зап. Белоруссии ; под ред. С. Скульского. Минск : Беларус. акад. наук, 1935. 335 с.

пачатку 1930-х гг. пасля рэпрэсій з боку савецкіх уладаў у дачыненні да былых кіраўнікоў Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі (БРА) былі зроблены высновы пра тое, што КПЗБ, прымаючы ў свае шэрагі БРА цэлай арганізацыяй, зрабіла вялікую палітычную памылку, так як разам з часткай сапраўды па-камуністычнаму настроеных элементаў такім шляхам пралезла ў КПЗБ група буржуазных нацыяналістаў з мэтай разгрому рэвалюцыйнага руху знутры. Менавіта палітычнай спадчынай БРА ў КПЗБ тлумачылася з'яўленне ў ёй т.зв. "сэцэсіі", якая была абвінавачана ў контррэвалюцыйнай, антыпартыйнай, падрыўной працы[10].

Вялікую ўвагу даследчыкаў у другой палове 1920-х – 1930-я гг. прыцягнула гісторыя Беларускай сялянска-работніцкай грамады, яе роля і значэнне ў развіцці рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі[11]. Аўтары, прадстаўляючы гэтую арганізацыю як самую ўплывовую ў Заходняй Беларусі, знаёмячы з асноўнымі пунктамі яе праграмы, першапачаткова жадаючы замаскіраваць яе сувязь з КПЗБ, даказвалі, што ў праграме партыі і дзеяннях пераважала не рабочая, а сялянская ідэалогія, падкрэслівалі дробнабуржуазны, некамуністычны характар БСРГ. Але пры гэтым сцвярджалі, што Грамада бліжэй за іншыя палітычныя арганізацыі блізкая да партыі пралетарыяту. Рэзкай крытыцы падвяргаліся польскія і беларускія друкаваныя органы за інфармацыю пра "як быццам бы існуючай сувязі" Грамады з камуністамі, якія атрымалі магчымасць легальнай працы[12]. Па меры выдалення ад часу БСРГ фармулёўкі пачалі мяняцца ў бок прызнання яе сувязі з КПЗБ, а ўжо ў 1935 г. адназначна канстатавалася, што "стотысячная баявая нацыянальна-вызваленчая арганізацыя – Грамада" вырасла пад кіраўніцтвам КПЗБ[13].

У БССР рэгулярна выходзілі працы, якія адлюстроўвалі асноўныя праграмныя ўстаноўкі і палітычную практыку беларускіх нацыянальна-дэмакратычных партый і арганізацый, у першую чаргу Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі (БХД), Беларускага сялянскага саюза (БКС), "Беларускай санацыі" і іншых арганізацый[14]. На працягу ўсяго савецкага часу гэтыя партыі і іх дзеячы неабгрунтавана маляваліся ворагамі беларускага народа, згоднікаў у адносінах да польскіх уладаў. Галоўная

---

[10] Политические партии в Польше, Западной Белоруссии и Западной Украине. С. 265–266 ; Корчык П. Нацыянал-апартунізм у КПЗБ … С. 35–43 ; НАРБ. Ф. 242п. Оп. 1. Д. 333. Резолюции и письма ЦК КПЗБ, материалы к докладам и выступлениям Роберта и др. (1930–1935). Л. 103.

[11] Западная Белоруссия : сб. ст. Кн. 1. Менск : Белорус. гос. изд-во, 1927. 211 с. ; Беларуская сялянска-работніцкая грамада. Менск : Дзяржвыд-ва, 1928. 54 с. ; Западная Белоруссия на скамье подсудимых. Процесс Белорусской Крестьянско-Рабочей Громады. Минск : Белорус. гос. изд-во, 1929. 263 с. ; Багданскі Я., Бабровіч Л. Аб клясавай барацьбе ў Заходняй Беларусі ...

[12] Западная Белоруссия. Кн. 1. С. 211, 206.

[13] Багданскі Я., Бабровіч Л. Аб клясавай барацьбе ў Заходняй Беларусі … С. 23.

[14] Западная Белоруссия. Кн. 1 ; Политические партии в Польше, Западной Белоруссии и Западной Украине ; Багданскі Я., Бабровіч Л. Аб клясавай барацьбе ў Заходняй Беларусі ... ; Гарадоцкі А. Як беларуская Хадэцыя гандлюе крывёю рабочых і сялян. Вільня, 1934. 34 с.

думка ў публікацыях такога роду заключалася ў тым, што беларускія нацыянальна-дэмакратычныя арганізацыі з'яўляюцца злымі ворагамі КПЗБ, БСРГ, БССР і не маюць уплыву сярод шырокіх пралетарскіх і сялянскіх мас[15].

З цягам часу надзеі савецкага кіраўніцтва на перамогу пралетарскай рэвалюцыі ў Польшчы пачалі згасаць, так як у грамадска-палітычнай сітуацыі ў краіне ў цэлым і ў Заходняй Беларусі ў прыватнасці не было аб'ектыўных перадумоў для перарастання рэвалюцыйных выступленняў у збройны чын. У сярэдзіне – другой палове 1930-х гг. чарговая хваля палітычных рэпрэсій у БССР захапіла і дзеячаў рэвалюцыйнага нацыянальна-вызвольнага руху Заходняй Беларусі, а таксама кіраўнікоў КПП і КПЗБ. Паступова камуністычны рух у Польшчы быў скампраметаваны, што адмоўна адбілася на асвятленні ў друку пытанняў рэвалюцыйнага руху і ў Заходняй Беларусі, колькасць публікацый і згадак пра КПЗБ змяншаецца. Выканкам Камінтэрна, які ў 1938 г. прыняў рашэнне аб роспуску КПП, знаходзіўся пад уплывам кіраўніцтва СССР. І.В. Сталін разумеў, што польскае і заходнебеларускае пытанне вырашацца хутчэй за ўсё ў выніку рэалізацыі намераў Гітлера пашырыць жыццёвую прастору для "арыйскай" нацыі за кошт Польшчы. У гэтай сітуацыі мерапрыемствы па інспірацыі і падтрымцы рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызвольнага руху ў Заходняй Беларусі, а таксама ідэалагічнае абгрунтаванне неабходнасці развіцця гэтай барацьбы адыходзілі на задні план[16].

Вынікам рашэння аб роспуску ў 1938 г. КПЗБ, як складовай часткі КПП, стала змена акцэнтаў і фармулёвак у асвятленні пытанняў нацыянальна-вызваленчага руху. Гэтаму спрыяла ўз'яднанне восенню 1939 г. Заходняй Беларусі з БССР у выніку паходу Чырвонай Арміі, пасля якога асноўная ўвага надавалася выпуску агітацыйных брашур з апісаннем цяжкіх умоў жыцця беларусаў у Польшчы, усенароднай рэвалюцыйнай барацьбы з польскім "крывавым рэжымам", кіраўніцтва якой з боку КПЗБ ігнаравалася[17], за выключэннем некалькіх работ[18]. Сцвярджалася, што Грамада была створана з дазволу "ўрада акупантаў", які разлічваў ўзяць яе пад свой нагляд і кіраўніцтва, абясшкодзіць масавы рух, раскласці яго

[15] Политические партии в Польше, Западной Белоруссии и Западной Украине. С. 25.

[16] Савіч А. А. Нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі ... С. 41–42.

[17] Гарбуноў Т. Год пад сцягам саветаў. Мінск : Дзярж. выд-ва пры СНК. Рэд. паліт. літ., 1940. 56 с. ; Егоров Г. Западная Белоруссия. М. : Гос. изд-во полит. лит., 1939. 40 с. ; Пичета В. Исторические судьбы Западной Украины и Западной Белоруссии. М. : Моск. рабочий, 1939. 40 с.

[18] Заходняя Беларусь пад панскім гнётам і яе вызваленне / пад рэд. Н. М. Нікольскага і І. Ф. Лочмеля. Мінск : Выд-ва АН БССР, 1940. 96 с. ; Лочмель И. Ф. Очерк истории борьбы белорусского народа против польских панов. М. : Воениздат, 1940. 162 с.

знутры і разграміць. Рэвалюцыйны і нацыянальна-вызваленчы рух пасля роспуску КПЗБ паказваўся як стыхійны працэс, павярхоўна, схематычна[19].

Замаруджаная Вялікай Айчыннай вайной распрацоўка гісторыі Заходняй Беларусі ажывілася з сярэдзіны 1940-х гг., калі ў перыядычным друку сталі з'яўляцца артыкулы агітацыйна-прапагандысцкага характару[20]. Актыўную дзейнасць па асвятленні Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. правёў у 1940–1950-я гг. Ц.С. Гарбуноў, які ў 1948 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю і апублікаваў шэраг прац[21]. У першай палове 1950-х гг. паступова складваліся навукова-тэарэтычныя передумовы паглыбленага вывучэння гісторыі Заходняй Беларусі, звязаныя з падрыхтоўкай і абаронай кандыдацкіх даследаванняў К.І. Дамарада, В.П. Панамарэнкі, І.А. Юхо, А.У. Царука, праведзеных на падставе значнай крыніцавай базы, у тым ліку архіўных дакументаў[22]. Паваенная беларуская савецкая гістарыяграфія праблемы, яе акцэнты і фармулёўкі ў асноўным працягвалі ўсталяваную ў другой палове 1930-х гг. традыцыю паказу цяжкага становішча Заходняй Беларусі, усхвалялі і ідэалізавалі падзеі верасня 1939 г., сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні савецкай улады. Як і раней публікацыі ўтрымлівалі цэлы шэраг вульгарызаваных ацэнак і высноў, напрыклад, беларускі рэвалюцыйна-дэмакратычны кірунак вызваленчай барацьбы і яго кіраўнікі ацэньваліся як нацыяналістычныя, БСРГ і яе лідэры характарызаваліся як дробнабуржуазныя, сцвярджалася, што стварэнне Грамады, аўтарытэту і

[19] Егоров Г. Западная Белоруссия. С. 32, 34 ; Заходняя Беларусь пад панскім гнётам і яе вызваленне. С. 56, 58.

[20] Каменская Н. В. 10 год сацыялістычнага будаўніцтва ў Заходніх абласцях Беларускай ССР / Т-ва па распаўсюджванню паліт. і навук. ведаў Беларус. ССР. Мінск : Дзярж. выд-ва БССР, 1949. 24 с. ; Ее же. Воссоединение белорусского народа в едином Белорусском Советском государстве // Совет. Белоруссия. 1947. 17 сент. ; Яе ж. Уз'яднанне беларускага народа ў адзінай Беларускай Савецкай сацыялістычнай дзяржаве : стэнагр. публ. лекцыі / Т-ва па распаўсюджванню паліт. і навук. ведаў Беларус. ССР. Мінск : Выд-ва Акад. навук БССР, 1948. 28 с. ; Перцаў У. Барацьба працоўных Заходняй Беларусі за сваё вызваленне ў перыяд польскай акупацыі (1921–1939 гг.) // Бальшавік Беларусі. 1947. № 12. С. 30–38.

[21] Гарбуноў Ц. Уз'еднаная Совецкая Беларусь. Мінск : Дзяржвыд БССР, 1945. 40 с. ; Яго ж. Уз'еднанне беларускага народа ў адзінай Беларускай совецкай соцыялістычнай дзяржаве // Полымя. 1948. № 2. С. 89–107 ; № 3. С. 64–89 ; Его же. Воссоединение белорусского народа в едином советском социалистическом государстве. М. : Гос. изд-во полит. лит., 1948. 232 с. ; Яго ж. Уз'еднанне беларускага народа ў адзінай совецкай соцыялістычнай дзяржаве. Мінск : Дзяржвыд БССР, 1949. 188 с. ; Яго ж. Уз'еднанне беларускага народа ў адзінай совецкай соцыялістычнай дзяржаве. 2-е выд. Мінск : Дзяржвыд БССР, 1952. 220 с.

[22] Доморад К. И. Борьба Коммунистической партии за коллективизацию сельского хозяйства западных областей Белоруссии накануне Великой Отечественной войны (сентябрь 1939 – июнь 1941 гг.) : автореф. дис. ... канд. ист. наук / Белорус. гос. ун-т. Минск, 1955. 15 с. ; Юхо И. А. Установление Советской власти в Западной Белоруссии в 1939 г. : автореф. дис. … канд. юрид. наук / Акад. наук СССР, Ин-т права. Минск, 1954. 16 с. ; Царюк А. В. Революционное освободительное движение в Западной Белоруссии (1919–1939 гг.) : автореф. дис. ... канд. ист. наук / Белорус. гос. ун-т. Минск., 1954. 22 с. ; Пономаренко В. П. Католическая церковь Западной Белоруссии – орудие колониальной политики буржуазно-помещичьей Польши (1919–1939 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук / Моск. гос. пед. ин-т им. В. И. Ленина. М., 1955. 14 с.

папулярнасці якой спрыяла падтрымка з боку КПЗБ, санкцыянаваў як быццам бы сам Ю. Пілсудскі. Прадстаўнікі беларускага руху ў цэлым, без уліку партыйнай прыналежнасці, аб'яўляліся агентамі дэфензівы[23].

Інтэнсіфікацыя вывучэння гісторыі Заходняй Беларусі пачалася ў другой палове 1950-х гг. пасля палітычнай рэабілітацыі КПП падчас працы XX з'езда КПСС. Гэта рашэнне было адным з найважнейшых эпізодаў распачатай у СССР дэсталінізацыі, пры ажыццяўленні якой факт роспуску ў 1938 г. камуністычных партый, якія дзейнічалі па распрацаваных у Маскве дырэктывах, успрымаўся як відавочнае злачынства Сталіна. Аб'ектыўна такая сітуацыя адкрывала шырокія магчымасці для вывучэння гісторыі КПЗБ і Заходняй Беларусі. Вялікая навукова-арганізацыйная праца па вывучэнні гісторыі КПЗБ і Заходняй Беларусі ў цэлым звязана з Інстытутам гісторыі партыі пры ЦК КПБ, у якім працаваў з 1956 г. да пачатку 1980-х гг. Н.С. Арэхва, былы член цэнтральнага кіраўніцтва КПЗБ і супрацоўнік замежнай яе рэдакцыі, у пачатку 1930-х гг. некаторы час узначальваў КЗБ. На яго ўскладалася задача канцэптуальнай распрацоўкі асноўных пытанняў гісторыі Заходняй Беларусі, нацыянальна-вызваленчага руху, але ў першую чаргу КПЗБ[24]. Публікацыі Н.С. Арэхвы, асабліва ў партыйных часопісах, станоўча паўплывалі на разгортванне навуковай працы не толькі па гісторыі КПЗБ, але і па іншых пытаннях заходнебеларускай тэматыкі і мелі важнае метадалагічнае значэнне[25]. Яны давалі падыходы да ацэнкі і адлюстраванню гісторыі Заходняй Беларусі, вызначалі станоўчыя моманты, поспехі і недахопы ў дзейнасці КПЗБ. Прапанаваныя Н.С. Арэхва і ухваленыя партыйным кіраўніцтвам канцэптуальныя падыходы замацаваліся і панавалі ў гістарыяграфіі да пачатку 1990-х гг., вызначаючы змест навуковых даследаванняў.

Акрамя Н.С. Арэхва актыўна займаліся асвятленнем у друку пытанняў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі С.Р. Анісаў, В.П. Ласковіч, Я.Р. Міско, Ф.Б. Пірышка, іншыя ветэраны, якія ў сваіх працах папулярызавалі гісторыю нацыянальна-вызваленчага руху, прапагандавалі ідэі і гісторыю КПЗБ, усхвалялі яе дзеячаў[26]. Яшчэ ў канцы

---

[23] Горбунов Т. Воссоединение белорусского народа ... С. 119, 137, 140.

[24] Савіч А. А. Нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі ... С. 46–48.

[25] К вопросу об истории Коммунистической партии Западной Белоруссии // Коммунист Белоруссии. 1957. № 8. С. 25–36 ; Арэхва М. С. Рэвалюцыйны рух у Заходняй Беларусі ў гады белапольскай акупацыі. Мінск : Т-ва па распаўсюджванню паліт. і навук. ведаў БССР, 1958. 32 с. ; За правильное освещение истории Компартии Западной Белоруссии // Коммунист. 1964. № 8. С. 68–79.

[26] Ласкович В. П. Вся жизнь – борьбе // Совет. Белоруссия. 1969. 4, 6, 8 февр. ; Яго ж. Людзі падпольных друкарань // Зара. 1961. 5 мая ; Его же. Николай Дворников, коммунист (Страницы революционного прошлого Брестчины) // Заря. 1967. 11 июля ; Его же. Когда отцы уходят на задание // Заря. 1968. 23 окт. ; Его же. Мятежное сердце // Заря. 1975. 10, 11 дек. ; Яго ж. Нашчадкі Чырвонай гвардыі // Звязда. 1973. 2 ліст. ; Его же. Неуловимая // Совет. Белоруссия. 1977. 20 нояб. ; Міско Я. Г. Маё маўклівае сэрца: з літаратурнай спадчыны : [для ст. шк. узросту] / [уклад., рэд. і камент. Я. Брыля]. Мінск : Юнацтва, 1983. 492 с. ; Яго ж. Права на бяссмерце // Полымя. 1979. № 6. С. 242–243 ; Пиришко Ф. Знакомство в камере // Комъяунимо тиеса ("Комсом. правда", Вильнюс). 1969. 27 сент. ; Его же.

1950-х гг., дзякуючы іх намаганням, пабачылі свет зборнікі артыкулаў і ўспамінаў[27], выхад якіх прадоўжыўся ў 1960–1980-я гг. [28]

Эфектыўнаму развіццю гістарыяграфіі праблемы спрыяла публікацыя дакументаў і матэрыялаў[29]. Іх агульная танальнасць пацвярджала накіраванасць не на ўсталяванне аб'ектыўнай інфармацыі, а на зацвярджэнне патрэбных савецкай ідэалогіі гістарычных уяўленняў. Гэта тлумачыцца відавочным і эфектыўным кантролем з боку кампетэнтных партыйна-дзяржаўных органаў за працэсам напісання і публікацыі мемуараў і даследаванняў. Такі кантроль быў і з боку былых адказных працаўнікоў КПЗБ, якія мелі значную цэнзурныя ролю ў фарміраванні гістарыяграфічнай традыцыі адлюстравання гісторыі Заходняй Беларусі[30].

Навуковыя даследаванні грунтаваліся на шырокім коле крыніц, у першую чаргу архіўных. Гэта матэрыялы Цэнтральнага партархіва Інстытута марксізму-ленінізму пры ЦК КПСС, партыйных архіваў Інстытутаў гісторыі партыі пры ЦК кампартый Беларусі і Літвы, Цэнтральнага дзяржаўнага архіва Кастрычніцкай рэвалюцыі і сацыялістычнага будаўніцтва БССР, Цэнтральнага дзяржаўнага архіва Літоўскай ССР, дзяржаўных архіваў Брэсцкай і Гродзенскай абласцей,

---

Товарищ Павлов // Драугисте ("Дружба", Вильнюс). 1967. 22 авг. ; Его же. Наследник Громады // Драугисте ("Дружба", Вильнюс). 1970. 24, 27 окт. ; Его же. По зову революции // Драугисте ("Дружба", Вильнюс). 1970. 3 сент. и др.

[27] У суровыя гады падполля : зб. успамінаў. Мінск : Дзяржвыд БССР, 1958. 361 с. ; Слаўная дачка беларускага народа : пісьмы, арт. В. Харужай і ўспаміны аб ёй. Мінск : Дзяржвыд БССР, 1960. 226 с. ; Славная дочь белорусского народа : письма, статьи В. З. Хоружей и воспоминания о ней. Минск : Гос. изд-во БССР, Ред. соц.-экон. лит., 1960. 228 с. ; Анісаў С. За волю і шчасце народа: Запіскі падпольшчыка. Мінск : Дзяржвыд БССР, Рэд. сац.-экан. літ., 1959. 164 с. ; Яго ж. З гісторыі камсамольскага падполля Заходняй Беларусі. Мінск : Дзяржвыд БССР, Рэд. паліт. літ., 1958. 66 с. ; Яго ж. Крутымі шляхамі: Запіскі былога камсамольскага работніка-падпольшчыка. Мінск : Дзяржвыд БССР, Рэд. сац.-экан. літ., 1960. 185 с.

[28] Они не стали на колени : сб. воспоминаний и документов о концлагере Береза-Картузская. Минск : Беларусь, 1966. 347 с. ; Вильнюсское подполье: Воспоминания участников революционного движения в Вильнюсском крае (1920–1939 гг.). Вильнюс : Vaga, 1966. 397 с. ; Ваупшасов С. А. На разгневанной земле. Минск : Беларусь, 1965. 344 с. ; Яго ж. На разгневанай зямлі. Мінск : Дзяржвыд БССР. Рэд. сац.-экан. літ., 1963. 232 с. ; Яго ж. На разгневанай зямлі // Полымя. 1963. № 1. С. 141–160 ; Муха-Мухновский Г. Пути-дороги. Минск : Беларусь, 1973. 207 с. ; В борьбе за счастье народное // Люди нарочанского края. Минск : Беларусь, 1975. С. 43–114 ; Молочко Н. П. О прожитом и пережитом. Минск : Беларусь, 1989. 191 с.

[29] Борьба трудящихся Западной Белоруссии за социальное и национальное освобождение и воссоединение с БССР. Документы и материалы : сборник. В 2 т. Т. 1 (1921–1929 гг.) / Ин-т истории партии при ЦК КПБ – фил. Ин-та марксизма-ленинизма при ЦК КПСС, Ин-т истории АН БССР, Арх. упр. при Совете Министров БССР. Минск : Госиздат БССР, 1962. 620 с. ; Т. 2 (1929–1939 гг.). Минск : Беларусь, 1972. 560 с. ; Революционное движение в Вильнюсском крае : док. и материалы / Ин-т истории партии при ЦК КП Литвы, Ин-т истории партии при ЦК КП Белоруссии – фил. Ин-та марксизма-ленинизма при ЦК КПСС ; сост.: В. Канцявичюс [и др.] ; редкол.: Р. Малюкявичюс [и др.]. Вильнюс : Минтис, 1978. 448 с. ; Революционный авангард трудящейся молодёжи Западной Белоруссии (1921–1939 гг.): документы и материалы : сборник / сост.: М. А. Бобер [и др.] ; под ред. В. Н. Жигалова [и др.]. Минск : БГУ, 1978. 328 с.

[30] Савіч А. А. Нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі ... С. 50–51.

Польскай Народнай Рэспубліцы. Аўтары выкарыстоўвалі пратаколы і сценаграфічныя справаздачы з'ездаў і канферэнцый КПЗБ, пленумаў яе ЦК, іх рэзалюцыі і пастановы бюро і сакратарыята, перапіску з мясцовымі партарганізацыямі, справаздачы, заклікі і звароты ЦК КПП і ЦК КПЗБ, акруговых і раённых партыйных камітэтаў. Значнай крыніцай па гісторыі КПЗБ і рэвалюцыйнага руху з'яўляўся падпольны камуністычны друк, часопісы "Бальшавік" і "Партработнік", газеты КПЗБ, БСРГ, "Змагання", выданні Камісіі па вывучэнні Заходняй Беларусі і інш.

Аднак, нягледзячы на вялікую колькасць даступных для даследчыкаў матэрыялаў, самымі аўтарытэтнымі крыніцамі пры падрыхтоўцы работ па гісторыі Заходняй Беларусі заставаліся творы класікаў марксізму-ленінізму, кіраўнікоў савецкай дзяржавы, партыйныя дакументы – рашэнні, звароты, рэзалюцыі, пастановы з'ездаў, пленумаў ЦК і інш. Гэта тычыцца і артыкулаў у партыйных часопісах, газетах 1920–1930-х гг., спасылка на якія лёгка забяспечвала пацверджанне неабходных высноў аб сітуацыі ў Заходняй Беларусі, пра стан нацыянальна-вызваленчага руху. Перыядычны друк праўрадавага напрамку, сацыялістычных, дробнабуржуазных партый і арганізацый, беларускіх палітычных груповак амаль цалкам ігнараваўся, акрамя выпадкаў, калі іх выказванні маглі быць устаўлены ў пэўную схему і зацвердзіць неабходныя тэзісы.

Нягледзячы на панаванне ў марксісцка-ленінскай метадалогіі гісторыі дыялектычнага матэрыялізму, які патрабаваў пільнай увагі да матэрыяльна-тэхнічных, вытворча-прамысловых, гандлёва-эканамічных адносінаў, не атрымалі належнай навуковай распрацоўкі многія пытанні сацыяльна-эканамічнага развіцця Заходняй Беларусі, у тым ліку рамеснай і кааператыўнай вытворчасці, гандлю, фінансаў, камунікацый. Што датычыцца аграрнай сферы і прамысловасці Заходняй Беларусі, то іх стан у тэндэнцыйна, з упорам на негатыўныя праявы быў асвечаны ў даследаваннях Б.Я. Кухарава, С.І. Наркевіч, А.А. Сарокіна[31]. Як і працы папярэдніх гадоў, названыя даследаванні акцэнтавалі ўвагу на адсталасці Заходняй Беларусі, дэградацыі яе прамысловай і аграрнай вытворчасці ва ўмовах польскага "каланіяльнага валадарства", асноўную ўвагу пры гэтым надаючы рэвалюцыйнаму руху, узровень якога штучна завышаўся.

Першыя кандыдацкія дысертацыі 1960-х гг. па заходнебеларускай праблематыцы, падрыхтаваныя і абароненыя І.В. Палуянам, А.М. Мацко,

---

[31] Кухарев Б. Е. Сельское хозяйство Западной Белоруссии (1919–1939 гг.) / под науч. ред. проф. И. Н. Шемякина. Минск : Выш. шк., 1975. 112 с. ; Наркевич С. И. Промышленность Западной Белоруссии в период белопольской оккупации (1920–1939 гг.) : автореф. дис. … канд. экон. наук. Минск, 1965. 20 с. ; Сорокин А. А. Аграрный вопрос в Западной Белоруссии (1920–1939 гг.). Минск : Наука и техника, 1968. 201 с. ; Его же. Революционное и освободительное крестьянское движение в Западной Белоруссии (1920–1939 гг.). Минск : БГУ, 1970. 171 с.

Б.С. Клейнам, У.А. Палуянам, былі накіраваны на пераадоленне найбольш брутальных заганаў папярэдняй канцэпцыі нацыянальна-вызваленчага руху, звязаных са стыхійнасцю, ігнараваннем КПЗБ, варожасцю дзеячаў рэвалюцыйна-дэмакратычных арганізацый і дзеячаў[32]. Непасрэдна па гісторыі КПЗБ першыя кандыдацкія дысертацыі былі абаронены Т.Ю. Глінскай і І.П. Хаўратовіч[33]. Канстатуючы невыносныя сацыяльна-эканамічныя і грамадска-прававыя ўмовы жыцця заходнебеларускага насельніцтва, даследаванні ўтрымлівалі асноўныя тэарэтычныя і канкрэтна-гістарычныя аспекты фарміравання КПЗБ і яе дзейнасці як палітычнага авангарду працоўных Заходняй Беларусі. Канцэптуальна звязваючы арганізацыю "барацьбы за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне" і КПЗБ, выводзячы партыю з забыцця, гэтыя працы надоўга і трывала замацоўвалі за КПЗБ імідж адзінай палітычнай сілы, якая паслядоўна, з пазіцый марксізму-ленінізму ажыццяўляла кіраўніцтва барацьбой.

У даследаваннях атрымала рэзкую негатыўную ацэнку палітыка розных "буржуазных" (эндэкі, хрысціянскія дэмакраты і інш.) і "дробнабуржуазных згодніцкіх партый" (ППС, Бунд, "Вызволене"), якія, на думку аўтараў, абаранялі інтарэсы памешчыкаў і капіталістаў, станоўча адносіліся да захопу беларускіх тэрыторый, вялі раскольніцкую работу сярод рабочых і сялян, адцягвалі народныя масы ад рэвалюцыйнага руху. Навукоўцы асабліва акцэнтавалі ўвагу на тым, што супраць КПЗБ і рэвалюцыйнай барацьбы працоўных выступалі і беларускія палітычныя партыі – БХД, БСС, Цэнтрасаюз і інш., а Бунд і сіяністкія партыі насаджвалі нацыяналізм, вялі антыкамуністычную прапаганду сярод яўрэйскага насельніцтва. У даследаваннях выразна падкрэслівалася, што КПЗБ з'яўлялася палітычным авангардам, які выказваў і абараняў карэнныя класавыя інтарэсы працоўных, і была адзінай сілай, здольнай павесці іх на барацьбу за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне.

Падрыхтоўка дысертацый з'явілася спрыяльнай умовай з'яўлення даследаванняў па гісторыі КПЗБ і рэвалюцыйнага руху, спачатку

---

[32] Полуян И. В. Революционное и национально-освободительное движение в Западной Белоруссии в 1929–1933 гг. : автореф. дис. … канд. ист. наук / Акад. наук БССР, Ин-т истории. Минск, 1960. 24 с. ; Мацко А. Н. Совместная борьба трудящихся Польши и Западной Белоруссии против фашизма 1933–1939 гг. : автореф. дис. … канд. ист. наук / Акад. обществ. наук ЦК КПСС. М., 1962. 24 с. ; Полуян В. А. Белорусская крестьянско-рабочая Громада в борьбе за социальное и национальное освобождение трудящихся Западной Белоруссии в 1925–1927 гг. : автореф. дис. … канд. ист. наук / Акад. наук БССР, Ин-т истории. Минск, 1962. 38 с. ; Клейн Б. С. Антифашистское освободительное движение в Вильнюсе в 1926–1939 гг. : автореф. дис. ... канд. ист. наук / Вильнюс. гос. ун-т. Вильнюс, 1963. 23 с.

[33] Глинская Т. Ю. КПЗБ во главе революционно-освободительной борьбы трудящихся Западной Белоруссии в период частичной относительной стабилизации капитализма (1924–1928 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук / Белорус. гос. ун-т. Минск, 1963. 19 с. ; Ховратович И. П. КПЗБ – руководитель борьбы трудящихся Западной Белоруссии за своё социальное и национальное освобождение в период мирового экономического кризиса (1929–1933 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук / Ин-т истории партии при ЦК КПБ. Минск, 1966. 22 с.

артыкулаў, а затым манаграфій. Найбольш значнымі працамі былі публікацыі Т.Ю. Глінскай, Б.С. Клейна, А.М. Мацко, а сумесная манаграфія У.А. Палуяна і І.В. Палуяна была па-сутнасці першай навуковай манаграфіяй па гісторыі нацыянальна-вызваленчага руху абагульняльнага характару[34]. Гэтыя даследаванні сталі ў канцы 1950-х – 1960-я гг. своеасаблівым прарывам у вывучэнні гісторыі Заходняй Беларусі, аднаўлялі гісторыю партый і асоб, да якіх у 1930-я гг. быў прымацаваны ганебны ярлык ненадзейных элементаў або нават ворагаў. Публікацыі былі ў пэўным сэнсе наватарскім, разглядалі новыя, раней практычна недаследаваныя аспекты. Аднак іх аўтары з самага пачатку падпарадкоўваліся пэўным канонам, цалкам адпаведным пануючай у дзяржаве камуністычнай ідэалогіі, якая практычна не пакідала месца на адлюстраванне станоўчых бакоў у сацыяльна-эканамічным і грамадска-палітычным жыцці Заходняй Беларусі, стваральнай ролі апазіцыйных у адносінах да кампартыі грамадска-палітычных і культурных арганізацый і дзеячаў.

Разгорнутыя ў другой палове 1950-х гг. даследаванні, а таксама публікацыя дакументаў і матэрыялаў па гісторыі КПЗБ і рэвалюцыйнага руху стварылі кадравыя, тэарэтычныя і факталагічныя перадумовы для падрыхтоўкі абагульняльнай працы па гісторыі КПЗБ, які быў выдадзены ў 1966 г. у выглядзе алектыўнай манаграфіі[35]. Яна была падрыхтавана супрацоўнікамі Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ М.С. Арэхвам, А.М. Мацко, І.П. Хаўратовічам, а таксама выкладчыкамі БДУ Т.В. Прытыцкай і А.В. Царуком. На думку М.С. Арэхва, гэта была першая навуковая праца па гісторыі КПЗБ, напісаная з марксісцка-ленінскіх пазіцый. На некалькі дзясяткаў гадоў манаграфія стала для айчынных даследчыкаў своеасаблівым арыенцірам, з якім яны суадносілі свае

[34] Глинская Т. Ю. КПЗБ в борьбе за завоевание трудящихся масс (1924–1928 гг.). Минск : Изд-во высш., сред. спец. и проф. образования, 1962. 65 с. ; Ее же. КПЗБ – руководитель освободительной борьбы трудящихся Западной Белоруссии. 1924–1928 гг. Минск : Беларусь, 1965. 200 с. ; Ее же. Так боролись за свободу // Коммунист Белоруссии. 1961. № 9. С. 74–79 ; Клейн Б. Гартаванне. З гісторыі рэвалюцыйнага падполля Заходняй Беларусі // Маладосць. 1957. № 12. С. 118–122 ; Яго ж. Слаўныя старонкі сумеснай барацьбы працоўных Заходняй Беларусі і Польшчы (1920–1939 гг.). Мінск : Т-ва па распаўсюджванню паліт. і навук. ведаў БССР, 1962. 32 с. ; Яго ж. Старонкі палымянага жыцця // Полымя. 1963. № 10. С. 141–153 ; Мацко А. М. З гісторыі сумеснай барацьбы працоўных Польшчы і Заходняй Беларусі супраць фашызму (1933–1939 гг.) // Вес. АН БССР. Сер. грамад. навук. 1961. № 4. С. 78–92 ; Его же. Борьба трудящихся Польши и Западной Белоруссии против фашизма (1933–1939 гг.). Минск : Изд-во АН БССР, 1963. 206 с. ; Орехво Н. С., Мацко А. Н. Пример служения народу // Коммунист Белоруссии. 1963. № 9. С. 53–58 ; Палуян І. В. Рабочы рух у Заходняй Беларусі ў 1929–1931 гг. // Вес. АН БССР. Сер. грамад. навук. 1960. № 1. С. 44–55 ; Яго ж. Рэвалюцыйны рух рабочых лясных промыслаў Заходняй Беларусі ў 1932–1934 гг. // Вес. АН БССР. Сер. грамад. навук. 1959. № 2. С. 69–79 ; Яго ж. Сялянскі рух у Заходняй Беларусі ў 1932–1933 гадах // Вес. АН БССР. Сер. грамад. навук. 1960. № 1. С. 42–54 ; Палуян У. А. Беларуская сялянска-рабочая Грамада. Мінск : Навука і тэхніка, 1967. 224 с. ; Полуян В. А., Полуян И. В. Революционное и национально-освободительное движение в Западной Белоруссии в 1920–1939 гг. Минск : Госиздат, 1962. 222 с.

[35] Революционный путь Компартии Западной Белоруссии (1921–1939 гг.) / А. Н. Мацко [и др.] ; под ред. А. Н. Мацко и В. Е. Самутина. Минск : Беларусь, 1966. 403 с.

напрацоўкі. Для таго часу даследаванне было актуальным па сваёй навізне і глыбіні і досыць аб'ектыўным ва ўмовах панавання марксісцка-ленінскага дыскурса.

У наступным у гісторыі КПЗБ вылучаліся новыя сюжэты, якія атрымалі вывучэнне ў кандыдацкіх працах: арганізацыйная структура і ўнутрыпартыйная праца – Р.І. Налівайка[36], дзейнасць партыі па мабілізацыі працоўных на барацьбу за дэмакратычныя правы і свабоды, стварэнне адзінага рабочага і народнага фронту супраць фашызму і вайны – У.Ф. Ладысеў, І.Ф. Дзяшко[37], па інтэрнацыянальным выхаванні працоўных – Г.Б. Ватковіч, С.У. Кабяк[38], па кіраўніцтве МОПР – Т.А. Гойдзь[39]. Блізкія па тэматыцы і ідэйна-палітычным характары дысертацыі былі абаронены О.Я. Красіўскім і І.В. Пылыпівым ва Украіне[40]. Традыцыйная для савецкай гістарыяграфіі тэма атэістычнага выхавання, барацьбы з клерыкалізмам, выкрыцця антынароднай сутнасці каталіцызму і уніяцтва атрымала сваё развіццё ў кандыдацкіх дысертацыях А.П. Курносава, І.А. Фёдарава, М.В. Анцыповіча, М.М. Ганчарова з відавочнай акцэнтацыяй выключнай ролі КПЗБ у правядзенні мерапрыемстваў, накіраваных на абмежаванне, як сцвярджалася, шкоднага і варожага ўплыву рэлігіі і асабліва каталіцызму[41]. У такім кантэксце

[36] Наливайко Г. И. Организационное строение и внутрипартийная работа Компартии Западной Белоруссии (1923–1938 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.570 / Ин-т истории партии при ЦК КПБ. Минск, 1969. 26 с.

[37] Ладысев В. Ф. Деятельность Компартии Западной Белоруссии по организации трудящихся масс на борьбу за демократические права и свободы (1934–1938 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.570 / Белорус. гос. ун-т. Минск, 1971. 24 с. ; Дешко И. Ф. Борьба Компартии Запаадной Белоруссии за единый рабочий и народный фронт против фашизма и войны (1934–1938 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.571 / АН БССР, Ин-т истории. Минск, 1972. 25 с.

[38] Воткович Г. Б. Деятельность Компартии Западной Белоруссии по интернациональному воспитанию трудящихся (1929–1933 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.01 / Белорус. гос. ун-т. Минск, 1974. 30 с. ; Кобяк С. В. Деятельность Компартии Западной Белоруссии по интернациональному воспитанию трудящихся (1923–1929 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.01 / Ин-т истории партии при ЦК КПБ. Минск, 1976. 27 с.

[39] Гойдь Т. А. Деятельность КПЗБ по руководству МОПРом (Международной организацией помощи борцам революции) в Западной Белоруссии в 1923–1939 гг. : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.01 / Белорус. гос. ун-т. Минск, 1981. 22 с.

[40] Красивский О. Я. Борьба прогрессивных сил Западной Украины и Западной Белоруссии против сионизма (1921–1939) : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.00.02 / Львов. гос. ун-т. Львов, 1986. 21 с. ; Пылыпив И. В. Единство действий КПЗУ И КПЗБ по руководству революционно-освободительной борьбой трудящихся (1923–1938 гг.) : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.00.01 / Львов. гос. ун-т. Львов, 1986. 19 с.

[41] Курносов А. П. Католическая церковь – идеологический защитник господства помещиков и буржуазии в Западной Белоруссии (1919–1939 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук / Отд-ние обществ. наук АН БССР. Минск, 1969. 27 с. ; Фёдоров И. О. Униатская политика Ватикана в Западной Белоруссии в довоенные годы (1919–1939 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / Белорус. гос. ун-т. Минск, 1985. 23 с. ; Гончаров Н. Н. Борьба трудящихся Западной Белоруссии против религии и церкви (1921–1939 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / Вильнюс. гос. ун-т им. В. Капсукаса. Вильнюс, 1987. 22 с. ; Анципович Н. В. Свободомыслие и атеизм в Западной Белоруссии (1919–1939 гг.) : дис. … канд. филос. наук : 09.00.06 / АН БССР, Ин-т философии и права. Минск, 1988. 190 с.

падавалася канфесійная гісторыя Заходняй Беларусі ў манаграфіі Я.Н. Мараш[42].

У самастойны даследчыцкі кірунак гісторыка-партыйнай навукі склалася гісторыя камсамола Заходняй Беларусі як "баявога памочніка партыі" дзякуючы кандыдацкім дысертацыям 1970-х гг. А.А. Віхрава і М.А. Бобера.[43] Разуменне выключнай значнасці друку для разгортвання актыўнай дзейнасці і паспяховай барацьбы за электарат сфармавала яшчэ адзін напрамак заходнебеларускай праблематыкі – роля друку ў нацыянальна-вызваленчым руху. Аднак у якасці прадмета даследавання выступілі толькі друк КПЗБ і выданні, якія, як правіла, былі праваднікамі палітычнай лініі Камінтэрна (друку Грамады, "Змагання", ТБШ і інш.). У кандыдацкіх дысертацыях П.І. Зялінскага, С.У. Говіна і М.А. Ракевіча[44] па праблемах падпольнага камуністычнага і дэмакратычнага друку, абароненых у канцы 1960-х – пачатку 1970-х гг., у значнай ступені адбівалася гісторыя кампартыі і камсамола, іх роля ў ідэйна-палітычнай барацьбе ў Заходняй Беларусі. Гэтую праблематыку дапаўняла кандыдацкая дысертацыя І.Я. Мараша, прадметам якой стала тэма распаўсюджвання работ У.І. Леніна ў Польшчы і Заходняй Беларусі[45].

Праблемы гісторыі КПЗБ і нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі на працягу 1960–1980 гг. былі даследаваны ў пяці доктарскіх дысертацыях. Чатыры з іх гісторыка-партыйнага характару (А.М. Мацко, Б.С. Клейн, У.Ф. Ладысеў, П.І. Зялінскі[46]), і толькі адна,

---

[42] Мараш Я. Н. Коммунистическая партия Западной Белоруссии в борьбе за атеистическое воспитание трудящихся: материал в помощь лектору / Гродн. обл. орг. о-ва «Знание». Гродно, 1969. 23 с. ; Его же. Политика Ватикана и католической церкви в Западной Белоруссии (1918–1939). Минск : Беларусь, 1983. 96 с.

[43] Вихрев А. А. Комсомол Западной Белоруссии – боевой помощник Коммунистической партии Западной Белоруссии в руководстве революционной борьбой трудящихся за социальное и национальное освобождение (1921–1928 гг.) : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.00.02 / АН БССР, Отд-ние обществ. наук. Минск, 1972. 21 с. ; Бобер М. А. Комсомол Западной Белоруссии – помощник КПЗБ в борьбе за социальное и национальное освобождение трудящихся (1934–1938 гг.) : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.00.01 / Белорус. гос. ун-т. Минск, 1976. 25 с.

[44] Зелинский П. И. Роль печати Коммунистической партии Западной Белоруссии в мобилизации трудящихся масс на борьбу за социальное и национальное освобождение в годы мирового экономического кризиса капитализма (1929–1933 гг.) : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.570 / Белорус. гос. ун-т. Минск, 1969. 19 с. ; Ракевич Н. А. Роль нелегальной коммунистической печати Западной Белоруссии в мобилизации трудящихся масс на борьбу за социальное и национальное освобождение (1921–1929 гг.) : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.570 / Ин-т истории партии при ЦК КПБ. Минск, 1969. 23 с. ; Говин С. В. Демократическая печать Западной Белоруссии в борьбе за социальное и национальное освобождение трудящихся (1921–1939 гг.) : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07. 580 / Белорус. гос. ун-т. Минск, 1972. 21 с.

[45] Мараш И. Я. Издание и распространение трудов В. И. Ленина в Польше и Западной Белоруссии в межвоенный период (1918–1939 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02. Минск, 1975. 23 с.

[46] Мацко А. Н. Деятельность Компартии Польши и Компартии Западной Белоруссии по организации трудящихся масс на борьбу против гнёта буржуазии и помещиков (1918–1938 гг.) : автореф. дис. … д-ра ист. наук : 07.570 / Белорус. гос. ун-т. Минск, 1968. 68 с. ; Клейн Б. С. Политическая деятельность марксистско-ленинской партии по обеспечению самозащиты в условиях подполья (на

абароненая на падставе манаграфіі, напісаная ў аспекце грамадзянскай гісторыі (У.А. Палуян[47]) з безумоўным прыярытэтам “мабілізуючай і кіруючай ролі КПЗБ”. У выглядзе асобных манаграфій былі апублікаваныя ўсе доктарскія дысертацыі[48], а таксама многія кандыдацкія даследаванні[49].

Дзейнасць КПЗБ і рэвалюцыйны рух на Віленшчыне вывучаліся літоўскімі гісторыкамі, у прыватнасці Ю.І. Марцінкявічусам і К.К. Манкявічусам[50], але ў працах літоўскіх савецкіх даследчыкаў гісторыя Вільні і Віленскага краю 1921–1939 гг. атрымлівала афарбоўку як частка літоўскай, а не беларускай гісторыі, што грунтавалася на валюнтарысцкіх рашэннях пытання прыналежнасці Вільні і Віленскага краю: у кастрычніку 1939 г. бальшавікі перадалі гэтыя тэрыторыі Літве. Літоўскія гісторыкі безапеляцыйна сцвярджалі літоўскую нацыянальна-дзяржаўную прыналежнасць Вільні і Віленскага краю, называючы іх “карэннай літоўскай тэрыторыяй”[51]. Ю.І. Марцінкявічус на падставе гістарычных фактаў, у асноўным звязаных з беларускім нацыянальным рухам, у сваім жаданні замацаваць правы на Віленшчыну амбіцыйна сцвярджаў, што

---

материалах Компартии Западной Белоруссии. 1920–1938 гг.) : автореф. дис. … д-ра ист. наук : 07.00.01 / Вильнюс. гос. ун-т. Вильнюс, 1988. 47 с. ; Ладысев В. Ф. Деятельность Компартии Западной Белоруссии по организации трудящихся масс на борьбу за демократию, подведение их к социалистической революции (1926–1938 гг.) : автореф. дис. … д-ра ист. наук : 07.00.01 / Ин-т истории партии при ЦК КПБ. Минск, 1988. 49 с. ; Зелинский П. И. Политическая работа Коммунистической партии Западной Белоруссии в массах (1923–1938 гг.) : автореф. дис. … д-ра ист. наук : 07.00.01 / Ин-т истории партии при ЦК КПБ. Минск, 1989. 50 с.

[47] Полуян В. А. Революционно-демократическое движение в Западной Белоруссии (1927–1939 гг.) : автореф. дис. … д-ра ист. наук : 07.00.02 / АН БССР, Ин-т истории. Минск, 1979. 56 с.

[48] Мацко А. Н. Революционная борьба трудящихся Польши и Западной Белоруссии против гнета буржуазии и помещиков (1918–1939 гг.). Минск : Беларусь, 1972. 335 с. ; Полуян В. А. Революционно-демократическое движение в Западной Белоруссии (1927–1939 гг.). Минск : Наука и техника, 1978. 359 с. ; Клейн Б. С. За дело правое: Борьба КПЗБ с буржуазным террором. Минск : Беларусь, 1986. 175 с. ; Зелинский П. И. Политическая работа Коммунистической партии Западной Белоруссии в массах, 1923–1938. Минск : Университетское, 1986. 136 с. ; Ладысев В. Ф. В борьбе за демократические права и свободы: Из исторического опыта Компартии Западной Белоруссии. 1926–1938 гг. Минск : Беларусь, 1988. 189 с.

[49] Говін С. В. Друк Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.). Мінск : БДУ, 1974. 95 с. ; Віхраў А. А. Баявы памочнік КПЗБ (1921–1928 гг.). Мінск : Выд-ва БДУ, 1975. 128 с. ; Воткович Г. Б. КПЗБ в борьбе за интернациональное единство трудящихся (1929–1933 гг.). Минск : БГУ, 1975. 128 с. ; Ладысеў У. Ф. КПЗБ – арганізатар барацьбы працоўных за дэмакратычныя правы і свабоды (1934–1938). Мінск : БДУ, 1976. 168 с. ; Яго ж. Шлях да свабоды: З гісторыі рэвалюцыйна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі ў 1919–1939 гг. Мінск : Полымя, 1978. 133 с. ; Зелинский П. И., Ракевич Н. А. Печать КПЗБ в борьбе за свободу. Минск : БГУ, 1977. 144 с. ; Кобяк С. В. Под знаменем пролетарской солидарности: Компартия Западной Белоруссии в борьбе за сплочение трудящихся (1923–1929 гг.). Минск : Беларусь, 1979. 142 с. ; Мараш И. Я. Ленинские идеи – в массы трудящихся: Издание и распространение трудов В. И. Ленина в Польше и Западной Белорусии в 1918–1939 гг. Минск : Беларусь, 1980. 76 с.

[50] Марцинкявичюс Ю. И. Революционная и национально-освободительная борьба в Вильнюсском крае в 1920–1928 гг. : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.00.02 / Вильнюс. гос. ун-т. Вильнюс, 1973. 31 с. ; Монкявичюс К. К. Деятельность КП Западной Белоруссии по руководству революционной борьбой трудящихся Вильнюсского края в 1926–1938 гг. : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.00.01 / Вильнюс. гос. ун-т. Вильнюс, 1979. 28 с.

[51] Каросас И. П. Деятельность Литовского Бюро ЦК КПЗБ // В авангарде революционной борьбы : материалы науч.-теорет. конф., посвящ. 50-летию образования КПЗБ и КСМЗБ, 29 нояб. 1973 г. Минск : Беларусь, 1974. С. 112.

“рэвалюцыйны і вызваленчы рух працоўных Віленскага краю, ...важны этап на шляху да ...аб’яднання ўсіх літоўскіх зямель у адзінай сям’і савецкіх народаў”[52].

У 1950–1980-я гады гісторыкі актыўна стваралі іканічныя вобразы дзеячаў рэвалюцыйнага руху Заходняй Беларусі – “палымяных рэвалюцыянераў”, “змагароў за шчасце народнае”. Паступова сфармавалася іерархія такіх герояў, на вяршыні якой па колькасці публікацый звышалася В.З. Харужая. Яна атрымала шмат увагі навукоўцаў-гісторыкаў і публіцыстаў, асабліва пасля прысваення ёй у 1960 г. звання Героя Савецкага Саюза. Акрамя згаданых вышэй зборнікаў, ёй прысвячалася велізарная колькасць іншых публікацый[53], а ў 1975 г. С.У. Талапіна абараніла прысвечаную В.З. Харужай кандыдацкую дысертацыю[54]. Колькасць работ у выглядзе новых кніг, артыкулаў або іх перавыданняў, асабліва павялічвалася ў юбілейныя гады. Гэта датычыцца С.В. Прытыцкага[55], Б.А. Тарашкевіча[56], М.М. Дворнікава[57] і некаторых іншых дзеячаў, розным аспектам рэвалюцыйнай дзейнасці якіх у Заходняй Беларусі таксама надавалася шмат увагі для прапаганды і папулярызацыі іх гераізму, вернасці і самаадданасці справе камуністычнай партыі.

У цэлым, у другой палове 1950-х – 1980-я гг. была праведзена значная навуковая праца па вывучэнні гісторыі Заходняй Беларусі, па якой

---

[52] Марцинкявичюс Ю. И. Революционная и национально-освободительная борьба в Вильнюсском крае в 1920–1928 гг. С. 28.

[53] Славная дочь белорусского народа : письма, ст. В. З. Хоружей и воспоминания о ней. 2-е изд., доп. Минск : Госиздат БССР, 1962. 328 с. ; Булацкий Г. В., Талапина В. В. Вера Хоружая – революционер, публицист. Минск : БГУ, 1973. 96 с. ; Жизнь, отданная борьбе : сб. воспоминаний о В. Хоружей. Минск : Беларусь, 1975. 175 с. ; Жизнь, отданная борьбе : сб. воспоминаний о В. Хоружей / сост.: Н. А. Селедневская, А. И. Селедневский, А. П. Ярохин. 2-е изд., испр. и доп. Минск : Беларусь, 1983. 222 с. ; Новиков И. Вера Хоружая. Изд. 2-е, перераб. М. : Политиздат, 1973. 159 с. ; Хоружая В. Письма на волю. М. : Молодая гвардия, 1962. 351 с. ; Ее же. Статьи и письма о комсомоле. Минск : Нар. асвета, 1970. 166 с. ; Ее же. Статьи и письма о комсомоле. Изд. 2-е, перераб. Минск : Нар. асвета, 1975. 160 с.

[54] Талапина С. В. Вера Хоружая – революционер-публицист : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.10 / Белорус. гос. ун-т. Минск, 1975. 27 с.

[55] Жизнь, отданная народу : ст. и речи С. О. Притыцкого, док. и воспоминания о нем. Минск : Беларусь, 1978. 270 с. ; Белугин А. Плоть от плоти своего народа: к 75-летию со дня рождения С. О. Притыцкого // Коммунист Белоруссии. 1988. № 1. С. 63–67 ; Мисаревич Е., Плешевеня А. Право на бессмертие // Полит. собеседник. 1989. № 9. С. 20–23 ; Плешавеня А. М. Жыццё – подзвіг // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1971. № 4. С. 38–47 ; Якутов В. Д. Сергей Притыцкий: Страницы биографии. Минск : Беларусь, 1991. 173 с.

[56] Бергман А. За турэмнымі кратамі // Полымя. 1969. № 10. С. 171–175 ; Клейн Б. Время выбора // Нёман. 1984. № 9. С. 140–147 ; Яе ж. Старонкі палымянага жыцця // Полымя. 1963. № 10. С. 141–153 ; Яе ж. Сын Грамады: да 90-годдзя з дня нараджэння Б. Тарашкевіча // ЛіМ. 1982. 29 студз. С. 14 ; Ліс А. Браніслаў Тарашкевіч. Мінск : Навука і тэхніка, 1966. 167 с. ; Яго ж. Старонкі слаўнай біяграфіі // Полымя. 1962. № 2. С. 152–158 ; Майхровіч С. Народны трыбун // Беларусь. 1966. № 12. С. 28 ; Орехво Н. Три встречи // Нёман. 1982. № 2. С. 162–165 ; Юрчанка Г. Кіраўнік стотысячнай грамады // ЛіМ. 1966. 7 кастр.

[57] Драбінскі Я. Такія застаюцца жыць // Беларусь. 1965. № 9. С. 24 ; Его же. Еще о Николае Дворникове // Нёман. 1966. № 8. С. 156–158 ; Его же. Он хату покинул – пошел воевать… // Нёман. 1966. № 5. С. 154–164 ; № 6. С. 168–177 ; Его же. От Гомеля до Эстремадуры. Минск : Беларусь, 1971. 192 с.

было падрыхтавана і абаронена 28 кандыдацкіх і 5 доктарскіх дысертацый. Усе яны былі накіраваны на вывучэнне грамадска-палітычных ці канфесійных праблем і ні адна прадметна не прысвячалася сацыяльна-эканамічнаму становішчу Заходняй Беларусі, акрамя дысертацыі на атрыманне ступені кандыдата эканамічных навук С.І. Наркевіч. Гістарычныя працы прадстаўлялі сабой асэнсаванне падзей гісторыі на падставе марксісцкіх патрабаванняў партыйнасці і класавага падыходу. Агучванне партыйных лозунгаў, заклікаў, пастаноў, якія адпавядалі лініі УКП(б) і Камінтэрна і не супярэчылі партыйна-дзяржаўным установкам 1950–1980 гг., не магло забяспечыць паўнавартаснага навуковага асэнсавання пытанняў гісторыі Заходняй Беларусі і нацыянальна-вызваленчага руху. Асноўная ўвага абароненых дысертацый і навуковых публікацый было накіравана на гісторыю КПЗБ. Пры тым, што Кампартыя Заходняй Беларусі атрымала авангардную ролю ў “барацьбе за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне”, многія бакі гісторыі дзейнасці КПЗБ апынуліся па ідэалагічных і палітычных прычынах па-за ўвагай гісторыкаў, не атрымалі дастатковага аб’ектыўнага асвятлення. Гэта тычылася, у першую чаргу, стварэння і роспуску КПЗБ, у тым ліку рэпрэсій у дачыненні да членаў КПЗБ, яе адносін з КП(б)Б КПЗУ, Кампартыяй Літвы, КПП, Камінтэрнам, беларускімі, польскімі, яўрэйскімі партыямі і арганізацыямі; удзелу ў партызанскай, дыверсійна-разведвальнай дзейнасці, арганізацыі і фінансавання падпольнай працы, рэальнага ўдзелу ў рабочых і сялянскіх выступленнях, колькаснага складу партыі, фракцыйнай барацьбе і “сэцэсіі”. Да гонару айчынных гісторыкаў варта адзначыць, што яны разам з вядомымі прычынамі слабасці нацыянальна-вызваленчага руху назвалі і неапраўданыя рэпрэсіі ў дачыненні да яго кіраўнікоў.

Айчынная гістарыяграфія гісторыі Заходняй Беларусі 1950–1980-хгг. была падпарадкавана савецкай дзяржаўна-партыйнай ідэалогіі. Пры гэтым вялікай увагі заслугоўваюць даследаванні У.А. Палуяна, І.В. Палуяна, А.М. Мацко, П.І. Зялінскага, У.Ф. Ладысева, Б.С. Клейна і іншых навукоўцаў, якія выхоўвалі ў беларускага чытача пачуццё гонару і павагі да гераічнага мінулага народа, які змагаўся за сваю незалежнасць, нягледзячы на тэрор, ціск з захаду і усходу, цяжкасці ідэалагічнага, палітычнага характару, змагаўся за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне, за ўз’яднанне ў складзе адзінай дзяржавы.

Якасна новы перыяд развіцця айчыннай заходнебеларускай гістарыяграфіі пачаўся пасля распаду СССР і ўстанаўлення незалежнасці Рэспублікі Беларусь, калі гістарычная навука здолела ажыццявіць якаснае ўдасканаленне арганізацыйна-метадалагічных аспектаў вывучэння гісторыі Заходняй Беларусі, забяспечыўшы яе, перш за ўсё, трывалы крыніцазнаўчы

грунт[58]. Як і ў папярэдні перыяд, найноўшая гістарыяграфія Заходняй Беларусі развівалася ў асноўным у выніку падрыхтоўкі і абароны кандыдацкіх дысертацый, першыя з якіх былі абаронены ў сярэдзіне 1990-х (А.А. Румак, А.М. Вабішчэвіч) і ў канцы 1990-х (В.В. Даніловіч і М.Б. Сямёнчык).[59] Названыя даследаванні адлюстроўвалі змены суадносін асобных тэматычных накірункаў гісторыі Заходняй Беларусі, звязаныя з тым, што гісторыка-партыйная тэматыка з КПЗБ у цэнтры саступіла іншым – маладаследаваным праблемам, гісторыя КПЗБ у 1990–2000-я гады на манаграфічным узроўні не вывучалася.

Важнае значэнне мелі даследаванні В.М. Гліны, М.М. Мязгі, А.М. Кротава, І.І. Трацяка, Н.А. Глушаковай[60], якія непасрэдна тычацца заходнебеларускай праблематыкі, раскрываюць вызначальныя па сваім уплыве на падзеі жыцця Заходняй Беларусі дыпламатычныя аспекты агульнаеўрапейскай гісторыі, у тым ліку дзейнасць БНР і беларускіх эсэраў, гістарыясофскія і псіхагістарычныя, звязаныя з асэнсаваннем ментальных асаблівасцей беларусаў і палякаў, успрыняцця палякаў і Польшчы беларусамі, культурна-асветніцкую дзейнасць беларускіх каталіцкіх святароў. Важкімі ў метадалагічным сэнсе з’яўляюцца даследаванні Р.Р. Лазько, у якіх аргументавана даказана абумоўленасць беларускага нацыянальнага руху палітыка-дыпламатычнымі прыярытэтамі Польшчы і СССР.[61]

Арганізацыйна-метадалагічнае ўдасканаленне вывучэння гісторыі Заходняй Беларусі асабліва ярка праявілася ў 2000-я гады ў выглядзе абароны дысертацый, апублікавання манаграфій, артыкулаў, матэрыялаў

---

[58] Савіч А. А. Нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі (1921–1939 гады) … С. 155–168.

[59] Румак А. А. Профсоюзы трудящихся Западной Белоруссии в революционно-демократическом движении, 1926–1939 гг. : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.01 / Белорус. гос. ун-т. Минск, 1994. 22 с. ; Вабішчэвіч А. М. Нацыянальная школа ў Заходняй Беларусі: стан, праблемы захавання (1921–1939 гг.) : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / Акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. Мінск, 1996. 19 с. ; Даніловіч В. В. Дзейнасць арганізацыі “Змаганне” ў Заходняй Беларусі (1927–1930 гг.) : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / Беларус. дзярж. пед. ун-т. Мінск, 2000. 21 с. ; Сямёнчык М. Б. Рабочы рух у Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) : аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук : 07.00.02 / НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. Мінск, 2000. 16 с.

[60] Гліна В. М. Сутнасць і асаблівасці нацыянальнага адраджэння ў Заходняй Беларусі (1920–1939 гг.) : аўтарэф. дыс. … канд. філас. навук : 09.00.03 / Беларус. дзярж. ун-т. Мінск, 1996. 17 с. ; Мезга Н. Н. Политика Рапалло и польско-советские отношения в 1922–1926 г.х : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.03 / Белорус. гос. ун-т. Минск, 1996. 19 с. ; Кротаў А. М. Вобраз Польшчы і палякаў у беларускім перыядычным друку 1920–1929 гадоў : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.03 / Беларус. дзярж. ун-т. Мінск, 1997. 21 с. ; Глушакова Н. А. Беларуская партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў: станаўленне і палітычная дзейнасць (1918–1924 гг.) : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / Беларус. дзярж. ун-т. Мінск, 1999. 22 с. ; Трацяк І. І. Культурна-асветніцкая дзейнасць беларускіх каталіцкіх святароў (пачатак XX ст. – 1939 г.) : аўтарэф. дыс. … канд. культуралогіі : 24.00.12 / Гродз. дзярж. ун-т. Гродна, 2000. 20 с.

[61] Лазько Р. Р., Кротаў А. М., Мязга М. М. Беларусь у еўрапейскай палітыцы. 1918–1925 гг. : нарысы. Гомель : ГДУ, 2003. 126 с. ; Лазько Р. Р. Еўрапейская палітыка Польшчы (1932–1939 гг.) : аўтарэф. дыс. … д-ра гіст. навук : 07.00.03 ; 07.00.15 / Беларус. дзярж. ун-т. Мінск, 2001. 38 с. ; Яго ж. Перад патопам (Еўрапейская палітыка Польшчы. 1932–1939 гг.). Мінск : БДУ, 2000. 354 с.

канферэнцый. Відавочным сведчаннем гэтага з'яўляюцца навуковыя здабыткі А.М. Вабішчэвіча і В.І. Крывуця ў выглядзе навуковых артыкулаў, манаграфій і абароненых імі доктарскіх дысертацый па тэматыцы Заходняй Беларусі[62]. Гістарыяграфічныя аспекты рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі атрымалі асэнсаванне ў кандыдацкай дысертацыі А.А. Савіча[63], прадметам манаграфічных даследаванняў С.С. Лісоўскага, А.М. Загідуліна, В.Э. Рабышкі, В.Р. Швайко, А.Т. Цымбала сталі праблемы нацыянальнага, этна-канфесійнага і этнакультурнага жыцця ў Заходняй Беларусі[64], А.М. Свірыд і Т.В. Лісоўская працягнулі даследаванне канфесійнай праблематыкі.[65] Гісторыю палітычных партый і арганізацый на тэрыторыі Заходняй Беларусі (БХД, БІГіК, Бунд, маладзёжныя арганізацыі, польскія і яўрэйскія партыі, беларускія паланафільскія арганізацыі) даследавалі Э.М. Мазько, В.І. Крывуць, А.В. Машчук, А.К. Гецэвіч, П.Т. Сцяцкевіч, К.С. Разуванава, В.Л. Шчука, А.А. Горны[66]. Здабыткам айчыннай гістарыяграфіі сталі

---

[62] Вабішчэвіч А. М. Нацыянальна-культурнае жыццё ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) : аўтарэф. дыс. … д-ра гіст. навук : 07.00.02 / Беларус. дзярж. ун-т. Мінск, 2010. 52 с.; Кривуть В. И. Молодежная политика польских властей в Западной Беларуси (1921–1939 гг.) : автореф. дис. … докт. ист. наук : 07.00.02 / Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории. – Минск, 2020. 47 с.

[63] Савіч А. А. Рэвалюцыйны нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг.: гістарыяграфія праблемы : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.09 / НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. Мінск, 2002. 23 с.

[64] Лісовський С. С. Національна політика Польщі в Західній Білорусі (1921–1926 рр.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / Львів. нац. ун-т ім. І. Франка. Львів, 2004. 19 с. ; Загідулін А. М. Нацыянальная і канфесіянальная палітыка польскіх улад у адносінах да беларускага насельніцтва Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. Мінск, 2005. 20 с. ; Рабышка В. Э. Этнапалітычныя працэсы ў Заходняй Беларусі ў 1919–1939 гадах : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / Беларус. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка. Мінск, 2004. 22 с. ; Швайко В. Г. Деятельность русских организаций в Польше по сохранению русской культуры в 1921–1939 гг. : автореф. дис. … канд. ист. наук : 24.00.01 / Гродн. гос. ун-т им. Я. Купалы. Гродно, 2005. 22 с. ; Цымбал А. Г. Палітыка польскіх улад у адносінах да праваслаўнай царквы ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / Беларус. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка. Мінск, 2009. 24 с.

[65] Свирид А. Н. Униатская церковь в Западной Беларуси (1921–1939 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / Белорус. гос. ун-т. Минск, 2003. 19 с. ; Лисовская Т. В. Неопротестантизм в Западной Беларуси в 1921–1939 гг. : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / НАН Беларуси, Ин-т истории. Минск, 2009. 28 с.

[66] Мазько Э. А. Уплыў Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі на фарміраванне культурнай сітуацыі ў Заходняй Беларусі ў 20–30 гады ХХ стагоддзя : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.03 / Гродз. дзярж. ун-т імя Я. Купалы. Гродна, 2003. 21 с. ; Кривуть В. И. Молодежные организации на территории Западной Беларуси (1929–1939 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / Белорус. гос. ун-т. Минск, 2005. 21 с. ; Гецевич А. К. Деятельность польских политических партий и организаций в Западной Беларуси (1918–1926 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / Белорус. гос. ун-т. Минск, 2007. 21 с. ; Мощук А. В. Деятельность Бунда на территории Западной Беларуси в 1921–1939 гг. : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / НАН Беларуси, Ин-т истории. Минск, 2008. 22 с. ; Стецкевич П. Т. Деятельность еврейских политических партий и организаций на территории Западной Беларуси (1918–1926 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / НАН Беларуси, Ин-т истории. Минск, 2008. 23 с. ; Разуванава К. С. Дзейнасць Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры ў Заходняй Беларусі (1926–1936 гг.) : аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук : 07.00.02 / Ін-т гісторыі НАН Беларусі. Мінск, 2011. 24 с. ; Щука О. Л. Общественно-политическая деятельность еврейских партий и организаций в Западной Беларуси (1926–1939 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02. Минск, 2015. 25 с. ;

даследаванні парламенцкага прадстаўніцтва беларускага народа ў міжваеннай Польшчы (А.В. Пашкевіч), краязнаўчага руху (І.У. Цітовіч), мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання і самакіравання ў Заходняй Беларусі (А.І. Борка), дзейнасці дабрачынных арганізацый (А.І. Пашковіч)[67]. У выглядзе кандыдацкай дысертацыі С.М. Грэся і В.П. Гарматнага атрымала даследаванн гісторыя аграрных пераўтварэнняў, прадметам навуковай распрацоўкі Г.С. Вайцешчык сталі заходнебеларускія мястэчкі, А.Л. Радзюка – заходнебеларускія кааператывы, В.М. Мярчук – міграцыйныя працэсы, У.А. Ганскага – рэкрэацыя і турызм, а Л.В. Лаўрэнкі – прамысловасць, рамесніцтва і гандаль у Заходняй Беларусі[68]. Шырокая тэматычная палітра дысертацыйных даследаванняў адлюстравае гісторыю Заходняй Беларусі на падставе антрапалагічнага падыходу з рознабаковым асэнсаваннем індывідуальных, ідэйна-рэлігійных, псіхаэмацыянальных аспектаў.

Усяго ў 1990–2000-я гг. было падрыхтавана 2 доктарскіх і 36 кандыдацкіх дысертацый па гісторыі Заходняй Беларусі. Да гэтага трэба дадаць іншыя кандыдацкія дысертацыі, найперш А.М. Чарнякевіча, В.М. Цынкевіча і В.М. Кузьміч, якія раскрываюць разнастайныя аспекты беларуска-польскіх адносін, у тым ліку ваенна-палітычныя і палітыка-дыпламатычныя, арганізацыйна-фінансавыя бакі арганізацыі і падтрымкі камуністычнага руху[69].

---

Горны А. С. Беларускія паланафільскія арганізацыі ў грамадска-палітычным і культурным жыцці Заходняй Беларусі (1921–1939) : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. Мінск, 2016. 24 с.

[67] Пашкевіч А. В. Парламенцкія формы змагання за нацыянальныя і сацыяльныя правы беларускага народа ў міжваеннай Польшчы (1921–1939) : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / Беларус. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка. Мінск, 2006. 21 с. ; Цітовіч І. У. Краязнаўчы рух на тэрыторыі Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / Рэсп. ін-т выш. шк., Беларус. дзярж. ун-т. Мінск, 2006. 21 с. ; Борка А. І. Мясцовыя органы дзяржаўнага кіравання і самакіравання ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. Гродна, 2007. 19 с. ; Пашковіч А. І. Дзейнасць дабрачынных арганізацый на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. Мінск, 2007. 22 с.

[68] Грэсь С. М. Аграрныя пераўтварэнні ў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. : дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. Мінск, 2007. 119 с. ; Вайцешчык Г. С. Мястэчкі Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.): сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё : аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук : 07.00.02 / Беларус. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка. Мінск, 2013. 23 с. ; Радзюк А. Л. Беларускія кааператывы ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.): аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.02. Мінск, 2014. 20 с. ; Мярчук В. М. Эміграцыя насельніцтва з Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. Мінск, 2016. 23 с. ; Гарматны В. П. Правядзенне камасацыі на тэрыторыі Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / Беларус. дзярж. ун-т. Мінск, 2016. 27 с.; Ганский В. А. Развитие туризма в Западной Беларуси (1921-1939 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / МГУ им. А. А. Кулешова. – Минск, 2020. – 24 с. Лаўрэнка Л. В. Прамысловасць, рамесніцтва і гандаль на тэрыторыі Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.): аўтарэф. дыс. …канд. гіст. навук : 07.00.02 / ІГ НАНБ. – Мінск, 2021. – 25 с.

[69] Чернякевич А. Н. Политика Польши на оккупированной территории Беларуси в период польско-советской войны (февраль 1919 – март 1921 г.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / Белорус. гос. пед. ун-т им. М. Танка. Минск, 2001. 20 с. ; Цынкевіч В. М. Палітычныя ўзаемадачыненні паміж БССР і Польскай Рэспублікай у 1921–1929 гг. : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.15 /

Паступова бягучы перыяд развіцця заходнебеларускай гістарыяграфіі пачаў атрымліваць больш паўнавартаснае афармленне выхадам манаграфій І.В. Палуяна, Я.А. Місарэвіча і М.Д. Каралёва.[70] У 2000-я гады апублікаваны навуковыя манаграфіі Т.А. Лугачовай, У. Конана, А.М. Вабішчэвіча, В.В. Даніловіча, В.І. Крывуця, А.К. Гецэвіча, А.М. Загідуліна, П.Т. Сцяцкевіча, А.І. Борка, У.В. Ляхоўскага, С.М. Грэся, А.А. Савіча, А.М. Свірыда, К.С. Разуванавай.[71] Здабыткі навуковага асэнсавання гісторыі Заходняй Беларусі былі акумуляваны і на старонках абагульняльных прац па гісторыі Беларусі. [72]

---

Беларус. дзярж. ун-т. Мінск, 2004. 20 с. ; Кузьмич В. Н. Белорусский участок советско-польской границы: становление и функционирование в 1921–1939 гг. : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / Ин-т истории НАН РБ. Мінск, 2011. 24 с.

[70] Полуян И. В. Западная Белоруссия в период экономического кризиса 1929–1933 гг. Минск : Навука і тэхніка, 1991. 205 с. ; Місарэвіч Я. А., Каралёў М. Д. І. С. Дварчанін : гіст.-біягр. нарыс. Гродна : Абл. аддз-не Беларус. фонду культуры, 1995. 303 с.

[71] Лугачёва Т. А. Международная организация помощи революционерам (МОПР) в Западной Беларуси (1923–1939 гг.). Гродно : ГрГУ, 2001. 114 с. ; Конан У. Ксёндз Адам Станкевіч і каталіцкае адраджэнне ў Беларусі. Мінск : Про Хрысто, 2003. 128 с. ; Токць С. М. Беларуская вёска на мяжы эпох: Змены этнічнай самасвядомасці сялянства ва ўмовах распаду традыцыйнага аграрнага грамадства (па матэрыялах Гарадзеншчыны 19 – першай трэці 20 ст.). Гродна : ГрДУ, 2003. 191 с. ; Яго ж. Беларуская вёска ў эпоху зменаў: Другая палова XIX – першая траціна XX ст. Мінск : Тэхналогія, 2007. 308 с. ; Вабішчэвіч А. М. Асвета ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) : манаграфія. Брэст : БрДУ, 2004. 116 с. ; Яго ж. Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) : манаграфія. Брэст : БрДУ, 2008. 319 с. ; Даніловіч В. В. Дзейнасць арганізацыі "Змаганне" ў Заходняй Беларусі (1927–1930 гг.). Мінск : Беларус. навука, 2007. 159 с. ; Кривуть В. И. Молодежные организации на территории Западной Беларуси (1929–1939 гг.). Минск : Белорус. наука, 2008. 164 с. ; Его же. Молодежная политика польских властей на территории Западной Беларуси (1926–1939 гг.) / науч. ред. А. А. Коваленя ; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории. Минск : Беларус. навука, 2009. 252 с.; Яго ж. Пад шыльдай "дзяржаўнага выхавання": рэалізацыя ўрадавых выхаваўчых канцэпцый на тэрыторыі Заходняй Беларусі (1926–1939) : манаграфія. Баранавічы : РВА БарДУ, 2010. 195 с.; Мицкович Н. С. Между истиной и выдумкой. Коммунистическое подполье Жабинковщины в 20–30-е годы XX ст. Брест : Альтернатива, 2007. 100 с. ; Цуба М. В. В. З. Корж: невядомыя і малавядомыя старонкі жыцця. Пінск : ТДА "ІРА "Паляшук", 2009. 88 с. ; Гецевич А. К. Деятельность польских политических партий и организаций в Западной Беларуси (1918–1926) : монография / М-во образования Респ. Беларусь, Гродн. гос. ун-т. им. Янки Купалы. Гродно : ГрГУ, 2010. 139 с. ; Загідулін А. М. Беларускае пытанне ў польскай нацыянальнай і канфесійнай палітыцы ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) : манаграфія / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Гродз. дзярж. ун-т імя Янкі Купалы. Гродна : ГрДУ, 2010. 183 с.; Стецкевич П. Т. Деятельность еврейских политических партий и организайций на территории Западной Беларуси (1918–1926 гг.) : монография / М-во образования Респ. Беларусь, Гродн. гос. аграр. ун-т. Гродно : ГрГАУ, 2010. 198 с. ; Борка А. І. Мясцовыя органы дзяржаўнага кіравання і самакіравання ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) : манаграфія. Гродна : ГрДУ, 2011. 139 с. ; Грэсь С. М. Аграрныя пераўтварэнні ў Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. : манаграфия / М-ва аховы здароўя Рэсп. Беларусь, Гродз. дзярж. мед. ун-т. Гродна : ГрДМУ, 2012. 202 с. ; Ляхоўскі У. Ад гоманаўцаў да гайсакоў. Чыннасць беларускіх маладзёвых арганізацый у 2-й палове 19 – першай трэці 20 ст. Беласток : Беларус. гіст. т-ва ; Вільня : Ін-т беларусістыкі, 2012. 484 с.; Савіч А. А. Нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі ... ; Свирид А. Н. Униатская церковь в Западной Беларуси (1921–1939 гг.) : монография / Брест. гос. ун-т им. А. С. Пушкина. Брест : БрГУ, 2012. 218 с.; Яго ж. Айчынная гістарыяграфія гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гадоў : манаграфія / навук. рэд. А. А. Каваленя ; М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Брэсц. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна. – Брэст : БрДУ імя А. С. Пушкіна, 2019. – 300 с.; Разуванава К. С. Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры ў Заходняй Беларусі (1926–1936 гг.) / нав. рэд. В. В. Даніловіч ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. Мінск : Беларус. навука, 2013. 245 с.

[72] Гісторыя Беларусі : курс лекцый. У 2 ч. Ч. 2. XIX–XX стст. / П. І. Брыгадзін [і інш.]. Мінск : РІВШ БДУ, 2002. 656 с. ; Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 5. Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч

Значнай была ў 2000-я гг. арганізацыйна-метадалагічная і навукова-выдавецкая роля Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў і Інстытута гісторыі НАН Беларусі у стварэнні спрыяльных умоў для развіцця і паглыблення заходнебеларускай гістарыяграфіі, падрыхтоўцы і выданні фундаментальных выданняў па гісторыі Заходняй Беларусі ў выглядзе абагульняльных прац[73] і зборнікаў дакуменатаў і матэрыялаў[74], ажыццяўленні рэгіяналізацыі ў даследаванні гісторыі Заходняй Беларусі, якое было адзначана выхадам зборнікаў па гісторыі рэгіёнаў Заходняй Беларусі, у тым ліку міжваеннага часу.[75]

Перспектывы далейшага развіцця і ўдасканалення гістарыяграфіі Заходняй Беларусі бачацца ў актыўным выкарыстанні перадавых навукова-метадалагічных напрацовак, якія накіраваны на выяўленне гісторыка-антрапалагічных акалічнасцей мінулага. Багатая і разнастайная крыніцавая база дае падставы для паглыблення і пашырэння прадмета заходнебеларускай гісторыі за кошт выкарыстання новых накірункаў гістарычнай рэканструкцыі і інтэрпрэтацыі, у тым ліку з пункту гледжання мікрагісторыі, псіхагісторыі, гендэрнай, лакальнай, паўсядзённай і вуснай гісторыі.

Такім чынам, айчынная гістарыяграфія гісторыі Заходняй Беларусі атрымала вырашальнае ўздзеянне ў выніку трансфармацый грамадска-палітычнага жыцця ў пачатку 1990-х гг. Незалежнасць Рэспублікі Беларусь з'явілася вызначальнай падзеяй, якая ажывіла нацыянальную

---

[і інш.]. ; рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск : Экаперспектыва, 2006. 613 с. ; История имперских отношений: беларусы и русские. 1772–1991 гг. / сост. и ред. А. Е. Тарас. Смоленск : Книж. клуб «Посох», 2008. 608 с. ; Круталевіч В. А., Юхо І. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі (1917–1945 гг.). Мінск : Беларус. навука, 1998. 238 с. ; Ладысеў У. Ф., Брыгадзін П. І. Паміж Усходам і Захадам: станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917–1939). Мінск : БДУ, 2003. 307 с. ; Шыбека З. Нарыс гісторыі Беларусі (1795–2002). Мінск : Энцыклапедыкс, 2003. 490 с.

[73] Беларусь: Народ. Государство. Время / Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории ; редкол.: А. А. Коваленя [и др.]. Минск, 2009. 879 с. ; Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 2 / М. У. Смяховіч [і інш.] ; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. Мінск : Беларус. навука, 2012. 654 с. ; Рижский мир в судьбе белорусского народа, 1921–1953 гг. В 2 кн. / А. А. Коваленя [и др.] ; редкол.: А. А. Коваленя (пред.) [и др. ] ; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории. Минск : Беларус. навука, 2014.

[74] "Ты з Заходняй, я з Усходняй нашай Беларусі...". Верасень 1939 г. – 1956 г. : дак. і матэрыялы : у 2 кн. / склад.: У. І. Адамушка [і інш.]. Мінск : Беларус. навука, 2009. Кн. 1 : Верасень 1939 г. – 1941 г. 340 с. ; Кн. 2 : Ліпень 1944 г. – 1956 г. 301 с. ; Польша – Беларусь (1921–1953) : сб. док. и материалов / сост.: А. Н. Вабищевич [и др.]. Минск : Беларус. навука, 2012. 423 с.

[75] Карэліччына: людзі, падзеі, час : зб. навук. арт. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі ; уклад.: А. А. Скеп'ян [і інш.] ; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]. Мінск : Беларус. навука, 2012. 486 с. ; Гісторыя Пінска. Ад старажытнасці да сучаснасці: да 915-й гадавіны з першага летапіснага ўпамінання / А. М. Літвін [і інш.]. Мінск : Выш. шк., 2012. 711 с. ; Беларусь праз прызму рэгіянальнай гісторыі: Бяроза і Бярозаўскі рэгіён : зб. навук. арт. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі ; уклад.: А. А. Скеп'ян, А. Б. Доўнар ; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]. Мінск : Беларус. навука, 2014. 403 с. ; Гісторыя Навагрудка – з глыбінь вякоў да нашых дзён / рэдкал.: М. П. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск : Белстан, 2014. 592 с. ; Беларусь праз прызму рэгіянальнай гісторыі: Ашмяны і Ашмянскі рэгіён : зб. навук. арт. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі ; уклад.: А. А. Скеп'ян, А. Б. Доўнар ; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]. Мінск : Беларус. навука, 2015. 497 с.

гістарыяграфію, адкрываючы доступ да дакументаў сакрэтнага захоўвання лібералізавала архіўнае справаводства, стымулявала пераасэнсаванне і ўдакладненне гісторыі Заходняй Беларусі, заходнебеларускага нацыянальна-вызваленчага руху, рэабілітацыю і вяртанне ў яе нацыянальных дзеячаў. Даследаванні бягучага перыяду карэнным чынам змянілі навуковае бачанне сацыяльна-эканамічных і дзяржаўна-прававых працэсаў, якія былі падставай для незадаволенасці заходнебеларускага насельніцтва польскай палітыкай і нарадзілі беларускі нацыянальна-вызваленчы рух.

Заходнебеларуская праблематыка атрымала значную ўвагу польскіх аўтараў, якія ў асноўным імкнуцца прэзентаваць Заходнюю Беларусь і яе гісторыю як частку Польшчы і польскай гісторыі. Не адмаўляючы ў цэлым найбольш відавочныя праявы абмежавальнай асіміляцыйна-паланізатарскай палітыкі ў дачыненні да беларускага насельніцтва, недасканаласць эканамічнай палітыкі польскага ўраду, польскія гісторыкі на падставе параўнання рэалій міжваеннай Польшчы і БССР схільныя падкрэсліваць перавагі польскай дзяржавы, а беларускі нацыянальна-вызваленчы рух абумоўліваць бальшавіцка-камінтэрнаўскім уплывам[76].

### Тэма 3. Рыжскі мір і Беларусь

Вызначэнне лёсу Беларусі адбывалася ў выніку польска-савецкай вайны, якая пачалася вясной 1919 г. у выніку імкнення адноўленай Польшчы пашырыць сваю тэрыторыю за кошт беларускіх, літоўскіх і ўкраінскіх тэрыторый. Паступова прасоўваючыся на ўсход, польскія войскі бралі пад свой кантроль беларускія землі, у красавіку 1919 г. узялі Вільню, а ў жніўні Мінск, урэшце выйшлі на р. Бярэзіна, дзе фронт стабілізаваўся ажно да вясны 1920 г.

Узмоцненая пасля няўдалага майскага наступлення 1920 г. Чырвоная Армія перайшла ў наступленне ў ліпені, якое прывяло да разгрому польскіх войскаў і наступленню на Варшаву пад лозунгамі сусветнай рэвалюцыі. На тэрыторыі Беларусі праводзілася шырокая мабілізацыя,

[76] Бергман А. Слова пра Браніслава Тарашкевіча. Гістарычны жыццяпіс. Мінск : Маст. літ., 1996. 192 с. ; Bergman A. Sprawy białoruskie w II Rzeczypospolitej. Warszawa : PWN, 1984. 287 s. ; Cichoracki P. Droga ku anatemie: Wacław Kostek-Biernacki (1884–1957). Warszawa : IPN, 2009. 495 s. ; Idem. Stołpce – Łowcza – Leśna 1924: II Rzeczpospolita wobec najpoważniejszych incydentów zbrojnych w województwach północno-wschodnich. Łomianki : LTW, 2012. 337 s. ; Idem. Województwo poleskie, 1921–1939: z dziejów politycznych. Łomianki : LTW, 2014. 477 s. ; Eberhadt P. Przemiany narodowościowe na Białorusi. Warszawa : Wydaw. naukowe PWN, 1994. 182 s.; Gomółka K. Między Polską a Rosją. Białoruś w koncepcjach polskich ugrupowań politycznych 1918–1922. Warszawa : Gryf, 1994. 264 s. ; Łatyszonek O. Bialoruskie formacje wojskowe, 1917–1923 / Bialorus. T-wo Hist. Bialystok, 1995. 273 s. ; Мілеўскі Я. Е. Заходняя Беларусь: да пытання тэрыторыі і насельніцтва // Беларус. гіст. часоп. 1998. № 3. С. 40–42 ; Mironowicz E. Białorusini i Ukraińcy w polityce obozu piłsudczykowskiego. Białystok : Wydaw. Uniwersyteckie „Trans Humana”, 2007. 293 s. ; Śleszyński W. Bezpieczeństwo wewnętrzne w polityce państwa polskiego na ziemiach północno-wschodnich II Rzeczypospolitej. Warszawa : RYTM, 2007. 400 s. ; Idem. Województwo poleskie. Kraków : Avalon, 2014. 335 s.

аднак бальшавікі так і не адважыліся стварыць у Чырвонай Арміі беларускія вайсковыя фарміраванні. З 200 тыс. чалавек, мабілізаваных улетку 1919 г. на беларускіх землях, на Заходні фронт былі адпраўленыя толькі 40 тыс. Адступленне польскага войска суправаджалася масавым марадзёрствам цывільнага насельніцтва. 11 ліпеня Чырвоная Армія захапіла Мінск, а ў сярэдзіне жніўня падышла да Варшавы.

Аднак насельніцтва Польшчы раўнадушна паставілася да прапагандаваных бальшавікамі лозунгаў, прадэманстравала высокі патрыятычны ўздым і пры падтрымцы краін Антанты 16 жніўня польскія войскіперайшлі ў контрнаступленне, у выніку якога Мінск зноў на пэўны час (15–17 кастрычніка) перайшоў у рукі польскіх уладаў. Дзесяткі тысячаў палонных чырвонаармейцаў, у тым ліку беларусаў, гінулі ад голаду і хваробаў.

Яшчэ падчас наступлення на Варшаву савецкі ўрад пачаў дзяліць беларускія землі. Савецкае кіраўніцтва было вельмі зацікаўлена ў польска-літоўскім канфлікце. Таму 12 ліпепя 1920 г., улічваючы, што Літва варагуе з Польшчай, ён схіліў літоўскае кіраўніцтва да падпісання ў Маскве мірнай дамовы. У адпаведнасці з ёю ленінскі ўрад Расіі прызнаваў незалежнасць Літоўскай Рэспублікі, а Віленскі край (з Гродна, Шчучынам, Лідай, Ашмянамі, Смаргонню, Браславам) – яе неад’емнай часткай. 14 ліпеня Чырвоная Армія заняла Вільню, а пры вераснёўскім адступленні саступіла горад літоўскай арміі. Літоўская дзяржава ўцягвалася ў вострую канфрантацыю з Польшчай і БНР, якія прэтэндавалі на гэтыя ж тэрыторыі. Паводле жнівеньскай дамовы 1920 г. з Латвіяй, Масква перадала ёй памежную паласу беларускіх земляў Віцебскай губерні разам з Дзвінскам. Праз беларускае насельніцтва Дзвіншчыны яна планавала ўплываць на палітыку суседніх дзяржаваў.

Адначасова ішлі спрэчкі пра аднаўленне савецкай дзяржаўнасці ў Беларусі. Гэтага настойліва патрабавалі беларускія камуністы, якія даказалі сваю адданасць Маскве барацьбой з палякамі. Пра ўзнаўленне Літбела не магло быць гаворкі, бо літоўцы мелі сваю дэмакратычную рэспубліку са сталіцай у Коўна. Грамадзянская вайна пераканала У. Леніна, што без падтрымкі прасавецкіх нацыянальных сілаў бальшавіцкую “імперыю” не стварыць. А таму, каб прадухіліць пераход улады ў рукі нацыянальных сілаў, бальшавікі апраналіся ў нацыянальныя строі. Створаная пры ЦК КП(б) Літвы і Беларусі камісія хоць і не знайшла ніякіх рэальных падставаў для ўтварэння беларускай савецкай рэспублікі, але мусіла выконваць дырэктывы Масквы.

31 ліпеня 1920 г. была апублікаваная Дэкларацыя аб абвяшчэнні незалежнай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь (ССРБ). Яе тэрыторыя не мела пэўных межаў і складалася прыкладна з 18 паветаў

пераважна Мінскай губерні. Масква паспела ўжо прыхапіць значную частку беларускіх земляў сабе, падзяліцца імі з Літвой і Латвіяй, а Беласточчыну ў перспектыве перадаць Польшчы пасля насаджэння там савецкай улады на чале з польскім камуністам Ю. Мархлеўскім. Вызначэнне межаў з Украінай адкладалася. Новаўтвораная Савецкая Беларусь не мела паўнавартаснага ўрада. Яго функцыі выконваў Ваенна-рэвалюцыйны камітэт на чале з А. Чарвяковым, створаны на аснове былога Мінскага ваеннага рэвалюцыйнага камітэта, што ўзнік яшчэ да заняцця Мінска бальшавікамі. У склад гэтай установы ўвайшлі лідэры беларускіх эсэраў і бундаўцаў. Беларускія эсэры патрабавалі стварэння ўрада з прадстаўнікоў усіх сацыялістычных партыяў, арганізацыі самастойнага Беларускага войска і абвяшчэння поўнай незалежнасці Беларусі. Але Дэкларацыя толькі паўтарала Маніфест марыянетачнага ўрада З. Жылуновіча ад 1 студзеня 1919 г. Таму эсэры яе не падпісалі. А беларускія камуністы пайшлі на супрацоўніцтва з расійцамі, бо верылі ў іх падтрымку незалежнай камуністычнай Беларусі. Што да абласнікоў, то яны шчыра заяўлялі, што разглядаюць ССРБ як нацыянальна-культурную аўтаномію беларусаў у складзе адной Мінскай губерні, дый тое часовую. У канцы 1920 г. В. Кнорын, старшыня ЦБ Кампартыі Беларусі (асобнай ад літоўскай з 5 верасня 1920 г.), інспіраваў увядзенне спецыяльнага цыркуляра аб перапісцы паміж камісарыятамі ССРБ абавязкова на рускай мове.

Кіраўніцтва БНР на чале з В. Ластоўскім не прызнала абвешчанай ССРБ і характарызавала другое ўсталяванне ў Беларусі савецкай улады як маскоўскую акупацыю. Яно патрабавала ад ленінскага ўрада вываду Чырвонай Арміі і прызнання незалежнасці Беларусі. Патрабаванне прызнаць незалежнасць выстаўлялася і Польшчы. Пры ўмове падтрымкі палякамі гэтага патрабавання беларускі ўрад згаджаўся на супольную барацьбу з бальшавікамі. Тым больш, што Польшча прызнала ўжо Украіну і Літву. У маі 1920 г. перад пагрозай падзелу Беларусі паміж Польшчай і Расіяй Вацлаў Ластоўскі быў гатовы на федэрацыю з Польшчай, калі б яна пагадзілася на стварэнне Беларуска-Літоўскай Дэмакратычнай Рэспублікі. Апошнюю спробу дамовіцца з Польшчай В. Ластоўскі зрабіў у верасні 1920 г., калі літоўскае кіраўніцтва пасля адступлення бальшавікоў далучыла да сваёй дзяржавы Віленскі край. Але ні ў Маскве, ні ў Варшаве беларускіх дзеячаў не хацелі слухаць.

***Савецка-польскае перамір’е 1920 г. і яго ўмовы.*** 12 ліпеня 1920 г. англійскі міністр замежных справаў Джордж Керзан прапанаваў бакам ваеннага канфлікту размежаванне па лініі Гародня – Ялаўка – Няміраў – Брэст. Але прапанова была адхіленая савецкім і польскім урадамі. На мірных перамовах у Рызе (верасень – кастрычнік 1920 г.) Расія згаджалася перадаць Польшчы і Мінскую губерню ўзамен на прызнанне палякамі

Украінскай ССР. Тым самым савецкі расійскі ўрад У. Леніна свядома ішоў на ліквідацыю савецкай Беларусі, тэрыторыя якой якраз укладвалася тады ў межы Мінскай губерні. Але польскія эндэкі, магчыма, насуперак волі Пілсудскага не дапусцілі далучэння да Польшчы ўсходніх земляў, бо баяліся, што іх праваслаўнае беларускае насельніцтва не ўдасца паланізаваць і што гэтая акцыя можа выклікаць пагаршэнне адносінаў з Расіяй, на ўладу ў якой у той час рэальна прэтэндаваў генерал П. Урангель.

12 кастрычніка 1920 г. у Рызе савецкая Расія і Украіна з аднаго боку і Польшча з другога заключылі перамір'е і папярэднія ўмовы міру. Дагавор аб перамір'і прызнаваў незалежнасць савецкай Украіны і савецкай Беларусі. Польшча пайшла на прызнанне гэтых савецкіх рэспублік, а ўзамен змагла ўтрымаць занятыя падчас контрнаступлення вялікія беларускія і ўкраінскія тэрыторыі. Мяжа падзелу Беларускай Народнай Рэспублікі праходзіла крыху на захад ад Дрысы (на поўначы), Мінска (у цэнтры) і Турава (на поўдні), прыкладна супадаючы з лініяй нямецкіх акопаў Першай сусветнай вайны. Пасля падпісання савецка-польскага перамір'я за абвешчанай ССРБ засталося ўсяго шэсць паветаў былой Мінскай губерні: Мінскі, Барысаўскі, Бабруйскі, Ігуменскі, Мазырскі і Слуцкі (52,3 тыс. км$^2$), дзе жыло крыху больш за 1,5 млн чалавек. 12 паветаў савецкай Беларусі адышлі Польшчы. Усе астатнія беларускія землі яшчэ раней забрала бальшавіцкая Расія.

Падпісанне перамір'я не спыніла ваенных дзеянняў. Пры падтрымцы польскага боку ў лістападзе на тэрыторыю Беларусі ўвайшлі атрады пад кіраўніцтвам С. Булак-Балаховіча, які абвясціў сябе начальнікам Беларускай дзяржавы. Але пасля захопу Мазыра, Петрыкава, Калінкавіч гэтыя злучэнні былі разбіты. У лістападзе – снежні 1920 г. адбылося ўзброенае выступленне на Случчыне (Слуцкі збройны чын), удзельнікі якога выступалі за беларускую дзяржаўнасць.

Наступныя перамовы ў Рызе ў асноўным пакінулі без змен дадзены стан. Беларускія дэлегацыі ні ад БССР, ні ад БНР не былі дапушчаны да падрыхтоўкі і падпісання дагавора. Дэлегацыя БССР прысутнічала ў Рызе з самага пачатку перагавораў, але яе паўнамоцтвы не былі прызнаныя польскім бокам. Расійскі бок таксама не быў зацікаўлены ва ўдзеле беларускіх прадстаўнікоў у працэсе выпрацоўкі пагаднення, паколькі гэта магло разбурыць дыпламатычную камбінацыю і нават сарваць заключэнне міру (ва ўмовах нежадання РСФСР рыхтавацца да зімовай кампаніі). Ад імя БССР выступала РСФСР. БНР апелявала да вядучых еўрапейскіх дзяржаў праз Савет паслоў у Парыжы, але члены Антанты падтрымлівалі Польшчу, якая была адным з асноўных элементаў пасляваеннай версальскай сістэмы.

Вялікабрытанія на працягу савецка-польскай вайны рабіла захады па спыненні вайны і выпрацавала прапановы па размежаванні па “лініі Керзана”, якая павінна была ўсталяваць усходнюю граніцу Польшчы па мяжы рассялення палякаў, з аднаго боку, і беларусаў і ўкраінцаў, з другога. Расія адмаўлялася ад англійскага пасрэдніцтва і перагавораў з Польшчай да паражэння Чырвонай Арміі пад Варшавай у жніўні 1920 г., якое прывяло да пералому ў вайне і, урэшце, перамогі Польшчы.

Канчатковы варыянт савецка-польскай граніцы, зафіксаваны падпісаннем Рыжскай мірнай дамовы паміж Савецкай Расіяй, Украінай і Польшчай 18 сакавіка 1921 г., прайшоў значна далей на ўсход ад лініі Керзана. Згодна з дагаворам, заходнія землі Беларусі, тэрыторыі сучасных Брэсцкай і Гродзенскай абласцей, частка Мінскай вобласці (без Мінска) і Віцебскай адышлі да Польшчы. Расія пагадзілася вярнуць Польшчы розныя культурныя каштоўнасці і выплаціць 30 млн руб. золатам. Рыжскі мір не прызналі і асудзілі кіраўніцтва БНР, Беларуская партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў, дзеячы Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі і Беларускай партыі сацыялістаў-федэралістаў, прадстаўнікі нацыянальнай інтэлігенцыі БССР Янка Купала, Якуб Колас, У. Дубоўка і інш. Рашуча асудзілі Рыжскі трактат і заклікалі змагацца супраць яго наступстваў Першая (1921, Прага) і Другая (1925, Берлін) Усебеларускія канферэнцыі.

Што тычыцца Віленшчыны, то 9 кастрычніка 1920 г. польскі генерал Люцыян Жалігоўскі, ураджэнец Ашмянаў і камандзір літоўска-беларускай дывізіі, па ўзгадненні з Пілсудскім захапіў Вільню і абвясціў сябе дыктатарам абвешчанай ім дзяржавы Сярэдняй Літвы. Літоўскі ўрад разарваў дыпламатычныя адносіны з Польшчай і фактычна пачаў з ёй неаб’яўленую вайну. На літоўскі бок стаў і ковенскі ўрад Народнай рады БНР на чале з В. Ластоўскім. Урад Найвышэйшай рады БНР падтрымаў акцыю Жалігоўскага, але яна не прынесла чаканых палітычных дывідэндаў. Назва “Заходняя Беларусь”, якая спачатку прызначалася для так званай новай дзяржавы, была адхіленая. Дзейнасць урада і сейма Сярэдняй Літвы набывала пры дыктатары відавочны прапольскі змест. Абраны ў студзені 1922 г. сойм Сярэдняй Літвы ў хуткім часе прыняў рэзалюцыю аб безумоўным уключэнні Сярэдняй Літвы ў склад Польшчы.

## Тэма 4. Тэрыторыя і насельніцтва Заходняй Беларусі

Згодна з Рыжскім дагаворам ад 18 сакавіка 1921 г. да Польшчы адышлі Гродзенская губерня, Навагрудкі, Пінскі, частка Слуцкага, Мазырскага і Мінскага ўездаў Мінскай губерні, а таксама Ашмянскі, Лідскі, Вілейскі і Дзісненскі ўезды Віленскай губерні. Яшчэ ў пачатку кастрычніка 1920 г. захопленыя Л. Жэлігоўскім тэрыторыі Віленскага,

Свянцянскага і Трокскага ўездаў Віленскай губерні, т.зв. Сярэдняя Літва, таксама былі далучаны да Польшчы. Гэтыя тэрыторыі атрымалі ў айчыннай гістарычнай літаратуры назву Заходняя Беларусь. У афіцыйных польскіх дакументах і літаратуры ўжывалася назва "паўночна-ўсходнія ўскраінныя землі II Рэчы Паспалітай" ці "крэсы ўсходнія", што азначала "ўсходнія ўскраіны" Польшчы. Пастановай польскага ўрада яны былі раздзелены на 4 ваяводствы: Палескае, Навагрудскае, Беластоцкае і Віленскае (апошняе да снежня 1925 г. насіла афіцыйную назву Віленская адміністрацыйная акруга).

Да Заходняй Беларусі ў складзе чатырох ваяводстваў адносіліся тэрыторыі наступных паветаў з пераважнай большасцю беларускага насельніцтва: Беластоцкае ваяводства – Аўгустоўскі, Беластоцкі, Бельскі, Высока-Мазавецкі, Ваўкавыскі, Гродзенскі, Саколкаўскі і Сувалкаўскі паветы; Віленскае ваяводства – Ашмянскі, Браслаўскі, Вілейскі, Віленска-Трокскі, Дзісенскі, Маладзечанскі, Дунілавіцкі (Пастаўскі) і Свянцянскі; Навагрудскае ваяводства – Баранавіцкі, Валожынскі, Лідскі, Навагрудскі, Нясвіжскі, Слонімскі, Стаўбцоўскі і Шчучынскі; Палескае ваяводства – Брэсцкі, Драгічынскі, Кобрынскі, Косаўскі, Лунінецкі, Пінскі, Пружанскі і Столінскі. Названы абшар у асноўным ахопліваў этнічныя беларускія землі.

Пры гэтым трэба адзначыць, што ва ўмовах відавочнай асіміляцыйнай і паланізатарскай палітыкі польскіх уладаў, пры правядзенні перапісаў насельніцтва для павелічэння колькасці палякаў у іх склад наўмысна залічвалася значная частка беларусаў-католікаў, польскамоўных жыхароў, выкарыстоўваліся разнастайныя сродкі фальсіфікацыі вынікаў перапісаў. Да беларусаў не залічваліся "тутэйшыя", у якіх не быў завершаны працэс фарміравання нацыянальнай свядомасці.

Сёння польскія вучоныя ў сваім навуковым лексіконе не выкарыстоўваюць тэрмін "Заходняя Беларусь", а карыстаюцца тэрмінам – "Паўночна-Усходнія ўскраінныя землі II Польскай Рэспублікі", заніжаючы плошчу яе тэрыторыі. У прыватнасці, Я. Мілеўскі да "ўскраінных зямель Польшчы" аднёс тэрыторыю тагачасных Віленскага, Навагрудскага і Палескага ваяводстваў (за выключэннем Сарненскага павета), а таксама Гродзенскага і Ваўкавыскага паветаў Беластоцкага ваяводства – больш за 97 тыс. км$^2$ [8].

Вызначэнне плошчы тэрыторыі і колькасці насельніцтва Заходняй Беларусі неадназначна разглядалася ў айчыннай гістарыяграфіі. Айчынныя савецкія і сучасныя даследчыкі не ставіліся з неабходнай увагай і дакладнасцю да гэтай праблемы. Адным з падыходаў, якія істотна абмяжоўваюць межы Заходняй Беларусі, з'яўляецца падача тэрыторыі БССР і сучаснай Рэспублікі Беларусь, якая ўваходзіла ў склад міжваеннай Польшчы, 82 тыс. км$^2$. Яскравым прыкладам няўзгодненасці адносна акрэсленых пытанняў

з'яўляецца інфармацыя Энцыклапедыі гісторыі Беларусі, у трэцім томе якой у артыкуле, прысвечаным грамадзянскай вайне і ваеннай інтэрвенцыі, плошча беларускай тэрыторыі, якая адышла да Польшчы, са спасылкай на артыкул па Заходняй Беларусі, пададзена 108 тыс. км$^2$, у самім жа артыкуле пра Заходнюю Беларусь названа плошча ў 113 тыс. км$^2$.

Прааналізаваўшы грунтоўныя напрацоўкі айчынных даследчыкаў 1920-х гадоў, падыходы сучасных беларускіх і польскіх гісторыкаў, пад тэрыторыяй Заходняй Беларусі перыяду 1921–1939 гг. трэба разумець тэрыторыю Віленскага і Навагрудскага ваяводстваў цалкам, Палескага без уліку Сарненскага і Камень-Кашырскага паветаў і 8 названых усходніх паветаў Беластоцкага ваяводства агульнай плошчай 113 тыс. км$^2$, якая складала 29% ад усёй тэрыторыі Польшчы. На ёй у 1921 г. пражывалі 3 372 тыс. чалавек, што складала 12,5% насельніцтва Польшчы. Беларусаў сярод насельніцтва Заходняй Беларусі было 2 371 тыс. чалавек (70,5%). На другім месцы па колькасці былі яўрэі (385 тыс., 11,4%). Польскае насельніцтва налічвала 311 тыс. чалавек (не больш за 10%), літоўскае – да 100 тыс. чалавек.

Аднак, паводле статыстыкі, у 1922–1924 гг. на тэрыторыю Заходняй Беларусі вярнуліся рэпатрыянты, не ўлічаныя перапісам 1921 г., колькасцю 195 тыс чалавек, з іх больш 170 тыс. – беларусы. Такім чынам, агульная колькасць насельніцтва Заходняй Беларусі ў сярэдзіне 1920-х гадоў складала больш 3 567 тыс. чалавек, з іх беларусаў больш чым 2 540 чалавек.

Паводле агульнапольскага перапісу 1931 г. на тэрыторыі Заходняй Беларусі пражываліа 4,6 млн. чалавек: беларусы – 65%, палякі – 15%, яўрэі – 11%, украінцы – 4%, літоўцы – 2,5%, рускія – 2%.

## Тэма 5. Палітыка польскай улады ў дачыненні да Заходняй Беларусі

Прававую аснову для інтэграцыі захопленых зямель і мясцовага насельніцтва з Польшчай склалі міжнародныя абавязкі, ўзятыя ёй паводле Версальскіх пагадненняў, Рыжскага мірнага дагавора, канстытуцый 1921 г. і 1935 г. і ўнутранага заканадаўства. Прадстаўнікам нацыянальных меншасцей, у тым ліку і беларусам, яны гарантавалі нацыянальнае раўнапраўе, свабоду развіцця адукацыі, асветы, культуры, мовы, стварэння таварыстваў. У прыватнасці, Канстытуцыя 1921 г. выключала любую дыскрымінацыю на падставе адметнасцей культуры, веравызнання, мовы, дэкларавала ўсім нацыянальным супольнасцям роўныя правы з палякамі пры адкрыцці за ўласны кошт розных адукацыйных, грамадскіх і іншых устаноў, свабоднае выкарыстанне ў іх нацыянальных моў, рэлігійнай практыкі.

Аднак на практыцы ўзятыя Польшчай абавязкі выконваліся далёка не паўсюдна і не поўнасцю, тэорыя і рэальная практыка ажыццяўлення дзяржаўнай нацыянальнай палітыкі ў міжваеннай Польшчы адрозніваліся. У аснове польскай палітыкі ў дачыненні да заходнебеларускага рэгіёну вызначальнымі былі стратэгічная і тактычная скіраванасць польскіх улад на нацыянальна-культурную асіміляцыю беларусаў і паланізатарскі змест сацыякультурнай дзейнасці польскай супольнасці.

Беларусы вельмі рэдка прымаліся на працу ў адміністрацыю і іншыя дзяржаўныя ўстановы, адміністрацыйныя кадры ў асноўным папаўняліся выхадцамі з польскіх цэнтральных ваяводстваў. Як правіла прысылаліся асобы польскай нацыянальнасці, якія скапраметаваліся або не праявілі сябе на папярэдняй пасадзе. У дзяржаўных установах не дазвалялася карыстацца беларускай мовай. Рабочыя і служачыя беларускай і яўрэйскай нацыянальнасці на чыгунцы, камунальных прадпрыемствах замяняліся палякамі. Нават на дзяржаўных тытунёвых фабрыках у Гродна і Вільні кваліфікаваныя рабочыя яўрэі і беларусы выкідваліся і замяняліся рабочымі-палякамі, ігнаруючы нярэдка прынцып прафесійнай кваліфікаванасці. У органах мясцовага самакіравання – гмінных радах, павятовых сейміках дзейнічалі ў большасці прызначаныя адміністратыўнымі ўладамі асобы польскай нацыянальнасці.

Рэакцыйная палітыка асабліва востра праявілася ў справе школьнай адукацыі. Да ўключэння ў склад Польшчы на анексіраваных землях функцыяніравала больш 350 беларускіх школ, 2 настаўніцкія семінарыі ў Барунах і Свіслачы, 5 агульнаадукацыйных гімназій у Вільні, Радашковічах, Навагрудку, Клецку і Нясвіжы. Урад спыніў фінансавую падтрымку большасці іх, паколькі існаванне беларускіх навучальных устаноў палічыў несумяшчальным з інтарэсамі дзяржавы. Таму да 1924 г. засталося толькі 37 беларускіх школ і 4 гімназіі з абмежаванымі правамі. Пад націскам узброенай барацьбы і нацыянальна-вызваленчага руху беларускага народа польскі сейм вымушаны быў прыняць 31 ліпеня 1924 г. распрацаваны ўрадам У. Грабскага “Закон аб мове і арганізацыі школьнай справы для нацыянальных меншасцяў”. Беларуская дзяржаўная школа магла быць адкрыта ў тых паветах, дзе беларусы складалі 25% насельніцтва, і ў тым выпадку, калі гэтага жадалі не менш 40 бацькоў дзяцей школьнага ўзросту. Каб адкрыць беларускую школу, трэба было падаць школьнаму інспектару дэкларацыі (заявы) з подпісамі, якія напярэдне павінны былі зацвердзіць у гміне стараста і натарыус. Аднак закон замацаваў няроўнасць беларускай і польскай школ. Пры наяўнасці 20 подпісаў за навучанне па-польску адкрывалася двухмоўная (польска-беларуская) школа. Але нават і гэтае заканадаўства ўводзілася ў дзеянне з перашкодамі і не забяспечыла беларусам адукацыю на роднай мове.

Вясной 1927 г. польскі ўрад зрабіў некаторыя захады дзеля зніжэння антыдзяржаўны антыпольскіх настрояў. Міністр веравызнання і публічнай асветы Г. Дабруцкі загадаў увесці вывучэнне беларускай мовы ў польскіх гімазіях з пераважаючым беларускім насельніцтвам, прысвоіў статус публічных школ дзвюм беларускім гімназіям у Вільні і Навагрудку, дазволіў стварыць больш 20 школ з беларускай мовай навучання і звыш 40 двухмоўных, пачалася падрыхтоўка праграм і падручнікаў для школ з беларускай мовай навучання. У перыяд праведзеных муніцыпальных выбараў беларусы атрымалі каля 205 месц у гарадскіх і гмінных радах. Аднак у 1928 г. урад спыніў практыкусаступак у беларускім пытанні. Мясцовая адміністрацыя атрымала ўсе правы самастойна праводзіць нацыяальна-дзяржаўную палітыку. Адкрытыя 18 беларускіх і 32 польска-беларускія школы з цягам часу былі амаль усе закрыты. Так у 1933–1934 навучальным годзе паводле даных афіцыйнай статыстыкі на тэрыторыі Заходняй Беларусі налічвалася ўсяго 16 школ, дзе вывучалася беларуская мова, а ў 1938–1939 г. не засталося ніводнай.

Польскіх школ таксама было недастаткова, каб забяспечыць навучаннем ўсіх дзяцей. У выніку толькі 2/3 насельніцтва Заходняй Беларусі было пісьменным. На верасень 1939 г. 129 тыс. дзяцей школьнага ўзросту заставалася па-за межамі адукацыі. Большасць з іх прыходзілася на беларускамоўную вёску. Высокая плата за навучанне, беднасць і перашкоды з боку ўлад абмяжоўвалі доступ у гімназіі, якія давалі сярэднюю адукацыю. На працягу 1932–1934 гг. Радашковіцкая, Навагрудская і Клецкая беларускія гімназіі былі закрыты, а Віленская была пераўтворана ў польска-беларускі філіял дзяржаўнай гімназіі. У адзінай ў краі ыфшэйшай навучальнай установе – Віленскім універсітэце – доля беларусаў вагалася ў межах 1–2,8% ад агульнай колькасці.

Беларускія газеты і часопісы, у першую чаргу радыкальнага напрамку, часта забараняліся і канфіскоўваліся, штрафаваліся друкарні, у якіх яны выдаваліся, беларускія рэдактары. Калі ў 1927 г. легальна выдаваліся 23 беларускія газеты і часопісы, то ў 1930 – 12, а ў 1939 – 8. Засталіся ў асноўным прапольскія клерыкальныя выданні. Закрываліся нешматлікія культурна-асвентніцкія ўстановы – клубы, бібліятэкі, хаты-чытальні, створаныя ў мінулыя гады намаганнямі беларускай грамадскасці.

Адной з праяваў нацыянальнага ўціску была рэлігійная нецярпімасць польскай улады да праваслаўнай царквы і абмежаванні рэлігійных правоў праваслаўнага насельніцтва Заходняй Беларусі. У 1924 г. урад дамогся аб'яўлення аўтакефаліі праваслаўнай царквы і вывядзення праваслаўя ў Польшчы з-пад юрысдыкцыі Маскоўскага патрыярхату. Праваслаўная царква ў выніку навязвання ёй юрыдычных актаў, якія рэгулявалі яе ўнутранае жыццё, апынулася ў поўнай залежнасці ад адміністрацыйных

улад. У выніку рэвіндыкацыі 1918–1924 гг. ва ўладанне каталіцкай царквы перайшлі каля 120 аб’ектаў праваслаўнай цэрквы. Каталіцкае польскае духавенства станавілася магутным сродкам паланізацыі насельніцтва.

У выніку майскага перавароту 1926 г. у Польшчы пад кіраўніцтвам Ю. Пілсудскага быў устаноўлены аўтарытарны рэжым “санацыі”, які быў накіраваны на істотнае абмежаванне дэмакратычных правоў і свабод, узмацненне палітычных пераследаў, паліцэйскага і адміністрацыйнага свавольства, абмежаванне магчымасцей легальнай дзейнасці беларускіх палітычных і культурных арганізацый і суполак. У сваім імкненні падарваць грамадска-палітычную актыўнасць насельніцтва Заходняй Беларусі польскі ўрад незаконна забараніў стотысячную Беларускую сялянска-работніцкую Грамаду, пасадзіў за краты беларускіх паслоў з вынясеннем ім у час суда над Грамадой у 1928 г. шматгадовых турэмных выракаў.

Яскравым сведчаннем актывізацыі рэпрэсіўнай палітыкі ўрада было стварэнне ў чэрвені 1934 г. лагера “ізаляцыі” ў Бярозе Картузскай, праз які да 1939 г. “прайшло” звыш 10 тыс. чалавек, у асноўным актыўных апанентаў улады ў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне.

Палітыка прававой дыскрымінацыі нацыянальных меншасцяў атрымала сваё лагічнае завяршэнне ў афіцыйнай заяве міністра замежных спраў Ю. Бека на пасяджэнні Лігі Нацый у Жэневе ў верасні 1934 г. пра тое, што Польшча адмаўляецца ад дадзеных раней гарантый аб ахове правоў нацыянальных меншасцей. Гэты чарговы дэмарш санацыйнага рэжыма з’явіўся высновай па актывізацыі дзеянняў у правядзенні масіраванай палітыкі далейшага апалячвання беларускага насельніцтва. Як справядліва сцвярджалася ў цэнтральным органе Беларускага народнага аб’яднання “Беларуская крыніца” ў маі 1936 г., пад сумненне было пастаўлена само паняцце беларускай нацыі і беларускай мовы, як душы беларускага народа. У кастрычніку Міністэрства ўнутраных спраў падрыхтавала праект паскарэння нацыянальнай асіміляцыі беларусаў. Пачаўся ўзмоцнены працэс закрыцця беларускіх нацыянальных арганізацый, у канцы 1938 г. у Польшчы іх фактычна не засталося. У канцы 1936 г. была забаронена дзейнасць ТБШ і БІГіК, у пачатку 1938 г. – Беларускага нацыянальнага камітэта. У выніку ў Польшчы не засталося ніводнай дзейснай палітычнай арганізацыі.

Напярэдадні ІІ сусветнай вайны польскі ўрад зрабіў многа, каб у беларускай грамадскасці на доўгія гады зніклі ўсялякія прапановы супрацоўніцтва з палякамі. У чэрвені 1939 г. беластоцкі ваявода Г. Асташэўскі падаў у Міністэрства ўнутраных спраў дэталёвую запіску па канчатковай паланізацыі “усходніх крэсаў”.

Палітыка Польшчы ў дачыненні да Заходняй Беларусі, накіраваная на асіміляцыю і паланізацыю беларускага насельніцтва, ігнараванне і абмежаванне магчымасцей паўнавартаснай рэалізацыі палітычных і нацыянальна-культурных правоў нацыянальных меншасцей, ўскладнялі становішча заходнебеларускага насельніцтва, былі вызначальным фактарам росту недаверу да польскай улады і незадаволенасці яе мерапрыемствамі.

**Тэма 6. Мясцовыя органы улады і самакіравання**

Насуперак Канстытуцыі 1921 г., якая прадугледжвала стварэнне органаў самакіравання, надзеленых шырокімі паўнамоцтвамі, у Заходняй Беларусі была створана цэнтралізаваная мадэль дзяржавы.

На заходнебеларускіх землях быў уведзены адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел, які існаваў у цэнтральных і заходніх рэгіёнах Польшчы, а менавіта: далучаныя землі былі падзелены на ваяводствы, якія складаліся з паветаў, паветы – з гмін, гміны – з грамад. Згодна з гэтым падзелам былі ўтвораны і мясцовыя органы дзяржаўнага кіравання і самакіравання.

***Ваяводскія адміністрацыйныя і калегіяльныя органы.*** *Адміністрацыйныя органы ваяводства.* У пачатку 1921 г. тэрыторыя Заходняй Беларусі згодна з адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелам Польшчы была падзелена на ваяводствы, за выключэннем Беластоцкага ваяводства, якое было ўтворана 2 жніўня 1919 г.

Згодна з распараджэннем Савета Міністраў ад 21 сакавіка 1921 г. адміністрацыйную ўладу другой інстанцыі ўзначальваў *ваявода*, які прызначаўся, пераводзіўся і звальняўся Начальнікам Дзяржавы паводле прапановы міністра ўнутраных спраў, зацверджанай Саветам Міністраў.

Ваявода на тэрыторыі ваяводства з’яўляўся начальнікам усіх існуючых дзяржаўных адміністрацыйных службаў і органаў, у роўнай ступені і органаў самакіравання. Ён ажыццяўляў агульны нагляд за іх дзейнасцю і сачыў за тым, каб яна адпавядала прадпісанням вышэйстаячых органаў і ўлад. Па выніках сваёй працы ваявода павінен быў рабіць і дасылаць у Варшаву справаздачы, у якіх адлюстроўваў агульнае становішча ў ваяводстве, дзейнасць палітычных партый, стан нацыянальных меншасцей, дзейнасць розных рэлігійных сектаў, павінен быў паказваць палітычны, сацыяльны, рэлігійны аспекты працы ў ваяводстве.

З цягам часу ваявода, як прадстаўнік урада і шэф агульнай адміністрацыі, стаў валодаць амаль неабмежаванымі паўнамоцтвамі на тэрыторыі ваяводства. Намеснікам ваяводы з’яўляўся *віцэ-ваявода.*

Кіраўнікі ўсходніх ваяводстваў належалі да дзяржаўнай і палітычнай эліты краіны. Яны павінны былі праводзіць палітыку дзяржаўных улад на далучаных землях, якая насіла асіміляцыйны характар. Каб супрацьстаяць гэтаму Б. Тарашкевіч, беларускі пасол у Сейме Польшчы, уносіў прапановы аб прызначэнні на пасады ваявод беларусаў, аднак яны не былі прынятыя.

Многія ваяводы акрамя кіраўніцтва аднаго з ваяводстваў Заходняй Беларусі ў розныя часы займалі пасады міністраў, ваяводаў іншых ваяводстваў. Займаючы свае пасады, ваяводы працавалі над складаннем перспектыўных планаў упраўлення на падначаленых ім тэрыторыях. Так, напрыклад, палескі ваявода С. Даўнаровіч выпрацаваў "Нарыс Праграмы дзяржаўных работ і задач на Палессі" і ўручыў яго міністру ўнутраных спраў 1 сакавіка 1923 г. Праграма ўключала ў сябе ўсе характэрныя палажэнні канцэпцыі нацыянальнай асіміляцыі меншасцей. Цэнтральнай тут была прапанова новага адміністрацыйнага падзелу Заходняй Беларусі і Украіны паводле нацыянальнага прынцыпу. "Падзяліць крэсы на ваяводствы патрэбна мэтанакіравана, з улікам гаспадарчых адносін, з аднаго, і этнаграфічна-палітычных – з другога боку. Геаметрычны ці механічны падыход непрымальны". Згодна з Даўнаровічам, усе "ўсходнія крэсы" трэба было падзяліць на тры ваяводствы: Віленскае, Палескае і Валынскае. Усе паветы з беларускім насельніцтвам трэба было аднесці да Віленскага ваяводства, каб Вільня са сваім моцным польскім культурным асяроддзем магла паглынуць і нівеліраваць беларускі рух, які ўжо не будзе пранікаць у суседнія ваяводствы і стане падкантрольным толькі Вільні. У Валынскім ваяводстве прапаноўвалася сканцэнтраваць усё ўкраінскае насельніцтва. Паланізацыю меркавалася пачынаць з Палесся. Палессе з яго нявыражанай нацыянальнай свядомасцю павінна было стаць польскім клінам паміж беларускім і ўкраінскім нацыянальнымі рухамі, каб тыя не маглі аб'яднацца. У Палессі прадугледжвалася не будзіць грамадскага жыцця, акцэнтуючы ўвагу дзяржаўных улад і грамадскасці на гаспадарчых праблемах.

Дзеяннямі польскай адміністрацыі палескі ваявода быў незадаволены, называў яе слабай, адзначаў яе залішні лібералізм, які ствараў ілюзію ўседазволенасці. На яго думку, трэба было для польскай адміністрацыі падабраць людзей палітычна вытрыманых, з найвышэйшай кваліфікацыяй, выдаліць з усіх дзяржаўных пасад непалякаў і напаўпалякаў, звязаных сімпатыяй ці роднаснымі сувязямі з мясцовым насельніцтвам або Расіяй. Патрэбна было паланізаваць судовую сістэму, узмацніць органы адміністрацыйнай улады, у першую чаргу ваяводаў і старастаў, шляхам надання ім рэальнай улады. Даўнаровіч падкрэсліваў важнасць ролі каталіцкага касцёла ў паланізацыі Заходняй Беларусі,

прапаноўваў ураду і кіраўніцтву касцёла супрацоўнічаць і прадаставіць ураду магчымасць уплываць на прызначэнне духавенства на пасады.

Ваяводы пабойваліся абмежавання сваіх паўнамоцтваў, што, на іх думку, справакавала б яшчэ большую анархію «на крэсах». З пункту гледжання мясцовых улад, падтрыманне бяспекі і станоўчае вырашэнне праблем нацыянальных меншасцей магла забяспечыць толькі асіміляцыйная палітыка.

Рост антыдзяржаўных і антыпольскіх настрояў у сярэдзіне 20-х гг. XX ст. выклікаў змены ў прызначэнні асоб на пасады ваяводаў. Назіраецца прызначэнне на пасады ваяводаў генералаў, якія, на думку ўрада, павінны былі забяспечыць спакой на далучаных да Польшчы землях. Так, напрыклад, у 1924 г. на пасаду навагрудскага ваяводы быў прызначаны генерал М. Жэгота-Янушайціс, палескім ваяводам стаў генерал К. Младзяноўскі.

Майскі пераварот 1926 г. прывёў да улады пілсудчыкаў. Пры прызначэнні на пасаду вырашальнымі сталі палітычныя погляды кандыдата, яго адносіны да рэжыма “санацыі”. На першыя месцы пачынаюць выходзіць былыя вайскоўцы. Так, напрыклад, з дзесяці ваяводаў, прызначаных пасля 1926 г. у паўночна-ўсходнія землі, шасцёра былі былымі вайскоўцамі (пяць палкоўнікаў і адзін маёр). Сярод іх былі асобы, якія вызначылі накірунак польскай палітыкі на «крэсах» у 30-я г. XX ст. (палкоўнікі – Я. Крахельскі, В. Костак-Бернацкі, Л. Бацянскі, А. Сакалоўскі). Яны сталі рэалізатарамі так званай праграмы палкоўнікаў, якая прадугледжвала абмежаванне легальнай дзейнасці апазіцыйных ураду арганізацый.

Свае функцыі ваявода выконваў праз *ваяводскае ўпраўленне*, якое з’яўлялася распарадчым органам пры ваяводзе для вырашэння спраў, звязаных са становішчам ваяводы як прадстаўніка ўрада і кіраўніка агульнай адміністрацыі. Прыблізная структура ваяводскага ўпраўлення складалася з наступных аддзелаў: прэзідыяльнага, адміністрацыйнага, самакіравання, харчовага забеспячэння, грамадскага здароўя, сельскай гаспадаркі і ветэрынарыі, прамысловага, працы і сацыяльнай аховы, бюджэтна-гаспадарчага, акруговай дырэкцыі грамадскай працы. Прэзідыяльны, адміністрацыйны і аддзел самакіравання адносіліся да кампетэнцыі МУС.

Аддзелы па меры неабходнасці падзяляліся на аддзяленні, рэфераты. На чале кожнага з аддзелаў стаяў начальнік, прызначаны адпаведным міністэрствам, які з’яўляўся яго штатным супрацоўнікам. Асобна аддзелы не выступалі як самастойныя органы, дзейнічалі выключна ад імя ваяводы.

З 1928 г. усе службовыя асобы ў ваяводскім упраўленні былі са штату МУС, за выключэннем прафесійных служачых, якія прызначаліся са

штатаў адпаведных міністэрстваў для вырашэння спраў, што патрабавалі спецыяльных ведаў.

На ўсе дзяржаўныя пасады ў ваяводствах Заходняй Беларусі прызначаліся толькі палякі і, як правіла, ураджэнцы самой Польшчы, выхадцы з багатых пластоў насельніцтва. Вышэйшыя органы ўлады рэспублікі нарматыўна вызначалі адносіны, якія павінны былі быць наладжаны паміж адміністрацыйнымі органамі ўлады і мясцовым насельніцтвам. Так, напрыклад, у адпаведнасці з цыркулярам МУС ад 28 лютага 1935 г. кожны дзяржаўны служачы па меры магчымасці павінен быў клапаціцца пра жыццё мясцовага насельніцтва, пазбягаць фармальнасцей і менавіта такім спосабам заваёўваць аўтарытэт сярод грамадзян. Гэты цыркуляр быў адрасаваны ваяводам для далейшага распаўсюджвання ў падлеглай ім адміністрацыі. На аснове гэтага нарматыўнага акта быў выдадзены тайны зварот палескага ваяводы В. Костак-Бернацкага да начальнікаў аддзелаў, павятовых старастаў, прэзідэнтаў выдзеленых гарадоў Палескага ваяводства, дзе ваявода загадваў добразычліва ставіцца да людзей, прыязна настроеных да Польскай дзяржавы, а ў адносінах да дыверсантаў і іншых праціўнікаў – строга, пакуль не будзе ўстаноўлена палітычная і сацыяльная дысцыпліна.

Прыняцце Канстытуцыі 1935 г. стала чарговым крокам па ўмацаванню палітычнай пазіцыі ваяводы, як найважнейшай асобы ў ваяводстве, а таксама ў дзяржаўнай структуры. Канстытуцыя вызначыла непасрэдную падначаленасць ваяводы прэм’ер-міністру, мінуючы Міністэрства ўнутраных спраў. Пасля майскага перавароту ў падпарадкаваных ваяводзе структурах усталёўваецца так званая “сістэма вайсковай дысцыпліны”. Рашучых дзеянняў ад ваяводаў патрабаваў і апошні прэм’ер Польшчы Феліцыян Славой Складкоўскі. Сярод ваяводаў, якія кіравалі на “крэсах”, асаблівай рашучасцю выдзяляліся віленскі ваявода Л. Бацянскі і палескі – В. Костак-Бернацкі. Апошні нават у сваім знешнім выглядзе прытрымліваўся моднага тады стылю “а-ля Гітлер”. У мясцовай перыёдыцы быў змешчаны яго фотаздымак з подпісам “гаспадар зямлі палескай”.

Галоўным прынцыпам пабудовы польскай адміністрацыі была жорсткая цэнтралізацыя. Улада была сканцэнтравана ў руках дзяржаўных органаў, пабудаваных паводле строгай іерархіі і падначаленых цэнтральнаму ўраду. У павятовай і ваяводскай адміністрацыі як у палітычнага кіраўніцтва адной з асноўных функцый было забеспячэнне парадку. Выконвалася гэта з дапамогай органаў дзяржаўнай паліцыі, складзеных тэрытарыяльна ў сетку камендатур і пастарункаў.

Палітыка прававой дыскрымінацыі нацыянальных меншасцей атрымала сваё лагічнае завяршэнне ў афіцыйнай заяве міністра замежных спраў Ю. Бека на пасяджэнні Лігі Нацый у Жэневе ў верасні 1934 г., дзе было

падкрэслена, што Польшча адмаўляецца ад дадзеных раней гарантый у галіне аховы правоў нацыянальных меншасцей. Гэты дэмарш санацыйнага рэжыму з'явіўся падставай для актывізацыі дзеянняў у правядзенні масіраванай палітыкі далейшага апалячвання беларускага насельніцтва. У кастрычніку 1936 г. МУС падрыхтавала праект паскарэння асіміляцыі беларусаў. Пачаўся хуткі працэс закрыцця беларускіх нацыянальных арганізацый. У канцы 1938 г. у Польшчы іх фактычна не засталося.

Палітыку Польшчы на тэрыторыі Заходняй Беларусі праводзіў ваяводскі ўрад у асобе ваяводаў. Пра іх стаўленне да мясцовага насельніцтва яскрава сведчыць дакладная запіска беластоцкага ваяводы Генрыха Асташэўскага ў Міністэрства ўнутраных спраў ад 23 чэрвеня 1939 г. "Мы жадаем аднаго і настойліва патрабуем, – заяўляў ваявода, – каб гэтая нацыянальная меншасць (меў на ўвазе беларусаў) думала па-польску – нічога ўзамен не даваць і нічога не рабіць у іншым напрамку".

Такім чынам, ваявода надзяляўся амаль неабмежаванай уладай, як у галіне дзяржаўнай улады, так і ў адносінах да органаў самакіравання. Спецыфікай заходнебеларускіх тэрыторый было тое, што на ўсе вышэйшыя пасады ў ваяводскіх упраўленнях прызначаліся толькі палякі і, як правіла, ураджэнцы самой Польшчы. Мэтай адміністрацыйных улад другой інстанцыі была паланізацыя далучаных земель, асіміляцыя мясцовага насельніцтва.

***Ваяводскія калегіяльныя органы.*** Дзеля функцыянавання дзяржаўнай улады на рэгіянальным узроўні, пры ваяводзе ствaралася *ваяводская рада*. Мэтай дзейнасці рады было выданне рэкамендацый па справах, даручаных ёй ваяводам, а таксама зацвярджэнне пастаноў, вызначаных законам. Старшынёй рады з'яўляўся ваявода або вызначаны ім намеснік, які па меры неабходнасці склікаў поўны склад рады, але не менш як два разы, а пазней адзін раз на год. Ваяводская рада з'яўлялася дарадчым органам пры ваяводзе. Рада па жаданні ваяводы выносіла рэкамендацыі па вырашэнні спраў, якія ўваходзілі ў кампетэнцыю ваяводы і датычыліся ўсяго насельніцтва ваяводства або асобных яго груп.

Ваяводская рада складалася з членаў, выбраных павятовымі сеймікамі і радамі гарадоў, выдзеленых са складу павятовых камунальных саюзаў, па адным ад кожнага сейміка і адпаведна рады. У склад ваяводскай рады мог увайсці кожны жыхар адпаведнага павета ці горада, які мог быць членам гміннай або гарадской рады, за выключэннем дзеючых супрацоўнікаў дзяржаўнай адміністрацыі і органаў самакіравання. Гэтае выключэнне не распаўсюджвалася на служачых цэнтральнай дзяржаўнай адміністрацыі. Мандат члена ваяводскай рады дзейнічаў на працягу тэрміну дзейнасці органа, які яго выбраў.

Для аператыўнага вырашэння спраў пры ваяводзе ствараўся *ваяводскі аддзел*, які з'яўляўся дарадчым органам пры ваяводзе, яго рашэнні насілі рэкамендацыйны характар. У выпадку, калі ваяводскі аддзел не быў арганізаваны або яго скліканне ў хуткім часе было немагчыма, ваявода прымаў рашэнні асабіста. Міністр унутраных спраў датэрмінова мог распусціць ваяводскую раду і аддзел, і прызначыць новыя выбары. Пасля роспуску ваяводскай рады справы, якія адносіліся да яе кампетэнцыі, вырашаў ваяводскі аддзел, а пры яго адсутнасці – асабіста ваявода.

Створаныя замест органаў самакіравання ваяводскія калегіяльныя органы фактычна без дазволу ваяводы нічога не вырашалі, што пацвярджалася старшынствам у іх ваяводы і намесніцтвам віцэ-ваяводы, да асобы якога таксама пільна прыглядаліся ў Варшаве. Практычна самастойная дзейнасць ваяводскіх калегіяльных органаў зводзілася да ажыццяўлення нагляду за органамі самакіравання. Існаванне такіх ваяводскіх органаў насіла дэкаратыўны характар. Дзейнасць органаў ваяводскага самакіравання, якія маглі быць створаны згодна з Канстытуцыяй 1921 г., тэарэтычна магла прадугледжваць аўтаномію, стварэнне якой польскія ўлады на тэрыторыі ўсходніх ваяводстваў не хацелі дапусціць. Польскі ўрад у любой аўтаноміі бачыў узмацненне сепаратысцкіх рухаў і імкненне процідзейнічаць асіміляцыйнай палітыцы.

***Павятовыя органы дзяржаўнага кіравання і самакіравання.*** Ваяводствы ў 1920–1930-я гг. падзяляліся на паветы (першапачаткова адпавядалі расійскім уездам). Павятовая адміністрацыя называлася *старостам.* На чале яе стаяў *стараста (староста)*, які з'яўляўся прадстаўніком дзяржаўнай улады ў павеце. Стараста і яго намеснік прызначаліся міністрам унутраных спраў Польшчы. Упраўленне на падначаленай яму тэрыторыі стараста ажыццяўляў пры дапамозе служачых, прызначаных адпаведнымі міністрамі. Да кампетэнцыі старасты адносіліся наступныя справы: у памежных паветах клопаты аб дзяржаўнай мяжы; вайсковыя справы (мабілізацыя, наборы і г.д.); улік насельніцтва (справы грамадзянства, прыналежнасці, перамяшчэнне людзей і г.д.); справы саюзаў і аб'яднанняў, грамадскай бяспекі; нагляд за прэсай і відовішчамі; справы веравызнання; сацыяльная апека; ахова працы; усе справы дзяржаўнай адміністрацыі, якія не адносіліся да кампетэнцыі іншых органаў і органаў самакіравання і інш.

Стараста з'яўляўся вышэйстаячай уладнай асобай для кіраўніцтваў гмін і мястэчак. Ён павінен быў клапаціцца аб стане бяспекі ў даручаным яму павеце, у сувязі з чым яму падпарадкоўваліся органы дзяржаўнай павятовай паліцыі ў галіне арганізацыі бяспекі. Стараста, як і ваявода на тэрыторыі ваяводства, валодаў шырокімі паўнамоцтвамі і амаль неабмежаванай уладай.

Першапачаткова павет падзяляўся на *раёны* колькасцю ад 3 да 6, якія ахоплівалі ад 3 да 5 гмін на чале з *начальнікам раёна*, скасаваныя ў 1922 г.

Гарады з насельніцтвам звыш за 75 000 жыхароў, а таксама гарады з меншай колькасцю насельніцтва, вызначаныя пастановай Савета Міністраў, утваралі *гарадскія паветы*. На чале гарадскога павета стаяў *гарадскі староста*, прызначаны міністрам унутраных спраў. Але міністр мог перадаць уладу гарадскога старасты павятоваму старасце, на тэрыторыі якога знаходзіўся горад. Савет Міністраў мог перадаць паўнамоцтвы гарадскога старасты часткова ці поўнасцю прэзідэнту горада. На тэрыторыі Заходняй Беларусі толькі горад Вільня ўтвараў самастойны гарадскі павет, на чале якога стаяў гарадскі староста.

*Павятовае староства* ўключала наступныя рэфераты: агульны, арганізацыйны, грамадскай бяспекі, адміністрацыйны, крымінальна-адміністрацыйны, вайсковы, аховы здароўя, сацыяльнай аховы, будаўнічы, земляробства і зямельных рэформаў, ветэрынарны, аховы лесу, меліярацыйны, інвалідаў вайны. Па меры неабходнасці рэфераты падзяляліся на аддзяленні. Колькасць рэфератаў была рознай нават на тэрыторыі аднаго ваяводства.

У павятовай адміністрацыі большасць складалі выхадцы з Цэнтральнай Польшчы, якія не лічылі беларусаў самастойнай нацыяй. Беларусы на практыцы не маглі займаць кіруючыя пасады і нават працаваць на дзяржаўнай службе. Згодна з пунктам сакрэтнага загаду 1922 г., усе дзяржаўныя чыноўнікі няпольскай нацыянальнасці падлягалі звальненню. Гэты загад выклікаў здзіўленне і нават незадавальненне некаторых кіраўнікоў дзяржаўных устаноў, бо ім прыйшлося звальняць адказных і добрасумленных работнікаў.

Адной з праблем арганізацыі павятовых староств стала моўнае пытанне. Нават у 1927 г. палескі ваявода канстатаваў, што недахопам працы павятовай адміністрацыі з'яўляецца няведанне яе супрацоўнікамі мясцовай мовы, што робіць немагчымым нармальныя стасункі ўлады з мясцовым насельніцтвам. З другога боку, здараліся выпадкі намагання прадухілення практыкі размовы служачых на рускай мове з мясцовым насельніцтвам. Падкрэслівалася, што згодна з законам аб мовах ад 1924 г. усе кантакты з мясцовым насельніцтвам павінны адбывацца на дзяржаўнай мове, а руская мова не з'яўляецца матчынай для мясцовага насельніцтва.

Для правядзення агульнадзяржаўных мерапрыемстваў польскай адміністрацыі неабходна было заручыцца падтрымкай мясцовага насельніцтва. Перад супрацоўнікамі староств стаяла задача ўстанавіць прыязныя адносіны з мясцовым насельніцтвам. Так, на з'ездзе старастаў Навагрудскага ваяводства, які адбыўся 4–5 лістапада 1924 г., ваявода М. Жэгота-Янушкайціс заўважыў, што павятовыя старасты павінны

зрабіць усё неабходнае, каб устанавіць добразычлівыя адносіны з мясцовымі людзьмі. Для гэтага неабходна надзяляць іх зямлёй і не дапускаць бальшавіцкай агітацыі. Аднак, зазначыў ваявода, поўнасцю на мясцовае жыхарства абапірацца нельга, асноўную падтрымку патрэбна шукаць сярод асаднікаў, якіх, па яго словах, на той момант у Навагрудскім ваяводстве было каля 1 200 чалавек. Асаднікі павінны былі ўздзейнічаць на беларускае асяроддзе з мэтай яго асіміляцыі, быць апорай мясцовай адміністрацыі і тым фактарам, які тармазіў бы антыдзяржаўныя выступленні. Таму асаднікі найчасцей выконвалі абавязкі солтысаў, войтаў, лаўнікаў (засядацеляў), станавіліся ніжэйшай прыступкай улады.

Польскія чыноўнікі часта адзначалі непрыхільнае стаўленне беларускага і яўрэйскага насельніцтва да польскіх улад, звярталі ўвагу на варожае стаўленне насельніцтва, за выключэннем палякаў, да адміністрацыйных улад. Улады таксама паводзілі сябе неадназначна. Так, напрыклад, дэпутат сейма Павел Валошын у час дыскусіі над уставай аб чужаземцах адзначаў “пануючую ў той час на так званых «крэсах» сістэму найпаўнейшай самаволі ўсялякага роду старастаў і гэтаму падобных адміністрацыйных кацыкаў”.

Дзеянні лакальных польскіх улад часта зводзілі да нуля многія ўрадавыя планы. Адна з галоўных прычын – пагардлівае стаўленне мясцовай дзяржаўнай адміністрацыі да беларускага насельніцтва. Выкананне нацыянальнай і канфесійнай палітыкі чыноўнікі (павятовыя старасты і ніжэй па чыноўніцкай лесвіцы) ажыццяўлялі не ў рэчышчы дзяржаўных дырэктыў і распараджэнняў, а згодна са сваім разуменнем сітуацыі на месцах. Абураны такімі выпадкамі палескі ваявода Я. Крахельскі ў 1930 г. крытыкаваў падначаленых яму павятовых старастаў за негатыўнае стаўленне да беларусаў: “Мы не можам стаяць на пазіцыі нацыянальнага нігілізму ў адносінах да некалькіх мільёнаў чалавек, тады мы будзем абуджаць сепаратызм і такая палітыка прывядзе да заняпаду Польшчы як вялікай дзяржавы”.

Польскае заканадаўства надзяліла павятовага старасту амаль неабмежаванай уладай. Быў створаны фактычны механізм кантролю павятовага старасты за ўсімі галінамі жыцця насельніцтва, органамі самакіравання на тэрыторыі павета, якія поўнасцю залежалі ад адміністрацыйных улад. На тэрыторыі Заходняй Беларусі на пасады павятовых старастаў, а таксама на адказныя пасады ў староствы прызначаліся ўраджэнцы Цэнтральнай Польшчы, якія не ведалі мясцовых асаблівасцей, што значна ўскладняла працу павятовай адміністрацыі, а часам выклікала варожыя адносіны да іх мясцовага насельніцтва. Камплектаванне павятовых староставаў выхадцамі з карэнных раёнаў Польшчы павінна было спрыяць хутчэйшай паланізацыі далучаных зямель.

*Павятовае самакіраванне.* На момант уключэння тэрыторыі Заходняй Беларусі ў склад Польшчы на гэтых землях не існавала органаў павятовага самакіравання, поўная арганізацыя якіх апынулася ў руках польскай улады. Кожны адміністрацыйны павет утвараў *камунальны саюз,* які з’яўляўся юрыдычнай асобай. Так, напрыклад, на тэрыторыі Палескага ваяводства ў 1929 г. было створана 10 павятовых камунальных саюзаў, Віленскага – 8, Навагрудскага ваяводства – 7 (на 1936 г. – 8). Згодна са Службовым статутам Навагрудскага камунальнага саюза 1935 г., служачым саюза мог быць грамадзянін Польшчы, здольны маральна і фізічна да гэтай працы, які валодаў польскай мовай, адпаведным узроўнем адукацыі і не меў крымінальнага мінулага. У кампетэнцыю павятовых камунальных саюзаў уваходзілі справы гаспадаркі, аховы здароўя, культурных інтарэсаў павета, а менавіта: кіраўніцтва ўласнай маёмасцю; будаўніцтва і ўтрыманне дарог, іншых сродкаў камунікацый; ахова і падтрымка сельскай гаспадаркі, гандлю і прамысловасці; ахова грамадскага здароўя, стварэнне і ўтрыманне бальніц і санітарных устаноў; грамадская дабрачыннасць; падтрымка асветы; павышэнне грамадскай культуры.

Органамі павятовага камунальнага саюза з’яўляліся *павятовы сеймік, павятовы аддзел, павятовы стараста.* У гарадскіх паветах – адпаведна *гарадская рада і магістрат.* Першапачаткова ў *павятовы сеймік* уваходзілі па два дэлегаты ад кожнага горада і павятовай гміны. У адпаведнасці з законам 1921 г., гарады з насельніцтвам звыш за 10 тыс. жыхароў выбіралі трох, ад 15 да 20 тыс. – 4, звыш за 20 тыс. – 5 дэлегатаў. У сельскіх гмінах дэлегатаў выбірала гмінная рада, у гарадскіх – гарадская рада на агульным пасяджэнні з магістратам пад кіраўніцтвам бурмістра. Членам павятовага сейміка магла быць выбрана асоба з адпаведнай выбарчай калегіі, якая ўмела чытаць па-польску

З 1933 г. распарадчым і кантралюючым органам у павятовых саюзах самакіравання замест сейміка стала *павятовая рада.* Асобы, якія ўваходзілі ў склад павятовай рады, сталі называцца раднымі. У склад павятовай рады ўваходзілі радныя і члены павятовага аддзела. Павятовая рада выбіралася на 5 гадоў. *Радных павятовай рады* выбірала выбарчая калегія, якая складалася з радных і членаў праўлення сельскіх гмін і гарадоў, не выдзеленых са складу павятовага саюза самакіравання. Згодна з гэтым законам, кандыдат на пасаду павятовага раднага павінен быў валодаць пісьмовай і вуснай польскай мовай. Аднак валоданне польскай мовай як умова выбарнасці на гэтую пасаду была адкладзена распараджэннем міністра ўнутраных спраў на тэрыторыі ўсходніх ваяводстваў на 5 гадоў. З гэтага можна зрабіць вывад, што моўны цэнз з’яўляўся значным абмежаваннем для прадстаўнікоў мясцовага насельніцтва, што вымусіла

польскія ўлады яго адтэрмінаваць. З 1938 г. выбраным на пасаду раднага мог быць кожны, хто пражываў на тэрыторыі павятовага саюза самакіравання, меў права быць выбраным гарадскім або гмінным радным, а таксама валодаў пісьмовай і вуснай польскай мовай. Выбары ў павятовыя рады прызначаў ваявода.

*Павятовы сеймік* з'яўляўся прадстаўніком павятовага камунальнага саюза. У справах, якія належалі да галіны дзеяння павятовага камунальнага саюза, сеймік выступаў распарадчым (пастанаўляючым) і кантралюючым органам. У кампетэнцыю павятовага сейміка ўваходзілі і патрабавалі яго вырашэння справы зацвярджэння павятовага бюджэту і гадавых разлікаў; справы пазыкі; падаткаў і выплат, дадаткаў да дзяржаўных і гмінных падаткаў, а таксама ўстанаўленне манаполій; выбар членаў павятовага аддзела і выключэнне членаў павятовага сейміка згодна з заканадаўствам і інш. Пасяджэнні павятовага сейміка склікаў старшыня не менш аднаго разу на квартал, сеймік мог быць скліканы па жаданні чацвёртай часткі сваіх членаў. Заканадаўства прадугледжвала налажэнне штрафу на члена сейміка, які без уважлівай прычыны не наведваў пасяджэнні. За адсутнасць без уважлівай прычыны на трох чарговых пасяджэннях член павятовага сейміка страчваў свой мандат.

Арганізацыя выбараў у павятовыя сеймікі Палескага ваяводства праводзілася з сакавіка 1923 г. і павінна была завяршыцца да 1 верасня гэтага ж года, з 10 паветаў ваяводства выключэнне павінен быў скласці толькі Столінскі павет, дзе яшчэ адбывалася арганізацыя староства. Да ліпеня 1923 г. органы павятовага самакіравання былі створаны ў Брэсцкім, Пружанскім, Кобрынскім, Пінскім, Сарнецкім паветах Палескага ваяводства. У 5 паветах вынікі выбараў былі наступныя: адбылося выбранне 178 дэлегатаў, сярод якіх 89 палякаў (50%), 76 палешукоў (42,7%), 2 беларусы і 3 украінцы (2,7%), 8 яўрэяў (4,5%). Вышэйшую адукацыю мелі 7,9%, сярэднюю – 9,2%, 4–6 класаў – 11,8%, першапачатковую – 71%. Паводле сацыяльнай прыналежнасці прыкладна 92% складалі сяляне, паводле партыйнай – каля 90% абраных лічылі сябе беспартыйнымі. На гэты час 4 павятовыя сеймікі ў Пружанах, Кобрыне, Брэсце і Пінску ўжо выбралі павятовыя аддзелы. Так, напрыклад, у склад павятовага аддзела ў Кобрыне ўвайшлі 4 палякі і 2 палешукі, у Брэсце – 3 каталікі і 3 праваслаўныя па веравызнанні. Першыя пасяджэнні павятовых сеймікаў праводзіліся ва ўрачыстай абстаноўцы, на іх прысутнічалі ваявода, начальнік аддзела самакіравання, рэферэнты, старасты, запрошаныя з іншых паветаў. Перад першым інаугурацыйным пасяджэннем усе абавязкова прысутнічалі на ўрачыстым набажэнстве ў касцёле.

Эфектыўнасць дзейнасці органаў павятовага самакіравання залежыла ад фінансавага становішча павятовых камунальных саюзаў, прынятых імі

бюджэтаў. Так, дэфіцыт бюджэту Віленска-Трокскага павятовага сейміка ў 1925 г. складаў 41,4% ад яго агульнай сумы, Свянцянскага – 28,5%, Ашмянскага – 50,2%, Дзісенскага – 40,8%, Дунілавіцкага – 42%, Вілейскага – 39%, Браслаўскага – 20%. Такі бюджэтны стан прывёў да адмаўлення ад правядзення многіх мерапрыемстваў, недафінансавання некаторых праектаў.

Чарговыя выбары ў павятовыя сеймікі праходзілі ў 1927 г. Палітыка, якую праводзілі польскія ўлады, садзейнічала распаўсюджванню сярод насельніцтва левых настрояў. Так, у Гродзенскі павятовы сеймік 27 радных з 40 былі выбраны па спісе рабоча-сялянскага блока. Такога кшталту вынікі замаруджвалі падпарадкаванне органаў самакіравання ўраду. Польскія ўлады рабілі значныя намаганні, каб склад павятовых органаў самакіравання стаў прапольскім. Ужо ў 1934 г. структура павятовых радаў Віленскага ваяводства была наступнай: Браслаўскі павет – 30 радных, сярод якіх 27 палякаў, 3 беларусы, з іх 26 каталікоў, 3 праваслаўныя; Дзісенскі павет – 32 радных, у тым ліку 29 палякаў, 3 яўрэі, з іх 26 каталікоў; Маладзечанскі – 22 радныя, сярод якіх 18 палякаў, 3 беларусы, рускі, з іх 18 каталікоў, 4 праваслаўныя; Ашмянскі павет – 20 радных, у тым ліку 18 палякаў, 2 яўрэі, з іх 18 каталікоў; Пастаўскі павет – 22 радныя, сярод якіх 21 паляк, беларус, з іх 18 каталікоў, 3 праваслаўныя; Свянцянскі – 34 радныя, у тым ліку 27 палякаў, беларус, 2 літоўцы, 2 яўрэі, з іх 30 каталікоў, праваслаўны; Віленскі – 26 радных, сярод якіх 22 палякі, 3 беларусы, яўрэй, з іх 21 каталік, 3 праваслаўныя; Віленска-Трокскі – 34 радныя, з іх 31 паляк, 3 літоўцы, усе каталікі

Нягледзячы на абяцанні дапускаць беларусаў на пасады ў органы дзяржаўнай адміністрацыі або самакіравання, іх грамадска-палітычныя правы абмяжоўваліся з-за падазрэння ў палітычнай ненадзейнасці.

*Павятовы аддзел* пад кіраўніцтвам старшыні павятовага сейміка або яго намесніка складаўся з 6 членаў, жыхароў павета, якія выбіраліся на трохгадовы тэрмін сеймікам простай большасцю галасоў і валодалі пасіўным выбарчым правам у гарадскія ці гмінныя рады.

З 1933 г. у склад павятовага аддзела мог быць выбраны толькі грамадзянін Польшчы, які, акрамя валодання выбарчымі правамі, ведаў польскую мову і меў практычныя веды, вызначаныя распараджэннем міністра ўнутраных спраў, а тэрмін паўнамоцтваў павятовага аддзела паводле новага закона павялічваўся да 5 гадоў адпаведна дзейнасці павятовай рады. Пасяджэнні павятовага аддзела склікаў старшыня не менш аднаго разу на месяц. Аддзел мог быць скліканы па жаданні двух яго членаў. У кампетэнцыю павятовага аддзела ўваходзіла наступнае: падрыхтоўка спраў на пасяджэнні сейміка, рашэнне спраў, якія не патрабавалі зацвярджэння сейміка, вызначэнне спосабу выканання

пастаноў сейміка; выкананне абавязкаў, вызначаных дзяржаўнай уладай і законамі; ажыццяўленне дысцыплінарнай ўлады над супрацоўнікамі павятовага камунальнага саюза. Павятовы аддзел ажыццяўляў нагляд за дзейнасцю органаў самакіравання сельскіх і гарадскіх гмін, не выдзеленых са складу павятовага камунальнага саюза. Павятоваму падпарадкоўваліся бурмістры, магістрацкія лаўнікі, войты і солтысы.

Старшынёй павятовага аддзела з'яўляўся *павятовы староста*. Ён рыхтаваў прапановы павятоваму аддзелу, кіраваў пасяджэннямі павятовага сейміка і аддзела, выконваў іх пастановы, вырашаў бягучыя справы і падпісваў ад імя павятовага камунальнага саюза дакументы. Старшыня фактычна з'яўляўся выканаўчым органам улады камунальнага саюза. Ён паводле прапановы павятовага аддзела прымаў служачых на працу ў камунальны саюз. З 1933 г. старшыня павятовага аддзела атрымоўваў дадатковы заробак са сродкаў павятовага саюза самакіравання, а яго намеснік (намеснік павятовага старасты) – чацвёртую частку ад заробку старшыні. Польскія ўлады вельмі пільна ставіліся да асабовага складу павятовых аддзелаў. Так, напрыклад, у павятовыя аддзелы Браслаўскага павета Віленскага ваяводства ўваходзіла 6 палякаў, усе яны былі па веравызнанні каталікамі; Дзісенскага павета – 6 палякаў, з іх 5 каталікоў; Маладзечанскі – 4 палякі, беларус, рускі, з іх 4 каталікі, 2 праваслаўныя; Ашмянскага павета – 6 палякаў, з іх 5 каталікоў; Пастаўскага павета – 6 палякаў, усе каталікі; Свянцянскага – 6 палякаў, усе каталікі, Віленскага – 6 палякаў, з іх 5 каталікоў; Віленска-Трокскага – 6 палякаў, усе каталікі.

Старшынство павятовага старасты ў выканаўчых органах павятовага самакіравання, з аднаго боку, ліквідавала прабел у адносінах паміж адміністрацыйнымі органамі ўлады і самакіраваннем, а з другога – абмяжоўвала дзейнасць апошніх. З 1933 г. быў узмоцнены нагляд дзяржавы за органамі самакіравання. Наглядальныя органы мелі права зацвярджэння пастаноў органаў самакіравання, зацвярджэння выбараў прадстаўнікоў гмін і гарадоў, роспуску органаў самакіравання. Усё гэта ў далейшым выклікала паступовае больш глыбокае падпарадкаванне самакіравання органам агульнай адміністрацыі, адначасова аслабляла ўплыў грамадзян на склад і дзейнасць органаў самакіравання.

Органы павятовага самакіравання не здолелі стаць актыўнымі рэалізатарамі палітыкі самакіравання на працягу існавання міжваеннай Польскай рэспублікі на заходнебеларускіх землях. З аднаго боку, гэта было звязана з адсутнасцю вопыту ў галіне самакіравання такога ўзроўню, а з другога – кіраўніцтва павятовым самакіраваннем поўнасцю знаходзілася ў руках павятовага старасты, які зацвярджаў або адхіляў рашэнні органаў самакіравання. Польскія ўлады ажыццяўлялі ўсебаковы

кантроль і без таго значна абмежаванай дзейнасці органаў павятовага самакіравання. Гэта выяўлялася як праз адміністрацыйнае старшынства, так і праз тыя змены, якія ўносіліся ў заканадаўства адносна кампетэнцыі органаў самакіравання. Перавага пры асабовым фарміраванні органаў павятовага самакіравання аддавалася палякам па нацыянальнасці, каталікам па веравызнанні, асобам, якія былі лаяльна настроены да ўлад. Эпізадычны характар пасяджэнняў органаў павятовага самакіравання сведчыў аб незацікаўленасці дзяржаўнай улады ў іх існаванні на заходнебеларускіх землях, і рашэнні імі важных спраў.

***Гарадское самакіраванне.*** Распараджэннем Генеральнага камісара ўсходніх зямель ад 27 чэрвеня 1919 г. на тэрыторыю Заходняй Беларусі, занятую польскімі войскамі, распаўсюджвалася часовае гарадское палажэнне, паводле якога кіраўніцтва гарадскімі справамі належала *магістрату* ў складзе *бурмістра, яго намесніка і лаўнікаў*. Магістрат першапачаткова прызначаўся дзяржаўнай уладай. У адпаведнасці з гэтым распараджэннем ствараліся магістраты ў гарадах: Брэсце, Ваўкавыску, Кобрыне, Лідзе, Навагрудку, Новай Вілейцы, Ашмянах, Пінску, Пружанах, Слоніме, Свянцянах.

*Гарадская гміна* з’яўлялася самакіруючай адзінкай і юрыдычнай асобай. Да галіны дзеяння гарадской гміны належалі справы, якія датычылі матэрыяльнага дабрабыту, адукацыі, культуры і здароўя яе жыхароў, а таксама справы, даручаныя ёй згодна з адміністрацыйнымі законамі і распараджэннямі. Органамі ўлады ў гарадской гміне з’яўляліся *гарадская рада і магістрат*. *Гарадская рада* была прадстаўнічым органам улады, які зацвярджаў рашэнні і кантраляваў выкананне магістрата.

*Магістрат* з’яўляўся кіруючым і выканаўчым органам улады ў гміне. Членамі магістрата ў Вільні, Гродне і Брэсце-Літоўскім былі *прэзідэнт, віцэ-прэзідэнт*, а таксама *лаўнікі*, у іншых гарадах – *бурмістр, яго намеснік і лаўнікі*. Колькасць лаўнікаў вызначала гарадская рада, аднак гэтая колькасць не павінна была перавышаць 10% ад агульнай колькасці радных, у выпадку перавышэння гэтага працэнта патрабавалася зацвярджэнне наглядальнай уладай. Магістрат, як і гарадская рада да змяненняў 1933 г., выбіраўся на тры гады. Адным з патрабаванняў да кандыдата на пасаду ў магістрат было веданне польскай мовы. Вынікі па выбарах членаў прэзідыума магістрата зацвярджаліся павятовым старастам, ваяводам або міністрам унутраных спраў. У выпадку незацвярджэння праводзіліся новыя выбары. Пасля паўторнага незацвярджэння адміністрацыйная ўлада прызначала на пасаду члена прэзідыума, які працаваў да правядзення новых выбараў і зацвярджэння іх вынікаў.

У *кампетэнцыю магістрата* ўваходзіла выкананне пастаноў гарадской рады, кіраўніцтва гарадской маёмасцю і яе інвентарызацыя; кіраўніцтва гарадскімі прадпрыемствамі, якія непасрэдна падпарадкоўваліся магістрату, і выкананне кантролю за прыватнымі; складанне гарадскога бюджэту і прадстаўленне яго ў вызначаны тэрмін гарадской радзе; распараджэнне даходамі і выдаткамі гміны, размеркаванне гмінных падаткаў і павіннасцей згодна з абавязковымі законамі, распараджэннямі і пастановамі гарадской рады; юрыдычнае прадстаўленне гміны; справаздачы перад гарадской радай аб сваёй дзейнасці, выкананні бюджэту, аб стане гміннай маёмасці і ўстаноў; прадстаўленне павятовому старасце, ваяводзе і гарадской радзе прапаноў па вядзенні гміннай гаспадаркі; выкананне абавязкаў, даручаных дзяржаўнай уладай і законамі. Магістрат па меры неабходнасці падзяляўся на аддзелы, якія ў сваю чаргу складаліся з рэфератаў. Так, асноўнымі аддзеламі Брэсцкага магістрата былі адміністрацыйны, падатковы, фінансавы, харчовы, будаўніча-тэхнічны, рэгістрацыйна-статыстычны, аддзел адукацыі і сацыяльнага забеспячэння, санітарны. Структура гарадскіх магістратаў у многім залежала ад адміністрацыйных улад.

Пры вызначэнні кампетэнцыі органаў самакіравання перавага аддавалася выканаўчым органам. Гэта выяўлялася ў магчымасці магістрата аспрэчваць пастановы гарадской рады, члены магістрата адначасова з'яўляліся і членамі гарадской рады, што давала ім магчымасць пашырыць уплыў на раду. Не менш значнай была незалежнасць членаў магістрата, а таксама прэзідэнта ад рады. Напрыклад, прэзідэнта горада мог вызваліць ад займаемай пасады толькі прэзідэнт Рэчы Паспалітай.

У 1938 г. у Заходняй Беларусі існавалі наступныя магістраты: Ваўкавыскі павет Беластоцкага ваяводства – Ваўкавыск, Свіслач; Гродзенскі павет – Гродна, Друскенікі, Індура, Крынкі, Скідзель; Віленскае ваяводства – Браслаў, Глыбокае, Дзісна, Докшыцы, Маладзечна, Радашковічы, Ракаў, Ашмяны, Смаргонь, Паставы; Навагрудскае ваяводства – Баранавічы, Ляхавічы, Валожын, Ліда, Клецк, Нясвіж, Навагрудак, Дзятлава (Здзенталь), Слонім, Стаўбцы, Шчучын; Палескае ваяводства: Брэст, Высока-Літоўск, Камянец, Драгічын, Кобрын, Косава, Ружаны, Лунінец, Пінск, Бяроза-Картузская, Пружаны, Столін.

*Бурмістр* з'яўляўся кіраўніком магістрата, ён таксама і прадстаўляў яго. У надзвычайных выпадках бурмістр асабіста вырашаў справы, якія ўваходзілі ў кампетэнцыю магістрата. Прызначэнне на пасады бурмістраў, якія не з'яўляліся палякамі па нацыянальнасці, было досыць рэдкай з'явай у пачатку 1920-х гг. Падбор кадраў у магістраты не заўсёды адпавядаў вынікам выбараў. Напрыклад, у Свянцянах, дзе палякі і яўрэі атрымалі па 5 мандатаў радных, бурмістрам і намеснікам бурмістра сталі палякі, і

толькі дзве пасады лаўнікаў былі размеркаваны паміж яўрэямі і рускімі (стараабрадцамі). Аднак у Ашмянскай гарадской радзе, дзе раднымі былі 7 палякаў і 5 яўрэяў, намеснікам бурмістра быў абраны яўрэй. Роля адміністрацыйных улад пры фарміраванні магістратаў была значнай. Так, напрыклад, у 1923 г. нясвіжскі стараста загадаў бурмістру Клецка звольніць з пасады некаторых членаў магістрата і прызначыць на іх месцы вызначаных ім асоб. У 1927 г. гродзенскі павятовы стараста звярнуўся да магістрата мястэчка Індура з паведамленнем, што не зацвярджае асобу, выбраную радай на пасаду бурмістра і папярэджвае, што калі пры паўторным галасаванні не будзе выбраны і адпаведна зацверджаны прапанаваны ім бурмістр, то згодна з законам стараста прызначыць яго самастойна. У 1927 г. індурскі магістрат складаўся з бурмістра, які быў палякам і каталіком па веравызнанні; віцэ-бурмістра – яўрэя; лаўнікаў – паляка-каталіка і яўрэя; усе яны былі беспартыйнымі.

Згодна з адміністрацыйным падзелам на тэрыторыі Гродзенскага павета Беластоцкага ваяводства было 5 гарадскіх гмін, у Ваўкавыскім павеце таго ж ваяводства – 2 гміны, у Навагрудскім ваяводстве – 10, Палескім – 14, Віленскім – 15 гмін, горад Вільня ўтвараў асобны гарадскі павет.

Планавалася, што першыя выбраныя гарадскія рады, калі не будзе заканадаўчых змяненняў, будуць працаваць да 1 ліпеня 1922 г. Аднак у 1922 г. было выдадзена распараджэнне міністра ўнутраных спраў, якое датычыла адтэрміноўкі працы органаў самакіравання, абраных на тэрыторыі «былой расійскай акупацыі» ў першыя гады польскага панавання. Згодна з гэтым нарматыўным актам органы гарадскога самакіравання павінны былі дзейнічаць да абвяшчэння ўрадам часу правядзення новых выбараў. Гарадскія рады, якія ствараліся ў 1919–1920-хгг., у пераважнай большасці дзейнічалі аж да 1927 г.

Арганізацыя органаў гарадскога самакіравання знаходзілася пад пільным наглядам адміністрацыйных улад. Так, старасты павінны былі падаваць звесткі ў ваяводскае ўпраўленне пра абраныя і прызначаныя гарадскія рады. Згодна з другім цыркулярам таго ж ваяводы старасты павінны былі прадстаўляць ваяводзе штомесячныя справаздачы аб дзейнасці органаў гарадскога самакіравання.

Згодна з законам 1933 г., кіруючым і выканаўчым органам гарадской гміны замест існуючага *магістрата* стала *гарадское ўпраўленне.* Тэрмін паўнамоцтваў гарадскіх органаў павялічыўся з 3 да 5 гадоў. Выбіраць гарадскія органы меў права кожны грамадзянін Польшчы, які дасягнуў 24-гадовага ўзросту, не менш як адзін год пражываў на тэрыторыі саюза самакіравання, дзе праходзілі выбары, а таксама валодаў выбарчым правам у сейм. Абранай магла быць асоба, якая на момант выбараў дасягнула 30-гадовага ўзросту. Новы закон павялічыў узроставы цэнз і тым самым

адлучыў значную колькасць моладзі ад дзейнасці органаў гарадскога самакіравання, і так ужо значна абмежаванай.

Польскія ўлады вельмі часта карысталіся правам роспуску гарадскіх радаў. Напрыклад, першая Брэсцкая гарадская рада, якая існавала 6 гадоў 9 месяцаў, была распушчана 25 красавіка 1926 г. міністрам унутраных спраў з матывіроўкай няздольнасці прыняцця рашэнняў кваліфікаванай большасцю. Другая Брэсцкая гарадская рада была распушчана 26 красавіка 1928 г. з матывіроўкай як "няздольная да плённай працы на карысць горада". Афіцыйна падставамі для роспуску рады сталі: не выкананне радай ад пачатку сваёй дзейнасці належным чынам ускладзеных на яе абавязкаў (не здолела своечасова выбраць членаў прэзідыума магістрата, у выніку чаго яны былі прызначаны ваяводам); змарнаваны значны час на стварэнне радных камісій, тэрміновыя цяжкасці з прадстаўленнем на зацвярджэнне ваяводзе гарадскога бюджэта на 1927/1928 год; абыякавыя адносіны да гарадской гаспадаркі ў цяжкіх фінансавых умовах. Трэцяя Брэсцкая гарадская рада была распушчана ў 1930 г., як рада, якая пасля ўключэння ў склад Брэста яго ваколіц, не прадстаўляла інтарэсы ўсяго насельніцтва горада. Гэтая гарадская рада дзейнічала 2 гады 1 месяц і 29 дзён. Калі параўнаць гэтыя дадзеныя, то можна зрабіць вывад, што асноўнымі прычынымі роспуску гарадскіх рад мог быць іх склад і кірунак дзейнасці.

Пінская гарадская рада, якая своечасова не выбрала старшыню магістрата, была распушчана ў сувязі з устанаўленнем дрэнных адносін з прызначанай на гэтую пасаду асобай, як вынік былі прызначаны новыя выбары гарадскіх радных. Былі нават і такія выпадкі, калі сама гарадская рада звярталася да ўрада з прапановай прызначыць новыя выбары. Адміністрацыйныя ўлады імкнуліся не дапусціць выбар такіх гарадскіх радаў, у якіх перавагу мела бы апазіцыя. Скасоўваліся выбарчыя лісты, адмяняліся выбары, распускаліся гарадскія рады. Так, напрыклад, пры рэгістрацыі выбарчага спіса "Рабоча-сялянскага адзінства" ў 1929 г. у час выбараў Баранавіцкай гарадской рады старшыня выбарчай камісіі заявіў, што "аб'яднанне камуністычнае, а гэтай заразы мы да гарадской рады не дапусцім".

Выбары ў органы гарадскога самакіравання часта адбываліся ва ўмовах вострай палітычнай барацьбы, у якой часам дамінавала саперніцтва польскіх груповак (альбо шырэй – хрысціянскіх) і яўрэйскіх. Сустракалася і супрацоўніцтва, якое адбывалася нягледзячы на нацыянальны падзел, так, на выбарах у гарадскія і сельскія органы самакіравання, якія праходзілі ў 1926–1929 гг., арганізацыі рабочых выступалі адзіным блокам пад назвай "Рабочае адзінства". У яго ўваходзілі прафсаюзы, ППС-лявіца, "Сельроб", а таксама камуністы.

Выбары праводзіліся пад пільным кантролем адміністрацыйных улад. Кантроль насіў пераважна палітычны характар, паколькі ў "санацыйных" урадаў не выклікалі даверу органы тэрытарыяльнага самакіравання, выбраныя насельніцтвам. Так, напрыклад, у час выбарчай кампаніі 1927 г. міністр унутраных спраў спецыяльна выдаў сакрэтны цыркуляр, у якім паліцыі і адміністрацыйным уладам прадпісвалася рабіць рознага характару перашкоды пры выстаўленні кандыдатаў ад левых сіл. Імкнучыся пашырыць і замацаваць палітычную базу, падпарадкаваць рэжыму "санацыі" органы мясцовага самакіравання ў Заходняй Беларусі, новыя ўлады правялі ў 1926–1929 гг. перавыбары органаў гарадскога самакіравання. Яны адбыліся ва ўсіх ваяводствах Заходняй Беларусі. Восенню 1926 г. прайшлі выбары ў гарадскую раду Брэста. Арганізацыі рабочых выступілі на іх аб'яднаным блокам "Рабочае адзінства", у які ўвайшлі прафсаюзы, ППС-лявіца, "Сельроб", а таксама камуністы. Гарадская арганізацыя КПЗБ правяла сярод рабочых шырокую агітацыю на карысць блока "Рабочае адзінства". Значная агітацыйная праца прынесла свае вынікі: у гарадскую раду было выбрана 6 прадстаўнікоў працоўных. Поспех левых сіл мог быць больш значным, калі б яны не праследаваліся ўладай. Так, за перыяд выбарчай кампаніі спісы "Рабочага адзінства" канфіскоўваліся чатыры разы, а кандыдаты гэтага блока неаднаразова арыштоўваліся і пазбаўляліся права ўдзельнічаць у выбарах.

Больш значных поспехаў дасягнула Кампартыя ў выбарчай кампаніі ў наступныя гады. Так, напрыклад, у Брэсце ў 1928 г. за спісы рабоча-сялянскага блока было пададзена 9 000 галасоў з 19 000 выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у выбарах. У Гродне на выбарах у гарадскую раду рабоча-сялянскі блок атрымаў 2 580 галасоў, што дазволіла правесці ў раду 5 прадстаўнікоў рабочых. Характэрна, што за ануляваныя ўладамі спісы рабоча-сялянскага блока ў 1929 г. было пададзена звыш 800 галасоў. Пры выбарах у Віленскую гарадскую раду ў 1928 г. за спіс рабоча-сялянскага блока было пададзена 4 200 галасоў. Што датычыцца рэфармісцкіх партый, то Бунд сумесна з так званымі «незалежнымі» партыямі сабраў 400, ППС – 4000 галасоў. Удзел прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей быў адносна прапарцыянальным нацыянальнаму складу гарадоў. Адхіленні ад гэтай заканамернасці праяўляліся хіба толькі ў павелічэнні перавагі палякаў у гарадскіх упраўленнях і большым удзеле яўрэяў у радах у 1920-я гг. і меншым прадстаўніцтве беларусаў на працягу ўсяго перыяду. У многіх выпадках гэта было вынікам невялікай колькасці беларускай інтэлігенцыі і слабага эканамічнага становішча гэтай часткі гарадскога насельніцтва.

Этнічны склад гарадскіх радаў істотна ўплываў на вырашэнне важных для асобных нацыянальных груп праблем, у т.л. фінансавання

прыватных школ, дабрачынных і культурна-асветніцкіх арганізацый, рабочай мовы на пасяджэннях, нядзельнага гандлю, пры прыёме служачых на працу ў магістрат і г.д. Ён быў важным таксама для фарміравання стаўлення да дзяржавы на ніжэйшым узроўні ўладных структур.

Скептычныя адносіны польскай улады да мясцовага самакіравання не спрыялі павелічэнню зацікаўленасці гараджан у выбарах, плённай працы органаў гарадскога самакіравання, што асабліва яскрава праяўлялася на прыкладзе невялікіх гарадоў. Так, пружанскі стараста ў сваёй справаздачы ў 1939 г. канстатаваў, што ў насельніцтва адсутнічае інтарэс да органаў гарадскога самакіравання. Пры гэтым, відавочна назіралася дыскрымінацыя беларускага прадстаўніцтва ў органах мясцовага самакіравання, што праяўлялася ў іх дзейнасці і камплектацыі.

***Органы сельскага самакіравання.*** Асноўным суб'ектам сельскага самакіравання была *сельская гміна*, якая складалася з вёсак, малых маёнткаў, пасёлкаў, гарадскіх пасяленняў і фальваркаў, аб'яднаных у адну гмінную адміністрацыйную акругу. Прадстаўнічым органам сельскага (гміннага) самакіравання была *гмінная рада*, як распарадчая і кантралюючая інстанцыя. Да кампетэнцыі рады належалі і патрабавалі яе рашэння наступныя справы: устанаўленне прынцыпаў кіравання і спосабу выкарыстання гміннай маёмасці, а таксама ўстаноў і інстытутаў, якія належалі ёй ці знаходзіліся ў яе распараджэнні; набыццё і продаж нерухомай маёмасці і г.д.; зацвярджэнне бюджэту, надзвычайных выдаткаў, унясенне змен у бюджэт; зацвярджэнне на карысць гміны розных выплат і падаткаў; замена натуральных павіннасцей на грашовыя і наадварот; устанаўленне правілаў анулявання запазычанасцей, пагашэнне якіх стала немагчымым; устанаўленне службовых пасад або іх скасаванне, за выключэннем пасад, вызначаных законам; зацвярджэнне штату гмінных супрацоўнікаў; устанаўленне цэн за карыстанне грамадскімі сродкамі камунікацыі на тэрыторыі гміны; выступленне ад імя гміны ў судовых працэсах; дараванне ганаровага грамадзянства; выступленне з прапановамі змянення гмінных межаў; кантроль за дзейнасцю гміннага праўлення, выбар яго членаў.

Членамі гміннай рады з'яўляліся радныя і члены гміннага праўлення. Радныя і іх намеснікі выбіраліся першапачаткова на 3 гады і выконвалі свае абавязкі на грамадскіх пачатках. Радны не меў права займаць аплачваемай пасады ў гмінным праўленні. На пасяджэннях гміннай рады старшынствавалі войт або яго намеснік, які таксама склікаў яе не менш аднаго разу ў квартал. Найбольш важныя пастановы гміннай рады патрабавалі зацвярджэння адміністрацыйнай улады, што падкрэслівае залежнасць гэтага органа ад дзяржаўных улад.

Заканадаўча шырока вызначаныя паўнамоцтвы гміннай рады на практыцы абмяжоўваліся выканаўчымі органамі ўлады гміны ў асобе *войта*, які ў сваю чаргу поўнасцю залежаў ад павятовага старасты. З 1925 г. ваявода выконваў нагляд за дзейнасцю сельскіх гмін і гарадоў, мог распусціць гмінную раду, што дазваляла адміністрацыйным уладам пазбавіцца ад нежаданых адзінак органаў самакіравання.

Склад гмінных рад залежыў ад агульнай грамадска-палітычнай сітуацыі. Так у выбарах 1927 г. значнага поспеху дасягнулі беларускія кандыдаты, напрыклад, у Віленскім ваяводстве быў абраны 1 051 радны, сярод іх звыш 500 чалавек – былыя члены БСРГ і ёй спачуваючыя. Акрамя таго, былі абраны 57 камуністаў і 14 былых членаў забароненай НСП.

Гмінная рада, створаная як распарадчы орган сельскага самакіравання і заканадаўча надзеленая шырокімі паўнамоцтвамі, фактычна была абмежавана на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў выкананні сваіх паўнамоцтваў, што было выклікана недаверам адміністрацыйных улад да мясцовага насельніцтва. У 1930-я гады былі ўнесены абмежаванні ў працэдуру выбараў і выбарнасці ў гмінныя рады, гэты працэс падпаў пад кантроль павятовага старасты, а ваявода ўвогуле мог распусціць нежаданую для польскай улады раду і прызначыць новыя выбары. Быў створаны механізм, які паставіў асабовы склад і дзейнасць гмінных радаў у залежнасць ад дзяржаўнай улады. Пры зацвярджэнні на пасады перавага аддавалася палякам па нацыянальнасці і каталікам па веравызнанні, якія падтрымлівалі дзяржаўную палітыку на далучаных заходнебеларускіх землях.

Выканаўчым органам сельскай гміны было *гміннае праўленне*, якое складалася з *войта, яго намесніка і аднага лаўніка*. Гміннае праўленне з'яўлялася кіруючым органам улады ў гміне. Да яго кампетэнцыі адносілася падрыхтоўка пастаноў гміннай рады і вызначэнне шляхоў іх выканання; улік і распараджэнне гміннай маёмасцю; бюджэту і фінансы, распараджэнне даходамі гміны; размеркаванне гмінных падаткаў і павіннасцей; прызначэнне на пасады гмінных супрацоўнікаў; справаздачы перад гміннай радай. На пасяджэннях гміннага праўлення старшынствавалі войт або яго намеснік.

*Войт* з'яўляўся прадстаўніком выканаўчай улады ў гміне. Ён кіраваў гміннай адміністрацыяй і ажыццяўляў за ёй нагляд. Як прадстаўнік дзяржаўнай адміністрацыі войт меў наступныя абавязкі: выкананне законаў і распараджэнняў, а таксама прадпісанняў вышэйшых улад; падтрыманне спакою, парадку, бяспекі; як прадстаўнік самакіравання – прадстаўленне гміны; выкананне пастаноў гміннага праўлення і гміннай рады; захаванне гмінных дакументаў і актаў; кіраўніцтва працай служачых і ажыццяўленне за імі нагляду. У надзвычайных выпадках войт асабіста вырашаў справы, якія ўваходзілі ў кампетэнцыю гміннага праўлення.

Войт і яго намеснік першапачаткова выбіраліся з радных на 3 гады гміннай рады. У выпадку, калі рада не выбірала войта, ён прызначаўся павятовым старастам. Наконт прызначэння на пасады войтаў газета «Беларуская доля» паведамляла, што амаль усе войты займаюць свае пасады па прызначэнні павятовых старастаў, а не па выніках выбараў. У значнай большасці гэта былі спецыяльна падабраныя людзі, палякі па нацыянальнасці. Атрымоўвалася так, што войтамі ў гмінах прызначаліся толькі палякі і каталікі, часам не папулярныя сярод мясцовых жыхароў.

Польская ўлада пры дапамозе войтаў адсочвала становішча на далучанай тэрыторыі. У пачатку 1920-х гг. войт кожны тыдзень павінен быў падаваць справаздачу аб грамадска-палітычным становішчы ў гміне. У сваёй справаздачы ён абавязаны быў адлюстроўваць стан улады і органаў самакіравання; фінансавае, санітарнае становішча; стан школьнай справы і асветы, харчовага забеспячэння, камунікацый, бяспекі; паказваць стаўленне насельніцтва да ўлады. Не змянілася становішча ў гэтай галіне і пазней. Так, у 1937 г. была выдадзена агульная сакрэтная інструкцыя брэсцкага павятовага старасты, адрасаваная бурмістрам і войтам, дзе староста загадваў асабіста войтам высвятляць настрой насельніцтва, гаспадарчыя патрэбы праз выезды на месцы, прыём грамадзян, а справаздачы солтысаў выкарыстоўваць як пацвярджэнне сваіх высноў. Другім сваім цыркулярам брэсцкі староста патрабаваў у войтаў звярнуць асаблівую ўвагу на дзейнасць солтысаў, на іх стаўленне да Польскай дзяржавы, узмацніць нагляд за збіраннем солтысамі падаткаў. Згодна з гэтым цыркулярам войты павінны былі прадастаўляць спісы тых солтысаў, якія негатыўна ставіліся да польскай дзяржаўнасці.

Войты, абраныя органамі самакіравання, у сваёй дзейнасці поўнасцю залежалі ад адміністрацыйных улад. На практыцы арганізацыя органаў сельскага самакіравання ажыццяўлялася са значнымі цяжкасцямі. Так, напрыклад, у дакладзе, які быў зроблены на з’ездзе прадстаўнікоў павятовых сеймікаў Польскай рэспублікі ў 1926 г., адзначалася, што ў Палескім ваяводстве гмінныя праўленні не могуць выконваць даручаных ім службовых абавязкаў, а таму павятовы аддзел вымушаны быў здзяйсняць не толькі наглядальную працу, але і выканаўчую. Яшчэ раней, у 1921 г., многія рэферэнты самакіравання ў сваіх справаздачах адзначалі частыя выпадкі звальнення з займаемых пасад войтаў у сувязі з п’янствам апошніх. У 1921 г. ашмянскі староста атрымаў інструкцыю, згодна з якой войтам, якія шмат часу праводзяць на ўласнай гаспадарцы і займаюць пасады ў сувязі з тым, што проста немагчыма прызначыць на гэтыя пасады больш адказных людзей, прызначыць мінімальны памер заробку, і наадварот, войтам, адданым працы, прызначыць заробак, які дазволіў бы існаваць без пабочных заняткаў.

Паводле закона 1933 г. гміннае праўленне складалася з войта, яго намесніка і 2 лаўнікаў, у гмінах з колькасцю насельніцтва больш за 10 тыс. – 3 лаўнікі. Сельская гміна павінна была ўтрымліваць неабходную для выканання працы колькасць служачых, абавязкова павінен быў быць гмінны сакратар. На пасаду гміннага сакратара магла быць прызначана асоба, якая мела адпаведную адукацыю, прайшла практыку і здала экзамен па спецыяльнасці. Абавязковае ўстанаўленне пасады гміннага сакратара не датычыла гмін з колькасцю насельніцтва менш за 5 тыс. жыхароў, дзе існавала пасада прафесійнага войта. На заняцце пасады ў гмінным праўленні абвяшчаліся конкурсы.

Пасаду начальніка сельскай гміны мог займаць прафесійны або непрафесійны войт. Выкананне абавязкаў прафесійным войтам магло наступіць толькі пасля адпаведнай пастановы гміннай рады, зацверджанай наглядальнай уладай. На пасаду прафесійнага войта магла быць зацверджана асоба, якая, акрамя выбарчых правоў, мела адпаведную кваліфікацыю, вызначаную міністрам унутраных спраў. Так, 31 студзеня 1934 г. было выдадзена распараджэнне міністра ўнутраных спраў у галіне кваліфікацыі кандыдатаў на пасады прафесійных войтаў. Гэтае распараджэнне вызначыла высокі адукацыйны цэнз, абавязковы 3-гадовы стаж кандыдатаў на пасаду. Выбар гміннай радай прафесійнага войта патрабаваў зацвярджэння кандыдатуры ваяводам.

Адносіны насельніцтва да адміністрацыйных улад, органаў самакіравання вышэйшай ступені ў значнай меры залежалі ад тых людзей, якія прадстаўлялі гэтую ўладу на месцы, ад іх стаўлення да мясцовых жыхароў і супрацоўніцтва з імі. Найбольш часта людзі кантактавалі з гмінным праўленнем, дзе вымушаны былі вырашаць многа спраў, таму войт і сакратар заставаліся галоўнымі людзьмі ў гміне, ад іх залежалі адносіны мясцовых жыхароў да дзяржаўных улад. Нягледзячы на агульнае негатыўнае стаўленне беларускага насельніцтва да гміннай адміністрацыі, сустракаліся выпадкі, калі мясцовыя жыхары станоўча ставіліся да гмінных войтаў, нават калі тыя былі ваеннымі асаднікамі.

Па стане на 1934 г. у Навагрудскім ваяводстве працавалі 87 войтаў, столькі ж іх намеснікаў, 220 лаўнікаў, з іх 313 палякаў, 76 беларусаў, 5 яўрэяў; у Віленскім ваяводстве сярод 96 войтаў было 90 палякаў, 5 беларусаў, 1 літовец. Значную перавагу ў мясцовай уладзе палякаў па нацыянальнасці пацвярджаў нацыянальны склад Гарадзейскага гміннага праўлення Нясвіжскага павета: у 1939 г. яно на 100% складалася з палякаў па нацыянальнасці і каталікоў па веравызнанні.

Ніжэйшай адзінкай у сістэме сельскага самакіравання была *грамада* ў памеры асобнай вёскі, калоніі, маёнтка ці фальварка. Грамада з’яўлялася гаспадарчым суб’ектам і валодала маёмаснымі правамі. Кола дзеянняў

грамады ўключала кіраўніцтва маёмасцю, а таксама распараджэнне даходамі, атрыманымі з яе. Праўленне гміны на падставе пастановы гміннай рады, зацверджанай наглядальнай уладай, магло даручыць грамадзе выкананне некаторых гаспадарчых функцый, калі грамада давала на гэта згоду або гміна выдзяляла на гэта фінансавыя сродкі.

Членамі грамады маглі быць усе асобы, якія з'яўляліся членамі гміны, у склад якой уваходзіла дадзеная сельская грамада, і пастаянна пражывалі на яе тэрыторыі. Органамі ўлады ў грамадзе з'яўляліся *солтыс, грамадская рада* ці *грамадскі сход*. Першапачаткова солтыс з'яўляўся выканаўчым органам улады грамады, гмінным служачым. Солтыса і яго намесніка выбіраў грамадскі сход з ліку членаў грамады на адзін год. Выбраных асоб на пасаду солтыса павінен быў зацвердзіць павятовы стараста, у выпадку незацвярджэння прызначаліся новыя выбары. Калі пасля правядзення паўторных выбараў кандыдат зноў не быў зацверджаны або ўвогуле грамада ўхілялася ад выбараў, павятовы стараста прызначаў солтыса і яго намесніка, якія выконвалі свае абавязкі на працягу аднаго года. Стараста мог асабіста вызваліць з займаемай пасады солтыса і прызначыць новыя выбары.

З 1933 г. на пасады солтыса і яго намесніка маглі быць абраны асобы, якія на момант выбараў дасягнулі трыццацігадовага ўзросту, больш аднаго года пражывалі на тэрыторыі дадзенай грамады, валодалі вуснай і пісьмовай польскай мовай. Аднак валоданне польскай мовай як умова выбарнасці на пасаду была адкладзена на тэрыторыі ўсходніх ваяводстваў на пяць гадоў. У 1936 г. было выдадзена распараджэнне, якое на тэрыторыі Навагрудскага, Палескага, Віленскага, Валынскага, а таксама Гродзенскага і Ваўкавыскага паветаў Беластоцкага ваяводства на адзін выбарчы тэрмін адмяняла абавязковую ўмову валодання польскай мовай кандыдатамі на пасады солтыса і яго намесніка. Солтыс і яго намеснік выбіраліся на тры гады. Выбары прызначаў павятовы стараста, які ажыццяўляў агульны нагляд за дзейнасцю грамады. Кандыдат, які пры галасаванні атрымаў найбольшую колькасць галасоў членаў грамады, станавіўся солтысам, намеснікам – кандыдат, які па колькасці галасоў быў на другім месцы.

Солтыс падпарадкоўваўся непасрэдна войту і прадстаўляў грамаду ў гмінным праўленні і ў дзяржаўных органах. Перад тым як заняць пасаду солтыса, кандыдат прыносіў прысягу на вернасць Польскай дзяржаве. Звычайна прызначэнне на пасады солтысаў аддавалася тым кандыдатам, што лаяльна ставіліся да польскіх улад, раней служылі ў польскім войску. Такое стаўленне польскіх улад прыводзіла да таго, што зацікаўленасць да так званых органаў самакіравання (грамадская рада або сход) зніжалася. Былі выпадкі нез'яўлення насельніцтва грамады на выбарныя пасяджэнні.

За выкананне сваіх абавязкаў солтыс штомесяц атрымоўваў з гмінных грашовых сродкаў заробак. У выпадку хваробы, выкліканай выкананнем службовых абавязкаў, солтыс лячыўся ў шпіталі органаў самакіравання за кошт гміннага праўлення. Ён вызваляўся ад выканання натуральных павіннасцей, мог накладваць за некаторыя парушэнні на жыхароў грамады штраф і арышт да двух сутак. Трэба адзначыць, што ў некаторых галінах сваёй дзейнасці солтысы кіраваліся яшчэ законамі Расійскай імперыі, выкарыстанне якіх дазвалялася польскім урадам.

Солтыс выконваў наступныя абавязкі: склікаў грамадскі сход (раду) па меры патрэбы, а таксама па жаданні дзяржаўных або гмінных улад, дзесятай часткі асоб, якія валодалі правам удзелу ў ім, аднак грамадскую раду павінен быў склікаць не менш аднаго разу ў квартал, грамадскі сход – двух разоў у год. Солтыс адкрываў і закрываў пасяджэнні грамадскага сходу (рады), старшынстваваў на іх, сачыў за парадкам; рыхтаваў пытанні для разгляду на пасяджэнні грамадскай рады (сходу); выконваў рашэнні грамадскага сходу (рады), якія не супярэчылі рашэнням гміннага праўлення і іншым нарматыўным актам; ажыццяўляў нагляд за станам дарог, мастоў і г.д.; выконваў нагляд за выкананнем розных натуральных павіннасцей членамі грамады, збіраў падаткі і выплаты, калі адсутнічалі для гэтага спецыяльна прызначаныя асобы; распараджаўся па рашэнні грамады маёмасцю і даходамі. За несумленнае выкананне службовых абавязкаў павятовы стараста са згоды павятовага аддзела мог солтысу або яго намесніку зрабіць заўвагу, вынесці вымову, накласці штраф, звольніць з пасады.

*Грамадская рада* (а там, дзе яна не была ўтворана – грамадскі сход) з’яўлялася пастанаўляючым органам улады грамады. Грамадская рада выбіралася ў грамадах з колькасцю насельніцтва больш за 200 жыхароў, а таксама магла быць склікана паводле прапановы грамадскага сходу, гміннай рады, павятовага аддзела са згоды ваяводы і ваяводскага аддзела ў грамадах з меншай колькасцю насельніцтва. З 1938 г. выбарчым правам у грамадскую раду валодалі ўсе польскія грамадзяне, якія валодалі аналагічным правам у Сейм і не менш як адзін год пражывалі на тэрыторыі грамады. Абраным мог быць кожны грамадзянін, які валодаў выбарчымі правамі і на момант выбараў дасягнуў дваццацісямігадовага ўзросту. Грамадскія радныя выконвалі свае абавязкі на грамадскіх пачатках.

Грамадская рада выбіралася на пяць гадоў. У яе склад уваходзілі солтыс (старшыня), намеснік солтыса і радныя. Колькасць радных залежала ад колькасці насельніцтва грамады. У мясцовасцях з колькасцю насельніцтва да 500 жыхароў выбіралася 12, ад 500 да 1 000 – 16, ад 1 000 да 1 500 – 20, ад 1 500 да 2 000 – 24, ад 2 000 – 30 радных. У адпаведнай колькасці выбіраліся і намеснікі радных.

Права ўдзелу ў грамадскім сходзе меў кожны жыхар грамады, які дасягнуў дваццацічатырохгадовага ўзросту і не менш аднаго года да пасяджэння пражыў у грамадзе. Колькасць грамад па сельскіх гмінах, паветах, ваяводствах была рознай. У залежнасці ад месца пражывання адрозніваўся і нацыянальны склад гэтых органаў. Так, нацыянальны склад грамадскіх радаў Навагрудскага ваяводства ў 1934 г. быў наступным: 12 045 палякаў, 11 175 беларусаў, 419 яўрэяў, 59 літоўцаў, 14 рускіх, 1 немец. У Віленскім ваяводстве на гэты ж год у складзе грамадскіх радаў значна пераважалі палякі, якіх было 10 936 чалавек, акрамя палякаў 4 151 беларус, 341 яўрэй, 1 050 літоўцаў, 299 рускіх, 40 асоб іншых нацыянальнасцей, адрознівалася і партыйная прыналежнасць радных.

Да кампетэнцыі грамадскіх радаў (грамадскага сходу) адносілася: зацвярджэнне рашэнняў пасяджэнняў грамадскіх радаў і іх камісій; зацвярджэнне праекта бюджэту грамады, размеркаванне яе даходаў; кантроль за дзейнасцю солтыса; вызначэнне патрэб грамады; зацвярджэнне прапаноў гміннай радзе аб прыцягненні жыхароў грамады да выканання натуральных павіннасцей і падаткаў на грамадскія справы; развіццё земляробства і жывёлагадоўлі, дзякуючы цеснаму супрацоўніцтву з грамадскімі аб’яднаннямі па стварэнні вопытных палеткаў, набыцця прылад працы, арганізацыі і ўтрымання ветэрынарных аптэк, ахоўнага прышчэпвання жывёлы, арганізацыі і ўтрымання жывёльных могільнікаў, грамадскіх садоў і г.д.; будаўніцтва і ўтрыманне грамадскіх будынкаў – будынкаў кіраўніцтва грамады, бібліятэк, чытальняў і іншых устаноў; будаўніцтва грамадскіх школ і іх утрыманне, жылля настаўнікам; будаўніцтва і рамонт грамадскіх дарог, мастоў, вуліц і г.д.; арганізацыя дапамогі бедным жыхарам грамады; арганізацыя і ўтрыманне начной варты, падтрымка пажарнай службы, набыццё супрацьпажарных прылад і будаўніцтва пажарных вадаёмаў; будаўніцтва прытулкаў, начлежных дамоў для бедных; асвятленне дарог, вуліц, плошчаў; арганізацыя дастаўкі карэспандэнцыі, калі гэтага не выконвалі паштальёны; будаўніцтва і ўтрыманне грамадскіх водаправодаў, лазняў, пляжаў, спартыўных пляцовак, могілак; будаўніцтва і ўтрыманне адвадных каналаў; пасадка і догляд за прыдарожнымі дрэвамі; устаноўка і абслугоўванне тэлефона для грамадскага карыстання; прапаганда турызму і летніх лагераў адпачынку.

Такім чынам, органы дзяржаўнай улады і самакіравання на тэрыторыі Заходняй Беларусі разглядваліся польскай дзяржавай як сродак ўмацавання свайго становішча на захопленых землях, інструментам асіміляцыі і апалячвання. Відавочная дыскрымінацыя беларускай большасці, а таксама нацыянальных меншасцей, асабліва пры фарміраванні ваяводскіх і павятовых органаў, дамінаванне ў іх выключна прадстаўнікоў польскага этнасу стала дадатковай падставай для росту

сацыяльнай напружанасці і пагаршэння эканамічнай сітуацыі. Органы дзяржаўнай улады і самакіравання не маглі стаць для шматнацыянальных усходніх ваяводстваў месцам збліжэння і ўзаемапаразумення, прадухіліць ад свавольства польскай адміністрацыі.

## Тэма 7. Сельская гаспадарка і аграрныя рэформы

***Сельская гаспадарка і рэформы.*** Першая сусветная і грамадзянская войны, польская акупацыя істотнта пагоршылі стан сельскай гаспадаркі, у якой было занята каля 80% насельніцтва Заходняй Беларусі. Агульная колькасць пасяўных плошчаў у 1921–1922 г. складала толькі 77,8% да ўзроўню 1913 г. Аграрныя адносіны ў Заходняй Беларусі характарызаваліся панаваннем буйнога памешчыцкага землеўладання, беззямеллем і малазямеллем сялян, наяўнасцю значных перажыткаў феадальна-прыгонніцкіх адносін. Буйнымі памешчыкамі шырока выкарыстоўваліся і адпрацовачныя павіннасці. Перажыткам прыгонніцтва з’яўлялася і абшчыннае землекарыстанне. Шырокае распаўсюджанне ў Заходняй Беларусі мелі сервітуты – выпасы, сенажаці, лес, якія знаходзіліся ў сумесным карыстанні сялян і памешчыкаў. За карыстанне гэтымі ўгоддзямі памешчыкі патрабавалі плату ў грашовай або адпрацовачнай форме. Была шырока распаўсюджана цераспалосіца – раз’яднанасць і раздробленасць зямлі аднаго землекарыстальніка на некалькі адасобленых частак.

Асноўную масу вясковага насельніцтва складалі беднякі, памеры зямельных надзелаў якіх не перавышалі 10 га. Такіх сялянскіх гаспадарак у Заходняй Беларусі налічвалася 284 706 (80,15%), ім належыла толькі 24,15% ад агульнай колькасці прыватнаўласніцкіх зямель.

У той жа час у Заходняй Беларусі налічвалася 3 402 гаспадаркі, якім належала 2 772 669 га зямлі, што складала 51,92% агульнай колькасці прыватнаўласніцкіх зямель. У склад гэтай групы ўваходзілі буйныя памешчыкі, якім належалі маяраты і ардынацыі, плошча якіх перавышала сотні тысяч гектараў зямлі. На тэрыторыі Заходняй Беларусі налічвалася звыш 3,6 тыс. маёнткаў. Сярэдні памер такой гаспадаркі складаў 790 га. Аднак былі і памешчыкі, якія валодалі некалькімі дзесяткамі тысяч гектараў зямлі. Так, Станіславу Радзівілу ў Столінскім павеце належала ардынацыя ў 146 970 га, у Палескім ваяводстве – звыш 95 тыс. га, а Каралю Радзівілу ў Давыд-Гарадку належаў маярат у 142 250 дзесяцін зямлі. Памешчыца Т. Агаркава валодала 100 тыс. га.

Прамежкавае становішча паміж гэтымі групамі займалі сяляне-серадлякі з надзеламі ад 10 да 20 га і заможныя сяляне з надзеламі ад 20 да 50 га. Сяляне-серадлякі ў Заходняй Беларусі ў 1921 г. налічвалі 49 426 гаспадарак. Ім належала 667 577 га зямлі, або 12,5% агульнай

колькасці прыватнаўласніцкіх земель. Сярэдні памер надзела гэтай групы сялян складаў 13,51 га.

Заможных гаспадароў з надзелам ад 20 да 50 га налічвалася 15 107 чалавек. Ім належала 454 696 га зямлі, або 8,14% прыватнаўласніцкіх зямель. Сярэдні памер іх гаспадарак складаў 28,77 га. У іх шырока выкарыстоўвалася наёмная праца. Яны мелі па 10–15 коней, 15–25 кароў. Напрыклад, у селяліна Драйзерава (Дзісенскі павет) было 45 га зямлі, 25 кароў, 12 коней, селянін Пузыроўскі у тым жа павеце валодаў 40 га зямлі, 15 каровамі, 8 коньмі. Карыстаючыся танным крэдытам у зямельным банку і іншых крэдытных установах, заможныя сяляне накіроўвалі грашовыя сродкі для скупкі зямлі.

Да дробных гаспадарак у Заходняй Беларусі адносіліся парцэльныя, якія мелі невялікія ўчасткі ўласнай або арэндаванай зямлі. Іх налічвалася каля 50 тыс. з агульнай зямельнай плошчай 52 тыс. га. Гэтыя гаспадаркі вымушаны былі арэндаваць дадатковую зямлю ў памешчыкаў і кулакоў.

Не было раўнамерным і размеркаванне ворнай зямлі па рэгіёнах Заходняй Беларусі. Па ваяводствах яно было наступным: у Навагрудскім ваяводстве плошча сельскагаспадарчых угоддзяў складала 42,5%, у Віленскім – 39,2%, у Палескім – 22,8%. Такія суадносіны ва ўдзельнай вазе ворнай зямлі склаліся на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў сувязі з існуючымі глебавымі ўмовамі. Так, калі ў Ваўкавыскім і Гродзенскім паветах агульная плошча ворных зямель дасягала 27,4%, то на Палессі яна не перавышала 11%. У гэтых гаспадарках было шмат зямлі, якая не апрацоўвалася (балоты, пустэчы). Яе налічвалася амаль столькі ж, колькі і ворнай – 18,6%. Зразумела, балоты патрэбна было асушаць, але справы ішлі так марудна, што выгаду гэтыя землі маглі прыносіць толькі праз працяглы час. Акрамя таго, асушэнне патрабавала вялікіх грашовых сродкаў, якія ні ўрад, ні прыватныя землекарыстальнікі не жадалі выдаткоўваць.

Да масіваў, якія не апрацоўваліся, адносіліся лугі, выганы, лясы. У буйных гаспадарках яны маглі складаць да 78–79% усёй зямельнай плошчы. Выганы часткова выкарыстоўваліся для выпасу гаспадарскай жывёлы, або здаваліся ў арэнду заможным сялянам. Так, у Давідгарадоцкай ардынацыі Радзівілаў са 146 970 га ўсёй зямлі паша складала толькі 407 га, або 0,28% ад усёй яе плошчы.

Паводле звестак за 1927 г., каля 29% сялянскіх гаспадарак не мелі коней, у 58,8% было толькі па аднаму каню, 15,7% адносіліся да бескароўных, 51,1% гаспадарак валодалі адной каровай.

Малазямельныя сяляне не маглі набыць зямлю па прычыне высокага яе кошту. Толькі асобныя, больш заможныя сяляне рашаліся на пакупку зямлі. Цана аднаго гектара ў сярэднім у Заходняй Беларусі ў 1927 г. складала

600–700 злотых, у той час як рабочы конь каштаваў 150–200 злотых, дойная карова – 100–120 злотых, 1 цэнтнер жыта – 35–37 злотых.

Наяўнасць значнай колькасці феадальных перажыткаў рабіла немагчымым эфектыўнае выкарыстанне зямельных угоддзяў. Нізкі ўзровень развіцця вытворчых сіл у сельскай гаспадарцы, недастатковасць арганічных і мінеральных угнаенняў не спрыялі інтэнсіўнаму развіццю сельскай гаспадаркі.

Аграрнае перанасяленне (на 1 км² сельскагаспадарчых зямель у Віленскім ваяводстве прыходзілася 54 чалавекі, у Навагрудскім – 52,6, у Палескім – 36,7 чалавек) яшчэ больш паглыбляла нераўнамернае развіццё галін гаспадаркі. Прамысловасць не была ў стане паглынуць лішнюю рабочую сілу. У вёсцы было прыкладна 700 тыс. чалавек свабоднай рабочай сілы. У памешчыкаў і заможных сялян працавала каля 75 тыс. сельскагаспадарчых рабочых, акрамя таго, 8,6 тыс. чалавек былі заняты ў памешчыцкіх маёнтках у якасці прыслугі.

Вялікай праблемай для беларускага селяніна былі падаткі. Падатковая сістэма была створана так, што дробныя гаспадаркі плацілі падатак большы, чым буйныя. Сяляне, ва ўласнасці якіх былі надзелы да 5 га, плацілі 2,38 злотых з 1 га зямлі, у той жа час уладальнікі буйных латыфундый – толькі 1,01 злотых, а астатнія гаспадаркі з зямельнай плошчай ад 15 да 60 га – 1,89 злотых.

Тысячы сялян, не знайшоўшы работу, разараліся, прадавалі сваю маёмасць і эмігрыравалі ў краіны Заходняй Еўропы, Амерыкі і інш. Толькі за 13 гадоў (з 1926 па 1938 г.) у заходнія краіны на пошукі лепшага жыцця з Заходняй Беларусі эмігрыравалі 78 тыс. чалавек.

Драбіліся гаспадаркі і пры ўтварэнні новай сям'і. Па дадзеных польскай статыстыкі, за перыяд з 1922 г. па 1930 г. на землях Заходняй Беларусі было ўтворана каля 20 тыс. гаспадарак, уладальнікамі якіх былі сем'і ва ўзросце ад 23 да 30 год. Амаль 80% з іх выдзяліліся з бацькоўскіх надзелаў і з'яўляліся на той час ужо дробнымі, якія не маглі эфектыўна развівацца і плаціць падаткі.

Кіраўніцтва Польшчы разумела складанасць становішча ў аграрнай сферы, якая пагражала палітычнай стабільнасці, і прадпрыняло шэраг рэформаў, якія павінны былі стабілізаваць сельскую гаспадарку і забяспечыць трывалую падтрымку ўраду з боку сялян, у тым ліку і на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Яшчэ 10 ліпеня 1919 г. сейм прыняў першы *закон аб аграрнай рэформе "Устава сейму аб умовах зямельнай рэформы"*, а ўжо 15 ліпеня дзеянне гэтага закона было распаўсюджана і на захопленыя землі. Паводле закона, у краіне ствараўся дзяржаўны зямельны фонд з так званых «свабодных» зямель, якія засталіся без гаспадароў. Землі гэтага фонду падлягалі разбіўцы на асобныя невялікія ўчасткі

(парцэлы) плошчай у 25 моргенаў (14 га), якія прадназначаліся для свабоднага продажу насельніцтву. Такое пераразмеркаванне зямельнай уласнасці ў Польшчы атрымала назву *парцэляцыі*.

Паскарэнне аграрнай рэформы адбылося летам 1920 г., калі пачалося наступленне Чырвонай Арміі на Варшаву і краіна апынулася на мяжы краху, перапалоханыя кіруючыя колы Польшчы прыступілі да рэалізацыі аграрнай рэформы. 6 ліпеня 1920 г. сейм прыняў пастанову аб зацвярджэнні зямельных камітэтаў, а 15 ліпеня 1920 г. сейм прыняў *закон аб выкананні аграрнай рэформы*, які ўтрымліваў асноўныя палажэнні закона ад 10 ліпеня 1919 г., але канкрэтныя мерапрыемствы па іх рэалізацыі.

У дзяржаўны зямельны фонд для парцэляцыі ўключаліся дзяржаўныя і царкоўныя маёнткі, а таксама землі, якія належалі раней расійскаму сялянскаму банку і розным установам, членам дынастычных сем'яў Расіі, Германіі, Аўстра-Венгрыі і інш. Касцёльныя землі, згодна з законам, маглі перадавацца ў дзяржаўны фонд толькі са згоды Ватыкана. Закон прадугледжваў прымусовы выкуп дзяржаўных зямель, набытых у час вайны асобамі, для якіх сельская гаспадарка не была асноўным заняткам, а таксама занядбаных гаспадарак, якія знаходзіліся ў межах гарадоў і прамысловых зон. Прымусоваму выкупу падлягалі таксама прыватныя ўладанні, якія складалі ў сельскай мясцовасці карэннай Польшчы больш за 180 га, у прыгарадных і прамысловых зонах – звыш 60 га. Ва ўсходніх ваяводствах за ўладальнікамі захоўвалася права мець 400 га зямлі. Лішкі зверх гэтай нормы падлягалі прымусоваму адчужэнню. Маёнткі, якія спецыялізаваліся на вытворчасці збожжа, жывёлы, рыбы, тэхнічных культур, а таксама высокапрадукцыйныя гаспадаркі, незалежна ад іх спецыялізацыі, пры любых памерах аб'яўляліся недатыкальнымі. Грашовая кампенсацыя гаспадарам за адчужаемыя землі ў новым законе ўстанаўлівалася ў памеры паловы рыначнай цаны.

З фонду для парцэляцы 80% плошчаў павінна было пайсці на нарэзку ўчасткаў для продажу беззямельным і 20% – малазямельным сялянам. Перавагу ў набыцці зямлі мелі інваліды вайны, затым батракі, якія засталіся без сродкаў да існавання ў выніку парцэляцыі. Закон устанаўліваў, што зямлю могуць купляць усе грамадзяне Польшчы, якія маюць здольнасць займацца сельскай гаспадаркай. У Сельскагаспадарчым банку адкрываўся крэдыт для сялян, жадаючых набыць зямлю з дзяржаўнага фонду. Абвяшчалася, што кожны, адчуваючы патрэбу, можа ўзяць грашовую ссуду. Інваліды вайны і салдаты, узнагароджаныя польскімі знакамі адрознення, надзяляліся зямлёй бясплатна.

Пераразмеркаванне зямель павінна было ажыццяўляцца праз парцэляцыю – разбіўка дзяржаўных і некаторых прыватнаўласніцкіх

зямель на дробныя ўчасткі па 2, 3, 5, 10, 15, 20 га і свабодны іх продаж усім жадаючым.

Для рэалізацыі закона былі створаны павятовыя і гмінныя зямельныя камісіі з дарадчымі правамі ў дапамогу дзяржаўным органам. Яны павінны былі ўлічваць землі, якія пераходзілі ў дзяржаўны фонд, ацэньваць іх, складаць спісы жадаючых набыць зямельныя ўчасткі і г.д. У склад камісій ўваходзілі ў асноўным мясцовыя польскія памешчыкі, якія злоўжывалі сваім становішчам, бралі хабар, спекулявалі зямлёй, павышалі цэны. Камісіі праіснавалі да 1923 г. і былі распушчаны з-за малой эфектыўнасці.

Калі землеўладальнікам, згодна з законам, кампенсацыя за адчужаныя землі ўстанаўлівалася ў памеры паловы рыначнай цаны, то сялянам распарцэляваныя ўчасткі прадаваліся за поўны кошт, але купіць іх яны не маглі па прычыне высокіх цэн. Рашэнні зямельных органаў аб прымусовым адчужэнні зямлі памешчыкамі маглі аспрэчвацца ў судзе. Гэта давала магчымасць памешчыкам заводзіць цяжбы, якія цягнуліся дзесяцігоддзямі, і захоўваць за сабой на доўгі час землі, якія падлягалі парцэляцыі.

Паводле закону *аб асадніцтве ад 17 снежня 1920 г.* удзельнікі польска-савецкай вайны мелі права атрымаць ва ўласнасць да 45 га зямлі. Асаднік павінен быў пасяліцца на сваёй парцэле на працягу года і ў трохгадовы тэрмін апрацоўваць яе. У выпадку невыканання гэтых ўмоў асаднік страчваў зямельны надзел.

Закон прадугледжваў бясплатнае надзяленне салдат польскай арміі зямлёй. Паводле распараджэння 1921 г. кіраўніка Галоўнага зямельнага ўпраўлення атрымаць бясплатны надзел маглі радавыя, сяржанты, афіцэры, прыроўненыя да іх служачыя арміі і добраахвотнікі, якія неслі службу не менш чым чатыры месяцы і мелі ўрадавыя ўзнагароды і адзнакі.

Асаднікі надзяляліся зямлёй у адпаведнасці з вайсковым званнем, палкоўнік мог атрымаць 30–50 га, капітан – 20, паручнік – 15, шэраговы – да 10 га зямлі. Не мелі права на атрыманне зямлі салдаты, якія былі пакараны за злачынствы супраць узброеных сіл польскай дзяржавы, або якія самавольна бралі ў карыстанне чужыя землі. Памер аплаты за зямлю быў прыроўнены да 100–300 кг збожжа за 1 га штогод з выплатай дзяржаве на працягу 30 гадоў, пачынаючы з 5-га года пасля атрымання зямлі. Дзяржава аказвала дапамогу натурай або грашыма для абзавядзення гаспадаркай. Звычайна на адну гаспадарку выдзялялася дрэва і крэдыт, 2 млн марак інвентаром або зернем. Крэдыт выдаваўся на ўмовах 12% гадавых пад залог гаспадаркі і двух паручэнцаў.

Асадніцтва было паўваеннай арганізацыяй, асаднікі на легальных умовах валодалі зброяй, былі сфарміраваны ў воінскія падраздзяленні, якія ўзначальвалі кадравыя афіцэры. Усе яны уваходзілі ў “Саюз асаднікаў”, які

падпарадкоўваўся генеральнаму штабу польскай арміі. Асаднікі разглядваліся як апора польскай улады і выконвалі розныя даручэнні афіцыйных улад, у тым ліку паліцэйскія функцыі. У асноўным асаднікі з'яўляліся зацятымі польскімі нацыяналістамі, іх адносіны з мясцовым насельніцтвам былі складанымі, мясцовыя жыхары бачылі ў іх прыгнятальнікаў, носьбітаў польскага шавінізму, апору акупацыйнага рэжыму.

Непасрэдная рэалізацыя закона распачалася ў 1921 г. Найбольшая колькасць надзелаў, выдзеленых для асаднікаў, прыпадае на 1923 г., найменшая – на 1932 г. У асноўным асаднікі сяліліся калоніямі, дапамагаючы ў ажыццяўленні гаспадарчых работ. Найчасцей такая калонія складалася з былых удзельнікаў аднаго ваеннага злучэння (рота, батальён і г.д.). У 1923 г. у Навагрудскім ваяводстве з агульнай колькасці асаднікаў у 1 391 асобаў 789 гаспадарыла індывідуальна і толькі 602 – калоніямі. Кожная вялікая калонія падтрымлівала блізкія адносіны з больш дробнымі, якіх апекавала не толькі маральна, але і матэрыяльна, дапамагаючы ім распачаць гаспадарку на новых землях. Частыя напады сялян на асаднікаў патрабавалі забеспячэння сваёй бяспекі, у 1923 г. ваенныя асады ўзяў пад сваю ахову корпус пагранічнай аховы.

Фонд, з якога надзялялі асаднікаў, складаўся з зямель казённых (галоўным чынам канфіскаваных царскім урадам у паўстанцаў 1863–1864 гадоў), памешчыцкіх (пераважна памешчыкаў няпольскай нацыянальнасці, якія да 1 красавіка 1921 г. не вярнуліся ў свае маёнткі), зямель праваслаўнага духавенства (надзелы, большыя за 30 га). Землі польскіх памешчыкаў засталіся некранутымі. Мелі месца выпадкі, калі ім аддавалі цэлыя маёнткі з пабудовамі, садамі і іншымі матэрыяльнымі каштоўнасцямі. У першай палове 20-х гадоў надзялялі зямлёй ваенных, потым пашырылася цывільнае асадніцтва. Ваенныя каланісты не апраўдалі тых надзей, якія ўскладвала на іх кіраўніцтва Польшчы. У сваім выступленні ў сейме 4 ліпеня 1926 г. беларускі дэпутат П. Мятла гаварыў: " ...п'янства, амаральныя паводзіны, жаданне атрымаць як мага больш даход з зямлі, на якой працуе беларускі селянін, – вось асноўныя рысы вольных носьбітаў еўрапейскай культуры". Яны не маглі аказваць станоўчага ўплыву на беларускую вёску, а тым больш выконваць ролю звяна, якое звязвае польскае і беларускае сялянства.

Выцясняючы карэнных жыхароў, каланісты атрымлівалі лепшыя зямельныя надзелы. Пасля прыняцця аграрнага заканадаўства селянін разлічваў на павелічэнне свайго зямельнага надзела, аднак лепшыя землі былі аддадзены асаднікам. Таму сярод мясцовага сялянства павялічваўся зямельны голад, мацнеў ціск на вясковую беднату і абвастралася аграрная праблема. Насаджэнне асадніцтва адбывалася ва ўмовах ігнаравання інтарэсаў мясцовага сялянства, варожа былі настроены да асаднікаў

і заможныя сяляне. Апошнія бачылі ў асадніках сапернікаў, якія імкнуліся захапіць лепшыя землі. Каланістаў не любілі і мясцовыя памешчыкі, бо бачылі ў іх сваіх канкурэнтаў у барацьбе за ўплыў у эканамічным і грамадскім жыцці. Ваенныя асаднікі трымаліся паасобку нават у адносінах да цывільных каланістаў, падкрэсліваючы свой ваенны характар і ўяўляючы сябе прывілеяваным казацтвам. Ваенным асаднікам-афіцэрам належалі ў асноўным участкі зямлі па 45 га, у той час як радавыя каланісты атрымлівалі па 10–20 га зямлі. Не было згоды і сярод саміх ваенных асаднікаў, асабліва паміж афіцэрамі і радавымі. На з’ездзе памешчыкаў, які адбыўся ў лютым 1922 г. у Вільні, была нават прынята рэзалюцыя, у якой гаварылася: ”...закон аб ваенным асадніцтве шкодны для дзяржавы, не супадае з канстытуцыяй, кампраметуе ўсю польскую каланіяльную палітыку з гаспадарчага і палітычнага пунктаў гледжання”. Ваенныя асаднікі не выканалі ўскладзеных на іх абавязкаў зліцця з беларускім насельніцтвам.

Паступова польскі ўрад пачаў падтрымліваць цывільных асаднікаў, ім сталі выдавацца льготныя крэдыты, дазвалялася мець для аховы сваіх гаспадарак агнястрэльную зброю. Ім прадпісвалася наладзіць цесныя кантакты з мясцовым беларускім насельніцтвам, асабліва каталіцкага веравызнання. Аб інтэнсіфікацыі цывільнага асадніцтва сведчыць той факт, што за перыяд з 1926 па 1929 гады цывільным асаднікам было выдзелена зямлі амаль у 2 разы больш, чым вайсковым. У першыя ж гады пасля перавароту колькасны склад гэтай групы асаднікаў павялічыўся больш як у 5 разоў і склаў на пачатак 1931 г. каля 15 тыс. чалавек.

На 1 красавіка 1936 г. на тэрыторыі Заходняй Беларусі налічвалася: у Палескім ваяводстве – 7 924 цывільных асаднікаў і звыш 8 тыс. ваенных, у Навагрудскім ваяводстве – 8 243 цывільныя асаднікі і 9,5–10 тыс. ваенных, у двух паветах Беластоцкага ваяводства – 1 198 цывільных і 2,7 тыс. ваенных, у беларускіх паветах Віленскага ваяводства – 1 567 цывільных і 4,3 тыс. ваенных (усе дадзеныя адносна ваенных асаднікаў прыблізныя, таму што не ўсе асаднікі рэгістраваліся). Такім чынам, агульная колькасць асаднікаў, па афіцыйнай статыстыцы, складала 18 932 чалавека цывільных асаднікаў і звыш 25 тыс. ваенных. Усяго на землях Заходняй Беларусі было паселена каля 45 тыс. каланістаў. Рост цывільняга асадніцтва ў 1930-я гады быў актыўны. Цывільныя асады пачынаюць надавацца не толькі выхадцам з цэнтральных раёнаў Польшчы, але і мясцоваму насельніцтву, якое лаяльна адносілася да польскіх уладаў.

Адным з напрамкаў рэформы была *ліквідацыя сервітутаў*, заканадаўства аб якой з 1922 г. было распаўсюджана і на Заходнюю Беларусь. Ліквідацыя сервітутаў прадугледжвалася як добраахвотная, так і прымусовая. Для прымусовага адхілення сялян ад карыстання сервітутнымі землямі дастаткова было заявы адной зацікаўленай у гэтым

асобы. Сервітут у землекарыстанні – гэта права на сумеснае карыстанне пэўным зямельным надзелам (часцей за ўсё гэта былі выганы, выпасы, хмызнякі і інш.), якія належылі некалькім асобам. Гісторыя фарміравання сервітутаў пачыналася ў той час, калі ў сялян не было асабістай уласнасці на зямлю і сялянская жывёла магла пасвіцца па лугах і ў лясах, якія належылі памешчыкам.

Па дадзеных перапісу 1921 г. звесткі аб сервітутных землях склалі толькі 766 памешчыкаў, астатнія ўтойвалі наяўнасць сервітутаў, імкнучыся ўключыць гэтыя землі ў склад сваіх. Так, па падліках палескага ваяводы, на Палессі было 590 вёсак, якія мелі сервітутныя землі, сялянству належала 575,4 тыс. га зямлі, а сервітуты складалі 1 347 тыс. га, што амаль у два разы перавышала плошчу ворыўнай зямлі. Сервітутныя землі меліся ў 70% сялянскіх гаспадарак Заходняй Беларусі. Сялянству важна было гэтыя землі захаваць за сабой. Скасаванне права сялян на сервітуты пры недастатковасці ўласнай пашы магло прывесці да яшчэ большага пагаршэння стану заходнебеларускай вёскі.

Драматычныя абставіны ліквідацыі сервітутаў шырока абмяркоўваліся ў грамадстве. У дэкларацыі БСРГ гаварылася аб тым, што “ў выпадках спрэчак памешчыкі звяртаюцца ўжо не ў суд, як гэта было прынята раней, а ў адміністрацыйныя органы. У выніку на месца канфлікту з’яўляецца паліцыя, якая прапануе сялянам прызнаць правы памешчыка... Калі ж яны не падпарадкоўваюцца загадам, паліцыянты страляюць, б’юць, здзекуюцца, выклікаючы адмоўную рэакцыю з боку насельніцтва. Гэта бясправе ў Заходняй Беларусі набывае ўсеагульны характар, вяртаючы яе ў часы прыгоннага права”. Часцей за ўсё дзеянні сялян, адкрыта незадаволеных пазбаўленнем іх магчымасцю карыстацца сервітутамі, і выступленні супраць паліцыі кваліфікаваліся як бунт.

Пазбаўленне сялян сервітутаў падразумевала перадачу ім іншых участкаў зямлі, якія часта не маглі задаволіць сялян. Так, жыхары вёскі Белавічы Косаўскага павета замест адабранага ўрочышча ў 2 000 га атрымалі іншы ўчастак у 225 га, у дзевяць разоў меншы і значна аддалены. У выніку гэтых махінацый сяляне не маглі ім карыстацца, і зямля адышла да памешчыка. У гэтым жа самым павеце такія дзеянні былі праведзены з жыхарамі вёсак Хрышчановічы і Квасевічы.

Знясіленыя барацьбой з памешчыцкім свавольствам, сяляне звярталіся ў дзяржаўныя судовыя органы, аднак улады прымалі бок памешчыкаў. У сярэдзіне 1923 г. солтыс Сіманюк заклікаў жыхароў навакольных вёсак Олтушскай воласці Брэсцкага павета ісці ў лес, які ім належыў. Аднак на гэту тэрыторыю прэтэндаваў інжынер Май-Мескулаў. Справа скончылася тым, што паліцыянты і інжынер былі выгнаны з лесу.

Яшчэ адзін выпадак меў месца ў маёнтку Чарнёва. Памешчык Халкоўскі, распрадаючы зямлю, адначасова прадаў і сервітут вёскі Дарохі Гарадоцкай воласці Маладзечанскага павета. Калі ж новы гаспадар прыехаў араць купленую зямлю, сяляне не дазволілі яму гэтага зрабіць. У дапамогу памешчыку былі высланы паліцэйскія сілы з Гарадоцкага і Караблянскага аддзяленняў. Аднак гэта не спалохала сялян. Толькі прымяніўшы сілу, карнікі змаглі зламаць супраціўленне жыхароў вёскі.

Захоп памешчыкамі сервітутных земель у Заходняй Беларусі прыняў масавы характар у 1924–1927 гг. За гэты час у сялян былі адабраны дзесяткі тысяч гектараў зямлі,а з 1919 па 1939 г. было ліквідавана ад 2 500 да 3 000 сервітутаў. Ад гэтага пацярпела звыш 134 тыс. сялянскіх гаспадарак (38,5%). Узамен яны атрымалі толькі 225 тыс. га зямлі з 1 300 тыс. ліквідаваных сервітутных земель. Сяляне былі вымушаны за карыстанне выганам аддаваць памешчыку і асадніку сельскагаспадарчыя прадукты ці разлічвацца адпрацоўкамі.

Радыкальная беларуская газета “Сцяг народа” ў 1923 г. апублікавала ліст селяніна вёскі Калодчына Вілейскага павета, у якім гаварылася, што “людзі на самай справе пакутуюць пад цяжасцю свайго цяперашняга сацыяльна-палітычнага становішча. У нас насельніцтва вельмі малазямельнае, на 2, 3 дзесяцінах зямлі жывуць па 8–10 душ. Да гэтага часу за выпас скаціны плацілі мясцоваму памешчыку Гецэвічу маслам і яйкамі, зараз жа маёнтак падзелены паміж асаднікамі, якія атрымалі па 10–15 дзесяцін зямлі. Асаднік за выпас патрабуе адпрацоўваць – араць пар, касіць. Разваліласа хата – будаваць новую і не думай: няма лесу. А тут яшчэ і падаткі напіраюць. Не паспееш заплаціць адзін, глядзіш – ужо выдадзены другі; то на гміну, то на сеймік, то на адміністрацыю, то на школу, то на зямлю, то яшчэ бог ведае на што…” Аб яшчэ адным прыкладзе свавольства памешчыкаў і асаднікаў гаворыцца ў запыце беларускіх паслоў: “Асаднік капітан Стылінскі захапіў сервітутны луг, які належыць сялянам вёскі Квасевічы Косаўскага павета. Пагражаючы зброяй, асаднік не дапускае сялян пасвіць жывёлу на сервітутнай зямлі”. У скарзе паслоў міністру зямельных рэформ ад 27 мая 1924 г. гаварылася: “З часоў адмены прыгоннага права сяляне вёскі Зарэчча Нясвіжскага павета карысталіся сервітутным выпасам маёнтка “Зарэчча”. Пасля захопу беларускіх зямель пачалася каланізатарская палітыка на гэтай тэрыторыі, і ў першую чаргу была распачата парцэляцыя ўзгаданага маёнтка для ваенных асаднікаў. У сувязі з парцэляцыйнымі працамі сяляне вёскі Зарэчча звярталіся да павятовай зямельнай управы з просьбай пакінуць сервітутны выпас для жывёлы. Зямельная ўправа абяцала выканаць іх пажаданне, аднак у выніку аказалася, што асаднікі ўвогуле забаранілі карыстацца выпасам”.

Разам з гэтым нельга ігнараваць і дабразычлівага стаўлення памешчыкаў да сялянскага насельніцтва. Гэта было характэрна для буйных землеўладальнікаў на тэрыторыі Палесся. Так, напрыклад, вядомая на Піншчыне Соф'я Хаментоўская з роду князёў Друцка-Любецкіх са сваім мужам у іх маёнтку Багданаўка гміны Пагост-Загародск Пінскага павета практыкавала бясплатную перадачу сервітутных зямель сялянскім сем'ям для вядзення асабістай гаспадаркі. У прыватнасці, каля 2 га сервітутнай зямлі атрымала маладая сям'я Андрэя і Вольгі Савічаў, а больш блізкія да землеўладальнікаў браты Андрэй і Іван Ільючыкі, якія дапамагалі ў вядзенні "панскай" гаспадаркі, на працягу пэўнага часу бясплатна атрымалі адпаведна 11 га і 8 га.

Але ў цэлым, сітуацыя ўскладнялася агульным ходам зямельнай рэформы, якая яшчэ больш падарвала эканамічнае становішча вёскі. Усе расходы, звязаныя з ліквідацыяй цераспалосіцы і хутарызацыі, вялікім цяжарам леглі на плечы сялян. Неабходнасць прымушала сялян ісці парабкаваць да памешчыка, за ўзятую пазыку прыходзілася выплачваць высокія працэнты, а за лес адпрацоўваць у памешчыцкай гаспадарцы або расплачвацца грашыма. Хранічны недахоп фінансавыў сродкаў рабіў немагчымым набыццё сялянамі сервітутных зямель, а гэта вяло да скарачэння колькасці жывёлы ў сялян.

***Камасацыя.*** Па стане на верасень 1921 г. з 207 900 сялян Заходняй Беларусі, што мелі цераспалосныя надзелы, абсалютную большасць (каля 88,5%) складалі малазямельныя, якія валодалі да 10 га зямлі і ў сувязі з гэтым фактычна не маглі забяспечваць сябе самастойна належным чынам. Некаторыя сялянскія гаспадаркі распадаліся, напрыклад, нават на некалькі дзясяткаў невялікіх раскіданых зямельных надзелаў. Цераспалосіца ў выніку прыводзіла да марнай траты і дарэмнага празмернага выкарыстання сялянскай працы, часу і сродкаў, істотна замаруджвала і ўскладняла развіццё мясцовай аграрнай сферы, асуджала сялянства на нізкі жыццёвы ўзровень. У такой сітуацыі заходнебеларуская сельская гаспадарка не мела аніякіх далейшых перспектыў без правядзення адпаведнай рэформы, а ліквідацыя цераспалосіцы станавілася яе фундаментам, бо без яе ажыццяўлення іншыя мерапрыемствы рэформы не маглі стаць паспяховымі.

Палітычныя партыі міжваеннай Польшчы імкнуліся заваяваць сярод мясцовага сялянства папулярнасць і аўтарытэт, у сувязі з чым прапаноўвалі ўласныя варыянты вырашэння аграрнага пытання. Прадстаўленыя імі праекты неаднаразова абмяркоўваліся ў польскім Сейме, выклікалі асаблівую дыскусію і сталі асновай для прыняцця законаў аб ажыццяўленні ў дзяржаве аграрнайрэформы. Агульнапольскія легальныя партыі планавалі адначасова з аграрным пытаннем вырашыць і нацыянальнае, таму падтрымлівалі правядзенне ў Заходняй Беларусі

камасацыі пры ўмове выкупу мясцовымі сялянамі зямліў памешчыкаў за грошы. Яны спадзяваліся такім чынам аслабіць напружанасць у вёсцы і забяспечыць станоўчыя адносіны большасці сялян да польскай дзяржавы. Заходнебеларускія нацыянальна-дэмакратычныя партыі бачылі ў камасацыі сродак паляпшэння дабрабыту сялянства Заходняй Беларусі і таму падтрымлівалі яе. Разам з тым, на іх думку, камасацыя магла быць паспяховай толькі пры ўмове аказання з боку польскага ўрада ўсялякай матэрыяльнай дапамогі сялянам, якія пераходзілі на хутар: выдачы льготных банкаўскіх крэдытаў на перанясенне хат і гаспадарчых пабудоў, набыцця дадатковай ворнай зямлі і меліярацыю і г.д. З крытыкай метадаў правядзення польскімі ўладамі камасацыі выступалі КПП і КПЗБ, якія ацэньвалі ўмовы рэалізацыі камасацыі як непрыдатныя для большасці сялян і падкрэслівалі, што яна прывядзе толькі да далейшага і больш хуткага разарэння асноўнай масы вяскоўцаў, асабліва беднаты. Камуністы прапаноўвалі рэалізацыю ў Заходняй Беларусі аграрных пераўтварэнняў па савецкім прыкладзе, арганізоўвалі і ўзначальвалі сялянскія выступленні супраць камасацыі, што стварала значныя цяжкасці ў яе ажыццяўленні.

Першапачаткова пераўтварэнні ў сферы сельскай гаспадаркі міжваеннай Польшчы ішлі на падставе закона ад 15 ліпеня 1920 г. Сеймавую большасць складалі прадстаўнікі буйнога землеўладання, якія паставілі сабе мэту прыняць найбольш збалансаваны праект рэформы, што пайшоў бы на карысць як мага большай часткі землекарыстальнікаў і пры гэтым не закранаў памешчыцкага дамінавання на вёсцы. Першым і найбольш грунтоўным крокам на шляху непасрэднага заканадаўчага афармлення камасацыі стаў закон ад 31 ліпеня 1923 г. “Аб аб’яднанні зямель”, які рэгламентаваў пераход сялян на хутары, абумоўліваў усю працэдуру аб’яднання цераспалосных сялянскіх надзелаў, вызначаў асноўныя этапы ў яго ажыццяўленні, адказнасць удзельнікаў і г.д. Сярод іншых пастаноў неабходна асабліва адзначыць закон аб аграрнай рэформе ад 28 снежня 1925 г. і сумеснае распараджэнне Міністэрства сельскай гаспадаркі і рамёстваў і Міністэрства фінансаў міжваеннай Польшчы ад 14 студзеня 1927 г. “Аб аказанні дзяржаўнай крэдытнай дапамогі пры аб’яднанні зямель”, дзякуючы якому планавалася паскорыць рэалізацыю камасацыі праз выдачу сялянам крэдытаў. Пераход сялян асобнай вёскі на хутары з-за вялікага аб’ёму работ і неабходнасці афармлення значнай колькасці патрабуемых дакументаў быў доўгім і складаным, звычайна зацягваўся, але з цягам часу скараціўся дзякуючы некатораму ўдасканаленню працэдуры камасацыі і назапашванню надзвычай карыснага вопыту ажыццяўлення аграрных пераўтварэнняў.

Неабходнасць ліквідацыі цераспалосіцы на заходнебеларускіх землях разумелі яшчэ царскія ўлады, але ў 1906–1914 гг. у выніку

сталыпінскай рэформы на хутары перайшла толькі каля 7–8% ад патрэбнага. У Заходняй Беларусі польскія ўлады распачалі правядзенне камасацыі фактычна з 1924 г. і працягвалі яе да верасня 1939 г., калі пачалася Другая сусветная вайна, якая спыніла існаванне польскай дзяржавы і адпаведна працэдуру камасацыі. Тэмпы камасацыі ў Заходняй Беларусі паскорыліся з 1927 г. дзякуючы выхаду ў свет распараджэння аб выдачы ільготных банкаўскіх крэдытаў сялянам, якія пераходзілі на хутар. Разам з тым не ўсе сяляне маглі своечасова выплачваць узятыя на камасацыю крэдыты, што ў многіх выпадках яшчэ больш абцяжарвала сітуацыю. У 1921–1928 гг. былі распрацаваны асновы аграрнай палітыкі міжваеннай Польшчы і вызначаны яе галоўныя накірункі. Новыя ўлады ажыццявілі даволі значныя работы па падрыхтоўцы рэалізацыі камасацыі, у многіх вёсках распачаліся работы па аб’яднанню надзелаў. На першым этапе рэалізацыі камасацыі ў Заходняй Беларусі дзяржаўныя ўлады сутыкнуліся з цэлым шэрагам рознага роду праблем (галоўным чынам неспрыяльныя прыродныя ўмовы і цяжкае матэрыяльнае становішча мясцовага сялянства), што абумовіла першапачаткова невысокія тэмпы рэалізацыі камасацыі: за 1921–1929 гг. сярэднія паказчыкі камасацыі ў Заходняй Беларусі складалі каля 4 100 гаспадарак абшарам 43 360 га штогод. Большасць заходнебеларускага сялянства падтрымлівала камасацыю як сродак мадэрнізацыі асабістай гаспадаркі, але пры гэтым марна спадзявалася на вялікую дапамогу з боку дзяржавы.

У надзвычай складаных умовах сусветнага эканамічнага крызісу 1929–1933 гг. магчымасці польскага ўрада па аказанні сялянам дапамогі на перасяленне на хутары істотна зменшыліся і таму аплачваць ажыццяўленне работ па камасацыі яны павінны былі пераважна самастойна. Мясцовыя зямельныя ўправы мелі таксама абмежаваныя магчымасці тэхнічнага характару і не маглі своечасова справіцца з вялікім аб’ёмам землеўпарадкавальных работ, што стала яшчэ адной з перашкод на шляху аб’яднання цераспалосных надзелаў. Польскія ўлады бачылі ў камасацыі сродак супрацьвагі негатыўнаму ўплыву эканамічнаму крызісу ў сферы сельскай гаспадаркі, надавалі ёй асаблівае значэнне. У цэлым скамасаваныя гаспадаркі ў негатыўных умовах сусветнага эканамічнага крызісу аказаліся больш устойлівымі і падрыхтаванымі дзякуючы інтэнсіфікацыі і рацыяналізацыі метадаў і форм апрацоўкі зямлі.

Разам з тым дзяржава ва ўмовах крызісу 1929–1933 гг. не магла аказваць ім дапамогу (перш за ўсё ў форме крэдытаў) у поўным аб’ёме. У сувязі з гэтым улады абмяжоўваліся ў першую чаргу адтэрміноўкай плацяжоў па крэдытах і прапагандай магчымай карысці камасацыі праз дзейнасць сельскагаспадарчых гурткоў, арганізацыю рознага роду асветніцкіх мерапрыемстваў, паказных узорных гаспадарак,

сельскагаспадарчых конкурсаў, выстаў і г.д. Дзякуючы гэтаму павышаўся ўзровень агульнай культуры і агратэхнічнай падрыхтоўкі заходнебеларускага сялянства (асабліва моладзі). У выніку тэмпы камасацыі ў разглядаемы перыяд даволі істотна (у 4–4,5 разы) паскорыліся: у 1929–1933 гг. у Заходняй Беларусі штогод было скамасавана каля 20 065 гаспадарак памерам 174 900 га. Такі поспех стаў магчымым у першую чаргу дзякуючы непамерным высілкам мясцовых сялян.

У 1934–1939 гг. эканамічная сітуацыя ў Польшчы часткова палепшылася дзякуючы мінімізацыі наступстваў сусветнага крызісу і паступовай стабілізацы і фінансавай сферы. Кошт сельскагаспадарчых тавараў вырас, што садзейнічала заможнасці сялянства і, як вынік, далейшаму паскарэнню тэмпаў камасацыі. За азначаны перыяд уладамі ў сярэднім штогод было скамасавана 23 680 гаспадарак агульным памерам каля 140 000 га, але гэта ўжо станавілася відавочна недастатковым, улічваючы вялікі аб'ём работ, якія яшчэ патрэбна было правесці. У польскім грамадстве неаднаразова агучвалася думка аб неабходнасці далейшага паскарэння тэмпаў ажыццяўлення камасацыі, але рэалізаваць гэта на практыцы было фактычна нерэальна ў сілу рознага роду прычын. Усяго да верасня 1939 г. польскімі ўладамі ў Заходняй Беларусі была праведзена камасацыя каля 259 300 гаспадарак (30% ад плана) абшарам прыкладна 1 930 000 га (35,5%).

У выніку камасацыя аказала вялікае ўздзеянне на развіццё вёскі і сацыяльнае расслаенне мясцовага насельніцтва. Па выніках камасацыі селянін атрымліваў зямлю звычайна ў адным-двух месцах, што спрашчала вядзенне асабістай гаспадаркі і стварала перспектыўныя ўмовы для яе арганізацыі ў новых абставінах. Разам з тым гэты працэс быў вельмі затратным і складаным, патрабаваў ад дзяржавы аказання вяскоўцам сутнаснай і мэтанакіраванай дапамогі, якая была абмежаванай і выбарачнай (у першую чаргу сялянам-каталікам і асобам, лаяльным да польскага панавання). Пры камасацыі польскі ўрад праводзіў сярод сялянства Заходняй Беларусі дыскрымінацыйную палітыку з мэтай паставіць яго ў залежнасць ад сябе і забяспечыць сваё далейшае панаванне на новадалучаных землях. Адначасова ўлады ў адказ на шматлікія просьбы сялян Заходняй Беларусі аб надзяленні іх дадатковай зямлёй падкрэслівалі неабходнасць пераходу мясцовых гаспадарак на інтэнсіўны шлях развіцця (праз выкарыстанне новых метадаў апрацоўкі зямлі і больш прадуктыўных форм арганізацыі працы), а не экстэнсіўны (дзякуючы механічнаму павелічэнню зямельнага надзелу).

У цэлым камасацыя ішла на карысць пераважна заможным сялянам і часткова сераднякам, якія мелі на гэта дастаткова сродкаў і таму былі лепш падрыхтаваны да такіх структурных змен. Пераход на хутары дазваляў

азначаным катэгорыям вяскоўцаў інтэнсіфікаваць сваю гаспадарку, скараціць транспартныя расходы, звязаныя з перамяшчэннем прылад працы, насення і ўгнаенняў, палепшыць апрацоўку зямлі, павялічыць яе прадукцыйнасць, больш шырока выкарыстоўваць перадавыя тагачасныя метады арганізацыі асабістай гаспадаркі: перш за ўсё сельскагаспадарчыя машыны, селекцыйныя пароды жывёл і гатункі раслін, штучныя ўгнаенні і г.д.

Для беднякоў камасацыя стала цяжкім выпрабаваннем. Многія з іх у выніку разараліся, але гэта было непазбежным вынікам развіцця на вёсцы капіталізму і паскарэння працэсаў сацыяльнай дыферэнцыяцыі сялянства. Разам з тым многія з бедных сялян атрымлівалі магчымасць наймацца на працу да сваіх больш багатых суседзяў, гаспадаркі якіх былі лепш прыстасаваны да капіталістычных умоў, дзякуючы чаму маглі пераняць неабходны вопыт для перабудовы асабістай гаспадаркі.

У канчатковым выніку камасацыя не была даведзена польскімі ўладамі да канца і таму не змагла цалкам выканаць пастаўленыя перад ёю задачы. Разам з тым камасацыя спрыяла развіццю вытворчых сіл у сельскай гаспадарцы і стварэнню шматлікіх гаспадарак фермерскага характару, часткова паслабіла сацыяльную напружанасць на вёсцы і стала для сялян у некаторай ступені аддушынай. Яна садзейнічала паляпшэнню дабрабыту вяскоўцаў, спецыялізацыі сялянскіх гаспадарак па вырошчванні асобных відаў культур, павышэнню культуры апрацоўкі зямлі, яе ўраджайнасці і ўвыніку павелічэнню агульнага збору ўраджаю, складванню агульнага ўнутранага рынку і станаўленню ў аграрнай сферы Заходняй Беларусі таварна-рынкавых адносін. Камасацыя была складаным і супярэчлівым працэсам, які нельга ацаніць адназначна, але дзякуючы ёй мясцовая сельская гаспадарка зрабіла ў цэлым даволі істотны крок наперад у сваім развіцці.

***Натуральныя працоўныя павіннасці (шарваркі)*** (ад ням. *Scharwerk*, *Schar* – натоўп, атрад, грамада, *Werk* – дзеянне, справа, работа) мелі вялікае значэнне ў гаспадарча-эканамічных жыцці Заходняй Беларусі. Яны адносіліся да кампетэнцыі павятовых і гмінных органаў мясцовага самакіравання. Яны вызначалі змест і аб’ём работ і іх грашовы эквівалент, памеры заданняў для выкананняў па добраўпарадкаванні дарог (даўжыні, вышыні і шырыні выкананай праезжай часткі), аб’ём патрэбнай зямлі і колькасць неабходных матэрыялаў з улікам адлегласці іх дастаўкі, аб’ём рвоў, якія патрэбна было выкапаць альбо паглыбіць, прымалі рашэнне аб будаўніцтве новых і рамонце старых мастоў, аб правядзенні меліярацыйных і іншых раброт, рэгламентуючы нават нязначныя віды прац, на якія выдаткоўвалі сродкі і грошы.

У прыватнасці, Міжлеская гмінная рада Пружанскага павета 12 студзеня 1932 г. пасля падвядзення вынікаў выканання шарваркавых

прац у 1931 г. прыняла Палажэнне аб выкарыстанні дарожнай павіннасці на тэрыторыі гміны на 1931–1932 гг. Гмінная ўправа ў справаздачы паінфармавала раду аб рамонце гмінных дарог і выкананні меліярацыйнага шарварка ў 1931–1932 гг. з указаннем тэрміну прац на адпаведных дарогах і каналах, іх даўжыні і шырыні, сярэдняй вышыні паднятай праезжай часткі, аб'ёму прывезенай зямлі, сярэдняй адлегласці давозу зямлі, каменю, фашыны, колькасці ўжытых матэрыялаў і адлегласць іх дастаўкі, выкапаных і паглыбленых рвоў, збудаваных новых і адрамантаваных старых мастоў. Справаздача была дастаткова дакладная, улічваліся нават асобныя нязначныя віды прац, у прыватнасці, за прыборку прыдарожнай таполі, якая ўпала ў час буры, было выдаткавана каля 10 зл., а 20–26 верасня 1931 г. шарваркавыя працы былі перарваны дажджом. Урад гміны выказаў згоду на замену натуральнай павіннасці на аплату грашыма ці матэрыяламі, вартасць аднаго рабочага дня пешага – 2 зл., фурманкі аднаканёвай – 4 зл., фурманкі двухконнай – 6 зл., кубічны метр фашыны ў лесе – 0.5 зл., прывезенай з уласнага лесу з адлегласці 4 км да дарогі і ўкладзенай шчыльна ў стосы – 1,5 зл., з 8 км – 2 зл., з 12 км – 3 зл. 1 м$^3$ каменя, дастаўленага на месца працы і ўкладзенага ў штабель: давезенага да 4 км – 15 зл., да 8 км – 18 зл., да 13 км – 20 зл., метр апрацаванай сасновай драўніны не меней 20 см на пню – 35 зл. і інш.

На 1932–1933 гг. праграма работ меліярацыйнага шарварку Міжлескай гміны прадугледжвала расчыстку 21,5 км каналаў, выкопванне новага каналу на 20,5 км і ўдзелу 10 650 работнікаў. Работы дарожнага шарварка на гэты час патрабавалі ўсяго на розныя гмінныя дарогі агульнай працягласцю 82 км і на павятовую дарогу 15 км – 4 186 пешых днёвак, 4 514 аднаконных, фашыны 300 м$^3$ і 4 178 зл.

Мясцовыя ўлады ажыццяўлялі нагляд за выкананнем шарваркаў, абмяжоўваючы свавольства цывільных і вайсковых улад у выкарыстанні шарваркавых магчымасцей, у прыватнасці фурманкавай. Так, пружанскі павятовы староста 21 сакавіка 1922 г. патрабаваў ад гмінных урадаў, магістратаў, начальнікаў раёнаў падрабязную інфармацыю аб выкарыстанні падвод, запатрабаваных рознымі дзяржаўнымі раённымі і гміннымі ўладамі, солтысамі вёсак. Стараста рэгламентаваў дадзеную сферу распараджэннямі аб рэквізіцыі і выкарыстанні коней для падводнай павіннасці, аб недапушчэнні п'янай і травай язды для бяспекі руху і ахове дарог ад псавання, аб коштах за карыстанне дарогамі (да 10 км – парнаконная падвода 30 гр., аднаконная 20 гр.), аб фінансаванні магістратамі і гміннымі ўрадамі прац па будаўніцтве мастоў.

Дакументы мясцовага справаводства ўтрымліваюць інфармацыю і аб фактычным удзеле жыхароў, якія адбывалі шарварак. Напрыклад, звесткі Рэвяціцкай гміннай управы Пружанскага павета за 1932 г. даюць уяўленне

аб персанальнай раскладцы павіннасці сярод 1 546 жыхароў гміны з указаннем віду прац, колькасці днёвак, суме грашовага замяшчэння і штрафаў за непрыбыцё на работу з улікам прадстаўленых фінансавых дакументаў і г.д. У сярэднім за год правацавалі прыблізна па 5–6 дзён, былі асобы, якія працавалі і па 8–10 дзён. Адзін дзень працы пешшу звыш адведзенага падаткам каштаваў 1,5 зл, аднаконны – 3 зл. Памер шарваркавай павіннасці залежыў ад памеру і якасці зямельнай маёмасці, большы памер і больш высокая катэгорыя зямельнай уласнасці вымагала ад землеўладальніка большага ўдзелу ў выкананні адпаведных работ у натуральным ці грашовым выглядзе.

Нарматыўна-прававая база шарваркаў дапускала існаванне т.зв. акордавых работ з мінімальнымі нормамі працы на працягу васьмі гадзін. Удзел у грамадска-дзяржаўных справах мог быць павялічаны пры ўмове атрымання суб’ектам гаспадарання пэўных даброт ад дзяржаўных ці мясцовых органаў улады. Шарваркавыя абавязкі маглі быць перагледзены і скарэктаваны на карысць грамадзян, якія маглі быць вызвалены ад удзелу ў выкананні шарваркавай павіннасці часткова ці цалкам на падставе ўважлівых прычын, якія выкладаліся ў пісьмовых зваротах на імя мясцовай адміністрацыі. У прыватнасці, жыхары Верцялішскай гміны неаднойчы выкарыстоўвалі такую магчымасць падтрымання свайго матэрыяльнага стану, аргументуючы просьбу панясеннем выдаткаў на рамонт будынкаў і пакупку жывога інвентара, па стараці, у сувязі з камасацыяй і пераносам гаспадаркі на калонію. Сустракаліся просьбы аб скарэктаванні шарваркавай дарогі, ад створаных у час камасацыі новых паселішчаў, якія прасілі дазволіць адпрацоўваць шарварак на дарогах сваёй, а не чужой вёскі і інш. У выпадку перадачы зямлі ў карыстанне іншай асобе без юрыдычнага афармлення, падаткавы і шарваркавы цяжар неслі юрыдычныя землеўладальнікі, звяртаючыся да гміннай управы з просьбай пераразмеркаваць працоўную павіннасць паміж ім і землекарыстальнікамі. Паводле Цыркуляра Міністэрства ўнутраных спраў ад 11 лютага 1933 г., ад падводнай павіннасці вызваляліся сяляне, якія аддалі сваіх коней для падрыхтоўкі кракусаў (krakusów) – кавалерыі з мясцовага насельніцтва.

Што тычыцца вартавой павіннасці, то, не выключаючы яе прымусова-размеркавальны характар, адзначым факты выплаты дарожнымі павятовымі службамі значных сумаў аплат за вартаўніцтва пры правядзенні шарваркавых работ.

Наяўныя дакументы не пацвярджаюць інфармацыю аб этнасацыяльнай абумоўленасці і дыскрымінацыйнай сутнасці шарваркавай павіннасці ў дачыненні да беларускіх сялян. Адпаведныя абавязкі павінны былі выконваць усе грамадзяне ў незалежнасці ад сацыяльнай і нацыянальнай прыналежнасці. Агучаныя савецкімі аўтарамі выпадкі

ўдзелу сялян у выкананні работ на карысць буйных землеўладальнікаў трэба выносіць за рамкі шарваркаў, яны, відавочна, ажыццяўляліся па-за адпаведным нарматыўна-прававым полем.

Матэрыялы вуснай гісторыі згадваюць работы па асушэнні балотаў, за ўдзел у якіх "паны" кармілі абедам і давалі адзін злоты ў дзень, распаўсюджанай з'явай заходнебеларускай рэчаіснасці была наяўнасць шматлікіх праектаў мясцовага ўзроўню, звязаных з будаўніцтвам дарог, рэалізацыяй меліярацыйных праектаў, якія фінансаваліся ўладамі, давалі заробак многім беспрацоўным палешукам і адчувальна паляпшалі эканамічнае і культурнае "самаадчуванне краю".

Натуральныя працоўныя павіннасці на Палессі і ў цэлым на беларускіх землях у складзе міжваеннай Польшчы былі істотным сродкам ажыццяўлення значных для грамадства і дзяржавы сацыяльна-эканамічных праектаў, забяспечвлі значную ступень гаспадрчай самастойнасці і самадастатковасці. Шарваркі, як характэрную асаблівасць сацыяльна-эканамічнага жыцця Заходняй Беларусі 1920–1930-х гг., трэба разглядваць як грамадзянскі абавязак насельніцтва па ажыццяўленні значных для дзяржавы і грамадства рамонтна-будаўнічых мерапрыемстваў (будаўніцтва і рамонт дарог, мастоў, грэбляў, каналаў, грамадскіх будынкаў і інш.). Шарварак ажыццяўляўся праз выкананне пэўных работ і фінансаванне, памер якіх усталёўваўся мясцовымі прадстаўнічымі і выканаўчымі ўладамі, залежыў ад канкрэтных патрэб часу і рэгіянальнай спецыфікі. Удзел у працах мог быць заменены ўнясеннем адпаведных грашовых сум, якія ішлі на аплату правядзення патрэбных работ, гэта стварала магчымасць заробка для зацікаўленага насельніцтва, што ва ўмовах беспрацоўя мела вялікае сацыяльнае значэнне.

Разам з гэтым, пры ажыццяўленні шарваркавых работ былі частымі выпадкі злоўжывання як чыноўнікаў, так і прыватных асоб, якія выкарыстоўвалі шарваркавыя магчымасці не па прызначэнні, што дадаткова ўскладняла гаспадарча-эканамічны і грамадска-палітычны стан.

Нявырашанасць аграрных праблем, цяжкае сацыяльна-эканамічнае становішча сялянства, свавольства польскай адміністраці, абшарнікаў і асаднікаў спалучалася з палітыкай паланізацыі і асіміляцыі, садзейнічала развіццю сялянскага руху ў розных формах яго праяўлення.

### Тэма 8. Прамысловасць і рамяство

***Прамысловае развіццё*** Заходняй Беларусі ў перыяд яе ўваходжання ў склад Польшчы адзначалася нераўнамернасцю і цыклічнасцю. Кіраўніцтва Польшчы разглядала край як крыніцу таннай сыравіны і рынак збыту прамысловай прадукцыі, выробленай у цэнтральных раёнах дзяржавы. Прамысловасць Заходняй Беларусі была арыентавана на

перапрацоўку мясцовай сыравіны і выпуск паўфабрыкатаў. Будаўніцтва фабрык і заводаў, чыгункі на тэрыторыі заходнебеларускіх зямель практычна не праводзілася. На тэрыторыі Заходняй Беларусі не было цяжкай прамысловасці, амаль поўнасцю адсутнічалі буйныя прадпрыемствы.

Найбольш буйнымі прадпрыемствамі з'яўляліся запалкавая фабрыка "Прагрэс-Вулкан" у Пінску, тытунёвая і фанерная ў Гродна, фанерная фабрыка ў Мастах Гродзенскага павета, шклозавод "Нёман" у Лідскім павеце і фабрыка гумавых вырабаў "Ардаль" у Лідзе.

Самым буйным прамысловым цэнтрам края быў Беласток і яго прыгарады, дзе канцэнтраваліся прадпрыемствы тэкстыльнай прамысловасці. На іх працавала ў сярэднім да 5 тыс. чалавек.

У прамысловасці, на транспарце і камунікацыі колькасць рабочых 4-х паўночна-усходніх ваяводстваў згодна з перапісам 1931 г. складала 128 тыс. Гэта было значна менш у параўнанні з агульнапольскімі паказчыкамі, нягледзячы на павелічэнне агульнага яго колькаснага ліку, што яскрава сведчыла аб аграрна-сыравінным характары рэгіёна. Большасць з іх было занята ў дрэваапрацоўчай і харчовай прамысловасці. Прычым эканамічнае становішча рабочых гэтага рэгіёна было горшым, чым у цэнтральных і заходніх ваяводствах краіны. Яго характэрнымі рысамі з'яўлялася дамінаванне ручной працы, амаль поўная адсутнасць тэхнікі бяспекі, фактычна неабмяжаваны рабочы дзень, антысанітарныя ўмовы працы, нізкі ўзровень заработнай платы. Прычым тэндэнцыя больш нізкай заработнай платы захоўвалася да верасня 1939 г. Так, у сакавіку 1925 г. у адной з высокааплачваемых галін – паліграфічнай – заработная плата рабочых-тэкставікоў у Вільні складала 9,38 злотых, а ў Варшаве – 16,72 злотых у тыдзень. На жнівень 1935 г. сярэдні заробак па Беластоцкаму ваяводству складаў 0,55 зл., Віленскаму – 0,58 зл., Навагрудскаму – 0,28 зл., Палескаму – 0,42 зл., у той час як у Варшаўскім – 0,66 зл., а для ўсёй Польшчы – 0,63 зл. у гадзіну. Шырока распаўсюджаная сістэма штрафаў яшчэ больш змяншала заробкі рабочых.

Сярэдні заробак за месяц кваліфікаванага рабочага ў 1934–1938 гг. складаў, напрыклад, у беластоцкага тэкстыльшчыка 120 зл. (у час крызісу 80–100 зл.), у работніка лесапільні – каля 100 зл. (у 1930–1934 гг. – 80 зл.). На сям'ю з 4-х чалавек у месяц на харчаванне неабходна было, як мінімум, 60 зл.; за жылое памяшканне каля 20 зл., адзенне і абутак – каля 8 зл., камунальныя паслугі – 7 зл. і г.д. Такім чынам, бюджэт нават кваліфікацыванага работніка быў досыць сціплым. Пастаянным спадарожнікам прамысловага развіцця края было хранічнае беспрацоўе. У выніку крызісу 1929–1933 гг. спынілі працу 230 прадпрыемстваў, а колькасць рабочых у 1933 г. зменшылася больш чым на 40%. Колькасць

жа афіцыйна зарэгістраваных беспрацоўных у канцы 1933 г. склала 9 500 чалавек. На ўлік браліся толькі тыя, хто прапрацаваў да звальнення не менш 6 месяцаў (пастанова Сейма ад 17 сакавіка 1932 г.). Дапамогі выплочваліся на працягу не болей 13 тыдняў, аб дапамозе пры частковым беспрацоўі нават не ўспаміналася. Беспрацоўе выкарыстоўвалася як сродак для зніжэння платы, павышэння інтэнсіўнасці працы, працягласці рабочага дня.

Вядучымі галінамі заходнебеларускай прамысловасці з'яўляліся *лясная, харчовая, мінеральная і тэкстыльная*. У разглядаемы перыяд з усіх галін прамысловасці Заходняй Беларусі пераважнае развіццё атрымала лясная прамысловасць – галіна са значным удзелам польскага дзяржаўнага і замежнага капіталу.

Лясы заходнебеларускіх зямель складалі 37% лясоў Польшчы. Велізарныя лясныя масівы належалі дзяржаве і сістэматычна павялічваліся за кошт куплі памешчыцкіх маёнткаў. З 1921 г. па кастрычнік 1937 г. плошча дзяржаўных лясоў павялічылася ў Віленскім, Навагрудскім і Палескім ваяводствах з 784,1 тыс. га да 930 тыс. га. На 1 кастрычніка 1937 г. дзяржаўныя лясы ў Беластоцкім ваяводстве складалі 67,2% (532,4 тыс. га), у Віленскім – 41,8% (257,5 тыс. га), у Навагрудскім – 42% (221,6 тыс. га), у Палескім – 40,7% (450,9 тыс. га) плошчы ўсіх лясоў. Лясная прамысловасць, да якой адносіліся лесанарыхтоўчая, лесапільная, фанерная і запалкавая галіны, адыгрывала вялікую ролю ў гаспадарчым жыцці міжваеннай Польшчы. Лес быў адной з асноўных крыніц польскага экспарту. За мяжу вывозілася звыш 70% драўніны, у той час як на ўнутраныя патрэбы ішло менш за 30%. Каля 80% экспартуемай драўніны складалі лесаматэрыялы з Заходняй Беларусі.

Пасля Першай сусветнай вайны ў лясной прамысловасці назіраўся перыяд высокай кан'юнктуры. Ва ўмовах інфляцыі капіталісты значна павялічылі норму дабаўленага кошту. Акрамя таго, інфляцыя садзейнічала павышэнню канкурэнтаздольнасці Польшчы на знешніх рынках, а нізкія чыгуначныя тарыфы спрыялі вывазу драўніны і іншай сыравіны. Вельмі актыўна ў лясную прамысловасць укладвалі капітал замежныя і польскія манаполіі. Так, у 1922 г. урад Польшчы прадаў пад высечку англійскім лесапрамыслоўцам большую частку лясоў Белавежскай пушчы, а замежнаму прамыслова-гандлёваму акцыянернаму таварыству "Swierk" – Налібоцкай. У 1927 г. акцыянернае англаеўрапейскае таварыства купіла лясы ў Слонімскім і Стаўбцоўскім паветах. У 1928 г. англійская акцыянерная кампанія "Continent" купіла на высечку 6 тыс. га лесу ў Вілейскім павеце. Падчас сусветнага эканамічнага крызісу 1929–1933 гг. англійская фірма "Gips Timber Forest compani" набыла ў Лунінецкім павеце ўсю маёмасць таварыства "Бобрык", у тым ліку лесапільны завод у

Малькавічах. Іншаземны капітал у дрэваапрацоўчай прамысловасці Заходняй Беларусі ў даследуемы перыяд складаў 46,3%.

Характэрнымі рысамі лясной прамысловасці Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. былі яе залежнасць ад знешніх рынкаў і арыентацыя выключна на экспарт. Перавагу мела дрэваапрацоўчая галіна лясной прамысловасці, якая развівалася на мясцовай сыравіне. Выгадныя водныя зносіны, сувязь з Балтыйскім морам спрыялі развіццю гэтай галіны прамысловасці. Колькасць прадпрыемстваў і колькасць рабочых у ёй у параўнанні з 1913 г. павялічылася больш чым у 2 разы. На першым месцы ў лесапільнай прамысловасці па колькасных і якасных паказчыках знаходзілася Беластоцкае ваяводства (з 348 лесапільных заводаў Заходняй Беларусі на гэтае ваяводства прыходзілася 109, сярод іх 2 найбольш буйныя з лікам рабочых ад 200 да 500).

Пры дапамозе польскага ўраду ў лясную прамысловасць Заходняй Беларусі шырока пранікаў замежны капітал. Манаполіі карысталіся ільготнымі тарыфамі на дзяржаўных чыгунках і на ільготных умовах атрымлівалі электраэнергію ад дзяржаўных электрастанцый. Большая частка дзяржаўных лесапільных заводаў была здадзена ў арэнду буйным замежным фірмам. Апроч таго па заніжаных цэнах ім выдзяляліся і ўчасткі дзяржаўнага лесу для сыравіны. Таму пад кантролем замежных манаполій знаходзіліся і дрэваапрацоўчыя прадпрыемствы польскіх акцыянерных кампаній.

Сярод галін лясной прамысловасці Заходняй Беларусі асноўнае месца займала *дрэваапрацоўчая прамысловасць*, якая аб'ядноўвала лесанарыхтоўчую і лесапільную галіны. Таннасць сыравіны і працоўнай сілы, блізкасць чыгункі і воднай артэрыі – усё гэта спрыяла яе развіццю. Заходняя Беларусь з'яўлялася галоўным пастаўшчыком таннай неапрацаванай драўніны за мяжу (каля 80% агульнапольскага экспарту складалі лесаматэрыялы з Заходняй Беларусі). Значную яе частку складала драўніна з парод, якія валодалі каштоўнымі тэхнічнымі асаблівасцямі (асіна, алешына, хвоя).

Асноўнымі прадуктамі лесанарыхтоўчай галіны з'яўлялася бярвенне, тэлеграфныя і тэлефонныя слупы, рудніковыя стойкі і балансы для вытворчасці драўлянай масы і цэлюлозы. На лесанарыхтоўчых прадпрыемствах працавалі пераважна сельскагаспадарчыя сезонныя рабочыя. Найбуйнейшым лесанарыхтоўшчыкам у Заходняй Беларусі былі "Дзяржаўныя лясы" – прадпрыемства, якому толькі ў Беластоцкім ваяводстве належала каля 0,5 млн га. Яго панаванне ў лясной гаспадарцы прывяло да ліквідацыі значнай колькасці дробных прадпрыемстваў, асабліва ў гады сусветнага эканамічнага крызісу. Так, у 1930 г. было ліквідавана 40% такіх устаноў.

Колькасць лесанарыхтоўчых прадпрыемстваў у заходнебеларускіх ваяводствах у 1931 г. была наступнай: у Віленскім ваяводстве – 62 (у 1929 г. налічвалася 266), у Беластоцкім – 25 (у 1929 г. – 74), у Навагрудскім – 108 (у 1929 г. – 153), у Палескім – 119 (у 1929 г. – 272). Лесапільная прамысловасць Заходняй Беларусі вырабляла піламатэрыялы, дошкі, паўфабрыкаты. На першым месцы па колькасных і якасных паказчыках было Беластоцкае ваяводства. Па дадзеных на 1931 г., з 348 лесапільных заводаў 109 знаходзілася ў Беластоцкім ваяводстве. Сярод іх буйны лесапільны завод у вёсцы Чорная Весь (на ім працавала 600 рабочых), які размяшчаўся на чыгунцы Беласток – Вільня і належыў “Дзяржаўным лясам”; лесапільны завод Данчыка, Готліба і Семяціцкага ў Супраслі; лесапільны завод Расткера і Ко. У 1934 г. прадпрыемствам “Дзяржаўныя лясы” было адкрыта 35 лесапільных заводаў, 124 лесапільныя рамы якіх перааапрацоўвалі 1 150 тыс. м$^3$ сыравіны, абсалютную большасць якой складалі іглічныя пароды: хвоя, елка, піхта, астатняе – лісцевыя (бук і дуб).

Галоўным спажыўцом прадукцыі дзяржаўных лесапільных заводаў была Англія, куды пастаўлялася 75% усяго экспарту лесу. Попыт на піламатэрыялы як на ўнутраным, так і на знешніх рынках быў звязаны з аднаўленнем гаспадаркі пасля Першай сусветнай вайны. У 1927–1928 гг. лесапільная вытворчасць развівалася хуткімі тэмпамі. Гэтаму ў некаторай ступені спрыяла заключанае 30 лістапада 1927 г. часовае пагадненне паміж Польшчай і Германіяй (дзейнічала да 1930 г.) па экспарце ў Германію лесу. Згодна з ім, у 1927 г. з Польшчы было вывезена 484 тыс. тон піламатэрыялаў, ў 1928 г. – 688 тыс. тон. У 1929–1930 гг. штогод у Германію вывозілася каля 470 тыс. тон, але ўжо ў 1931 г. вываз лесу рэзка скараціўся да 36 тыс. тон, а ў 1932 і 1933 гг. ён склаў адпаведна 5 і 11 тыс. тон. Адной з прычын спаду экспарту лесу лічыцца заканчэнне тэрміну пагаднення з немцамі. На зніжэнне экспарту ў той ці іншай ступені паўплывала і пагаршэнне польска-германскіх адносін, асабліва пасля заключэння ў 1932 г. савецка-польскай дамовы аб ненападзенні.

Найбольш буйныя цэнтры лесапільнай прамысловасці знаходзіліся каля чыгуначных вузлоў. Так, каля станцыі Гайнаўка яшчэ ў перыяд нямецкай акупацыі часоў Першай сусветнай вайны былі пабудаваны лесапільныя прадпрыемствы і завод па сухой перагонцы дрэва. Гэты завод польскай дзяржавай быў пераабсталяваны, тэхнічна ўдасканалены і стаў самым буйным заводам па сухой перагонцы дрэва ва ўсёй Польшчы: ён меў 2 пары рухавікоў магутнасцю 60 к.с. і 4 аддзяленні, якія ахоплівалі 128 перагонных кубоў, кожны аб’ёмам 3 м$^3$. Асноўнымі прадуктамі вытворчасці былі драўляны спірт, паташ і смала. З 1923 г. завод знаходзіўся ў арэндзе ў акцыянернага таварыства “Grodzisk” (асноўны

капітал 3,25 млн злотых). Завод у Гайнаўцы выробляў толькі паўфабрыкаты для хімічных прадпрыемстваў Польшчы. Заводу неабходна было забяспечыць патрэбы прамысловасці карэннай Польшчы, а таксама ажыццяўляць экспарт у Англію, Швейцарыю і Францыю. «Grodzisk» займаўся перапрацоўкай выключна лісцевых парод дрэва, якое не магло быць выкарыстана ў якасці будаўнічага матэрыялу. Вытворчая магутнасць завода складала 100 тыс. м$^3$; яму належалі электрычная станцыя і 2 паравыя машыны магутнасцю 500 к.с.

Акрамя гэтага прадпрыемства, у Белавежскай пушчы было яшчэ некалькі заводаў па сухой перагонцы дрэва, якія належалі фірме “Terebenthen”. Найбольш буйныя прадпрыемствы “Terebenthen” знаходзіліся ў Гайнаўцы і Сточцы і спецыялізаваліся на вытворчасці з хвоі тэрпенціну (жывіцы), смалы, каніфолі, толю (асфальтавай паперы для пакрыцця дахаў) і г.д. Капітал фірмы складаў 700 тыс. зл., а на яе прадпрыемствах налічвалася 250 працоўных. Прадпрыемствы былі адкрыты ў шэрагу населеных пунктаў Белавежскай пушчы, дзе меліся невялікія фабрыкі тэрпенціну (Гайнаўка, Бялы-Лясак, Чарлянка, Дэмбова, Гарбач, Алёнка, Ляцке, Нарэўка, Альхоўка, Пераралока, Скуравол, Савэ і Гапіла).

Беластоцкае ваяводства ў прамысловым развіцці знаходзілася вышэй за іншыя паўночна-ўсходнія ваяводствы Польшчы. На яго прыходзілася каля 40% прадукцыі дрэваапрацоўчай прамысловасці, у той час як на астатнія тры ваяводствы – Віленскае, Навагрудскае і Палескае – разам каля 60%. Дрэваапрацоўчая прамысловасць Беластоцкага ваяводства развівалася ў больш спрыяльных умовах: яно знаходзілася бліжэй не толькі да ўнутраных, але і да знешніх рынкаў збыту, таму несла значна меншыя транспартныя выдаткі. Гэта мела важнае засцерагальнае значэнне ў час крызісу 1929–1933 гг.

Буйнымі дрэваапрацоўчымі цэнтрамі ў Навагрудскім ваяводстве з’яўляліся Ліда, Слонім, Валожын, Воранава, Дзятлава, Шчучын, Быцень. У Лідскім павеце налічвалася 10 лесапільняў (6 з іх знаходзілася ў самой Лідзе). Значным цэнтрам лесапільнай прамысловасці з’яўляўся Слонім. Тут размяшчаўся паравы лесапільны завод “Aspago”, лесапільны завод Файна і Канцапольскага, лесапільны завод братоў Гольдбергаў, лесапільны завод І. Канцапольскага і лесапільны завод у Слоніме. 4 лесапільні знаходзіліся ў Стоўбцах: эксплуатацыя лясоў англійскага таварыства (лесапільныя заводы), лесапільны завод наднёманскай лясной прамысловасці, лесапільны завод Кітаевіча, лесапільны завод З. Нахамчыка. Адзін з пералічаных лесапільных заводаў належаў англійскай фірме, якая займалася эксплуатацыяй лесу ў Заходняй Беларусі.

У 1931 г. у вёсцы Усялюб Навагрудскага павета графам Арурке быў пабудаваны лесапільны завод, абсталяваны 2 лесапільнымі рамамі,

габлявальнай машынай і падвеснай круглай пілой. Гадавая вытворчая магутнасць завода складала 6 тыс. м$^3$. У 1932 г. лесапілка была выкарыстана толькі напалову сваёй вытворчай магутнасці – 3 тыс. м$^3$. Тавараў было рэалізавана на суму ў 169 095 злотых, з іх 115 647 злотых складаў прыбытак ад экспарту. На тэрыторыі Віленскага ваяводства ў 1931 г. знаходзіліся 88 лесапільных заводаў. Найбольш вядомыя лесапільныя заводы Вільні – завод Моргенстэрна, лесапільны завод Я. Гінзбурга (асноўны капітал завода – 100 тыс. зл.), лесапільны завод Салуцкага і Гершатэра, лесапільны завод Ц. Левіна і Шалюбскага, лесапільны завод братоў Хволесаў і лесапільны завод Парнэса. У мястэчку Лынтупы Свянцянскага павета каля чыгуначнай станцыі таксама дзейнічаў лесапільны завод. Абсталяванне завода складалася з механічнага рухавіка і 2 лесапільных рам. Гадавая вытворчая магутнасць – 20 тыс. м$^3$ драўніны, аднак завод выкарыстоўваў толькі чвэрць сваёй магчамасці і вырабляў 5 тыс. м $^3$. Яшчэ адзін завод размяшчаўся ў маёнтку К. Вагнера ў в. Вялікія Салечнікі.

Сярод лесапільных заводаў Віленскага ваяводства вылучаўся буйнейшы завод С. Дубіна ў Вілейцы, пабудаваны ў 1927 г. Пры заводзе меўся паравы млын (на тэрыторыі Заходняй Беларусі вельмі часта пры лесапільнях меліся і млыны). Таксама заводу належалі лакаматыў магутнасцю 75 к.с., 1 лесапільная рама, 1 круглая піла і габлявальная машына. У 1932 г. на заводзе было перапрацавана 2 тыс. м$^3$ лесаматэрыялаў. Такім чынам, на Віленскае ваяводства ў 1928 г. прыходзілася 99 тыс. м$^3$ вырабленых піламатэрыялаў, у 1929 г. – 80 тыс. м$^3$, у 1930 г. – 75 тыс. м$^3$. Гэта самыя нізкія паказчыкі ў параўнанні з астатнімі ваяводствамі Заходняй Беларусі.

У Палескім ваяводстве ў 1931 г. налічваўся 91 лесапільны завод. У 1929 г. іх было 55, а ў 1925 г. з 84 лесапільных заводаў дзейнічала толькі 46. Вядомымі лесапільнымі заводамі Палескага ваяводства былі: у Пінску – лесапільны завод “Pina”, завод Я. Любашэўскага, лесапільны завод “Lasgo”, лесапільны завод “Оак” у Жоўкіна (Пінскі павет); у Лунінецкім павеце – лесапільны завод “Альшанка” (Лунінец), лесапільны завод Б. Крыгера ў Бастыні (4 лесапільныя рамы), лесапільны завод “Josszyf” у Людвігаве, лесапільны завод фірмы “Olza” ў Мікашэвічах (працавала 70 рабочых у 3 змены); у Брэсцкім павеце – аб’яднаныя брэсцкія лесапільныя заводы ў Брэсце, лесапільны завод Барэнгольца і лесапільны завод Х. Алергата ў Маларыце; у Косаўскім павеце – лесапільныя заводы ў Івацэвічах і Броннай Гары, якія належалі акцыянернаму таварыству братоў Боркен-Гагенаў і Мароза. У 1934 г. у дрэваапрацоўчай прамысловасці Палескага ваяводства налічвалася 57 прадпрыемстваў (без уліку дробных, арыентаваных толькі на мясцовы

рынак). Вытворчасць піламатэрыялаў у Палескім ваяводстве ў 1928 г. складала 241 тыс. м$^3$, у 1929 г. – 210 тыс. м$^3$, у 1930 г. – 233 тыс. м$^3$.

Сусветны эканамічны крызіс 1929–1933 гг. негатыўна паўплываў на лесапільную вытворчасць. Асабліва гэта адчувалася ў 1932 г., калі ўзровень вытворчасці быў значна ніжэйшы за паказчыкі 1928 г. Адпаведнае развіццё на тэрыторыі Заходняй Беларусі атрымала вытворчасць фанеры. Клееная фанера была важным паўфабрыкатам не толькі для мэблевай прамысловасці і вырабу скрынь, але таксама і для вытворчасці аэрапланаў і аўтамабіляў, таму карысталася попытам на знешніх рынках. У 1929 г. у Польшчы налічвалася 20 фанерных фабрык, з іх 10 у Заходняй Беларусі.

Найбольш вядомыя фабрыкі па вытворчасці фанеры знаходзіліся ў Беластоку, Гродне, Мастах, Семятычах (Беластоцкае ваяводства), Шчучыне (Навагрудскае ваяводства), Пінску, Мікашэвічах, Маларыце (Палескае ваяводства). У Беластоку гэта фанерная фабрыка “Тэміль”, а таксама фабрыка клеенай фанеры Ф. Госбаха ў Дойлідах; у Гродне – аб’яднаныя фабрыкі клеенай фанеры акцыянернага таварыства братоў Браўнаў “Гродна-Ласосна”; у Семятычах – фабрыка фанеры Маліняка (у 1934 г. працавала 195 рабочых). У Мастах знаходзіўся фанерны завод братоў Канапацкіх, пабудаваны ў 1925 г. На ім працавала 260 рабочых. Фабрыка мела сваю электрастанцыю. Браты Канапацкія былі ўласнікамі і фанернага завода ў Шчучыне. У Пінску размяшчаліся 4 буйныя фанерныя фабрыкі: фабрыка фанеры братоў Л. і А. Лур’е, фабрыка фанеры А. Мэрцэра, фабрыка “Leszcze” і фанерная фабрыка “Kunda”. Яшчэ адзін фанерны завод – “Union” Навума Цукера – знаходзіўся за Пінскам у мястэчку Гарадзішча. У Маларыце дзейнічаў фанерны завод “M. Hammer i Syn”.

Найбольш буйнымі фанернымі фабрыкамі на тэрыторыі Заходняй Беларусі былі фабрыка “Braci L. i Al. Lourie” у Пінску і фабрыка фанеры “Olza” ў Мікашэвічах Лунінецкага павета. Прадпрыемства братоў Лур’е было пабудавана яшчэ ў 1880 г. як завод па вытворчасці драўляных цвікоў, а ў 1898 г. там выраблялася фанера для скрынь, гэты завод стаў першай фанернай фабрыкай у свеце. Падчас Першай сусветнай вайны завод быў разбураны і аднавіў работу толькі ў 1921 г. Пасля смерці А. Лур’е ўпраўляючым стаў Якаў Эліясберг. За час яго кіравання была праведзена мадэрнізацыя тэхнічнага абсталявання, павышаны мінімум зарплаты да 10%, праведзена добраўпарадкаванне фабрыкі і прылягаючай тэрыторыі. Фабрыка была прыстасавана да патрабаванняў розных краін і пачала вырабляць новыя гатункі фанеры, тым самым пашырыўшы асартымент і палепшыўшы якасць. Быў наладжаны экспарт фанеры ў еўрапейскія краіны. У 1926 г. вытворчасць завода склала 8 700 м$^3$. Рост вытворчасці

не прыпыняўся нават у гады сусветнага эканамічнага крызісу і ў 1933 г. складаў 20 тыс. м$^3$.

У 1932 г. у Польшчы налічвалася ўжо 32 фанерныя фабрыкі, у тым ліку 13 на тэрыторыі Заходняй Беларусі. У 1934 г. колькасць фанерных фабрык у Польшчы складала 33. Прадпрыемствы па вытворчасці фанеры на заходнебеларускіх землях выраблялі ў 1929 г. 50 тыс. м$^3$, а ў цэлым у Польшчы яе вытворчасць у 1929 г. складала 96 тыс. м$^3$.

Такім чынам, каля паловы выробленай у Польшчы фанеры прыходзілася на Заходнюю Беларусь. Гадавы экспарт заходнебеларускай фанеры складаў 22 тыс. тон на суму 17 млн зл. Каля 85% выробленай у Заходняй Беларусі фанеры экспартавалася за мяжу, галоўным чынам у Англію і Галандыю. Спажыўцамі заходнебеларускай фанеры былі таксама Бельгія, Швейцарыя, Аргенціна, Аўстрыя, Данія, Грэцыя, Францыя, Егіпет, Германія. Асноўная частка экспарту фанеры знаходзілася ў руках нямецкіх прадпрыемстваў. Асноўнай сыравінай для фанерных фабрык ў Заходняй Беларусі была алешына, таму фанерныя прамыслоўцы былі зацікаўлены ў яе нізкіх коштах. І як вынік – патрабаванне забароны вывазу алешыны ці ўсталявання высокіх вывазных пошлін на яе. Фанерныя фабрыкі былі абсталяваны лушчыльнымі станкамі і прэсамі; у 1928 г. усяго налічвалася 36 станкоў для лушчэння і 46 прэсаў. Вытворчасць фанерных фабрык у 1931 г. складала 43 тыс. м$^3$ .

У адрозненне ад дрэваапрацоўчай і фанернай галін запалкавая прамысловасць на тэрыторыі Заходняй Беларусі развівалася даволі слаба. Асноўная сыравіна запалкавай прамысловасці – алешына. Экспарт алешыны з тэрыторыі Заходняй Беларусі складаў 90% ад агульнапольскага экспарту. 70% алешыны, якая ішла на патрэбы ўнутранага рынку дзяржавы, таксама была з заходнебеларускіх зямель.

У 1925 г. шведска-амерыканскі канцэрн Крэйгера выдзеліў пазыку на суму ў 6 млн долараў польскаму ўраду, які ўсталяваў і здаў у арэнду адзначанаму канцэрну запалкавую манаполію. Спецыяльна створаная ў Польшчы акцыянерная кампанія па эксплуатацыі польскай запалкавай манаполіі, што ўвайшла ў канцэрн Крэйгера, скупіла ўсе польскія запалкавыя фабрыкі, атрымаўшы адначасова права на набыццё завода па вытворчасці хларыду калію і будаўніцтва новых заводаў па вытворчасці фасфату і хларыду калію. Большая частка набытых гэтай кампаніяй фабрык была зачынена, што выклікала скарачэнне вытворчасці, звальненне рабочых і павышэнне цэн на запалкі. У Заходняй Беларусі пасля ўвядзення манаполіі 5 запалкавых фабрык было закрыта. Сярод іх 2 фабрыкі ў Вільні, па адной у Лідзе, Беластоку і Слоніме. Працягвалі функцыянаваць толькі 2 фабрыкі: фабрыка “Марыёс” у Гродне і “Progres-Wulkan” у Пінску.

Польшча была адной з нямногіх краін, якая займалася вырабам драўніны алешыны для запалкавай саломкі. Імпарцёры драўніны алешыны (найперш Германія) імкнуліся набываць яе ў неапрацаваным выглядзе з мэтай вытворчасці запалкавай саломкі ўнутры краіны. У адпаведнасці з новым пагадненнем, вываз драўніны ў выглядзе запалкавай саломкі залежаў ад згоды шведска-амерыканскага канцэрна. На тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1930 г. налічвалася дзве фабрыкі па вытворчасці запалкавай саломкі: адна з іх знаходзілася ў Белай Вацы каля Вільні, другая – у Міёрах Браслаўскага павета. Аднак ужо ў 1931 г. фабрыка ў Міёрах была ліквідавана. Такім чынам, засталася толькі адна фабрыка запалкавай саломкі, якая працавала выключна на экспарт у Францыю. Да пачатку сусветнага эканамічнага крызісу на заходнебеларускіх землях выраблялася каля 80% агульнадзяржаўнай вытворчасці запалкавай саломкі. На тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1928 г. было выраблена 21 138 скрынь (у 1 скрыні – 5 тыс. пачкаў), у 1929 г. – 28 330, 1930 г. – 48 882, 1931 г. – 31 821, 1932 г. – 22 468. З прыведзеных дадзеных вынікае, што вытворчасць запалак на тэрыторыі Заходняй Беларусі да 1931 г. не толькі не змяншалася, а, наадварот, павялічвалася, у той час як у цэлым у Польшчы скарачэнне назіралася на працягу ўсіх крызісных гадоў.

У канцы 1931 г. дзенічала толькі адна фабрыка “Progres-Wulkan” у Пінску, на якой у 1938 г. працавала 233 чалавекі (у 1922 і 1923 гг. на фабрыцы працавала 900 чалавек); ¾ прадукцыі фабрыкі “ProgresWulkan” ішло на экспарт. Такім чынам, неабходна адзначыць, што на тэрыторыі Заходняй Беларусі запалкавая вытворчасць не атрымала значнага развіцця, а пасля ўвядзення запалкавай манаполіі прыйшла ў заняпад.

*Папяровая прамысловасць* Заходняй Беларусі была прадстаўлена вытворчасцю паперы, розных гатункаў кардону і драўлянай масы. Галоўнай сыравінай для папяровай прамысловасці была яліна. У 1921–1939 гг. на тэрыторыі Заходняй Беларусі дзейнічала 8 фабрык па вытворчасці паперы і кардона, 7 з якіх знаходзілася на тэрыторыі Віленскага (у Алькеніках, Вілейцы, Вільні, Верках, Новай Вілейцы, Новым МядзелІ) і 1 – на тэрыторыі Навагрудскага (у Альбярціне) ваяводстваў. Альберцінская фабрыка кардона была пабудавана ў 1928 г. і адносілася да буйнейшых фабрык Заходняй Беларусі. У 1929 г. на фабрыцы працавала 158 рабочых, якія выраблялі 3 000 тон кардона і ўпаковачнай паперы. У 1934 г. колькасць працоўных знізілася да 150 рабочых, а выпуск прадукцыі зменшыўся да 2 000 тон кардона ў год. Прадукцыя кардоннай фабрыкі ішла на экспарт, пераважна ў Германію.

***Тэкстыльная прамысловасць*** 20–30 гг. ХХ ст. перажывала спад па прычыне нізкай пакупніцкай здольнасці асноўнай масы насельніцтва Заходняй Беларусі і канкурэнцыі з боку буйных, добра абсталяваных

прадпрыемстваў цэнтральнай Польшчы. Цэнтрам тэкстыльнай прамысловасці быў Беласток і яго прыгарады. Аднак Беластоцкае ваяводства ў 1920–1930-я гады паступова страчвае ролю асноўнага цэнтра тэкстыльнай прамысловасці Заходняй Беларусі. Галоўнымі прычынамі такой з’явы сталі страта расійскага рынку збыту і вельмі нізкі тэхнічны стан гэтай галіны прамысловасці. Льнамяльні, трапальні і часальні Віленскага, Навагрудскага, Палескага і Беластоцкага ваяводстваў належалі сельскагаспадарчым кааператывам. Большасць прадпрыемстваў былі заснаваны на ручной працы, але сустракаліся і механізаваныя прадпрыемствы. У Зэльве Ваўкавыскага павета Беластоцкага ваяводства назва вуліцы “Фабрычная” паходзіла ад механізаванай суконнай фабрыкі, якая належала яўрэю Барадзіцкаму. Павятовае мястэчка Дунілавічы Віленскага ваяводства было цэнтрам тэкстыльнай прамысловасці ў Дунілавіцкім павеце: працавала прыватная фабрыка па вытворчасці дываноў, ткацкі цэх, фарбавальня.

Сярод уладальнікаў тэкстыльных прамысловых прадпрыемстваў пераважную большасць складалі яўрэі. Так, буйнымі прадпрыемствамі Палескага ваяводства былі прадзільня Х. Мілнера і С. Харсэля ў Драгічыне з 20 рабочымі, прадзільня братоў Бараноўскіх з 12 рабочымі ў Ганцавічах. У такіх мястэчках, як Пагост-Загародскі, Лахва, Кажан-Гарадок, Хомск колькасць працоўных на прадзільнях не перавышала 6 чалавек.

Вельмі значную ролю ў прамысловым развіцці займала ***харчовая прамысловасць***, да якой адносіліся прамысловасць па пераапрацоўцы сельскагаспадарчай сыравіны, мясамалочная вытворчасць. Увогуле, харчовая прамысловасць па колькасці прадпрыемстваў займала першае месца ў Заходняй Беларусі. У 1930 г. колькасць прадпрыемстваў харчовай прамысловасці складала 3 590, у 1931 г. – 3 557, у 1932 г. – 3 403. Змяншэнне іх колькасці было выклікана тым, што прадукцыя гэтай галіны ішла не на экспарт, а распаўсюджвалася на ўнутраных рынках Польшчы.

*Вытворчасць спіртовых напояў* адносіцца да найбольш прыбытковых галін прамысловасці. Аднак спіртаварэнне і піваварэнне Заходняй Беларусі знаходзілася ў 1921–1939 гг. у глыбокім крызісе. Існуючая дзяржаўная спіртавая манаполія вызначала колькасць прадукцыі і цэны на спірт. Сыравінай бровараў з’яўляўся ячмень, які прывозілі з Познаншчыны. Акрамя таго, у Заходнюю Беларусь прывозілі некаторую колькасць польскага піва.

Заходнебеларускія спіртзаводы, бровары і лікёра-гарэлачныя заводы былі дробнымі прадпрыемствамі і належалі польскім землеўладальнікам ці яўрэям. Абслугоўвалі такія прадпрыемствы пераважна ўнутраны рынак. Так, у 1927 г. у 132 мястэчках дзейнічала 252 прадпрыемствы па вытворчасці гарэлкі і піва, найбольшую колькасць складалі спіртзаводы

(123), якія працавалі (пастаянна ці сезонна) у большасці мястэчкаў Заходняй Беларусі.

У 1931–1939 гг. сезонна працаваў спіртзавод у мястэчку Вялікая Бераставіца Гродзенскага павета Беластоцкага ваяводства, які належаў мясцоваму памешчыку. Да буйных віна-водачных прадпрыемстваў Навагрудскага ваяводства можна аднесці віна-водачны завод І. Любаньскай у Воранава. У 1927 г. на прадпрыемстве працавалі 43 рабочыя: 39 жанчын і 4 мужчыны.

*Крухмала-патачная вытворчасць* была слаба развітай у Заходняй Беларусі і налічвала 13 заводаў у 1929 г., 11 – у 1930 г., 9 – у 1931 г., 12 – у 1932 г. У гэтай галіне прамысловасці выдзяляліся толькі два мястэчкі – Яромічы і Зэльва, дзе дзейнічалі крухмальныя заводы.

У мястэчках Відзы і Іўе дзейнічалі кандытарскія фабрыкі, у Скідзелі і Свіры – фабрыкі цукерак. Асартымент тавараў гэтых прадпрыемстваў быў вельмі разнастайным; пячэнне і цукеркі з кандытарскіх фабрык знаходзілі свайго пакупніка і за межамі ваяводства. Амаль у кожным мястэчку Заходняй Беларусі дзейнічалі свае мясцовыя пякарні, якія насычалі мясцовыя рынкі пернікамі, булкамі, пірагамі, пячэннем, здобамі, цукеркамі і іншымі кандытарскімі вырабамі. Местачковыя пякарні Палескага ваяводства былі дробнымі немеханізаванымі рамеснымі прадпрыемствамі (у большасці сваёй 8 катэгорыі), на якіх працавала ад 1 да 3 рабочых. Уладальнікамі пякарняў былі пераважна яўрэі. На такіх пякарнях выраблялася ад 16 да 80 кг цеста ў дзень.

*Малочная галіна прамысловасці* ў Заходняй Беларусі мела ў большасці кааператыўную форму дзейнасці. У 43 малочных кааператыўных заводах Палескага ваяводства, акрамя павятовых цэнтраў, 8 былі ў мястэчках Дамачава, Кажан-Гарадку, Лахва, Моталь, Янове і інш.

Кааператыўны малочны завод у Свіслачы Беластоцкага ваяводства адкрыўся 10 красавіка 1927 г. Першапачаткова малако пастаўлялі на прадпрыемства 20 членаў кааператыва: ад 40 да 150 літраў у дзень. У 1928 г. на заводзе ўжо было 67 членаў кааператыва.

Навагрудскае ваяводства было асноўным цэнтрам сыраварэння ў Заходняй Беларусі. У 1928 г. крыніцы фіксуюць 232 сыраварні на тэрыторыі Навагрудскага ваяводства, аднак гэта лічба ахоплівала не толькі прамысловыя прадпрыемствы, але і рамесныя, і нават прадукцыю хатняга промыслу. Значна вылучаліся Шчучын, Ляхавічы, Карэлічы, Нягневічы, Яромічы, Гарадзішча, Сноў як вельмі важныя цэнтры сыраварэння ў ваяводстве, прадпрыемствы якіх давалі больш за 3 000 кг сыра ў дзень. Сыр з Навагрудскага ваяводства паступаў на ўсе лакальныя рынкі ў Заходняй Беларусі і часткова ў Варшаву.

У гарадах і большасці мястэчак было некалькі рэзняў (бойні), адна з якіх абавязкова была на рынку. Значная колькасць рэзняў належала яўрэям, якія клапаціліся аб кашэрнасці сваёй ежы. На адкрыццё рэзні неабходна было атрымаць канцэсію. У 1938 г. яўрэйскаму насельніцтву 14 мястэчак Палескага ваяводства было выдадзена 30 канцэсій на будаўніцтва і ўтрыманне рэзняў.

Мястэчкі Навагрудскага (Воранава, Моўчадзь, Шчучын) і Віленскага ваяводстваў (Дзевянішкі, Лужкі, Шаркаўшчына) былі цэнтрамі па вытворчасці мінеральнай газіраванай вады. Побач з сусветна вядомымі маркамі мінеральных вод, такімі як ”Hunyadi Janos” з Будапешту, “Franc Josef” з Варшавы, у мясцовых крамах можна было убачыць і местачковую прадукцыю.

У Заходняй Беларусі атрымала значнае развіццё ***гарбарная прамысловасць***. Буйнейшымі цэнтрамі гарбарства былі Беласток і Вільня, невялікія гарбарныя заводы ці рамесная майстэрня працавалі амаль у кожным мястэчку рэгіёну, напрыклад, у т.л. Крынках, Іўі, Свіслачы, Скідзелі. У 1935 г. С. Борух атрымаў дазвол на будаўніцтва гарбарнага завода ў Малечы Пружанскага павета, які спецыялізаваўся на вырабе і апрацоўцы барановых скур. За тыдзень апрацоўвалася каля 100 скур. На прадпрыемстве працаваў толькі ўладальнік без наёмных рабочых. У Скідзеле Гродзенскага павета Беластоцкага ваяводства ў 1925 г. было 4 гарбарныя заводы, на якіх працавала ад 10 да 30 рабочых. У Крынках працавалі 2 гарбарныя заводы, на якіх выраблялі хром, падэшвенную скуру, а таксама скуры для рымарных патрэб, падклейкі і іншыя тавары. Заработная плата рабочых на скураных заводах у Крынках за 12 гадзін складала 1,25–2,5 зл. Мястэчкі Віленскага ваяводства, такія як Будслаў, Кабыльнікі і Паставы былі цэнтрамі гарбарнай прамысловасці ў Пастаўскім павеце. Як сведчаць архіўныя крыніцы, у 1921–1922 гг. у Паставах было 4 гарбарныя прадпрыемствы, у Кабыльніках – 3, у Будславе – 2.

Асобнае месца ў прамысловасці Заходняй Беларусі займала ***мінеральная прамысловасць***, а менавіта шкляная, цэментная, цагляная вытворчасць. Да 1930 г. адзіны цэментны завод у Заходняй Беларусі (з 16 па Польшчы) знаходзіўся ў мястэчку Падароск (Рось) Ваўкавыскага павета Беластоцкага ваяводства. Завод быў пабудаваны ў 1914 г. выключна для ваенных мэт. У міжваенны час ён належаў да акцыянернага таварыства “Порланд-Цэмент” і з’яўляўся адным з буйнейшых у Заходняй Беларусі. У 1929 г. на ім працавала каля 500 рабочых. У 1930 г. завод прыпыніў сваю дзейнасць, аднак у 1934 г. ён зноў пачаў дзейнічаць. Завод экспартаваў сваю прадукцыю ва Усходнюю Прусію, Літву, Латвію, Фінляндыю. З 30-х гг. XX ст. пачалі дзейнічаць цэментныя заводы ў

Яшунах Віленскага ваяводства, у мястэчках Сноў і Сталовічы Навагрудскага ваяводства.

На вытворчасці вапны спецыялізавалася прамысловае развіццё мястэчак Дуброва, Новы Свержань, Шчучын Навагрудскага ваяводства.

Завод па вырабу чарапіцы ў мястэчку Іўе Валожынскага павета, паводле звестак польскага бізнес-даведніка за 1929 г., належаў яўрэю Шломе Заку і з'яўляўся адзіным прадпрыемствам, якое дзейнічала ў 30-я гг. на тэрыторыі Навагрудскага ваяводства. Кафельныя заводы ў Івянцы, Мілейчыцах, Орлі, Поразаве, Сваяцічах штогод давалі 20% прадукцыі ад агульнай колькасці вытворчасці кафлі ў Заходняй Беларусі.

Буйныя шкляныя гуты дзейнічалі ў Ганцавічах Палескага ваяводства, Варапаева Віленскага ваяводства. Усяго ў Заходняй Беларусі ў 1929 г. працавала 11 шклозаводаў, у 1930 г. – 10. Адной з асноўных прычын заняпаду вытворчасці шкла стала палітыка агульнапольскага сіндыката заводаў ліставога шкла «Верполь», па рашэнні якога ў Заходняй Беларусі былі зачынены ўсе заводы ліставога шкла. Шкляная гута ў Ганцавічах “J. Stolle” выпускала высокагатункавае аконнае і люстраное шкло, на гэтым прадпрыемстве працавала 60–70 работнікаў. У 1925 г. завод перажываў крызіс і працаваў толькі 7 месяцаў. У 1926 г. фабрыка пачала выпускаць шкло для фотаапаратаў, што значна павялічыла колькасць заказаў, асабліва з Германіі. Аднак у канцы 1926 г. фабрыка апынулася на мяжы разарэння, а ў 1928 г. увогуле перастала дзейнічаць. На шклозаводзе “Гута” ў Варапаева працавалі спецыялісты з Бельгіі, якія выраблялі вельмі прыгожыя вазы з рознакаляровага шкла.

Цагельні ў гарадах і мястэчках былі дробнымі прадпрыемствамі, колькасць працуючых у іх вагалася ад 3 да 10 чалавек. Цэгла была цяжкім і нізкавартасным прадуктам для перамяшчэння. Па гэтай прычыне мясцовыя цагельні абслугоўвалі ўнутраны рынак. У Маларыце дзейнічалі 4 прыватныя цагельні, у Давыд-Гарадку, Ізабеліне, Лыскаве, Паставах, Рымшанах – па тры, у Валожыне, Відзах, Волме, Дуброва, Вярховічах, Новым Двары, Турцы, Цырыне – па дзве, у астатніх мястэчках – па адной цагельні.

Асобныя мястэчкі ў 1921–1939 гг. былі цэнтрамі здабычы граніту ў Заходняй Беларусі. У 1927 г. у Жалудку, Ляндвараве, Маларыце, Мсцібава дзейнічалі невялікія каменаломлі, на якіх працавала не больш за 50 рабочых.

Металургічная прамысловасць не атрымала развіцця ў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. Ліцейны завод у Высока-Літоўску Брэсцкага павета Палескага ваяводства, які меў характар рамеснага прадпрыемства, быў адзіным дзеючым у 1925 г. прадпрыемствам у Палескім ваяводстве ў металічнай прамысловасці. Невялікая прыватная фабрыка цвікоў і дроту дзейнічала ў мястэчку Ляндварава Віленска-Троцкага павета Віленскага ваяводства.

Класіфікацыя прамысловых прадпрыемстваў і цана на прамысловае пасведчанне залежала ад колькасці рабочых, якія працавалі на прадпрыемстве. Прадпрыемствы, на якіх было больш за 2 000 рабочых, адносіліся да першай прамысловай катэгорыі, што была характэрна выключна для буйных гарадоў Польшчы і Заходняй Беларусі. Па колькасці рабочых большасць местачковых прадпрыемстваў ва ўсіх галінах прамысловасці (акрамя лясной) адносіліся да 5–8 прамысловай катэгорыі, на якіх працавала ад 2 да 50 рабочых. У лясной, хімічнай і часткова мінеральнай прамысловасці былі прадпрыемствы 2–4 катэгорыі, з колькасцю рабочых ад 100 да 1 000 чалавек на прадпрыемстве. Ад катэгорыі прадпрыемства залежала цана на прамысловае пасведчанне, якое выдавалася ўладальніку ці фірме толькі пры наяўнасці рамесніцкай карты. Ад 4 да 12 зл. каштавала прамысловае пасведчанне для прадпрыемства 8 катэгорыі, ад 20 да 50 зл. – для 7 катэгорыі, 2 000 зл. – для 5, 4000 зл. – для 2.

Эканамічныя крызісы 1924–1926 гг., 1929–1933 гг. выклікалі спад прамысловай вытворчасці ў Заходняй Беларусі, павялічылі колькасць беспрацоўных, садзейнічалі разарэнню многіх прадпрыемстваў. Большасць прадпрыемстваў лясной прамысловасці Палескага ваяводства ў 1924–1926 гг. набылі сезонны характар і працавалі ад 1 да 6 месяцаў. У 1933 г. быў закрыты лясны завод у Івацэвічах Косаўскага павета і былі звольнены з працы 25 рабочых. Увогуле, у дрэваапрацоўчай прамысловасці Навагрудскага і Палескага ваяводстваў, у якіх была занята большасць рабочых, колькасць іх зменшылася з 13,4 тыс. у 1928 г. да 5,1 тыс. у канцы 1931 г., або ў 2,5 разы. За гады крызісу рэзка ўзрасло беспрацоўе. Колькасць афіцыйна зарэгістраваных беспрацоўных (рэгістравалі не ўсіх) да канца 1931 г. павялічылася ў тры разы і дасягнула 16,1 тыс.

Адносная стабілізацыя польскай эканомікі пасля крызісу 1929–1933 гг. стала галоўнай прычынай актывізацыі эканамічнай палітыкі польскай дзяржавы, накіраванай на падтрымку прамысловасці ў Заходняй Беларусі. Сведчаннем таму з’яўляецца выданне дэкрэта Міністэрства прамысловасці і гандлю ад 25 лістапада 1936 г. аб накіраванні інвестыцыйнага руху ва ўсходнія ваяводствы. Згодна з гэтым дэкрэтам прадугледжвалася змяншэнне на пяць гадоў падаткаў з прыбытку ў паўночна-ўсходніх ваяводствах, што мела сваім вынікам дадатковыя капіталаўкладанні і актывізацыю мясцовай прамысловасці. У сувязі з тым, што найбольш даходнай галіной прамысловасці была лясная прамысловасць, новыя прадпрыемствы будаваліся, нягледзячы на эканамічныя крызісы, менавіта ў гэтай галіне. У 30-я гг. колькасць дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў павялічваецца за кошт адкрыцця новых лясных заводаў: лесапільнага завода ў Ганцавічах (з 1935 г.), лесапільнага

завода М. Валынскага і М. Слонімскага ў Івацэвічах (з 1934 г.), ляснога завода фірмы “Ласго” у Ганцавічах (з 1930 г.). Акрамя лясной прамысловасці, местачковыя прадпрыемствы будаваліся ў хімічнай і харчовай галіне прамысловасці. 28 лютага 1929 г. пачаў дзейнічаць вінакурны завод Санера Стефана ў Лінова Пружанскага павета Палескага ваяводства, на якім працавала першапачаткова 8 рабочых.

Заработная плата рабочага залежала ад кваліфікацыі, ад галіны прамысловасці, у якой працаваў работнік, і ад велічыні прадпрыемства. Найменшую заработную плату атрымлівалі работнікі, занятыя ў лясной галіне прамысловасці, дзе працавала найбольшая колькасць некваліфікаваных работнікаў. Аналізуючы заработную плату рабочых на прамысловых прадпрыемствах, неабходна адзначыць, што рабочыя лясной галіны прамысловасці атрымлівалі ў сярэднім 17,94 зл. (у тыдзень), мінеральнай – 21,96 зл., тэкстыльнай – 23,61 зл., харчовай – 27,63 зл. На прадпрыемствах, дзе працавала больш за 49 работнікаў, заробак працоўнага ў сярэднім складаў 23,65 зл. у тыдзень, а на прадпрыемствах, дзе працавала больш за 200 работнікаў, – 31,47 зл.

Прамысловасць у Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. захоўвала традыцыйны характар развіцця тых галін прамысловасці, якія атрымалі найбольшае развіццё ў другой палове XIX – пачатку XX ст. У гаспадарчым жыцці насельніцтва вядучым напрамкам стала лясная прамысловасць, дзе назіралася тэндэнцыя росту аб’ёмаў вытворчасці і экспарту за мяжу і якая была прадстаўлена найбольшай колькасцю буйных прадпрыемстваў 2–4 прамысловых катэгорый. Аднак заработная плата работнікаў, занятых у лясной прамысловасці, была самай нізкай па прычыне вялікай колькасці занятага ў гэтай галіне некваліфікаванага насельніцтва.

***Рамяство***, заснаванае на ручной працы і на ўласнай мясцовай сыравіне, здольна было забяспечыць працай мноства працоўных рук, палепшыць дабрабыт, прапанаваць гарадскому і сельскаму пакупніку вырабы, якіх не хапала, і даць дадатковы ці асноўны прыбытак местачкоўцам.

Пад рамёствамі разумелася дробная вытворчасць, заснаваная на індывідуальнай ручной працы з выкарыстаннем механічных прылад і інструментаў. Да пачатку XX ст. рамяство прайшло тры стадыі свайго гістарычнага развіцця: хатняе рамяство, рамяство на заказ, рамяство як дробнатаварная вытворчасць (саматужная прамысловасць). У мястэчках Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. былі прадстаўлены ўсе тры названыя формы рамяства, і для большасці местачкоўцаў рамяство было звязана выключна ці пераважна з рынкам.

Прававыя асновы рамеснай дзейнасці як сталага занятку былі замацаваны ў распараджэнні прэзідэнта Рэчы Паспалітай ад 7 чэрвеня 1927 г. “Аб прамысловым праве”, а таксама ў дадатковых пастановах,

распрацаваных Міністэрствам прамысловасці і гандлю ад 1934 і 1938 г. У распараджэнні да ліку рамяства адносіліся 63 рамесныя спецыяльнасці.

Галоўнымі цэнтрамі рамяства ў Заходняй Беларусі былі мястэчкі, якія з'яўляліся цэнтрамі сельскіх гмін. Местачковае рамяство вырастала з рамяства сельскага і было з ім цесна звязана. Местачковыя рамеснікі паступова манапалізавалі рамесную вытворчасць гмін. Як прыклад – мястэчка Гарадная Столінскага павета было “сапраўдным запаведнікам ганчарства” ў Палескім ваяводстве, бо з'яўлялася самым буйным цэнтрам вытворчасці белаглінянай керамікі ў межах Палесся. Ганчарствам у Гараднай займаліся з XVIII ст., у 1920-х гг. там была рэкордная колькасць ганчароў – 500 (19% ад агульнай колькасці насельніцтва). У мястэчку налічвалася 215 майстэрняў, дзе, акрамя саміх ганчароў, працавала 40 членаў іх сем'яў. Амаль у кожнага жыхара Гараднай была свая ганчарка (майстэрня па вытворчасці ганчарных вырабаў). Высокія тэхналагічныя якасці гараднянскай керамікі ведалі на Палессі, у Цэнтральнай Беларусі, трапляла яна і на Валынь, у Кіеў, Вільню, Варшаву. У Вільні гараднянскую кераміку называлі целяханскай (па аналогіі з шырока вядомым целяханскім фаянсам). Уладальнікі ювелірных фабрык ведалі яе высокую тэрмічную ўласцівасць і ахвотна набывалі для выплаўкі каштоўных металаў. У 1929 г. польскі Саюз сельскагаспадарчых гандлёвых кааператываў прыкладаў намаганні, каб залажыць у Гараднай ганчарны кааператыў, аднак ганчары мястэчка не жадалі быць членамі кааператыва. На прыкладзе Гараднай можна прасачыць тэндэнцыю перарастання хатняга народнага промыслу ў рамесную дробнатаварную вытворчасць.

Акрамя Гараднай, значнымі цэнтрамі беларускага ганчарства ў Заходняй Беларусі ў 20–30-х гг. XX ст. былі Івянец, Крывічы, Мір, Поразава, Ракаў, Радашковічы, Свянцяны, у якіх у гэты час былі прадстаўлены ўсе формы развіцця ганчарства – ад рэліктавага вясковага да прафесійнай ганчарнай вытворчасці. У арганізацыі ганчарства выкарыстоўвалася наёмная праца, большасць рамесных майстэрняў мелі рамеснае пасведчанне (звычайна 7 ці 8 катэгорый).

На развіццё промыслаў паўплываў той факт, што Польшча была адзінай еўрапейскай краінай, дзе на заканадаўчым узроўні значна падтрымлівалася гэта сфера эканамічнай дзейнасці. Закон аб народных промыслах быў прыняты сеймам 31 ліпеня 1924 г. і гэтая галіна народнай гаспадаркі атрымлівала ўрадавыя фінансавыя субсідыі. З 1918 г. у складзе Міністэрства прамысловасці і гандлю дзейнічаў аддзел народных промыслаў, з дапамогай якога ў 20-я гады XX ст. былі створаны 4 таварыствы дапамогі народным промыслам (у Беластоку, Брэсце, Вільні, Навагрудку), якія наладжвалі выставы і кірмашы ў многіх мястэчках

Заходняй Беларусі. У 1925 г. па ініцыятыве Брэсцкага таварыства была арганізавана выстава народных промыслаў у мястэчку Антопаль. У Шчучыне штогод з 1934 г. адбывалася выстава ткацкіх вырабаў, на якую з’язджаліся наведвальнікі з усяго павета.

Падтрымку рамяства як сталага занятку насельніцтва ў польскай дзяржаве ажыццяўлялі прамыслова-гандлёвыя палаты, якіх у 1921–1927 гг. на тэрыторыі Польшчы было 12. З 1927 г. іх колькасць павялічылася да 17. Да 1927 г. тэрыторыя Беластоцкага, Віленскага, Палескага і Навагрудскага ваяводстваў адносілася да дзейнасці Віленскай прамыслова-гандлёвай палаты. Віленская прамысловая палата была самай вялікай па плошчы ахопліваемых тэрыторый (128 тыс. км² – 32,4% ад усёй Польшчы) у параўнанні з іншымі палатамі Рэчы Паспалітай, таму ў 1927 г. яна была падзелена на 4 больш дробныя палаты (Беластоцкую, Брэсцкую, Віленскую і Навагрудскую), якія ахоплівалі па адным ваяводстве Заходняй Беларусі.

Згодна з польскім прамысловым правам, дзейнасць прамысловых палат у адносінах да рамяства заключалася ў стварэнні рамесных школ для пашырэння той ці іншай рамесніцкай спецыяльнасці, арганізацыі экзаменацыйных камісій для экзамену на званне «майстра», статыстычны ўлік колькасці рамесных спецыяльнасцей па гмінах, паветах, ваяводству, улік колькасці рамеснікаў і іх вучняў.

На тэрыторыі Палескага ваяводства, паводле дадзеных Брэсцкай прамысловай палаты за 1933 г., налічвалася 9 962 рамесныя майстэрні розных рамесніцкіх спецыяльнасцей, аб’яднаных у 7 груп: апрацоўка дрэва – 2 078 майстэрань, апрацоўка скуры – 2 057, выраб адзення – 1 835, апрацоўка металу – 1 646, спажывецкі промысел – 1 375, будаўніцтва – 655, сфера паслуг – 316. У Навагрудскім ваяводстве ў 30-я гг. рамяство было прадстаўлена 10 000 майстэрнямі наступных рамесніцкіх спецыяльнасцей: краўцы (1 108 майстэрань), кавалі (1 172), шаўцы (1 161), рэзнікі (634), сталяры (675), пекары (407), цырульнікі (221), слесары (198) і інш. На 1 красавіка 1931 г. на тэрыторыі Беластоцкага ваяводства прамысловай палатай было зафіксавана 20 000 рамесных прадпрыемстваў, з якіх 14 500 з рамеснымі картамі, і пераважалі рамесныя спецыяльнасці, звязаныя са сферай паслуг і апрацоўкай дрэва, скуры і будаўніцтва.

Найбольш запатрабаванымі рамеснымі спецыяльнасцямі ў Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд былі спецыяльнасці, звязаныя з апрацоўкай дрэва, металу, скуры, вырабам адзення і харчовым промыслам.

Пашыранымі рамеснымі спецыяльнасцямі ў мястэчках Заходняй Беларусі былі: кавалі, шаўцы, краўцы, ткачы, гарбары, рэзнікі, фурманы, столяры, цесляры, пекары. У *мястэчках Віленскага ваяводства* крыніцы

фіксуюць 1 534 рамеснікі з рамеснымі картамі 29 рамесных спецыяльнасцей. Найбольш пашыранымі рамеснымі спецыяльнасцямі з'яўляліся наступныя: гарбары (135), кавалі (224), краўцы (169), пекары (67), рэзнікі (124), сталяры (95), фурманы (120), цесляры (81), шаўцы (200). У *мястэчках Беластоцкага ваяводства* 812 рамеснікаў 26 рамесных спецыяльнасцей, найбольшую колькасць з якіх складалі: кавалі (107), краўцы (93), рэзнікі (78), шаўцы (100). У *мястэчках Навагрудскага ваяводства* з 1 150 рамеснікаў 30 рамесных спецыяльнасцей найбольш пашыранымі былі прафесіі: гарбароў (82), кавалёў (143), краўцоў (118), пекараў (64), рэзнікаў (86), ткачоў (142), шаўцоў (142). У *мястэчках Палескага ваяводства* рамесныя спецыяльнасці кавалёў (93), краўцоў (69), рэзнікаў (96), сталяроў (69), ткачоў (94), фурманаў (70) складалі колькасную большасць сярод 970 рамеснікаў 27 рамесных спецыяльнасцей.

Неабходна адзначыць, што статыстычныя дадзеныя, якія датычыліся колькасці рамеснікаў і рамесных майстэрняў, не з'яўляліся абсалютнымі, бо большасць з іх працавала нелегальна, без рамесных карт. З агульнай лічбы рамеснікаў (9 505 чалавек) па Навагрудскім ваяводстве ў 1931 г. – 8 773 рамеснікі мелі рамесную карту. Таму ўстанавіць нават прыблізную колькасць рамеснікаў і рамесных майстэрняў у мястэчках вельмі цяжка. Некаторыя жыхары мястэчак спалучалі некалькі спецыяльнасцей, а рамесную карту мелі па адной спецыяльнасці.

У большасці мястэчак Заходняй Беларусі налічвалася ад 5 да 30 рамесніцкіх спецыяльнасцей, у той час як у сярэдніх гарадах Заходняй Беларусі (Ашмяны, Ваўкавыск, Семяцічы) – да 50, у буйных (Беласток, Вільня, Гродна) – да 70 рамесных спецыяльнасцей. У буйных гарадах Польшчы (Варшава, Кракаў, Торунь) колькасць рамесных спецыяльнасцей перавышала 150 спецыяльнасцей.

Невялікая колькасць рамесных спецыяльнасцей у заходнебеларускіх мястэчках тлумачылася нізкім узроўнем жыцця насельніцтва, адсутнасцю прафесійных рамесных школ, а таксама досыць складаным працэсам атрымання рамесных карт для легальнага заняцця пэўным відам рамяства.

У цэлым, неабходна канстатаваць, што спецыялізацыя местачковага рамяства была не такой разгалінаванай, як у гарадах. Досыць абмежаванае кола рамесніцкіх спецыяльнасцей і перавага ў большасці мястэчак адных і тых жа груп спецыяльнасцей сведчылі аб тым, што местачковае рамяство насіла лакальны характар, забяспечвала найбольш неабходныя, штодзённыя патрэбы местачкоўцаў і насельніцтва сельскіх гмін. Наяўнасць рамеснікаў вузкаспецыяльных прафесій сведчыць аб набліжанасці мястэчка да малога горада і значнасці як рамеснага цэнтра гміны ці павета.

Прафесійным рамеснікам можна было стаць пасля заканчэння рамеснай школы ці здачы экзамена на атрыманне статусу рамесніка пэўнай спецыяльнасці. Штогод Міністэрствам прамысловасці і гандлю і гандлёва-прамысловымі палатамі ажыццяўляўся набор на экзамен для рамеснікаў, якія не скончылі рамесныя школы па прычыне нязначнай іх колькасці. Толькі пасля такога экзамену рамеснік атрымліваў пасведчанне аб прафесійным валоданні рамеснай спецыяльнасцю і мог атрымаць рамесную карту, якая давала магчымасць легальнага адкрыцця рамеснага прадпрыемства, а потым і фабрыкі. Дробныя рамёствы дзяліліся на 3 катэгорыі: канцэсійнае рамяство (каналізацыйнае абслугоўванне, газавыя работы, чыстка комінаў, рытуальная сфера паслуг, вадзіцелі аўтамабіляў і інш.); кваліфікацыйнае рамяство (бляхары, кавалі, слесары, токары, сталяры, печнікі, цырульнікі, шаўцы, краўцы і інш. (усяго 64 рамесныя спецыяльнасці)); вольнае рамяство (іншыя рамёствы, якія не трапляюць ні ў першую, ні ў другую групу). Займацца канцэсійным рамяством можна было пры атрыманні канцэсіі на пэўны від рамяства ад рамесных улад І-й інстанцыі (магістратаў гарадоў Быдгошча, Варшавы, Вільні, Кракава, Лодзі, Познані, Торуня); займацца прафесійным ці вольным рамяством можна было пры атрыманні рамеснай карты ці ліцэнзіі. Згодна з цыркулярам Міністэрства прамысловасці і гандлю ад 20 сакавіка 1934 г., рамесная карта выдавалася толькі тым рамеснікам, якія мелі ўласныя майстэрні і рамяство для якіх было пастаянным заняткам.

Атрыманне рамеснай карты суправаджалася працяглай працэдурай, якая патрабавала ад рамеснікаў не толькі фінансавых затрат, але і шмат часу на выкананне ўсіх фармальнасцей. Спачатку местачковец звяртаўся да павятовага старасты з прашэннем аб дазволе на атрыманне карты і прадастаўляў неабходныя дакументы. Павятовы стараста накіроўваў гэтыя дакументы ў прамысловую палату. Калі прамысловая палата давала дазвол, то дазвол даваў і стараста. На практыцы працэс атрымання рамесных карт мог доўжыцца некалькі месяцаў і нават гадоў. Гэта прыводзіла да таго, што большасць рамеснікаў працавалі без рамесных карт, нелегальна, караліся штрафамі і нават турэмным зняволеннем у выніку няўплаты штрафу.

У 30-х гг. ХХ ст. у большасці мястэчак Заходняй Беларусі значна павялічваецца попыт на рамесныя спецыяльнасці, звязаныя са сферай паслуг: фатографаў, цырульнікаў, гадзіннікавых майстроў, фурманаў, дворнікаў, механікаў па рамонту тэхнікі, аўтамабіляў, майстроў па электрычных работах. У Дзярэчыне Навагрудскага ваяводства ў 30-я гг. пачалі дзейнічаць дзве майстэрні па рамонту веласіпедаў і матацыклаў, дэталі для якіх прывозіліся з-за мяжы. У 1929 г. у мястэчку Гарадзец Кобрынскага павета двум местачкоўцам былі выдадзены дзве рамесныя

карты на права працаваць у якасці гадзіннікавага майстра з уласнай майстэрняй на вуліцы Клецкай і на права адкрыць цырульню на вуліцы Шасейнай. У мястэчку Мір Стаўбцоўскага павета ў гэты час было адкрыта некалькі фотамайстэрняў: Гольдзіна, Ермаковіча, Сілко.

З пашырэннем электрафікацыі мястэчак у 30-я гг. XX ст. з'яўляецца новая рамесніцкая спецыяльнасць – майстар па ўладкаванню электрычных работ. Гэта рамесніцкая спецыяльнасць была вельмі запатрабаванай у мястэчках, але прафесійных майстроў з ліцэнзіямі і рамеснымі картамі было вельмі мала. Жыхар мястэчка Ганцавічы Лунінецкага павета Л. Мардухоў 18 сакавіка 1932 г. атрымаў рамесную карту на права заняцца рамяством па ўладкаванню электрычных работ.

Характар арганізацыі местачковага рамяства істотна не адрозніваўся ад гарадскога. Пэўны працэнт местачковых рамеснікаў працаваў на патрэбы памешчыцкіх сядзіб і фальваркаў, і сувязь з рынкам у іх была слабейшай, чым у тых рамеснікаў, якія працавалі ва ўласных майстэрнях.

Значная колькасць яўрэйскага насельніцтва ўплывала на нацыянальны склад рамеснікаў. Традыцыйна рамяство і гандаль для яўрэйскага насельніцтва былі асноўнымі крыніцамі даходу. Працэнт яўрэйскіх рамеснікаў у прафесійнай структуры заходнебеларускіх ваяводстваў у некалькі разоў перавышаў удзельную вагу рамеснікаў-неяўрэяў. Так, у Беластоцкім ваяводстве ў 1929 г. рамеснікаў-яўрэяў налічвалася 6,3%, рамеснікаў-неяўрэяў – 1,3%, у Віленскім ваяводстве – 3,7% і 1,6%, у Навагрудскім – 4,4% і 0,8%, у Палескім – 5,5% і 0,8%.

На тэрыторыі Заходняй Беларусі яўрэі манапалізавалі тэкстыльнае рамяство (краўцы – 77% яўрэяў, чапнікі – 97%), лясное (токары – 49%, цесляры – 53%), гарбарнае (гарбары – 73%, шаўцы – 86%), харчовае (пекары – 90%, рэзнікі – 85%), сферы абслугоўвання насельніцтва (фурманы – 93%, цырульнікі – 87%). У прыватнасці фурманства было выключна яўрэйскай спецыяльнасцю для большасці мястэчак Заходняй Беларусі. Асабліва гэты занятак быў пашыраны ў мястэчках Палескага ваяводства, дзе ўдзельная вага яўрэяў гэтай прафесіі складала 99%.

У 1921–1939 гг. рамеснікі ў гарадах і мястэчках былі аб'яднаны ў цэхавую арганізацыю. Кааперацыя местачковага рамяства ў 1921–1939 гг. захоўвала нацыянальны характар. Прафесійныя саюзы яўрэйскіх рамеснікаў адносіліся да наступных арганізацый: Цэнтральны Саюз яўрэйскіх рамеснікаў (фалкісты) (Związek Rzemieśników Żydów), Саюз цэхаў і карпарацый (сіяністы) (Związek Cechów i Korporacyj), Саюз яўрэйскіх рамеснікаў (бундаўцы) (Związek Rzemieśników Żydów). Дзейнасць такіх саюзаў была накіравана на абарону інтарэсаў рамеснікаў у легалізацыі рамесных прадпрыемстваў, падтрымку цэхаў, дапамогу пры здачы экзаменаў на майстра, юрыдычную дапамогу ў справах эміграцыі.

Сярод польскіх прафсаюзаў найбольшую значнасць мелі саюз тэкстыльшчыкаў (з цэнтрам у Лодзі), саюз жалезнікаў і асоб, працуючых з металам (Варшава), саюз чыгуначнікаў (Варшава).

Статыстычныя дадзеныя дазваляюць сцвярджаць, што кааперацыя рамяства ў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. была пераважна яўрэйскай. Такая тэндэнцыя была характэрна і для мястэчак, аднак колькасць кааператыўных саюзаў у іх была мізарнай. Большасць местачковых кааператываў узніклі ў 30-я гг. XX ст. ва ўмовах стабілізацыі эканомікі. Дзейнасць кааператываў была накіраваны на цесную сувязь с вясковым насельніцтвам для рэалізацыі сельскагаспадарчай і рамеснай прадукцыі без пасрэднікаў паміж мястэчкам і вёскай. Як прыклад, з 1936 г. пачаў дзейнічаць яўрэйскі кааператыў шаўцоў у Давыд-Гарадку, цесляроў і сталяроў – у Івацэвічах.

Аналіз рамесніцкіх заняткаў насельніцтва паказвае, што рамяство як сталы занятак местачкоўцаў у 1921–1939 гг. пераўтварае гэтыя паселішчы ў рамесныя цэнтры гмін. З’яўленне новых спецыяльнасцей і рост іх колькасці набліжалі рамяство да гарадскога, а мястэчкі, дзякуючы разгалінаванай сетцы рамесных спецыяльнасцей сферы паслуг, пераўтвараліся ў малыя гарады.

**Тэма 9. Гандаль**

Розны ўзровень эканамічнага развіцця асобных рэгіёнаў Польшчы, пошук новых знешнегандлёвых партнёраў паўплывалі на развіццё гандлю Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. Польшча сваімі знешнегандлёвымі сувязямі ў першую чаргу была звязана з краінамі Заходняй Еўропы, што было абумоўлена як традыцыйнасцю гэтых сувязей, так і наяўнасцю разгалінаванай сістэмы шляхоў зносін. Рэгламентацыя аб’ёмаў імпартных і экспартных паставак значна скарачала польскі знешні гандаль у 20–30 гг. XX ст., адштурхоўвала ад яго як польскіх, так і замежных экспарцёраў. Цяжкасці ў знешнім гандлі ўскладняла падаткова-фінансавая палітыка польскага ўрада. Распараджэнні аб падатку з гандлёвага абароту і маёмасці, прынятыя ў 1922 і 1923 гг., значна абмяжоўвалі ўдзел яўрэяў у знешнім гандлі, прымушаючы іх да набыцця гандлёвых патэнтаў выключна вышэйшых катэгорый, што не адпавядала фактычным памерам яўрэйскіх гандлёвых прадпрыемстваў, асабліва ў Заходняй Беларусі. Так, напрыклад, у Навагрудскім ваяводстве ў 1933 г. налічвалася 7 917 гандлёвых прадпрыемстваў, з якіх 1-й катэгорыі было 1 прадпрыемства, 2-й – 291, 3-й – 2907, 4-й – 4964, 5-й – 24.

Асаблівасць польскага знешняга гандлю ў 20–30 гг. XX ст. была ў тым, што экспартавалася за мяжу сыравіна, а імпартавалася гатовая прадукцыя. З заходнебеларускіх мястэчак на экспарт ішлі пераважна збожжа і лес. Сыравіна вывозілася ў еўрапейскія краіны – Англію,

Германію, Данію, Нарвегію, Францыю, Швецыю. У 30-я гг. XX ст. экспарт Польшчы складаў у Велікабрытанію 19%, у Германію – 17%, у СССР – 6%, у Аўстрыю – 6% і ў іншыя краіны ад агульнага польскага экспарту. А імпарт з Германіі складаў 18%, з ЗША – 13%, з Велікабрытаніі – 10%, з Францыі – 7% і з іншых краін.

Нераўнамерная шчыльнасць чыгункі адрывала Заходнюю Беларусь ад асноўных рынкаў збыту і знешніх рынкаў. Асабліва дрэнна наладжаным быў чыгуначны рух у Віленскім і Навагрудскім ваяводствах, мінімальная адлегласць населеных пунктаў ад чыгункі складала 50–60 км. Польшча ў міжваенны перыяд па шчыльнасці чыгункі займала адно з апошніх месц сярод заходнееўрапейскіх краін. За ўсе гады знаходжання заходнебеларускіх зямель у складзе Польшчы тут была пабудавана толькі адна чыгуначная ветка Варапаева – Друя, даўжынёй 89 км (якая злучала Віленшчыну з рачным портам на Дзвіне), што складала 6,2% ад агульнай колькасці пабудаваных чыгунак у польскай дзяржаве.

Станцыя Граева Беластоцкай чыгункі да вайны мела важнае стратэгічнае значэнне для многіх мястэчак ваяводства, паколькі горад быў асноўным чыгуначным вузлом для экспарту збожжа і дрэва, якія вывозіліся ў Кёнігсберг па лініі Граева – Беласток. Па гэтай лініі даследчыкі зафіксавалі найбольш значныя грузапатокі (1 млн км) ва ўсёй Заходняй Беларусі. Уся лінія да вайны была двухкалейнай, у 20–30 гг. палякі разабралі адну каляю і горад страціў значэнне буйнейшай гандлёвай кропкі Беластоцкага ваяводства.

Мястэчкі Гайнаўка, Масты, Маладзечна з’яўляліся чыгуначнымі вузламі па экспарту лесу на магістралі Семяцічы – Ваўкавыск – Маладзечна – Загацце (часткі Беластоцкай чыгункі).

Водныя шляхі зносін пераўтваралі мястэчкі Альбярцін, Гарадзец, Дуброву, Дзераўную, Дзісну, Друю, Масты, Пагост-Загародскі, Сялец ў галоўныя водныя прыстані і важныя гандлёвыя пункты.

Выгаднае геаграфічнае становішча, якое займала Друя – мястэчка Віленскага ваяводства, дазваляла сплаўляць тавары ў Рыгу і Балтыку. Аднак, нягледзячы на гэта, прыстані і тым больш порта для арганізацыі гандлю ў мястэчку ў 1921–1939 гг. пабудавана не было. Гэта садзейнічала скарачэнню як знешняга, так і ўнутранага гандлю. Міжваенны перыяд у жыцці Друі і яе жыхароў пісьменнік Я. Маскевіч, які ў 30-я гг. быў рэпарцёрам газеты “Слова”, характарызаваў наступным чынам: “Сама Друя выглядала страшна. Дамы былі абарванымі, як старыя жабракі. На рынку стаяць “руіны дамоў” без вокан, дзвярэй і даху, у якіх летам растуць дрэўцы, а зімой ляжыць снег. Я перакананы, што ў 1914 г. Друя лепей выглядала, чым у 1936 г. Пануе галеча і роспач. На рынку столькі нядзеючых магазінаў, што я падумаў, што сёння яўрэйскае свята. Але гэта

проста значнае скарачэнне гандлю. Няма каму прадаваць. Раней магазіны адкрываліся два разы ў тыдзень, падчас таргоў. Цяпер і такога няма. У Друі прыпынены ўсялякі гандаль. Толькі банды беспрацоўных яўрэяў сядзяць пры дарозе і чакаюць...“.

Закрыццё савецкай мяжы стала прычынай эканамічнага заняпаду Дзісны, павятовага мястэчка Віленскага ваяводства, якое ў 20–30 гг. ХХ ст. называлі “рубіконам” паміж СССР і Заходняй Беларуссю.

Дробнатаварны характар вытворчасці, неўцягнутасць тэрыторыі Заходняй Беларусі ў будаўніцтва шляхоў зносін, арыентацыя прамысловасці мястэчак на ўнутраны рынак значна абмяжоўвалі магчымасці ўдзелу мястэчак у знешнім гандлі Заходняй Беларусі і Польшчы, ператвараючы гэтыя паселішчы, перш за ўсё, у цэнтры ўнутранага гандлю, якія забяспечвалі штодзённыя патрэбы насельніцтва мястэчка і вёскі. Унутраны гандаль мястэчак развіваўся ў некалькіх формах: кірмашовай, базарнай, стацыянарнай, развозна-разноснай.

Унутраны рынак Заходняй Беларусі ў 20–30 гг. ХХ ст. можна разглядаць як сістэму ўзаемазвязаных мясцовых (лакальных) рынкаў, аб’яднаных у адзінае цэлае агульнай функцыяй – ажыццяўлення тавараабмену паміж вытворцам і спажыўцом у маштабах усёй краіны – на аснове таварнай вытворчасці і геаграфічнага падзелу працы. У аснове гэтай схемы – гандлёвая сетка, якая ахоплівала заходнебеларускія землі, наяўнасць пастаянных гандлёвых сувязей, што забяспечвалі неабходныя маштабы тавараабмену і пэўныя адносіны попыту і прапанавання ў польскай дзяржаве.

Местачковыя кірмашы ў 1921–1939 гг. пастунова страчвалі ролю дамінуючай формы таварнага абарачэння, колькасць іх паступова скарачалася па прычыне нізкіх тавараразваротаў, канкурэнцыі з боку гарадскіх кірмашоў і местачковых стацыянарных форм гандлю. З 1918 г. у мястэчку Гарадзец Кобрынскага павета Палескага ваяводства 12 верасня штомесяц збіраўся дробны кірмаш, які быў ліквідаваны мясцовай адміністрацыяй у 1927 г. па прычыне правядзення вераснёвых кірмашоў у Антопалі і Кобрыне. У Малечы Пружанскага павета Палескага ваяводства штогод праводзілася 5 буйных кірмашоў (12.08, 14.09, 21.11, 09.12, 16.02), аднак апошнія тры кірмашы з 1927 г. не збіраліся.

Каб акрэсліць значэнне кірмашовага гандлю, яго інтэнсіўнасць, шырыню ахопу насельніцтва, разгледзім працягласць местачковых кірмашоў. У ХІХ – пачатку ХХ ст. асобныя местачковыя кірмашы маглі доўжыцца ад 1 да 4 тыдняў (Ганненскі кірмаш у Зэльве). У 20–30 гг. ХХ ст. у Заходняй Беларусі местачковыя кірмашы доўжыліся толькі адзін ці два дні, гарадскія кірмашы – ад двух да пяці дзён. Скарачэнне працягласці кірмашоў садзейнічала паскоранаму абароту капіталу, паколькі гандляр за

той жа час паспяваў наведаць большую колькасць кірмашоў, чым раней. Местачковыя кірмашы абслугоўвалі толькі пэўны мясцовы рынак, у той час як гарадскія кірмашы – агульнапольскі рынак. Гандлёвыя таваразвароты і асартымент местачковых кірмашоў былі невялікімі. Як сведчаць архіўныя крыніцы, на кірмашы ў Міры ў 1935 г. было зафіксавана 900 вазоў з рознымі таварамі, 50 коней, 200 хатняй жывёлы, 500 дробнай хатняй жывёлы. Лічба гандлюючых асоб складала 130, сярод якіх: 30 гандляроў спажывецкімі таварамі, 60 – адзеннем, галантарэяй і мануфактурай, 35 – сельскагаспадарчымі прыладамі працы, 5 – іншым таварам.

Па часе правядзення местачковыя кірмашы ўмоўна можна падзяліць на звычайныя і святочныя. Звычайны кірмаш праводзіўся па пэўных датах штогод (калі на гэту дату прыпадала каталіцкае свята, то кірмаш пераносіўся на наступны дзень). Святочныя кірмашы былі прыўрочаны да пэўнага рэлігійнага свята (звычайна каталіцкага) і праходзілі ў дзень свята ці ў наступныя дні. Буйныя рэлігійныя святы (Раство, Пасха, дзень Св. Троіцы, Тры каралі, Вялікі пост, Зялёныя Святы і інш.) маглі выступаць кропкамі адліку часу на правядзенне кірмашоў. Так, у мястэчку Кажан-Гарадок Лунінецкага павета звычайныя кірмашы праходзілі ў 5 дзень кожнага месяца, а святочныя – 22 мая (на Св. Мікалая – праваслаўнае свята), 19 снежня (на Св. Мікалая – праваслаўнае свята), 19 студзеня (Вадохрышча – праваслаўнае свята), у апошнюю нядзелю перад Раством і на Вербніцу. Штогадовыя кірмашы ў мястэчку Куранец Вілейскага павета праходзілі 8 жніўня, 8 верасня, 9 снежня; святочныя – у апошні аўторак перад Вялікім Пастом, у другі аўторак пасля Пасхі, у першы аўторак пасля Раства, у 10 пятніцу пасля Пасхі.

Большасць местачковых кірмашоў у 1921–1939 гг. па таварнай спецыялізацыі былі ўніверсальнымі: на іх можна было набыць самыя разнастайныя па асартыменту тавары, як сельскагаспадарчыя, так рамесныя і прамысловыя. Другімі па значэнні былі сельскагаспадарчыя кірмашы. Тут галоўнымі былі земляробча-раслінная і мяса-рыбна-птушыная прадукцыя. На працягу даследуемага перыяду ў кірмашовым асяроддзі вызначыўся працэс спецыялізацыі кірмашоў па гандлі якім-небудзь адным ці двума таварамі. Асабліва відавочна спецыялізацыя закранула гандаль збожжам, коньмі ці іншай буйной хатняй жывёлай. Спецыялізацыя гандлю дапамагала купцам, рамеснікам і сялянам больш мэтанакіравана арыентаваць пакупнікоў на набыццё патрэбных рэчаў, а таксама з’яўлялася своеасаблівай рэкламай прадукцыі пэўнай мясцовасці. Так, у Міры штогод 22 мая і 19 снежня адбываліся 2 вялікія конскія базары, якія доўжыліся па 2 дні. За коньмі прыязджалі нават купцы з Амерыкі і Бельгіі, ваенныя з Польшчы закупалі тут коней для польскай арміі. Пераважна коньмі і іншай хатняй жывёлай гандлявалі таксама на

кірмашах у Вялікай Бераставіцы, Дывіне, Іўі, Маларыце. Спецыялізаванымі цэнтрамі па продажы льну і вырабаў з ільну былі Валожын, Гарадзея, Любча, Саколка, Сувалкі.

Арганізацыя і правядзенне спецыялізаваных кірмашоў звычайна ажыццяўлялася за межамі ці на ўскраіне мястэчка. Так, збожжавы кірмаш у Новым Пагосце Браслаўскага павета з 1937 г. быў перанесены па рашэнні гміннай рады з цэнтра за межы мястэчка, што не задавальняла яго жыхароў. Згодна са справаздачай павятовага ўрача г. Слоніма за 1928 г., усе кірмашы і вялікія базары, якія збіраліся ў мястэчках Слонімскага павета (акрамя Беняконь і Радуні), былі перанесены за межы мястэчак.

Немалаважную ролю ў структуры ўнутранага размеркавання прадуктаў адыгрываў базарны гандаль, які паступова выцясняў кірмашы. Слова “базар” перайшло ў беларускую мову ў сэнсе “месца для гандлю, таржышча, рынка”. У асобных мястэчках (Індура, Дукшты, Лунна) таргі збіраліся тры разы на тыдзень, у некаторых мястэчках – два (Браслаў, Відзы, Гальшаны, Друя, Жабкі, Ігналіна, Лынтупы, Міёры, Скідзель, Шумск), а ў большасці – адзін раз на тыдзень.

У залежнасці ад таварнай спецыялізацыі штотыднёвыя таргі дзяліліся на вялікія і малыя. Вялікія таргі былі ўніверсальнымі, малыя таржкі – спецыялізаваліся на продажы якога-небудзь аднаго тавара (збожжа ці хатняй жывёлы). Так, у мястэчку Ігналіна Свянцянскага павета Віленскага ваяводства з 1922 г. у кожны чацвер адначасова адбываліся і малыя (хатняй жывёлай) і вялікія таргі. Малы торг адбываўся за межамі мястэчка, дзе звычайна збіраліся кірмашы, вялікі торг праходзіў у цэнтры на рыначнай плошчы.

Па таваразваротах, маштабах і колькасці ўдзельнікаў таргі не саступалі кірмашам. І толькі па працягласці гандлёвых аперацый на іх можна адрозніць кірмаш ад торгу. У мястэчках Віленскага ваяводства, згодна з распараджэннем міністра ўнутраных спраў ад 1929 г., былі ўстаноўлены наступныя гадзіны гандлю: для кірмашоў – 7.00–13.00 (летам), 8.00–13.30 (зімой); для таргоў – 10.00–18.00 (у святочныя дні), 10.00–21.00 (у звычайныя дні).

Польскім урадам былі выпрацаваны асноўныя правілы і інструкцыі па арганізацыі і правядзенні гандлю ў мястэчках Заходняй Беларусі. Выканаўчыя і кантралюючыя функцыі на месцы ажыццяўлялі павятовыя ўрачы і фельчары, гандлёвыя камісіі, гандлёвыя інспектары, адміністрацыя рынка, паліцыя. Рэгламентацыі падвяргаліся: тавар (якасць, колькасць, цана), яго размяшчэнне, умовы захоўвання і продажу, паводзіны прадаўцоў і пакупнікоў. Прадаўцам расхвальваць свой тавар крыкам забаранялася, пакупнікам забаранялася каштаваць і чапаць тавар рукамі (асабліва гэта датычылася мяса, пячэння, цукерак, масла, сыра,

малака). За пачаткам кірмашу і яго арганізацыяй сачылі паліцэйскія ці гандлёвыя інспектары, якія мелі на левай руцэ павязку з надпісам “Nadzór targowy”. За парушэнне правіл гандлю прадугледжваўся штраф да 50 зл., а ў выніку яго нявыплаты – арышт да 8 дзён.

Гандлёвая пошліна (рагавая) збіралася з кожнага ўдзельніка гандлю, кожнай фурманкі і прадаваемай жывёлы. Гмінным урадам мястэчка Лебедзева Маладзечанскага павета Віленскага ваяводства ў 1927 г. былі ўстаноўлены наступныя памеры гандлёвых выплат: за ўезд на рынак – 20 гр., за гандлёвае месца для продажу прамысловых вырабаў, мяса, скуры – 1 зл., за столік з галантарэйнымі таварамі – 50 гр.

З развіццём прамысловасці, удасканаленнем сферы таварна-грашовага абарачэння, паступовым пашырэннем унутранага рынку, побач з кірмашовым гандлем набіраў сілу стацыянарны гандаль: крамны, лавачны. Значэнне гэтай формы гандлю паступова ўзрастала і была дамінуючай для многіх мястэчак Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг.

Асаблівае развіццё ў мястэчках Заходняй Беларусі атрымаў крамны гандаль. Колькасць магазінаў, дробных і сярэдніх лавак у буйных мястэчках вагалася ад 50 да 150, у астатніх – да 50. Так, у мястэчку Івянец Навагрудскага ваяводства ў 20-х гг. XX ст. налічвалася 113 сталых месцаў гандлю, з якіх 98 магазінаў і дробных лавак. Пераважалі прадуктовыя магазіны, бакалеі, магазіны галантарэйных і каланіяльных тавараў, карысталіся попытам лаўкі рамесных і прамысловых вырабаў, крамы адзення і абутку, лаўкі з прадуктамі харчавання. Попытам у насельніцтва карысталіся крамы тэхнікі і абсталявання, у якіх былі выстаўлены на продаж радыёпрыемнікі, веласіпеды, швейныя машыны, музычныя інструменты, запчасткі для аўтамабіляў і інш. Найбольш пакупнікоў у крамах і лаўках збіралася, калі быў скончаны збор ураджаю – у канцы восені. Тавары ў крэдыт (акрамя некаторых яўрэйскіх лавак і магазінаў) звычайна не выдаваліся. Крамны гандаль амаль поўнасцю знаходзіўся ў руках яўрэяў, за выключэннем нязначнай колькасці польскіх крам і крам польскіх кааператыўных саюзаў і таварыстваў. Д. Шыпер у сваёй працы падкрэсліў, што ў 1933 г. у мястэчках Навагрудскага і Палескага ваяводстваў яўрэйскія крамы складалі 82,7% і 84,6% ад агульнай колькасці крам.

Асаблівы даход уладальнікам і мястэчку прыносілі піцейныя ўстановы: віна-водачныя крамы, рэстараны, кафэ, сталовыя, сталовыя-тракціры, корчмы, бары, буфеты. Выраб спірту і гарэлкі, а таксама гандаль гэтым таварам быў пад непасрэдным і строгім кантролем дзяржавы. Кантроль гэты ажыццяўляўся службай акцызу і паліцыяй. Аднак, нягледзячы на гэта, піцейных устаноў у мястэчках было шмат. У мястэчку Мір Стаўбцоўскага павета было 5 рэстаранаў, 2 карчмы,

1 кавярня, некалькі піцейных і бараў, і, як успамінаюць самі жыхары, яны ўсе заўсёды былі перапоўненымі. У некаторых піцейных нават быў більярд. Крыніцы дазваляюць прасачыць, што ў 1930 г. з 238 піцейных устаноў, якія прадавалі спіртныя напіткі ў Палескім ваяводстве (без Камень-Кашырскага і Сарнецкага паветаў), 109 знаходзіліся ў мястэчках і належалі яўрэям.

Для продажу спіртных напіткаў на вынас неабходна была канцэсія, якая выдавалася пераважна палякам. Мясцовыя яўрэі арэндавалі такія канцэсіі ў палякаў, што дазволіла ім адкрываць свае крамы.

Амаль у кожным мястэчку былі гасцініцы і заезныя дамы, колькасць якіх залежала ад гандлёва-прамысловай інфраструктуры мястэчка. Напрыклад, у мястэчках Віленскага ваяводства заезныя дамы былі самым танным месцам часовага прыпынку, і іх было значна больш у параўнанні з колькасцю гасцініц. У найбольш буйных мястэчках колькасць гасцініц і пастаялых двароў дасягала 4–5 (Дунілавічы, Гальшаны, Паставы), у астатніх – 1–3. Сярэдні кошт пакоя быў ад 1,5 да 2 злотых за ноч. Гасцініцы будаваліся часцей за ўсё разам з рэстаранам ці іншымі піцейнымі ўстановамі, а таксама непадалёку ад чыгуначных і аўтобусных станцый. Уладальнікамі гасцініц былі ў роўнай ступені як яўрэі, так і палякі. Заезныя двары належалі пераважна яўрэям.

Развозна-разносным (менавым) гандлем у мястэчках займаліся пераважна яўрэі, якія ў архіўных дакументах сустракаліся пад назвай “вулічныя гандляры”. Д. Шыпер вулічных гандляроў называў “безкатэгорнымі” купцамі (zdeklasowane kupcy), якія ў дзень зараблялі 1–2 зл. Яны на таргах і кірмашах скуплялі розную дробязь, а потым перапрадавалі ці мянялі на іншы тавар у вёсках, мястэчках, гарадах. Прадметамі скупкі з’яўляліся галантарэя, лён і льняныя вырабы, мыла, скуры, фіранкі, дываны, запалкі, грыбы і сельскагаспадарчыя прадукты. Некаторыя вулічныя гандляры спецыялізаваліся на гандлі адным таварам: марожаным, содавай вадой, цукеркамі.

Вулічныя гандляры звычайна разносілі свой тавар па хатах у кошыках і скрынях, але маглі прадаваць з вазоў ці перанасных сталоў. Працэнт вулічных гандляроў у мястэчках Палескага ваяводства быў невысокім, на занятак такім гандлем неабходна было атрымаць ліцэнзію. У 1936 г. у Кобрынскім павеце з 48 вулічных гандляроў толькі 2 былі з мястэчкаў Жабінка і Антопаль, у Столінскім павеце з 400 гандляроў толькі 8 местачковых (у Гараднай). У Лунінецкім павеце налічвалася 9 местачковых вулічных гандляроў: Кажан-Гарадок – 7, Лахва – 1, Ленін – 1; у Драгічынскім павеце – 12 гандляроў: Драгічын – 4, Моталь – 2, Хомск – 3, Янова – 3. Сярод мястэчак Брэсцкага павета вулічным гандлем займаліся ў Высока-Літоўску – 2, Дамачава – 1, Камяні Літоўскам – 1.

Вулічныя гандляры не стваралі амаль ніякай канкурэнцыі стацыянарнаму гандлю, бо цэны на тавары ў вулічных гандляроў былі вышэйшымі. Найбольшае развіццё гэта неперыядычная форма гандлю атрымала ў гарадах.

Важную ролю ў рознічным местачковым гандлі займалі дробныя аптовыя купцы, якія па зніжанай цане скупалі ў земляробаў збожжа і сельскагаспадарчыя прадукты, а потым перапрадавалі свой тавар гандлёвым фірмам ці аптавікам. Раней такіх аптовых купцоў за іх пасрэдніцкія функцыі называлі камісіянерамі. Крыніцы адзначаюць некаторыя імёны найбольш значных местачковых камісіянераў Гродзенскага павета Беластоцкага ваяводства. Так, М. Файнзельберг займаўся закупкай збожжа ў Лунна, А. Грыншпан – у Свіслачы, браты Левіны, Х. Новік, А. Зак – у Вялікай Бераставіцы. Нярэдка местачковым аптовым купцам дапамагалі фактары, якія за грошы вывучалі эканамічную кан’юнктуру, прагназавалі выгаднасць той ці іншай аперацыі, арганізоўвалі гандлёвыя здзелкі. Працай фактараў карысталіся не толькі ў гандлі, але і ў паліцыі, банках, судах. Фактары па характары аказваемых паслуг дзяліліся на некалькі катэгорый: гандлёвыя, прамысловыя, службовыя.

Ліхвярства было вельмі распаўсюджанай з’явай у мястэчку. Займаліся ліхвярствам пераважна яўрэі, пазычаючы грошы пад 4–5% за месяц. Аднак у некаторых мястэчках пазыка давалася пад залог каштоўных рэчаў (ювелірных вырабаў, посуду) ці за выкананне пэўнай працы, у залежнасці ад раменай спецыяльнасці местачкоўца.

Банкаўская сістэма пазык толькі пачынала распаўсюджвацца ў мястэчках. Банкаў было мала, але досыць разгалінаванай была сетка камунальных ашчадных кас і крэдытных кааператываў (хрысціянскіх і яўрэйскіх ашчадных кас, кас Стэфчыка (ашчадных кас, якія атрымалі імя заснавальніка), якія давалі пазыку местачковым сялянам, гандлярам і рамеснікам на 1–2 гады пад пэўны працэнт ці ў беспрацэнтны крэдыт.

У адрозненні ад гарадскога, местачковае купецтва было дробным і цесна звязаным з рамяством і прамысловасцю. Вельмі рэдка местачковы купец займаўся выключна гандлем, звычайна купцы былі ўладальнікамі прамысловых і рамесных майстэрняў, арандатарамі лавак і піцейных устаноў. Такія купцы, як С. Групп і браты Шэлубскія з Ашмян, Ш. Гурвіч і І. Левісон з Вілейкі, І. Грунхаіс і М. Мандаль з Улодаўкі, А. Касоўскі з Лунна, Б. Іцкавіч з Гарадзеі былі ўладальнікамі лясных прадпрыемстваў (тартакаў) і ажыццяўлялі гандаль дрэвам.

Для абароны гандлёвых інтарэсаў і барацьбы са знешняй канкурэнцыяй дробныя купцы аб’ядноўваліся ў прафесійныя саюзы. Згодна з 11 артыкулам польскага гандлёвага Кодэкса за 1918 г., у кожным

населеным пункце, дзе было больш чым за 10 купцоў, павінен быў быць створаны Саюз купцоў. У 30-я гг. XX ст. у такіх мястэчках Палескага ваяводства, як Антопаль, Высока-Літоўск, Ганцавічы, Драгічын, Кажан-Гарадок, Ленін, Лахва, Целяханы, Янова яўрэйскія купцы былі арганізаваны ў саюзы, якія налічвалі да 80 членаў.

Такім чынам, гандаль ў Заходняй Беларусі быў значнай і ўнікальнай з'явай эканамічнай гісторыі Беларусі, ва ўсходняй частцы якой у 1920–1930-х гг. гандлёвыя адносіны былі абмежаваны савецкай уладай. У структуры гандлю Заходняй Беларусі заўважна праяўляліся пяць ўзроўняў яго функцыянавання – міжнародны, агульнапольскі, ваяводскі, павятовы (гарадскі) і гмінны (мястэчка, вёска), гаспадарчыя суб'екты якіх ва ўмовах капіталістычнай арганізацыі гаспадаркі дзеля паспяховай канкурэнтнай барацьбы з рознай ступенню эфектыўнасці супрацоўнічалі, спалучаліся і арганізацыйна перапляталіся, абумоўліваючы адпаведныя эканамічныя паказчыкі. Асаблівую ўвагу прыцягвае гандаль на ўзроўні мястэчка і вёскі, інфармацыя аб якім найбольш чулліва ўспрымаецца грамадствам, які пакінуў пасля сябе значны масіў разнастайных крыніц, у першую чаргу архіўных, і падвержаны для навуковай распрацоўкі з выкарыстаннем методыкі вуснай гісторыі з магчымасцю рознаварыянтных верыфікацый. Гандлёвыя адносіны ў Заходняй Беларусі развіваліся кантынуітэтна, на падставе ўсталяваных яшчэ ў часы Расійскай імперыі традыцый гаспадарчага жыцця і не ўспрымаліся грамадствам і сродкамі масавай інфармацыі, акрамя выданняў левай арыентацыі, як сацыяльнае зло, адмоўна, а наадварот – былі натуральнай, эканамічна абумоўленай формай гаспадарчай дзейнасці.

Аднак цяжкі эканамічны стан гарадскога і местачковага насельніцтва, панаванне манаполій і буйнога памешчыцкага землеўладання, зямельная і падатковая палітыка польскага ўрада, малазямелле і паўперызацыя сялян абвастралі сацыяльныя супярэчнасці. Палітыка паланізацыі і асіміляцыі ва ўмовах нявырашанасці асноўных сацыяльна-эканамічных праблем і абмежаванай дэмакратыі яшчэ больш паглыблялі супярэчнасці паміж народам і польскай адміністрацыяй. Нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі быў адказам беларускага народа на ціск і гвалт, якім падвяргаліся беларусы, іх мова, культура, іх грамадзянскія правы ў Польшчы.

## Тэма 10. Нацыянальна-вызваленчая барацьба ў Заходняй Беларусі

Усталяваныя ў Заходняй Беларусі эканамічныя, грамадска-палітычныя і нацыянальныя адносіны з самага пачатку не спрыялі дабразычлівым адносінам паміж дзяржаўнай уладай і мясцовым насельніцтвам, што абумовіла нацыянальна-вызваленчы рух. Асноўнымі

сіламі яго была дэмакратычная інтэлігенцыя, палітычна актыўная частка рабочага класа і сялянства, апошнія складалі сацыяльную базу гэтага руху. У ім удзельнічалі прадстаўнікі дробнай і сярэдняй беларускай нацыянальнай буржуазіі, якая была нешматлікай і эканамічна слабай. Менавіта сялянства Заходняй Беларусі, як найбольш шматлікі сацыяльны пласт насельніцтва края, рабочы клас, гарадскія рамеснікі і дэмакратычная інтэлігенцыя склалі аснову рэвалюцыйна-дэмакратычнага вызваленчага лагера, які супрацьстаяў урадаваму. Спецыфіка нацыянальна-вызваленчага руху Заходняй Беларусі заключалася ў тым, што барацьба супраць сацыяльнага прыгнёту злівалася з барацьбой за нацыянальнае вызваленне. Найважнейшай і асаблівай прычынай беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, якая абумоўлівала дзейнасць партый і арганізацый, была барацьба за дзяржаўную незалежнасць Беларусі ў розных формах.

З самага пачатку захопу беларускіх зямель Польшчай беларуская палітычная эліта, якая фарміравалася ў складаных умовах панавання на беларускіх землях іншанацыянальных ідэйных плыняў, у асноўнай сваёй масе выказалася супраць захопніцкай палітыкі былой прыгнечанай царызмам Польшчы. Аднак паступова беларускі нацыянальна-вызваленчы рух, нягледзячы на амаль агульную незалежніцкую антыпольскую накіраванасць, аказаўся падзелены на некалькі плыняў, прадстаўнікі якіх па-свойму ўяўлялі сабе будучыню Заходняй Беларусі і ўсёй Бацькаўшчыны. Ідэйная раз’яднанасць не спрыяла кансалідацыі, а наадварот паглыбляла супярэчнасці.

Левы фланг беларускага нацыянальна-вызваленчага руху займалі Беларуская партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў (БПС-Р), якая стаяла на пазіцыях БНР і намагалася праз паўстанне дабіцца адмены рыжскіх пагадненняў і стварэння незалежнай Беларусі. Дзеячы БНР рашуча выступалі за перагляд Рыжскага мірнага дагавора, патрабуючы аднаўлення незалежнай Беларусі ў яе этнаграфічных межах. Па ініцыятыве прем’ер-міністра БНР В. Ластоўскага ў канцы верасня 1921 г. ў Празе была склікана Беларуская нацыянальна-палітычная нарада з удзелам прадстаўнікоў найбольш значных беларускіх нацыянальных палітычных партый. Большасць дэлегатаў (18 з 37) складалі дэлегаты Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў. У прынятай на заканчэнні нарады рэзалюцыі падкрэслівалася, што Беларусь павінна быць ненадзельнай і незалежнай дзяржавай. Рыжскі дагавор яе ўдзельнікі назвалі трактатам аб падзеле, а ўсталяваны парадак – акупацыяй Беларусі двюма суседнімі дзяржавамі, усе ”актыўныя беларускія сілы” заклікаліся да барацьбы ўсімі магчымымі сродкамі “супраць падзелу Беларусі”.

Паступовае аслабленне пазіцый БПС-Р садзейнічала ўзмацненню уплыву камуністычных арганізацый, аб’яднаных у 1923 г. у

Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ). Яна ўзначаліла левварадыкальную плынь у нацыянальна-вызваленчым руху, ставіла сваёй мэтай перамогу сацыялістычнай рэвалюцыі, узʼяднання Заходняй Беларусі з БССР і ажыццяўлення сацыялістычныя пераўтварэнні накшталт тых, якія ўжо былі праведзены ў Савецкай Беларусі. У сваёй паўсядзённай практыцы прадстаўнікі леварадыкальнага крыла ўсяляк прапагандавалі дасягненні БССР у сацыялістычным будаўніцтве.

Але палітыка дыктатуры пралетарыяту, эканамічныя пераўтварэнні, калектывізацыя і палітычныя рэпрэсіі ў БССР, якая першапачаткова складалася ўсяго толькі з шасці паветаў, актыўна адштурхоўвалі насельніцтва Заходняй Беларусі, асабліва інтэлігенцыю, ад сацыялістычных ідэй. Тым больш, што знаходжанне БССР у складзе СССР разглядвалася імі як становішча падначаленага “малодшага брата”, якое з царскай імперыі трансфарміравалася ў “саюз непарушны рэспублік свабодных”. Таму прадстаўнікі нацыянальна-дэмакратычнай плыні ў нацыянальна-вызваленчым руху ў Заходняй Беларусі, бачачы бесперпектыўнасць сацыялістычных пераўтварэнняў, асабліва вырашэння нацыянальнага пытання, па-іншаму ўяўлялі сабе перспектывы развіцця беларускай дзяржаўнасці і далейшага лёсу Заходняй Беларусі.

Лідэры правага крыла склалі дзеячы, раней звязаныя з Найвышэйшай радай – А. Луцкевіч, Б. Тарашкевіч, А. Смоліч, Ад. Станкевіч, Л. Дубейкаўскі, Ф. Ярэміч і інш. Яны лічылі, што змаганне з польскай дзяржавай можа толькі пагоршыць сітуацыю беларусаў, а парламентарызм і польская дэмакратыя дазволіць палепшыць іх гаспадарчы і сацыяльна-культурны стан. У такіх умовах галоўным павінна стаць асветная работа, змаганне за асвету на роднай мове, стварэнне вытворчых кааператываў, удзел у парламенцкіх выбарах. У выніку трансфармацыі грамадска-палітычнай сітуацыі ў асяродку гэтай групоўкі адбылося размежаванне, схіляючыся да легальных парламенцкіх сродкаў палітычнай барацьбы, яны не адмаўляліся ад супрацоўніцтва і ўзаемакантактаў з іншымі палітычнымі сіламі, у адносінах да польскай дзяржавы займалі пазіцыі ад відавочна незалежніцкіх да паланафільства. Палітычная палітра атрымлівала сваю большую каляровую разнастайнасць з-з таго, што беларускі фактар зʼяўляўся даволі значным у геапалітычнай архітэктуры Усходняй Еўропы і меў пэўнае ўвасабленне ў дзейнасці, напрыклад, літоўскіх і нямецкіх палітыкаў, якія завязвалі кантакты з беларускімі дзеячамі, ці за іх спінамі.

Адзначаныя разыходжанні тлумачыліся яшчэ і тым, што палітычныя сілы розных плыняў беларускага нацыянальна-вызваленчага руху не былі самастойныя ў палітычных і матэрыяльных адносінах. Стан нацыянальна-вызваленчага руху шмат у чым абумоўлівала слабасць беларускай буржуазіі і адсутнасць сродкаў на арганізацыйна-прапагандысцкія

мерапрыемствы. Адзіным відавочным выключэннем з гэтага з'яўляецца дзейнасць беларускіх кааператываў, якія на Віленшчыне ўтваралі *Віленскі саюз кааператываў*, шчыльна кантактуючы з Беларускім нацыянальным камітэтам у Вільні (БНК). Беларускія кааператывы мелі выключнае значэнне ў стварэнні матэрыяльнай і арганізацыйнай базы беларускага нацыянальнага руху па ўсёй Віленшчыне. Гэта стала магчымым у выніку дзейнасці В. Іваноўскага, які выкарыстоўваў сваё высокае месца ва ўрадзе Сярэдняй Літвы на пасадзе дырэктара дэпартамента грамадскага забеспячэння (аправізацыя) для падтрымкі Віленскага саюза кааператываў і паступовага надання яму выразна беларускага характару. Але гэты прыклад быў рэдкім і, як аказалася, нязначным выключэннем у рэаліях Заходняй Беларусі.

Вядома, што КПЗБ атрымлівала маральную і матэрыльную падтрымку ў БССР. З'яўляючыся складовай часткай Кампартыі Польшчы (КПП), свае намаганні КПЗБ прыкладвала не столькі для дасягнення дабрабыту заходнебеларускага насельніцтва, колькі на карысць прапаганды і распаўсюджвання камуністычных ідэй. У сваю чаргу беларускія дэмакратычныя партыі і арганізацыі ў Заходняй Беларусі, найперш паланафільскія, якія заяўлялі аб сваёй некамуністычнай арыентацыі, разглядваліся як супрацьвага камуністычнаму ўплыву і падтрымліваліся ў розных формах польскімі палітычнымі сіламі і групоўкамі. Імкненне да ўсталявання ў палітыцы сапраўды незалежніцкіх пляцовак, напрыклад заходнебеларускіх хрысціянскіх дэмакратаў, прыводзіла партыю да стану “вайны на два фронты”: з праўрадавымі і блізкімі да яго арганізацыямі з аднаго боку, і прабальшавіцкімі – з другога.

Акрамя гэтага, адмоўнай з'явай, што характарызавала беларускі рух у Польшчы, была наяўнасць пастаянных міжасабовых канфліктаў паміж рознаскіраванымі дзеячамі. Перакананыя ў сваіх поглядах, яны з неверагоднай зацятасцю накідваліся на сваіх палітычных апанентаў, разрывалі агульны фронт змагання за Беларусь, гэтым прыносілі карысць ворагам беларускай справы, якія з лёгкасцю маніпулявалі беларускім пытаннем.

Першапачаткова вызваленчы рух набыў пераважна ўзброеную, ***партызанскую форму*** барацьбы. Разам з праявамі стыхійнага ўзброенага супраціўлення польскай уладзе, на Віленшчыне, Гродзеншчыне, Беласточчыне партызанскі рух разгортваўся пад кіраўніцтвам БПС-Р, якая яшчэ летам 1921 г. стварыла Цэнтральны беларускі паўстанцкі камітэт на чале з У. Пракулевічам. Для аператыўнага кіраўніцтва партызанскім рухам быў створаны Галоўны беларускі штаб.

Літоўскі ўрад падтрымаў лінію беларускіх эсэраў на ўзброеную барацьбу, мяркуючы выкарыстаць беларускіх партызан для барацьбы з

Польшчай за “Сярэднюю Літву”. З Літвы паўстанцам паступала зброя, амуніцыя, выбуховыя матэрыялы і грошы, якія беларускія дзеячы патаемна ад літоўцаў выкарыстоўвалі на ўмацаванне беларускай справы. На літоўска-польскай мяжы ў мястэчку Мерач быў размешчаны штаб па кіраўніцтву партызанскім рухам. Так, на Гродзеншчыну быў накіраваны В. Разумовіч (“Хмара”), які ўзначаліў IV-ю групу партызанскіх атрадаў. Камандаванне штабоў астатніх паўстанцкіх груп размяшчалася ў Аранах, Уцянах і Вільні. Некаторыя з партызанскіх атрадаў і злучэнняў былі даволі шматлікімі і добра арганізаванымі, так злучэнне пад камандаваннем Г. Шыманюка (“Скамарох”), якое дзейнічала на Беласточчыне, мела 12 партызанскіх атрадаў, агульным лікам звыш 1 000 чалавек. Пры партызанскім злучэнні Галоўны штаб выдаваў газету пад назвай “Беларускі партызан”, у адным з нумароў якой быў надрукаваны ўльтыматум беларускіх партызан да Ю. Пілсудскага і адначасова змяшчаўся зварот да старшыні Лігі Нацый у Жэневе. Ад імя сялянства Беластоцкага, Бельскага, Брэсцкага, Ваўкавыскага, Пружанскага і іншых паветаў выказваліся патрабаванні спыніць рэпрэсіі ў адносінах да беларускага насельніцтва, закрыццё праваслаўных храмаў, прызнаць права Беларусі на самавызначэнне і г.д. У праэсэраўскіх падпольна-паўстаніцкіх структурах згодна з данымі Галоўнага штаба беларускіх партызан налічвася да 10 тыс. чалавек. У адпаведнасці з дырэктывай Галоўнага штаба, на іх ускладаліся абавязкі арганізацыі ў каспіратыўных мэтах асветных гурткоў, кааператываў.

Ва ўмовах актывізацыі эсэраўскага партызанскага руху савецкае кіраўніцтва пачало ажыццяўляць тактыку паступовага пранікнення ў партызанскія структуры і падпарадкавання сабе партызанскіх груповак. Падпольныя арганізацыі КП(б)Б, што засталіся ў краі, раздзялялі пазіцыі эсэраў на разгортванне партызанскага руху, разам з эсэрамі склалі аснову левага, радыкальнага рэвалюцыйнага крыла нацыянальна-вызваленчага руху. З Савецкай Беларусі на падпольную работу былі накіраваны былыя рэвалюцыйныя дзеячы-бальшавікі, удзельнікі грамадзянскай вайны С.А. Дубовік, С.Т. Міллер, М.А. Блінчыкаў, і Гордзін (А. Леановіч) і інш., якія затым сталі кіраўнікамі падпольных партыйных камітэтаў у Беластоку, Брэсце, Вільні. Таму на Палессі, Навагрудчыне і Вілейшчыне партызанскі рух разгортваўся галоўным чынам пад кіраўніцтвам камуністаў. Ён з самага пачатку набыў ярка выражаны класавы характар. Найбольш вядомымі кіраўнікамі партызанскай барацьбы былі камуністы К.Л. Арлоўскі, С.А. Ваўпшасаў, В.З. Корж, А.М. Рабцэвіч, Д.І. Балашка, Д.І. Яблонскі, К.Н. Такушэвіч і інш.

Нягледзячы на розніцу палітычных поглядаў ўдзельнікаў партызанскага руху, яго сацыяльную базу склала беларускае сялянства,

сельская інтэлігенцыя і рамеснікі. Асноўнымі аб’ектамі нападу партызан з’яўляліся памешчыцкія маёнткі, лясніцтвы, сядзібы асаднікаў і паліцэйскія пастарункі, як узброеная апора польскіх улад на заходнебеларускіх землях. Згодна з прызнаннямі ўрадавых колаў Польшчы, у 1922 г. было зроблена 878, а ў 1923 г. – 503 партызанскія напады.

Партызанскі рух у Заходняй Беларусі насіў у цэлым нацыянальна-вызваленчы характар і быў накіраваны супраць польскай улады, яе прадстаўнікоў і прыхільнікаў. Ён абапіраўся на падтрымку сялян, якія забяспечвалі партызан адзеннем, абуткам і разведдадзенымі. Баявыя дзеянні партызан прынялі шырокі размах і наводзілі панічны жах на памешчыкаў і асаднікаў. Многія з іх пачалі прадаваць маёнткі і ўцякаць у Польшчу.

У пачатку 1922 г. польская дэфензіва з дапамогай засланых у эсэраўскую паўстанцкую арганізацыю правакатараў раскрыла яе структуру і правяла масавыя арышты. Частка кіраўнікоў паўстанцкага эсэраўскага руху вымушана была пакінуць тэрыторыю Заходняй Беларусі і застацца ў Літве. Многія тысячы сялян падвергліся арыштам і жорсткім катаванням у паліцэйскіх участках і у дэфензіве. У канцы 1923 г. у турмах Заходняй Беларусі знаходзілася 1 300 палітзняволеных, большасць з іх абвінавачвалася ва ўдзеле ў “партызанцы”. У маі 1923 г. ў Беластоку адбыўся гучны працэс над 45 беларускімі партызанамі, сярод якіх былі два дэпутаты сейма эсэры С. Баран і С. Якавюк. У красавіку 1925 г. адбыўся “працэс 72-х” у Гродна над другой групай беларускіх партызан, следства над якімі цягнулася звыш двух год.

Партызан судзілі не толькі акруговыя, але і надзвычайныя ваенна-палявыя суды. Яны выносілі смяротныя прыгаворы. Так ваенна-палявы суд у Беластоку 23 мая 1923 г. прыгаварыў да расстрэлу партызан А. Тамашука, Я. Сахарчука, Я. Піцелюка, Д. Мартынюка і няпоўнагадовага П. Нічыпарука за напад на паліцэйскі ўчастак у мястэчку Кляшчэлі Бельскага павету, пад час якога былі забіты 2 паліцэйскіх за здзекі над мясцовым насельніцтвам. Нічыпаруку прэзідэнт Польшчы смяротную кару замяніў пажыццёвым зняволеннем, аднак той памёр ад здзекаў. Усяго да смяротнай кары ў Польшчы ў 1923 г. па сведчанні старшыні Беларускага пасольскага клуба Б. Тарашкевіча было прыгаворана 109 чалавек. Большасць асуджаных складалі жыхары Заходняй Беларусі і Валыні.

Пад уплывам партызанскай барацьбы актывізавалася барацьба рабочых у абарону сваіх класавых інтарэсаў. З патрабаваннямі павышэння заработнай платы, супраць эксплуатацыі выступілі рабочыя Гродна, Брэста, Пінска і іншых гарадоў. Найбольш буйнай была ўсеагульная забастоўка беластоцкіх тэкстыльшчыкаў у студзені – лютым 1923 г., у якой удзельнічала звыш 12 тыс. рабочых і рамеснікаў. Па даным інспектарата працы, у Заходняй Беларусі ў 1923 г. адбылося 590 калектыўных канфліктаў, у якіх удзельнічала

126 тыс. чалавек. Дынаміка развіцця рабочага руху ў краі супадала з працэсамі палітычнага развіцця ў Заходняй Еўропе.

Важнае месца ў грамадска-палітычным і культурным жыцці Заходняй Беларусі меў ***Беларускі нацыянальны камітэт*** у Вільні (БНК) – каардынацыйны прадстаўнічы орган беларускіх партый і арганізацый, які імкнуўся стаць кіруючым цэнтрам усіх беларускіх нацыянальна-дэмакратычных партый і арганізацый. Створаны ў Вільні ў 1921 г., у розны час аб’ядноўваў ад 19 да 40 прадстаўнікоў розных партый, арганізацый і таварystваў, вёў нацыянальную, культурна-асветную і кааператыўную работу. Да 1925 г. канкурыраваў з Варшаўскім БНК, стаяў у апазіцыі да польскага ўрада. Ставіў сабе за мэту стварыць Беларуска-Літоўскую дэмакратычную рэспубліку, напачатку дамагчыся культурна-нацыянальнай аўтаноміі Заходняй Беларусі.

Пасля стварэння ў 1926 г. Беларускай сялянска-работніцкай грамады (БСРГ) БНК апынуўся пад яе ўплывам. У гэты час у БНК уваходзіў 31 прадстаўнік беларускіх палітычных партый і арганізацый: БСРГ, Беларускага сялянскага саюза, Беларускай хрысціянскай дэмакратыі (БХД), Таварыства беларускай школы (ТБШ), Беларускага студэнцкага саюза, Беларускага навуковага таварыства і Беларускага выдавецкага таварыства, прэсы, кааператываў і інш. У 1926–1927 гг. вядучую ролю ў БНК адыгрывала левае крыло на чале з кіраўнікамі БСРГ Б. Тарашкевічам, С. Рак-Міхайлоўскім, П. Мятлой. Пасля разгрому БСРГ і рэпрэсій польскіх улад супраць яе прадстаўнікоў дзейнасць БНК паступова заняпала.

Галоўнай беларускай культурна-асветніцкай арганізацыяй з’яўлялася ***Таварыства беларускай школы*** (ТБШ), якое было створана на аснове рашэння Цэнтральнай беларускай школьнай рады ў Вільні ў 1921 г. Кіраўнікамі і актыўнымі дзеячамі ТБШ у розны час былі Б. Тарашкевіч, Р. Астроўскі, Ф. Валынец, Я. Гаўрылік, І. Грэцкі, І. Дварчанін, П. Кізевіч, П. Крынчык, А. Луцкевіч, М. Марцінчык, П. Мятла, С. Паўловіч, М. Пяткевіч, С. Рак-Міхайлоўскі, А. Станкевіч, Ф. Стацкевіч, А. Неканда-Трэпка, А. Уласаў, Я. Шнаркевіч і інш. Напачатку кіруючымі яго органамі былі Цэнтральная школьная і Наглядная рады. Паводле статута 1926 г. вышэйшым органам ТБШ быў з’езд, паміж з’ездамі – Галоўная ўправа, якая мела Наглядную раду, акруговыя і павятовыя ўправы. Друкаваныя органы – “Бюлетэнь ТБШ”, часопіс “Летапіс ТБШ”, газета “Шлях”.

ТБШ імкнулася распаўсюджваць і дапамагаць асвеце сярод беларусаў, пашыраць беларускія школы і беларускую асвету наогул. Асноўная мэта дзейнасці была абвешчана ў Статуце: “пашыраць і памагаць асвеце ў беларускім нацыянальным, людскім і хрысціянскім духу”. Таварыства адкрывала і ўтрымлівала народныя школы і дамы, курсы, настаўніцкія семінары, чытальні-бібліятэкі, сярэднія і вышэйшыя

навучальныя ўстановы, выдавала часопісы, падручнікі і іншую літаратуру, займалася канцэртнай дзейнасцю. ТБШ выступала супраць паланізацыі, сацыяльнага прыгнёту, праводзіла шырокую дзейнасць па адкрыцці беларускіх школ, павышала агульнаадукацыйны і культурны ўзровень насельніцтва, яго нацыянальную свядомасць.

У першыя гады існавання ТБШ пазбягала палітычных метадаў і сродкаў змагання, схіляючыся да культурна-асветніцкіх мерапрыемстваў. Наладжвала курсы для настаўнікаў, аказвала матэрыяльную і навучальна-метадычную дапамогу беларускім гімназіям і пачатковым школам, нелегальна накіроўвала моладзь на вучобу за мяжу, у т.л. ў БССР. З утварэннем Беларускага пасольскага клуба адстойвала нацыянальныя правы на парламенцкім узроўні. Для павышэння эфектыўнасці навучання і выхавання, абароны нацыянальнай адукацыі правяло 11–14 красавіка 1923 г. у Вільні з’езд педагогаў беларускіх гімназій. ТБШ удзельнічала ў падрыхтоўцы падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў, арганізавала кнігавыдавецкую дзейнасць (з 1921 у Вільні працавала Выдавецтва Таварыства беларускай школы).

Якасна новы этап у развіцці нацыянальна-вызваленчага руху быў звязаны з утварэннем у лістападзе 1922 г. беларускай нацыянальнай фракцыі ў польскім сейме – ***Беларускі пасольскі клуб***. У жніўні месяцы напярэдадні выбараў у мэтах аб’яднання сіл беларускія нацыянальныя палітычныя партыі ўтварылі Беларускі цэнтральны выбарчы камітэт, які ўзначаліў А. Луцкевіч. Галоўнай задачай камітэта была выпрацоўка агульнай для ўсіх беларускіх партый адзінай выбарчай платформы, падбор і падтрымка кандыдатаў у дэпутаты (паслы) сейма. А. Луцкевіч з’яўляўся таксама прадстаўніком Беларускага цэнтральнага выбарчага камітэта ў створаным у Варшаве Цэнтральным выбарчым камітэце нацыянальных меншасцей. У яго склад акрамя беларусаў уваходзілі прадстаўнікі ўкраінцаў, літоўцаў, немцаў і яўрэяў.

Асноўная маса беларускага сялянства аддала галасы за блок нацыянальных меншасцей, які сабраў у Заходняй Беларусі 286 000 галасоў. Гэты вялікі поспех беларускіх нацыянальных дэмакратычных сіл у кастрычніку 1922 г. дазволіў правесці ў сейм 11 дэпутатаў, якія прадстаўлялі практычна ўсе найбольш значныя беларускія палітычныя партыі: А. Аўсянік, П. Мятла, Б. Тарашкевіч, Ф. Ярэміч прадстаўлялі сацыял-дэмакратаў; С. Баран, С. Якавюк, У. Каліноўскі – сацыялістаў-рэвалюцыянераў; А. Станкевіч – БХД, С. Рак-Міхайлоўскі – незалежны сацыяліст; М. Кахановіч і В. Рагуля з’яўляліся беспартыйнымі. У сувязі з абвіначваннем у падрыхтоўцы паўстання С. Барана, С. Якавюка і У. Каліноўскага першыя два былі пазбаўлены мандатаў паслоў у чэрвені 1923 г., а месца апошняга ў сейме заняў сацыял-дэмакрат П. Валошын.

Яны разам з сенатарамі В. Багдановічам (БХД), А. Назарэўскім і А. Уласавым (беспартыйныя) стварылі нацыянальную пасольскую фракцыю ў сейме.

Тактыка Беларускага пасольскага клуба была накіравана на адстойванне нацыянальных і сацыяльных правоў беларускага народа шляхам унясення законапраектаў і інтэрпеляцый (запытаў), якія маглі колькі-небудзь палепшыць гаротнае становішча беларускага сялянства, рабочых і рамеснікаў. Так, яшчэ 14 снежня 1922 г. беларускія паслы і сенатары запатрабавалі ад польскага ўрада выканання шэрагу ўмоў культурна-асветнага характару, прадугледжаных Версальскім і Рыжскім дагаворамі. На працягу 1922–1924 гг. БПК было накіравана польскаму ўраду 12 запытаў аб гвалтах і ганеннях у гэтай галіне. У час працы асобных секцый і камісій беларускія парламентарыі дамагаліся адкрыцця беларускіх школ і курсаў, настаўніцкіх семінарый, допуску беларускай мовы ў дзяржаўныя органы і ўстановы адукацыі. Іх захады не заўсёды давалі станоўчыя вынікі, аднак польскі сейм вымушаны быў прыняць “Закон аб мове і арганізацыі школьнай справы для нацыянальных меншасцей”.

Шырокі водгук у грамадскасці і палітычных колах краіны атрымалі запыты дэпутатаў у сувязі з фактамі паліцэйскага самавольства над жыхарамі “ўсходніх крэсаў”, якія затым публікаваліся на старонках дэмакратычнай беларускай прэсы. Інтэрпеляцыі красамоўна сведчылі аб злоўжываннях і злачынствах польскіх улад і іх памагатых. Характэрнай рысай дзенасці беларускіх паслоў былі частыя сустрэчы з насельніцтвам беларускіх сёл і мястэчак. Так у маі – чэрвені 1924 г. адбыліся добра арганізаваныя сустрэчы паслоў з жыхарамі Лідскага, Баранавіцкага, Слонімскага, Сакольскага, Вілейскага і Навагрудскага паветаў. На іх былі абмеркаваны розныя балючыя пытанні сацыяльна-эканамічнага, культурнага і рэлігійнага характару, прыняты адпаведныя рэзалюцыі, якія сталі асновай для далейшай практычнай дзейнасці дэпутатаў у сейме. Сабраны матэрыял склаў аснову “Інтэрпеляцый беларускіх паслоў”, выдадзеных БПК у снежні 1924 г. у колькасці 5 000 экзэмпляраў, распаўсюжаных затым у Беластоку, Брэсце, Пінску, Баранавічах і ў Варшаве.

На дзейнасць беларускага прадстаўніцтва ў польскім парламенце значны ўплыў аказалі знешнія фактары. Галоўным з іх была ўнутраная і замежная палітыка, якую ажыццяўлялі камуністычныя ўлады суседняга СССР. Менавіта пад уплывам камуністаў у чэрвені 1925 г. адбыўся падзел БПК, пасля чаго беларускае парламенцкае прадстаўніцтва перастала існаваць як інстытут, што аб’ядноўваў заходнебеларускі нацыянальны рух.

Нягледзячы на непаслядоўнасць у тактыцы БПК, разыходжанні ў поглядах на спосабы вырашэння сацыяльна-эканамічных праблем і нацыянальнага пытання, дзейнасць клуба мела вялікае ўздзеянне на грамадска-палітычнае жыццё края. Адстойванне на пасяджэннях сейма патрабаванняў адкрыцця беларускіх школ і гімназій, неабходнасці адчужэння царкоўных, касцельных, манастырскіх і буйных прыватнаўласніцкіх зямель, надзялення зямлёй бяднейшых сялян без выкупу, назначэння беларусаў на адміністрацыйныя пасады ўключна да ваяводаў выдзялення грашовых субсідый на адбудову зруйнаваных вайной гаспадарак і інш., мела вялікае значэнне ў выхаванні нацыянальнай і палітычнай самасвядомасці насельніцтва. На факты паліцэйскага тэрора і нацыянальнага ўціску ў Польшчы рэагавала замежная прэса, што не маглі не ўлічваць урадавыя колы Польшчы. З гэтага часу парламенцкія, легальныя сродкі барацьбы становяцца неад'емнай састаўной часткай нацыянальна-вызваленчага руху края.

***Фарміраванне і дзейнасць палітычных партый і арганізацый.*** На змест і характар нацыянальна-вызваленчага руху ў пачатку 1920-х гг. моцнае ўздзеянне аказвала дзейнасць беларускіх палітычных партый, у першую чаргу Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў, а таксама Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі і Беларускай хрысціянскай дэмакратыі.

Праграмныя патрабаванні ***беларускіх эсэраў*** (БПС-Р) (падзел без выкупу памешчыцкіх зямель паміж сялянамі, нацыянальнае раўнапраўе і дэмакратычныя свабоды, утварэнне незалежнай Беларускай дэмакратычнай рэспублікі ў яе этнаграфічных межах і ў федэрацыі з Літвой) знаходзілі шырокі водгук сярод беларускіх сялян і інтэлігенцыі. Пасля таго, як у БССР у лютым 1921 г. было арыштавана 860 актыўных членаў БПС-Р, уключаючы членаў ЦК і Мінскага губкама, дэпартацыі арыштаваных за мяжу, беларускія эсэры вымушаны былі абмежаваць сваю дзейнасць пераважна тэрыторыяй Заходняй Беларусі і Літвы. У 1921–1923 гг. БПС-Р заставалася найбольш масавай і ўплывовай беларускай палітычнай партыяй, у шэрагах якой налічвалася звыш 10 тыс. чалавек. Частка яе кіраўніцтва – Т. Грыб, П. Бадунова, Я. Мамонька знаходзілася ў Празе, В. Ластоўскі, А. Трафімаў, А. Цвікевіч – у Коўна, В. Маслоўская і інш. – нелегальна ў Вільні. Менавіта БПС-Р у 1921 г. узяла ініцыятыву аб'яднання ўсіх беларускіх дэмакратычных сіл на аснове агульнай барацьбы супраць польскай акупацыі беларускіх зямель, была асноўнай арганізацыйнай сілай партызанскага руху.

Ва ўмовах развіцця рэвалюцыйна-вызваленчага руху з левага крыла БПС-Р вылучылася і ў ліпені 1922 г. аформілася ў якасці самастойнай ***Беларуская рэвалюцыйная арганізацыя*** (БРА) – нелегальная

рэвалюцынна-дэмакратычная арганізацыя нацыянальна-вызваленчага характару ў Заходняй Беларусі ў 1922–1923 гг. У шэрагу дакументаў БРА называлася Беларускай рэвалюцыйнай партыяй, Беларускай камуністычнай партыяй. Тэрытарыяльныя арганізацыі БРА існавалі ў Вільні, Навагрудку, Пружанах, Баранавічах, Слоніме, Нясвіжы, Лідзе, Валожыне, Свіслачы, Ваўкавыску і ў 1923 г. аб'ядноўвалі каля 300 сябраў. Мела некалькі соцень спачуваючых, арганізаваных у групы. У ЦК БРА уваходзілі: П. Корчык (І.К. Лагіновіч), А.У. Канчэўскі, Л.І. Родзевіч (А. Сталевіч), А.Р. Капуцкі. Друкаваны орган – газета “Наш сцяг”.

БРА стаяла на пазіцыях класавай барацьбы, падтрымлівала дыктатуру пралетарыяту, выступала за канфіскацыю памешчыцкай зямлі, сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне працоўных, уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР. Мела ўплыў на сялян, лесарубаў, рабочых лесапільных заводаў, рэвалюцыйна настроеную беларускую інтэлігенцыю. На палітычнае аблічча БРА вялікі ўплыў рабілі поспехі ў гаспадарчым і культурным развіцці Савецкай Беларусі. З самага пачатку сваёй дзейнасці БРА наладзіла цесную сувязь з камуністамі Вільні, кантактавала з ЦК Кампартыі Польшчы (КПП).

Кіраўнікі і члены БРА прымалі актыўны ўдзел у перадвыбарчай кампаніі ў польскі сейм у 1922 г., вялі агітацыю за кандыдатаў у дэпутаты ад кампартыі, праводзілі сходы і мітынгі, перакладалі на беларускую мову і распаўсюджвалі агітацыйную літаратуру. БРА арганізавала 15 мясцовых выбарчых камітэтаў, якія пасля выбараў сталі выконваць функцыі сакратарыята Беларускага пасольскага клуба ў сейме. Пасля ўтварэння ў кастрычніку 1923 г. Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ) кантакты паміж БРА і кампартыяй узмацніліся. У канцы 1923 г. адбыўся шэраг сустрэч і сумесных пасяджэнняў членаў ЦК КПЗБ С. Мілера, С. Дубовіка і сакратара Віленскага акруговага камітэта КПЗБ А. Буксгорна з кіраўнікамі БРА П. Корчыкам, А. Канчэўскім, Л. Родзевічам, на якіх абмяркоўвалася палітыка Кампартыі і адносіны да яе БРА. Ад ЦК КПП у гэтых сустрэчах удзельнічаў С. Мертэнс.

БРА прызнала асноўныя праграмныя і тактычныя прынцыпы кампартыі і на краявой канферэнцыі 30 снежня 1923 г. у Вільні прыняла рашэнне пра самароспуск і ўступленне ў КПЗБ. У склад ЦК КПЗБ ад БРА кааптаваны П. Корчык, А. Канчэўскі, А. Капуцкі і Л. Родзевіч. Пра значэнне ўваходжання БРА у КПЗБ сведчыць тое, што ў складзе ЦК КПЗБ да гэтага часу не было ніводнага чалавека, які б свабодна валодаў беларускай мовай, ведаў жыццё сялян, гісторыю Беларусі. На думку П. Корчыка, які ацэньваў аб'яднанне КПЗБ з БРА, “КПЗБ перастала быць арганізацыяй Беластока і Вільні, а стала сапраўды масавай партыяй, якая

арганізуе шырокія пласты беларускага сялянства на ўсёй тэрыторыі Заходняй Беларусі”.

У адрозненні ад БПС-Р сацыяльная база ***Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі*** (БСДП) была значна вужэй. БСДП абапіралася галоўным чынам на беларускую інтэлігенцыю, уплыў партыі на беларускае сялянства быў нязначным. Ва ўмовах польскай акупацыі партыя не змагла выпрацаваць паслядоўную лінію ў нацыянальна-вызваленчым руху. Выступала як палітычная апазіцыя, імкнучыся парламенцкімі сродкамі дабіцца ад польскіх улад культурна-нацыянальнай аўтаноміі Заходняй Беларусі, адчужэння зямлі ў буйных памешчыкаў і перадачы яе малазямельным сялянам, дэмакратычных свабод, увядзення 8-гадзіннага рабочага дня і ўсеагульнага выбарчага права. Будучыня края бачылася ў мірным эвалюцыйным шляху развіцця беларускага грамадства, захаванні дробнай сялянскай гаспадаркі, аб’яднанай у кааператывы і гаспадарчыя саюзы. Паміж яе лідэрамі А. Луцкевічам, Б. Тарашкевічам, С. Рак-Міхайлоўскім, з аднаго боку, П. Аляксюком, Л. Дубяйкоўскім, А. Більдзюкевічам, А. Паўлюкевічам – з другога, узніклі вострыя разнагалоссіі па прычыне адкрытага супрацоўніцтва апошніх з польскімі ўладамі. Аднак арыентацыя на Польшчу не была папулярнай у беларускім асяроддзі. Таму супрацьстаянне закончылася ў верасні 1924 г. расколам і фактычнай самаліквідацыяй партыі. Яшчэ ў 1922 г. у партыі аформілася левае крыло – ***Беларуская партыя незалежных сацыялістаў*** (БПНС) на чале з С. Рак-Міхайлоўскім, да якой пазней далучыўся Б. Тарашкевіч. У 1925 г. БПНС улілася ў КПЗБ.

Ва ўмовах сыходу з палітычнай арэны БПСР і БСДП самай уплывовай сярод беларускіх дэмакратычных палітычных арганізацый была ***Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя***, створаная яшчэ ў маі 1917 г. Яна прайшла складаны шлях ад нешматлікай клерыкальнай арганізацыі ў 1920 гг. да масавай свецкай партыі ў сярэдзіне 1930-х гадоў. Ідэолагі і арганізатары партыі, каталіцкія ксяндзы, беларусы па паходжанні – Ф. Абрантовіч, А. Станкевіч, В. Гадлеўскі, Л. Хвецька, Ф. Будзька, К. Стаповіч, – адмаўляючы капіталізм як лад жыцця, у той жа час негатыўна ставіліся да савецкай улады і тэорыі класавай барацьбы. У пачатку 1930-х гадоў выступілі з абгрунтаваннем трэцяга, прамежкавага паміж капіталістычным і сацыялістычным эвалюцыйнага шляху развіцця грамадства. У аснову практычнай дзейнасці БХД была пакладзена тэорыя самабытнасці беларускай нацыі, прынцып самавызначэння народаў, адмаўленне класавай барацьбы. Беларускі народ разглядаўся як бяскласавы, цалкам працоўны, “сярмяжны” люд. Патрабаванні перадачы зямлі беззямельным і малазямельным сялянам без выкупу ва ўласнасць, 8-гадзіннага рабочага дня, дэмакратычных свабод, адстойванне права

беларускага народа на самастойнасць у яго этнаграфічных межах мелі водгук сярод насельніцтва края, у першую чаргу каталіцкага веравызнання. БХД таксама выступала супраць аддзялення касцёла, як і царквы, ад дзяржавы, супраць выкарыстання рэлігіі ў палітычных мэтах, за абавязковасць вывучэння рэлігіі ў школах. У 1926 г. дзеячы БХД разам з кіраўнікамі Беларускага сялянскага саюза (БСС) стварылі арганізацыю культурна-гаспадарчага характару “Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры” (БІГіК). Шляхам арганізацыі сельскагаспадарчай асветы, заснаваннем сельскагаспадарчых каапературываў, выдачай грашовых пазык кіраўнікам БХД удалося значна распаўсюдзіць свой уплыў на сялянства, частку беларускай інтэлігенцыі галоўным чынам каталіцкага веравызнання. Да 1930 г. функцыяніравала 51 аддяленне БІГіК у розных мясцовасцях Віленскага і Навагрудскага ваяводстваў.

БХД актыўна выступала за ўзмацненне нацыянальнай свядомасці беларусаў, за беларусізацыю касцёла і царквы, выклікаючы незадаволенасць дзяржаўных і касцёльных улад. Цэнтральны друкаваны орган БХД “Беларуская крыніца” нярэдка канфіскоўваўся, а ксяндзы за пропаведзі на беларускай мове падвяргаліся паліцэйскім рэпрэсіям. Так адзін з лідэраў БХД таленавіты прамоўца і публіцыст В. Гадлеўскі двойчы, у 1926 і 1927 гг., арыштоўваўся польскімі ўладамі і быў асуджаны на два гады турэмнага зняволення.

Летам 1925 г. дэпутаты Беларускага пасольскага клуба Ф. Ярэміч і В. Рагуля ў процівагу БСРГ, якая праходзіла стадыю арганізацыйнага афармлення, стварылі палітычную арганізацыю – ***Беларускі сялянскі саюз***. У сакавіку 1926 г. была прынята палітычная праграма, якая змяшчала шэраг радыкальных патрабаванняў: раздзел памешчыцкіх зямель і перадачу іх ва ўласнасць малазямельным і беззямельным сялянам па працоўнай норме, скасаванне асадніцтва, самастойнасць беларускага народа ва ўсіх яго этнаграфічных землях і інш. Аднак неакрэсленасць у пытаннях тактыкі, адкрытая канфрантацыя лідэраў БСС з левымі, рэвалюцыйна-дэмакратычнымі арганізацыямі не спрыялі пашырэнню ўплыва саюза сярод беларускага сялянства. У канцы 1928 г. БСС распаўся.

Найбольш уплывовай і моцнай партыяй, якая вызначала змест і характар нацыянальна-вызваленчага руху, была ***Камуністычная партыя Заходняй Беларусі*** (КПЗБ). Яна была ўтворана 30 кастрычніка 1923 г. на канфэрэнцыі Беластоцкага, Брэсцкага і Віленскага акруговых камітэтаў Камуністычнай рабочай партыі Польшчы, што адбылася нелегальна у Вільні. КПЗБ уваходзіла ў склад Кампартыі Польшчы на правах тэрытарыяльна-аўтаномнай арганізацыі, таму асобнай праграмы і статута не мела. У практычнай дзейнасці зыходзіла з тактычных установак, якія былі прыняты на І-м (1928 г.) і ІІ-м (1935 г.) з’ездах партыі і

канферэнцыях. Яны прадугледжвалі ажыццяўленне сацыялістычнай рэвалюцыі ў краіне, ліквідацыю памешчыцкага землеўладання і перадачу зямлі сялянам без выкупу, права на самавызначэнне Заходняй Беларусі і далучэнне да БССР. Апошняя частка гэтага патрабавання (далучэнне да БССР) была знята ў чэрвені 1931 г. V-м пленумам ЦК КПЗБ у сувязі з падрыхтоўкай савецка-польскага пакта аб ненападзе.

Першымі арганізатарамі партыі былі С. Мертэнс (Скульскі), А. Славінскі (Адам), С. Міллер (Шлёмка), С. Дубовік, А. Тамашэўскі (Стары). У момант стварэння КПЗБ у яе шэрагах налічвалася 528 чалавек. З снежня 1925 г. палітычным сакратаром ЦК КПЗБ быў І. Лагіновіч, адзін з кіраўнікоў БРА, якая ў 1923 г. улілася ў КПЗБ. Зліццё падпольнага камуністычнага руху з левым эсэраўскім пашырыла сацыяльную базу нацыянальна-вызваленчага руху. Нягледзячы на нелегальнае становішча, рэпрэсіі паліцэйскіх улад, ішоў хуткі працэс арганізацыйнага ўмацавання КПЗБ. У канцы 1924 г. у шэрагах партыі налічвалася 2 296 чалавек, у 1927 г. – 3 254. Прыкладна трэцяя частка складу КПЗБ пастаянна знаходзілася ў турмах, а з 1934 г. у створаным для “небяспечных элементаў” “лагеры ізаляцыі” Бяроза Картузская. КПЗБ стала найбольш актыўнай і небяспечнай для ўлад палітычнай сілай у краі.

У практычнай дзейнасці КПЗБ аказвалася падтрымка (ідэйная, фінансавая і арганізацыйная) з боку савецкіх уладных структур. У гэтых мэтах у ліпені 1924 г. было створана Бюро дапамогі Кампартыі Заходняй Беларусі, якое затым у 1925 г. было рэарганізавана ў Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ пры ЦК КП(б)Б. У Мінску функцыяніравала падпольная школа ў мэтах падрыхтоўкі кадраў для нелегальнай работы ў краі. Ва ўмовах несупыннай сочкі і праследвання паліцэйскіх улад ЦК КПЗБ здолеў наладзіць дзейнасць нелегальных друкарняў, арганізаваць выданне з лістапада 1924 г. на беларускай мове газеты свайго цэнтральнага друкаванага органа “Чырвоны сцяг”, часопіса “Бальшавік” і іншыя выданні на беларускай, польскай, яўрэйскай і літоўскай мовах. У вялікай колькасці друкаваліся брашуры, лістоўкі, адозвы.

Дзейнасць камуністычных партый у Еўропе кантралявалася і накіроўвалася з Масквы Камінтэрнам. Стварэнне КПЗБ ў 1923 г. было выклікана жаданнем савецкага кіраўніцтва ўмацаваць сваю прысутнасць у Польшчы, бо становішча ў Заходняй Беларусі было зручнай падставай для бальшавіцкага кіраўніцтва выступаць у якасці абаронцы правоў прыгнечанага народа, а беларускі рух разглядваўся ў Маскве як сродак пралангацыі сваіх уплываў, пры дапамозе якога рэалізоўвалася бальшавіцка-камінтэрнаўская палітыка ў Польшчы. КПЗБ павінна была прыстасоўвацца да ўмоў грамадска-палітычнага жыцця ў Заходняй Беларусі, выкарыстоўваць існуючую сярод беларускага народа незадаволенасць, перацягваць на свой

бок актыўныя элементы, навязваючы свае сацыяльна-класавыя каштоўнасці замест ідэй беларускага нацыянальна-вызваленчага характару. Стварэнне КПЗБ было тактычным крокам Камінтэрна для разгортвання больш шырокага і трывалага рэвалюцыйнага руху ў Польшчы ва ўмовах павелічэння ролі і месца беларускага фактара ва ўнутранапалітычным жыцці Польшчы, відавочным сведчаннем чаго з’яўляліся вынікі выбараў у польскі сейм у 1922 г. У асобе сваіх выбраннікаў, дэпутатаў сейма, беларускія сяляне бачылі абаронцаў нацыянальных і сацыяльных інтарэсаў беларускага народа ў складзе Польшчы.

Відаць, пры арганізацыі беларускай кампартыі ў Заходняй Беларусі бальшавіцка-камінтэрнаўскае кіраўніцтва зыходзіла з інтарэсаў польскіх камуністаў, якія не жадалі губляць кантроль над Заходняй Беларуссю. Аўтарытэт польскай кампартыі, адной з секцый Камінтэрна, быў пацверджаны тым, што стварaемая Кампартыя Заходняй Беларусі не стала паўнавартаснай самастойнай палітычнай адзінкай, а была арганізавана ў выглядзе аўтаномнай адзінкі КПП (у Заходняй Украіне КПЗУ). Аднак новастворанай аўтаномнай адзінцы кампартыі Польшчы не хапала нацыянальнага каларыту, не было ніводнага члена ЦК КПЗБ, які свабодна валодаў бы беларускай мовай, партыя не мела б падтрымкі сярод беларускага насельніцтва. Таму спатрэбіліся прымаць у свае шэрагі былых эсэраў – членаў БРА, магчымую ініцыятыву якой па стварэнні камуністычнай партыі перахапіў Камінтэрн. Гэтая падзея садзейнічала кансалідацыі камуністычных беларускіх і польскіх сіл, аднак мэты і накіраванасць беларускай фракцыі ў КПЗБ не супадалі з імкненнямі польскіх камуністаў.

КПЗБ стваралася ў кастрычніку 1923 г., у час узброенага паўстання ў Кракаве, калі кіраўніцтва Камінтэрна патрабавала ад Кампартыі Польшчы ўзначаліць кіраўніцтва паўстаннем і пачаць стварэнне чырвонай гвардыі, каб трансфарміраваць паўстанне ў рэвалюцыю. Таму бальшавіцкае кіраўніцтва пайшло на тактычны крок: каб перацягнуць на свой бок беларусаў, “замацавала” за КПЗБ тэрыторыю Віленшчыны, нягледзячы на тое, што 12 ліпеня 1920 г. у Маскве быў падпісаны савецка-літоўскі дагавор, па якім Вільня і Віленшчына абяцаліся бальшавікамі Літве – пакуль яшчэ не савецкай. Пазней літоўскія камуністы неаднаразова аспрэчвалі рашэнне аб замацаванні Вільні і Віленшчыны за КПЗБ. Прызнанне Віленшчыны за беларускую этнічную тэрыторыю ўздымала патрыятычны настрой беларускіх нацыянальных дзеячаў, якія спадзяваліся на канчатковае замацаванне з цягам часу Вільні і Віленшчыны за Беларуссю, больш лаяльна ўспрымалі камуністычную агітацыю.

КПЗБ была створана як складовая частка КПП, члены якой не хацелі губляць кантроль над “крэсамі”. Польскія камуністы былі занепакоены

актыўным колькасным ростам КПЗБ за коншт беларускага сялянства і ўзмацнення паўстанцкіх настрояў, намагаліся прыпыніць рэалізацыю небяспечных для Польшчы праектаў беларускіх камуністаў. Маючы неаднойчы справу з такім сабатажам, беларускія дзеячы КПЗБ у канцы 1924 г. заявілі пра неабходнасць стварэння сапраўднай КПЗБ, незалежнай ад палякаў. Іх абвінавацілі ў расколе і парушэнні партыйнага адзінства і назвалі “сэцэсіянерамі”. У кастрычніку 1924 г. прадстаўнікі нацыянальнай фракцыі ў КПЗБ т.зв. “сэцэсіі” рыхтавалі антыпольскае паўстанне ў Заходняй Беларусі, у канцы кастрычніка на ІІ-й канферэнцыі КПЗБ прынялі рашэнне аб пачатку яго падрыхтоўкі. Польскія камуністы праявілі свае патрыятычныя пачуцці, маючы прадстаўніцтва і падтрымку ў Камінтэрне і РКП(б), прыклалі намаганні для зрыву антыпольскага выступлення і здолелі спыніць “заходнебеларускую партызанку”.

Саперніцтва паміж КПП і беларускімі дзеячамі ў КПЗБ можна назіраць на падставе двух устаноў, якія пэўным чынам характарызуюць адносіны паміж беларускім і польскім бакамі ў іх змаганні за КПЗБ, за Заходнюю Беларусь. Вядома, што ў хуткім часе пасля стварэння КПЗБ і ўваходжання ў яе склад БРА ў ліпені 1924 г. пры садзейнічанні прадстаўніцтва ЦК КПРП пры Выканкаме Камінтэрна з мэтай арганізацыі дапамогі КПЗБ было створана Бюро дапамогі Кампартыі Заходняй Беларусі пры ЦК КП(б)Б (“Закардоннае бюро”). У яго склад уваходзілі вышэйшыя дзяржаўна-партыйныя дзеячы БССР, у тым ліку У. Ігнатоўскі, які да кастрычніка 1924 г. кіраваў тэхнічнай работай і арганізоўваў выкананне рашэнняў. Асоба У. Ігнатоўскага і яго дзейнасць паказальныя, менавіта пад яго патранажам дзейнічаў М. Гурын-Маразоўскі (Ханевіч, “Ян”, “Стах”), будучы правадыр “сэцэсіі”, накіраваны рашэннем Бюро ЦК КП(б)Б ад 28 лютага 1924 г. у Заходнюю Беларусь і ўведзены ў склад ЦК КПЗБ, падтрымліваў сувязь з Замежным бюро ЦК КП(б)Б і асабіста з У. Ігнатоўскім, дасылаў туды лісты, атрымліваў дырэктывы, у канцы 1924 г. фактычна выконваў функцыі сакратара ЦК КПЗБ. М. Гурын-Маразоўскі і “сэцэсія”, магчыма са згоды У. Ігнатоўскага, мелі прамое дачыненне да выпрацоўкі і прыняцця на ІІ канферэнцыі курса КПЗБ на арганізацыйную і палітычную падрыхтоўку да ўзброенага паўстання з мэтай аб’яднання Заходняй Беларусі з БССР – вызваленне з-пад Польшчы.

Пасля ўзнікнення ў складзе КПЗБ беларускай нацыянальнай фракцыі, т.зв. сэцэсіі, у лютым 1925 г. Бюро дапамогі было скасавана. Замест яго было створана Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ пры ЦК КП(б)Б, якое фактычна працавала пад кіраўніцтвам Прадстаўніцтва КПП пры Выканкаме Камінтэрна ў Маскве і фактычна лічылася яго філіялам у Мінску, гэта значыць, польскія камуністы, ліквідаваўшы т.зв. сэцэсію, змаглі пазбавіцца значнай, часам вырашальнай ролі камуністаў-беларусаў,

навязаць КПЗБ свой кантроль, выводзячы яе з-пад уплыву КП(б)Б, якая дэманстравала сваю незадаволенасць і патрабавала своечасовага інфармавання па пытаннях палітычнай работы ў Заходняй Беларусі.

Стварэнне КПЗБ было на карысць польскім камуністам, якія атрымалі пэўны кантроль над беларускім рухам, маглі аказваць на яго вырашальны ўплыў. У Маскве глядзелі на КПЗБ і рэвалюцыйны рух у Польшчы як на сродак і своеасаблівы рычаг, з дапамогай якога пры неабходнасці можна было аказваць уплыў на Польшчу падчас савецка-польскіх дыпламатычных гульняў. КПЗБ садзейнічала ўмацаванню пракамінтэрнаўскіх пазіцый, а яе радыкалізм і сектанцтва прыводзілі да аслаблення беларускага руху.

Зліццё нізавых структур БРА з КПЗБ садзейнічала актывізацыі дзейнасці прафесійных, кааператыўных і культурна-асветных арганізацый края, у тым ліку ТБШ. Рэалізацыя на практыцы закона 1924 г. аб мове і школе зводзілася на практыцы да стварэння двухмоўных школ і вяла да фактычнай паланізацыі беларускага насельніцтва. Таму ТБШ узмацніла намаганні па адкрыццю прыватных беларускіх школ, народных дамоў, клубаў-чытальняў. Мэтанакіраваная акцыя па адкрыццю ахапіла ў хуткім часе сотні сёл, дзясяткі паветаў Заходняй Беларусі. Найбольш шырокі размах гэты рух набыў у Пружанскім, Косаўскім, Дзісненскім, Вілейскім і Навагрудскім паветах.

Беларускія палітычныя арганізацыі канкурыравалі з агульнапольскімі легальнымі палітычнымі партыямі, якія актыўна дзейнічалі на тэрыторыі Заходняй Беларусі і аказвалі вялікі ўплыў на мясцовае насельніцтва. Галоўнымі сярод іх былі ***Польская сацыялістычная партыя*** (ППС) і ***Сялянская партыя "Вызваленне"***, а таксама сацыял-дэмакратычная партыя яўрэйскіх рабочых – ***Бунд***, нізавыя арганізацыі якіх часта супрацоўнічалі з камуністычнымі арганізацыямі ў абароне дэмакратычных свабод, супраць падаткавага гнёту, увядзенне на практыцы 8- гадзіннага рабочага дня, за права народаў на аўтаномію і самавызначэнне.

У сувязі з разгромам дэфензівай паўстанцкіх структур БПС-Р кіраўніцтва ***партызанскім рухам*** перайшло пад кантроль КПЗБ, што садзейнічала актывізацыі ўзброеных выступленняў. Так, з 3 на 4 жніўня 1924 г. партызанскі атрад пад камандаваннем С. Ваўпшасава паводле дырэктывы з Мінска зрабіў напад на мясцовую турму ў Стаўбцах з мэтай вызвалення затрыманых пры нелегальным пераходзе савецка-польскай мяжы члена ЦК КРПП С. Мертэнса і члена ЦК КПЗБ І. Лагіновіча, аб чым дэфензіва не ведала, як і сам Ваўпшасаў. Шырокі рэзананс у грамадстве ў верасні 1924 г. атрымаў напад на пасажырскі цягнік партызанскага атрада К. Арлоўскага на пераездзе Парахонск-Лоўча чыгункі Пінск-Лунінец.

Партызаны раззброілі паліцэйскіх і афіцэраў, затрымалі ў цягніку палескага ваяводу С. Даўнаровіча, які пасля гэтага вымушаны быў падаць у адстаўку.

Многія акцыі адбываліся ад імя легендарнага ў той час партызанскага важака Ю. Мухі-Міхальскага, былога харунжага польскай арміі, вобраз якога тагачасная прэса атаясамлівала з пушкінскім Дуброўскім. Толькі з красавіка 1924 г. па лістапад 1925 г. партызаны правялі каля 280 баявых аперацый.

У адказ польскія ўлады ўзмацнілі паліцэйскія рэпрэсіі. У дадатак да паліцыі быў сфарміраваны "Корпус аховы граніц", у задачу якога ўваходзіла барацьба з партызанскім рухам. Паўсюдна дзейнічалі надзвычайныя суды і карныя экспедыцыі. Так, у Палескім ваяводстве за 9 месяцаў 1924–1925 гг. было расстраляна 57 чалавек. Яшчэ больш асуджана на пажыццёвае турэмнае зняволянне.

Ва ўмовах стабілізацыі капіталістычнай сістэмы, пасля афіцыйнага прызнання краінамі Антанты ў сакавіку 1923 г. усходняй мяжы Польшчы і нежаданні Літвы падтрымліваць арганізацыйна і фінансава беларускі партызанскі рух, тактыка далейшай партызанскай барацьбы была безперспектыўнай і нават шкоднай. Яна ставіла пад удар мясцовае жыхарства, бо карныя экспедыцыі прымянялі "пацыфікацыі", пад час якіх разбурэнням падвяргаліся пабудовы сялян, а жыхары жорсткім катаванням за малейшае спачуванне партызанам. У скасаванні паўстанцка-партызанскай барацьбы праявілі сваю рашучую зацікаўленасць і польскія камуністы, якія паўплывалі на асуджэнне ў 1925 г. рашэнняў II канферэнцыі КПЗБ аб паўстанні, дабіліся спынення партызанскага руху, які перашкаджаў наладжванню збліжэння Масквы і Варшавы.

Новая тактычная лінія бальшавіцка-камінтэрнаўскага кіраўніцтва была накіравана на спалучэнне нелегальнай дзейнасці і легальнай працы ў масавых арганізацыях для заваёвы ідэйнага ўплыву сярод працоўных края.

***Беларуская сялянска-работніцкая Грамада.*** У другой палове 20-х гадоў нацыянальна-вызваленчы рух дасягнуў вышэйшага этапу свайго развіцця. Гэтаму садзейнічалі ў першаю чаргу актыўныя захады кіраўніцтва КПЗБ па згуртаванні левых сіл нацыянальна-вызваленчага руху ў краі і расколе Беларускага пасольскага клуба. Па ініцыятыве КПЗБ з яго складу ў чэрвені 1925 г. выйшлі Б. Тарашкевіч, С. Рак-Міхайлоўскі, П. Мятла, П. Валошын і ўтварылі асобную сеймавую фракцыю "Беларуская сялянска-работніцкая грамада". На прадстаўнічай нелегальнай сустрэчы ў Сопаце бліз Гданьска ў жніўні 1925 г. кіраўнікоў ЦК КПЗБ, ЦК КП(б)Б, ЦК КПП з кіруючым актывам БСРГ Б. Тарашкевічам, П. Мятлой, Р. Астроўскім і М. Марцінчыкам была дасягнута дамоўленасць аб стварэнні шырокай арганізацыі рэвалюцыйна-дэмакратычнага вызваленчага характару, вызначаны асноўныя аспекты яе палітычнай праграмы.

Праграма была апублікавана вясной 1926 г. і ўключала дэмакратычныя і сацыяльна-эканамічныя патрабаванні, якія адлюстравалі інтарэсы практычна ўсіх слаёў насельніцтва края, з акцэнтацыяй на сялянства. У ёй высоўваліся патрабаванні стварэння рабоча-сялянскага ўраду, поўнай свабоды сходаў і палітычных арганізацый, права свабоднага абрання органаў самакіравання, перадачы памешчыцкіх і царкоўных зямель сялянам без выкупу, скасаванне асадніцтва, перакладання налогаў на маёмасныя класы і вызваленне ад падаткаў беззямельных і малазямельных сялян, 8- гадзіннага рабочага дня, аплачваемага адпачынку, дапамогі беспрацоўным у памеры пражытачнага мінімума, права народаў на самавызначэнне і аб’яднанне ўсіх беларускіх зямель у адзінай рэспубліцы пад уладай рабочых і сялян і інш.

У хуткім часе БСРГ пераўтварылася ў масавую арганізацыю, сацыяльную базу якой складала беларускае сялянства, галоўным чынам бяднейшае і сярэдняе. У арганізацыю ўступалі таксама рабочыя, рамеснікі, прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі. У студзені 1927 г. у яе шэрагах налічвалася звыш 100 тыс. чалавек, аб’яднаных у двух тысячах гурткоў.

Праз свае друкаваныя органы, якія з-за праследванняў паліцэйскіх улад часта мянялі назвы, БСРГ асвятляла жыццё сялянства, рабочых і інтэлігенцыі края, самавольства польскай адміністрацыі, памешчыкаў і асаднікаў. У друку Грамады актыўна працаваў А. Луцкевіч, іншыя нацыянальныя дзеячы, якія выступалі супраць палітыкі паланізацыі. Аб папулярнасці друку БСРГ сведчаць такія факты, што многія сяляне-беднякі выпісвалі газеты ўскладчыну, наладжвалі калектыўныя чыткі, чэргі па дастаўцы газет з пошты.

Значна актывізавала ў гэты перыяд сваю дзейнасць Таварыства беларускай школы. Колькасць гурткоў ТБШ у 1927 г. дасягнула 450 – найбольшая колькасць за ўвесь перыяд яго існавання. Яны аб’ядноўвалі ў сваіх шэрагах каля 16 тыс. чалавек. У Гродна, Глыбокім, Слоніме, Лідзе, Міры і іншых гарадах былі створаны акруговыя ўправы ТБШ. Кружкі і ўправы ТБШ разгарнулі шырокую культурна-асветніцкую дзейнасць: у сёлах і мястэчках чыталіся даклады на грамадска-палітычныя тэмы, адкрываліся бібліятэкі-чытальні, ставіліся спектаклі, будаваліся народныя дамы.

Сумесная культурна-асветніцкая праца садзейнічала збліжэнню камуністычнага руху з беларускімі нацыянальна-дэмакратычнымі сіламі і супрацоўніцтва з асобнымі яго прадстаўнікамі, чаму садзейнічала мэтанакіраваная палітыка на збліжэнне палітычнага сакратара ЦК КПЗБ І. Лагіновіча. Выкарыстоўваючы легальныя магчымасці павятовых камітэтаў БСРГ і акруговых упраў ТБШ, КПЗБ разгарнула шырокую кампанію барацьбы за амністыю палітзняволеным і адкрыццё школ на роднай мове. У гарадах і сёлах Заходняй Беларусі прайшлі мітынгі і

дэманстрацыі, на якіх прымаліся рэзалюцыі з патрабаваннямі вызвалення з турэм палітзняволеных і адкрыцця школ на беларускай мове. У другой палове 1926 г. пад патрабаваннямі вызвалення палітзняволеных было сабрана ў Заходняй Беларусі 100 тыс. подпісаў. Акрамя збору подпісаў, падачы "школьных дэкларацый", гурткі Грамады і ТБШ арганізоўвалі байкот польскай школы беларускімі дзецьмі, адкрывалі прыватныя беларускія.

Была праведзена работа па адкрыцці Беларускага кааператыўнага банка, для якога Бюро ЦК КП(б)Б выдаткавала 30 тыс. рублёў. Банк узначальваў у 1925–1926 гг. дырэктар Віленскай беларускай гімназіі і віцэ-старшыня БСРГ Р. Астроўскі. У канцы 1926 г. банк налічваў каля 900 укладчыкаў і меў свае аддзяленні ў Пінску і Глыбокім. Ён аказваў малаёмасным сялянам дапамогу ў крэдытах за невялікі працэнт.

Мясцовая адміністрацыя імкнулася аслабіць барацьбу беларускага насельніцтва. Пасля майскага дзяржаўнага перавароту 1926 г. і ўсталявання ў краіне аўтарытарнага рэжыму Пілсудскага былі ўзмоцнены рэпрэсіі супраць арганізацый нацыянальна-вызваленчага характару. Непрымірымую пазіцыю да Грамады занялі крэсавыя памешчыкі, асабліва тагачасны міністр юстыцыі А. Мяйштовіч. Актывізацыя і радыкалізацыя мясцовых суполак БСРГ вельмі непакоіла і польскіх камуністаў, якія шырока былі прадстаўлены ў кіраўніцтве КПЗБ. Па гэтых пытаннях у партыі назіралася вострая фракцыйная барацьба, польскія камуністы баяліся, што рашучыя дзеянні БСРГ у асноўнай сваёй масе беларускіх сялян могуць сапраўды прывесці да паўстання, якое пакладзе канец польскаму ўплыву і далучыць Заходнюю Беларусь з БССР. Відавочна, з-за гэтага разгром Грамады не выклікаў рашучай дзейснай рэакцыі з боку КПП і КПЗБ.

У студзені 1927 г. польскія ўлады арыштавалі кіраўнікоў БСРГ Б. Тарашкевіча, С. Рак-Міхайлоўскага, П. Валошына і П. Мятлу, а таксама звыш 400 яе актывістаў. Зняволенне парламентарыяў супярэчыла абавязваючым законам, якія гарантавалі ім недатыкальнасць у час выконвання дэпутацкіх абавязкаў. У сакавіку БСРГ была аб'яўлена нелегальнай арганізацыяй, сялян сілай прымушалі здаваць членскія білеты. Узмацніліся рэпрэсіі супраць іншых беларускіх кааператыўных і культурна-асветніцкіх арганізацый. Шырокі рэзананс у грамадскасці атрымаў "паказальны" працэс над 56 кіраўнікамі і актывістамі Грамады, які праходзіў у Вільні ў лютым – маі 1928 г. Суд прыгаварыў Б. Тарашкевіча, С. Рак-Міхайлоўскага, П. Валошына і П. Мятлу да 12 гадоў, М. Бурсевіча – да 8 , іншых 32 актывістаў – ад 3 да 6 год турмы.

Адначасова з рэпрэсіўнымі мерамі Пілсудскі ў прапагандысцкіх мэтах выступіў з праграмай дробных уступак нацыянальным меншасцям.

Шляхам увядзення некалькіх гадзін радыёперадач на беларускай мове на віленскай радыёстанцыі, выдзяленнем грашовых субсідый асобным арганізацыям гаспадарчага і культурна-асветніцкага характару, выданнем цыркуляра аб вывучэнні мясцовай адміністрацыяй і польскімі настаўнікамі беларускай мовы, іншымі мерамі рэжым “санацыі” імкнуўся адцягнуць беларускую інтэлігенцыю і сялянства ад камуністычных палітычных структур. Некаторыя беларускія нацыянальныя дзеячы і арганізацыі, як Беларускі сялянскі саюз, фармальна застаючыся ў апазіцыі да ўрада, фактычна пайшлі на супрацоўніцтва з ім. Аднак гэта было хутчэй выключэннем, чым правілам, бо такая пазіцыя не атрымала падтрымкі беларускага сялянства і інтэлігенцыі. Не спрыяла супрацоўніцтву тое, што з 1928 г. урад адкінуў абвешчаныя раней сціплыя дэкларацыі ў вырашэнні беларускага пытання.

Актыўная барацьба ў абарону сацыяльных патрэб і нацыянальных правоў розных сацыяльных пластоў беларускага грамадства садзейнічала росту аўтарытэту КПЗБ сярод насельніцтва края. Аб гэтым сведчылі вынікі выбараў у сейм восенню 1928 г. За яе кандыдатаў, нягледзячы на рэпрэсіі і перашкоды з боку афіцыйных улад, прагаласавала 26,8% выбаршчыкаў (328 832), што значна перавышала колькасць галасоў, адданых за іншыя Беларускія палітычныя партыі. У выніку выбараў КПЗБ стварыла ў польскім сейме легальную фракцыю – беларускі пасольскі клуб ***“Змаганне”***. Дэпутаты клуба Я. Гаўрылік (старшыня клуба), І. Дварганін, Я. Грэцкі, Ф. Валошын, П. Крынчык, які змяніў А. Стагановіча, праз парламенцкую трыбуну адстойвалі сацыяльна-эканамічныя патрабаванні працоўных і нацыянальныя правы беларускага народа. Разам з гэтым у дзейнасці кіраўніцтва арганізацыі праяўлялася абсалютызацыя класавых падыходаў, насаджэнне левардыкальных настрояў замест беларускіх культурных прыярытэтаў і задач нацыянальна-вызваленчага руху. Радыкалізацыя “Змагання” садзейнічала таму, што ў верасні 1930 г. дэпутаты клуба былі арыштаваны польскімі ўладамі і пасаджаны ў турму.

На стане развіцця нацыянальна-вызваленчага руху, пачынаючы з 1929 г., адмоўна сказалася імкненне кіраўніцтва КПЗБ фарсіраваць рэвалюцыйны працэс, ставіць максімалісцкія лозунгі і патрабаванні з разлікам на абвастрэнне барацьбы рабочых і сялян. Асабліва яскрава гэта выявілася ў час сусветнага эканамічнага крызісу 1929–1933 гг. Так VI пленум ЦК КПЗБ у кастрычніку 1932 г. даў устаноўку “папулярызацыі лозунга аб усеагульнай забастоўцы”, увязваючы яе “з прапагандай узброенага паўстання”. Трэба адзначыць, што такая тактычная лінія лагічна выцякала з тагачаснага курсу Камінтэрна на рэвалюцыйны выхад з крызісу.

Гэтая лінія яскрава выявілася ў імкненні ЦК КПЗБ надаць культурна-асветніцкаму напрамку дзейнасці ТБШ ярка выражаны рэвалюцыйны

характар шляхам змены яго кіраўніцтва. Пасля працяглай арганізацыйнай барацьбы, у якую былі ўцягнуты амаль усе нізавыя гурткі і акруговыя ўправы таварыства, на з’ездзе ТБШ у маі 1929 г. быў абраны новы склад Галоўнай управы, у якую увайшлі ў асноўным члены КПЗБ: Ф. Стэцкевіч (старшыня), Р. Шырма (сакратар), І. Дварчанін, Ф. Валынец і інш. Ад кіраўніцтва ТБШ былі адхілены А. Луцкевіч, Р. Астроўскі, Я. Станкевіч, І. Шнаркевіч, А. Трэпка і іншыя вядомыя беларускія дзеячы. Гэты раскол у лагеры нацыянальна-вызваленчага руху, а таксама ўзмоцненыя рэпрэсіі з боку польскіх улад адмоўна паўплывалі на практычную дзейнасць ТБШ. Калі ў 1930 г. налічвалася 7 акруговых упраў Таварыства, то ў 1931 г. іх засталося толькі 3 – Беластоцкая, Косаўская і Ваўкавыская. Зменшылася і колькасць членаў ТБШ: з 10 тыс. у 1930 г. да 4 тыс. у 1932 г.

Левацка-сектанцкі ўхіл у дзейнасці КПЗБ быў адной з асноўных прычын спаду нацыянальна-вызваленчага руху ў пачатку 30-х гадоў. Аднак паступова забастовачная барацьба рабочых станавілася ўсё больш масавай, ахопліваючы зачастую цэлыя галіны прамысловасці. У працэсе барацьбы мяняўся і характар забастовак. Калі ў 1929–1930 гг. яны былі накіраваны на абарону раней дасягнутых заваёў, то ў 1931–1933 гг. забастоўкі сталі насіць папераджальны характар. Бастуючыя актыўна выкарыстоўваюлі метад заняцця прадпрыемстваў. Асабліва ўзмацнілася барацьба ў Заходняй Беларусі, як і ва ўсёй краіне ў 1932 г. супраць прыняцця антырабочага заканадаўства. Баставалі рабочыя лесапільных заводаў Гайнуўкі, Белавежы, Слоніма, фабрыкі гумавых вырабаў у Лідзе, тэкстыльшчыкі Беластока і яго прамысловай акругі, рабочыя фанерных фабрык Пінска і Гродна, лесапільняў Слоніма, шклозаводаў Гродна і Нёмана.

З кастрычніка 1932 г. па люты 1933 г. праходзіла забастоўка рабочых лясной промысловасці Белавежскай пушчы, дзе выступленнямі было ахоплена больш 7 тыс. чалавек (4 тыс. рабочых і 3 тыс. сялян). Яна была спынена пасля павышэння заработнай платы на 30%. Праз год (з лістапада 1933 г. па люты 1934 г.) рабочыя лясной галіны зноў аб’явілі забастоўку, якая насіла яшчэ большы размах і арганізаванасць. Усяго ў 1932 г. у Заходняй Беларусі адбылася 51 забастоўка, у якіх прынялі ўдзел 32,4 тыс. рабочых, у 1933 г. – 81 забастоўка і адпаведна 36,7 тыс. рабочых. Гэта значна больш у параўнанні з папярэднім 1931 годам.

Эканамічныя стачкі, як правіла пад уплывам камуністаў, усё часцей перарасталі ў палітычныя. Яны праходзілі пад знакам пралетарскага адзінства, супраць рэпрэсій, урадавай знешняй і ўнутранай палітыкі. Асабліва гэта характэрна для 1933 г., што было звязана з новым наступленнем манаполій на сацыяльныя заваёвы рабочых. У гэтым годзе адбылося звыш 14 палітычных забастовак, што значна перавышала іх

колькасць за ўсе гады сусветнага эканамічнага крызісу. Палітычныя стачкі суправажаліся шматлюднымі мітынгамі і дэманстрацыямі, якія нярэдка завяршаліся сутычкамі з паліцыяй.

Пачынаючы з 1931 г., колькасна ўзраслі выступленні сялян супраць памешчыкаў, камасацыі і ліквідацыі сервітутаў, падатковага цяжару, шарварак (дарожнай павіннасці). Яны прымалі розныя формы, пачынаючы ад масавых патраў, заканчваючы актыўным супраціўленнем уладам. Такія выступленні ў 1931–1932 гг. адбыліся больш чым у 160 сёлах Беластоцкага, Брэсцкага, Гродзенскага, Віленскага, Пінскага і Навагрудскага паветаў. Для падаўлення сялянскіх выступленняў улады пасылалі карныя экспедыцыі, праводзілі "пацыфікацыі", якія пераўтвараліся ў бязлітасныя расправы над сялянамі. У верасні 1931 г. былі ўведзены надзвычайныя, фактычна ваенна-палявыя суды, прыгаворы якіх не падлягалі абскарджанню. У адказ на дзеянні паліцыі сяляне вымушаны былі ствараць атрады самаабароны, а ў шэрагу выпадкаў станавіцца на шлях партызанскай барацьбы. Восенню 1932 г. стыхійны партызанскі рух ахапіў шэраг паўднёвых паветаў Палескага ваяводства і Валынь.

У 1932–1933 гг. у выніку пагаршэння эканамічнага становішча насельніцтва і агітацыйна-прапагандысцкай дзейнасці КПЗБ у краі вырасла сацыяльнае напружанне, абвастрыліся формы барацьбы. У сакавіку 1932 г. адбылося ўзброенае выступленне сялян вёскі Асташына Навагрудскага павета і навакольных вёсак супраць падатковага прыгнёту. Пасля таго як сяляне спалілі маёнтак абшарніка, сядзібы асадніка і гандляра, якія купілі канфіскаваную ў сялян за даўгі маёмасць, паліцыя прымяніла да сялян рэпрэсіі. Прыбыўшыя на дапамогу асташынцам сяляне 8 навакольных вёсак уступілі ва ўзброеную барацьбу з карным атрадам. Па прысудзе надзвычайнага суда сяляне Асташына І. Бахар, А. Гаўраш, А. Малец, В. Стасевіч былі павешаны, пяць сялян прысуджаны да пажыццёвага зняволення, 44 чалавекі атрымалі 241 год турмы.

У ліпені 1933 г. адбылося ўзброенае выступленне сялян Кобрынскага павета, незадаволеных цяжкім жыццёвым станам. Стыхійныя пратэставыя настроі сялян былі выкарыстаны камуністамі, якія заклікалі да ўзброенага паўстання, што прывяло да ахвяр. Кобрынскі і суседнія з ім паветы былі аб'яўлены на асадным становішчы, арганізатараў узброенага выступлення, у тым ліку і сакратара Брэсцкага акруговага камітэта КПЗБ Р. Каплан, аддалі ваенна-палявому суду. У выніку разгорнутай кампаніі салідарнасці смяротная кара ім была заменена пажыццёвым турэмным зняволенем.

Абвастрэнне грамадска-палітычнай сітуацыі ў выніку радыкалізацыі апазіцыйных выступленняў па закліку КПЗБ прыводзіла да ўзмацнення рэжыму. Яскравым сведчаннем актывізацыі рэпрэсіўнай палітыкі ўрада было стварэнне ў чэрвені 1934 г. лагера "ізаляцыі" ў Бярозе Картузскай,

праз якi да 1939 г. “прайшло” звыш 10 тыс. чалавек, у асноўным актыўных апанентаў улады ў Заходняй Беларусi i Заходняй Украiне.

Палiцэйскi перaслед i адмiнiстрацыйныя перашкоды, а таксама левацка-сектанцкая пазiцыя ЦК КПЗБ значна звузiлi арганiзацыйныя магчымасцi нацыянальна-вызваленчага руху. У 1933 г. функцыянiравала толькi Беластоцкая акруговая ўправа ТБШ i каля 50 гурткоў. Прычым супраць кiраўнiкоў ТБШ – Ф. Стэцкевiча, Р. Шырмы i М. Пяткевiча – КПЗБ разгарнула чарговую кампанiю па абвiнавачваннi ў нацыянал-апартунiзме i бяздзейнасцi. На развiццi нацыянальна-вызваленчага руху таксама адмоўна адбiлiся неапраўданыя рэпрэсii, якiм у 1933 г. падверглiся ў БССР былыя кiраўнiкi БСРГ i “Змагання”: П. Валошын, Ф. Валынец, Я. Гаўрылiк, І. Грэцкi, І. Дварчанiн, П. Крынчык, С. Рак-Мiхайлоўскi, а некалькi пазней – Б. Тарашкевiч. У адпаведнасцi з пагадненнем, заключаным памiж Польшчай i СССР па абмену палiтзняволенымi, яны ў 1932 г. прыехалi ў БССР, дзе ў хуткiм часе былi абвiнавачаны ў “контррэвалюшяйнай змове i антысавецкай дзейнасцi”. Разам з iмi былi арыштаваны кiруючыя работнiкi ЦК КПЗБ: Я. Бабровiч, А. Капуцкi, С. Клiнцэвiч, Л. Родзевiч i iнш. З гэтага часу органамi НКУС пачынаецца адпрацоўка версii аб засмечанасцi КПЗБ, як i КПП “агентамi польскай дэфензiвы”.

Пад уплывам гэтых абвiнавачванняў ЦК КПЗБ у 1934 г. прыняў памылковыя рззалюцыi, у якiх з левасектанцкiх пазiцый разглядалася дзейнасць партыi па кiраўнiцтву нацыянальна-вызваленчым рухам, а прынятая ў партыю БРА квалiфiкавалася як нацыяналiстычная агентура ў шэрагах камунiстычнага руху.

У той жа час у 30-я гг. у нацыянальна-вызваленчым руху ўсё большую ролю сталi адыгрываць беларускiя нацыянальна-дэмакратычныя партыi. *Група А. Луцкевiча – Р. Астроўскага*, якая з канца 1929 г. дзейнiчала пад сцягам беспартыйнасцi, накiроўвала дзейнасць розных нацыянальных культурна-асветных, грамадскiх i маладзёжных арганiзацый: Таварыства беларускай асветы, Беларускага навуковага, дабрачыннага i жаночага таварыстваў, Беларускага студэнцкага саюза. У мемарыяле да прэзiдэнта Польшчы І. Масцiцкага дзеячы групы, якая атрымала iранiчную назву “Беларуская санацыя”, заявiлi аб “маральным разбраеннi з абодвух бакоў” i неабходнасцi пагаднення з урадам. У аснову яго было пакладзена патрабаванне выдзялiць Вiленскае, Навагрудскае i Палескае ваяводствы ў асобную адмiнiстрацыйную адзiнку, з чым звязвалася надзея на пэўную аўтаномiю. У жнiўнi 1930 г. кiраўнiкi групы зрабiлi спробу кансалiдаваць разрозненыя групоўкi беларускага дэмакратычнага лагера ў адзiную арганiзацыю пад назвай “Цэнтрасаюз”. Аднак няўдача на выбарах у сейм у лiстападзе 1930 г., разнагалоссi ў тактычных пытаннях прывялi да яго хуткага расколу.

Значна пашырыла свой уплыў сярод сялянства і інтэлігенцыі ў асноўным каталіцкага веравызнання *БХД*, галоўным чынам праз нізавыя гурткі падкантрольнай ёй арганізацыі – Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры. У 1934 г. 80 нізавых гурткоў БІГіК аб'ядноўвалі звыш 1 200 чалавек. Да іх нярэдка далучаліся члены ліквідаваных уладамі гурткоў ТБШ. Каб прыдаць свецкую накіраванасць дзейнасці БХД у студзені 1936 г. была прынята новая палітычная праграма і зменена назва на *Беларускае народнае аб'яднанне (БНА*). У яе новай праграме па-ранейшаму адстойвалася незалежнасць Беларусі, вылучаўся тэзіс барацьбы супраць "дыктатуры капіталізму, фашызму і камунізму". Праграма арыентавала насельніцтва на трэці шлях развіцця грамадства праз арганізацыю кааператываў, асветніцка-гаспадарчых гурткоў, бібліятэк-чытальняў і інш. Прадстаўнікі гэтай партыі выступалі з пратэстам супраць пераследу і здзекаў над дзеячамі культуры і навукі ў БССР, якія абвінавачваліся ў нацыянал-дэмакратызме і контррэвалюцыйнай дзейнасці.

У пачатку 1930-х гг., дзякуючы БХД, якая дамагалася кансалідацыі пад сваім кіраўніцтвам на нацыянальна-дэмакратычнай аснове ўсіх беларускіх нацыянальных партый і арганізацый, актывізаваў сваю дзейнасць рэарганізаваны *Беларускі нацыянальны камітэт.* Палітычная дзейнасць камітэта, як і БХД, была накіравана супраць КПЗБ. У лютым 1931 г. БНК выступаў з пратэстам супраць праследавання беларускіх вучоных, дзеячаў культуры ў БССР, якія абвінавачваліся ў нацыянал-дэмакратызме. У 1934 г. палітычныя арганізацыі дэлегавалі ў БНК па тры прадстаўнікі, культурна-асветныя, кааператыўныя і студэнцкія – па два. Старшынёй БНК, які ў гэты час складаўся з 26 чалавек, быў Я. Пазняк, намеснікамі – В. Багдановіч і М. Манцэвіч, сакратаром – У. Казлоўскі, скарбнікам – А. Клімовіч. У чэрвені 1935 г. прыняты новы статут арганізацыі, які падкрэсліваў каштоўнасці і прыярытэты "права беларускага народа, абвешчанага 25 сакавіка 1918 г." У адносінах да БССР кіраўніцтва БНК у 1930-я гады займала крытычныя пазіцыі. У 1935 г. у Жэневу была накіравана заява-пратэст БНК супраць прыняцця СССР у Лігу Нацый. У студзені 1938 г. дзейнасць БНК забаронена польскімі ўладамі.

Сярод часткі заходнебеларускай інтэлігенцыі пасля прыходу да ўлады Гітлера ў Германіі пашырыўся ўплыў ідэалогіі нацыянал-сацыялізму. Сведчаннем гэтага стала арганізаваная ў 1934 г. Ф. Акінчыцам і У. Казлоўскім "*Беларуская нацыянал-сацыялістычная партыя".* Аднак яна з'ўлялася нешматлікай арганізацыяй, нягледзячы на намаганні кіраўнікоў і друкаванага органа партыі "Новы шлях".

Ва ўмовах узмацнення палітычнай рэакцыі ў краіне ў сувязі з прыняццем ў 1935 г. новай канстытуцыі, якая заканадаўча абмяжоўвала

дэмакратычныя правы і свабоды, і курсам на збліжэнне з гітлераўскай Германіяй (у 1934 г. быў заключаны германа-польскі пакт аб ненападзе), кіраўніцтва КПЗБ адыходзіць ад ранейшых сектанцкіх пазіцый. Паварот у тактычнай лініі партыі ад канфрантацыі да супрацоўніцтва з арганізацыямі ППС, Стронніцтва людовага, Бунда, Паалей-Цыёна і беларускім дэмакратычным лагерам быў зроблены на II з’ездзе КПЗБ (8–18 мая 1935 г.). Гэтаму садзейнічала выпрацоўка Камінтэрнам новага курса на адзінства дзеянняў з сацыял-дэмакратыяй, што было замацавана ў дакументах яго VII кангрэса летам 1935 г. ЦК КПЗБ у якасці галоўнай вызначыў задачу стварэння шырокага дэмакратычнага, *антыфашысцкага народнага фронту* шляхам уцягнення ў яго нізавых арганізацый сацыял-дэмакратычных партый, БХД, іншых беларускіх партый і арганізацый на аснове агульнай барацьбы за дэмакратычныя свабоды, школу на роднай мове і жыццёва важныя сацыяльна-эканамічныя патрабаванні насельніцтва. На працягу жніўня – верасня 1935 г. упершыню адбыліся тры афіцыйныя сустрэчы прадстаўнікоў ЦК КПЗБ і ЦК БХД. Нягледзячы на супярэчнасці, была дасягнута дамоўленасць пра сумесны збор дэкларацый за адкрыццё беларускіх школ, выданне беларускай граматыкі. У лютым 1936 г. паміж падкантрольнымі названым партыям адпаведна ТБШ і БІГіКам было заключана пагадненне аб адзінстве дзеянняў у барацьбе за школу на роднай мове. Створаны на аснове пагаднення Цэнтральны школьны сакратарыят распаўсюдзіў у заходнебеларускай вёсцы звыш 127 тыс. дэкларацый, 1 259 заяў і 1 205 інструкцый на адкрыццё дзяржаўных пачатковых беларускіх школ. Беларускае пытанне выйшла на шырокую палітычную арэну, як і ў пачатку 20-х г. стала прадметам дыскусій у польскім сейме.

Адлюстраваннем працэса радыкалізацыі дэмакратычнай інтэлігенцыі і студэнцкай моладзі з’явілася дзейнасць у 1935–1936 гг. у Вільні легальнай антыфашысцкай арганізацыі – Саюза студэнцкай лявіцы “Фронт”, яна аб’ядноўвала студэнтаў і прадстаўнікоў інтэлігенцыі Вільні розных нацыянальнасцяў, галоўным чынам польскай. Арганізацыя выступіла за ажыццяўленне глыбокіх дэмакратычных і сацыяльных пераўтварэнняў, падтрымала права на самавызначэнне Заходняй Беларусі. Узначальвалі арганізацыю прадстаўнікі польскай прагрэсіўнай інтэлігенцыі Г. Дэмбінскі і С. Ендрыхоўскі. Газета “Папросту”, якая выдавалася арганізацыяй, карысталася папулярнасцю сярод насельніцтва края і стала своеасаблівай трыбунай народнага фронту.

Адначасова КПЗБ рабіла практычныя захады па ўстанаўленні адзінства дзеянняў з арганізацыямі ППС, Бунда і “Стронніцтва людовага”. У аснову былі пакладзены бліжэйшыя дэмакратычныя і сацыяльна-эканамічныя патрабаванні: скасаванне рэакцыйнай канстытуцыі 1935 г. і

антыдэмакратычнага выбарчага закону, устанаўленне дэмакратычных свабод, поўная амністыя палітзняволеным і ліквідацыя канцлагера ў Бярозе Картузскай, раўнапраўе ўсіх нацынальнасцей і моў, дзяржаўная школа на беларускай мове, падпісанне дагавора аб бяспецы з СССР, Францыяй, Чэхаславакіяй і разрыў пакта аб ненападзе з гітлераўскай Германіяй, скасаванне падатковай запазычанасці, 8-гадзінны рабочы дзень, бясплатнае надзяленне зямлёй малазямельных сялян пры парцэляцыі і інш. На працягу канца 1935 – пачатку 1936 г. адзінафрантавыя камітэты і камісіі былі створаны на шэрагу прадпрыемстваў Беластока, Вільні, Гродна, Баранавіч, Ваўкавыска. У выніку забастовачны рух сярэдзіны 1935–1937 гг. характарызаваўся большай арганізаванасцю і перавысіў узровень папярэдніх гадоў. У 1936 г. адбыліся 184 забастоўкі, у якіх удзельнічала каля 40 тыс. рабочых. У першай палове 1937 г. у краі ў забастоўках прынялі ўдзел больш за 25 тыс. рабочых. Пачасціліся палітычныя выступленні, мітынгі і дэманстрацыі, якія мелі, як правіла, адзінафрантавы і салідарны характар. Так у красавіку 1936 г. на шэрагу прадпрыемстваў Вільні, Гродна, Беластока і Брэста былі праведзены забастоўкі пратэсту супраць расстрэлу рабочых у Кракаве і Чэнстахове. Назіралася ажыўленне барацьбы сялян за адтэрміноўку падаткаў, супраць камасацыі і канчатковай ліквідацыі сервітутаў. Шырокі водгук атрымала забастоўка нарачанскіх сялян-рыбакоў, якая пачалася вясной 1935 г. У ёй удзельнічала каля 5 тыс. сялян з больш чым 40 навакольных вёсак.

Беларускія сяляне праяўлялі таксама салідарнасць з барацьбой сялян Польшчы і Заходняй Украіны. Так выступленні ўкраінскіх сялян Валыні восенню 1936 г. былі падтрыманы сялянамі Кобрынскага і Брэсцкага паветаў. А калі ў жніўні 1937 г. пачалася агульнапольская забастоўка сялян, у якой удзельнічала каля 10 млн чалавек, яе падтрымалі сяляне Бельскага, Гродзенскага і Слонімскага паветаў. Яны таксама перасталі дастаўляць прадукты ў гарады, выходзіць на шарваркі, праводзілі мітынгі.

У той жа час у карэннай Польшчы і Заходняй Украіны атрымала падтрымку акцыя ў абарону С. Прытыцкага, які ў 1936 г. выконваючы прысуд КПЗБ страляў у правакатара, агента дэфензівы Я. Стральчука ў зале Віленскага акруговага суда ў ходзе чарговага палітычнага працэсу. Хваля пратэсту супраць смяротнага прысуду і ў БССР, вымусіла польскія ўлады замяніць смяротнае пакаранне пажыццёвым зняволеннем.

На ўздым нацыянальна-вызваленчага руху польскія кіруючыя колы адказалі чарговай хваляй рэпрэсій. У пачатку 1936 г. быў арганізаваны судовы працэс над членамі арганізацыі “Фронт”, над шэрагам літаратараў беларускіх легальных выданняў. У снежні таго ж года была забаронена далейшая дзейнасць ТБШ і БІГіКа. Такі лёс спасціг у 1937 г. Саюз

Беларускіх настаўнікаў, у 1938 г. Беларускі нацыянальны камітэт, іншыя дэмакратычныя беларускія арганізацыі.

Аднак больш моцны удар па арганізаванаму рэвалюцыйна-вызваленчаму руху нанёс роспуск Выканкамам Камінтэрна ў жніўні 1938 г. Кампартыі Польшчы і яе складовых частак КПЗБ і КПЗУ. Ён быў праведзены на аснове абвінавачвання аб пранікненні ў кіруючы актыў партыі агентаў дэфензівы. Роспуску папярэднічалі рэпрэсіі ў 1936–1937 гг. яго кіруючага актыву. У лютым 1936 г. органамі НКУС БССР быў арыштаваны палітычны сакратар ЦК КПЗБ І. Лагіновіч, якому пазней двойчы ў 1938–1939 гг. выносіліся смяротныя прысуды. Рэпрэсіям падвергліся кіруючыя работнікі КПЗБ А. Славінскі, С. Мертэнс, А. Альшэўскі, Р. Вольф, М. Майскі, М. Маслоўскі, А. Розеншайн, М. Словік і іншыя дзеячы КПЗБ.

Такім чынам, у складаны час напярэдадні II сусветнай вайны заходнебеларускі нацыянальна-вызваленчы рух быў пазбаўлены важнага арганізацыйнага і каардынуючага цэнтра. Нягледзячы на гэта, яго прадстаўнікі працягвалі змагацца, што садзейнічала развіццю нацыянальнай і палітычнай самасвядомасці беларускага насельніцтва, стрымліваючы асіміляцыю і паланізацыю народа, ствараючы маральна-псіхалагічныя і палітычныя перадумовы аб’яднання беларускага народа ў адзінаю нацыянальную дзяржаву ў верасні – кастрычніку 1939 г. Уз’яднанне ў верасні 1939 г. беларускага народа паставіла кропку ў спрэчцы аб будучыні Заходняй Беларусі паміж рознымі палітычнымі групоўкамі. Вырашэнне з дапамогай вайсковай сілы польскага і заходнебеларускага пытання не адбілася становуча ні на лёсе беларускіх нацыянальна-дэмакратычных дзеячаў, ні прадстаўнікоў камуністычнага руху, да якіх з недаверам і нават варожа ставілася новая ўлада. Але іх праца не аказалася дарэмнай, у 1920–1930-я гады заходнебеларускае насельніцтва, дзякуючы камуністычнай прапагандзе, было ў асноўным падрыхтавана да прыходу ўлады Саветаў, да сацыялістычных пераўтварэнняў і першапачаткова ў вялікай большасці ставілася да іх са спагадай.

## СПІС ВЫДАННЯЎ ДА ЎСІХ ТЭМ

1. Беларусь: Народ. Государство. Время / Нац. Акад. наук Беларуси, Ин-т истории ; редкол.: А.А. Коваленя [и др.]. – Минск, 2009. – 879 с.

2. Вабішчэвіч, А. М. Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) : манаграфія / А. М. Вабішчэвіч. – Брэст : БрДУ, 2008. – 319 с.

3. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 2 / рэдкал. : А. А. Каваленя [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларус. навука, 2012. – 654 с.

4. Гісторыя Беларусі : вучэб. дапам. : у 2 ч. / пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля. – Мінск : Універсітэцкае, 1998. – Ч. 2 : Люты 1917 г. – 1997 г. – С. 196–214.

5. Гісторыя Беларусі : курс лекцый : у 2 ч. / П. І. Брыгадзін [і інш.]. – Мінск : РІВШ БДУ, 2002. – Ч. 2 : XIX–XX стст. – С. 390–434.

6. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2000–2006. – Т. 5 : Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]. – 2006. – С. 352–448.

7. Зелинский, П. И. Политическая работа Коммунистической партии Западной Белоруссии в массах, 1923–1938 / П. И. Зелинский. – Минск : Университетское, 1986. – 136 с.

8. История белорусской государственности / Национальная академия наук Беларуси, Институт истории. Т. 3 : Белорусская государственность: от идеи к национальному государству (1917–1939 гг.) / [А. А. Коваленя и др.]. – 2019. – 639 с.

9. Клейн, Б. С. За дело правое: Борьба КПЗБ с буржуазным террором / Б. С. Клейн. – Минск : Беларусь, 1986. – 175 с.

10. Ладысев, В. Ф. В борьбе за демократические права и свободы: Из исторического опыта Компартии Западной Белоруссии. 1926–1938 гг. / В. Ф. Ладысев. – Минск : Беларусь, 1988. – 189 с.

11. Ладысеў, У. Ф. Паміж Усходам і Захадам: станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917–1939) / У. Ф. Ладысеў, П. І. Брыгадзін. – Мінск : БДУ, 2003. – С. 163–204.

12. Латышонак, А. Гісторыя Беларусі ад сярэдзіны XVIII ст. да пачатку XXI ст. / А. Латышонак, Я. Мірановіч. – Вільня : Ін-т беларусістыкі ; Беласток : Беларус. гіст. т-ва, 2010. – 368 с.

13. Мацко, А. Н. Революционная борьба трудящихся Польши и Западной Белоруссии против гнета буржуазии и помещиков (1918–1939 гг.) / А. Н. Мацко. – Минск : Беларусь, 1972. – 335 с.

14. Мірановіч, Я. Беларусы ў Польшчы (1918–1949) / Я. Мірановіч. – Вільня : Ін-т беларусістыкі ; Беласток : Беларус. гіст. т-ва, 2010. – 191 с.

15. Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. / Ін-т гісторыі АНБ ; рэдкал.: М.П. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 1995. – Ч. 2. – С. 214–264.

16. Полуян, В. А. Революционно-демократическое движение в Западной Белоруссии (1927–1939 гг.) / В. А. Полуян. – Минск : Наука и техника, 1978. – 359 с.

17. Полуян, В. А. Революционное и национально-освободительное движение в Западной Белоруссии в 1920–1939 гг. / В. А. Полуян, И. В. Полуян. – Минск : Госиздат, 1962. – 222 с.

18. Революционный путь Компартии Западной Белоруссии (1921–1939 гг.). – Минск: Беларусь, 1966. – 403 с.

19. Рижский мир в судьбе белорусского народа. 1921–1953 гг. В 2 кн. Кн. 1 / НАН Беларуси, Ин-т истории; редкол.: А. А. Коваленя [и др.]. – Минск: Беларус. навука, 2014. – 593 с.

20. Савіч, А. А. Нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі (1921–1939 гады) : гістарыяграфія праблемы : манаграфія / А. А. Савіч; навук. рэд. А. А. Каваленя ; Брэсц. дзярж. ун-т імя А.С. Пушкіна. – Брэст : БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2012. – 288 с.

21. Савіч, А. А. Айчынная гістарыяграфія гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гадоў : манаграфія / А. А. Савіч ; навук. рэд. А. А. Каваленя ; М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Брэсц. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна. – Брэст : БрДУ імя А. С. Пушкіна, 2019. – 300 с.

22. Сорокин, А. А. Революционное и освободительное крестьянское движение в Западной Белоруссии (1920–1939 гг.) / А. А. Сорокин. – Минск : БГУ, 1970. – 171 с.

23. Шыбека, З. Нарыс гісторыі Беларусі (1795–2002) / З. Шыбека. – Мінск : Энцыклапедыкс, 2003. – 490 с.

## СПІС ВЫДАННЯЎ ДАКУМЕНТАЎ І МАТЭРЫЯЛАЎ

1. Антон Луцкевич : материалы следственного дела НКВД БССР / подготовка к печати, введение и комментарии В. Н. Михнюка, Н. М. Климовича и А. Н. Гесь. – Минск : БелНИИДАД, 1997. – 204 с.

2. Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Фонд № 582 Дзяржаўнага архіву Літвы (“Рада Міністраў Беларускай Народнай Рэспублікі”). – Т. 1. Кн. 1. – Вільня – Нью-Ёрк – Менск – Прага: Printed in Lithuania, 1998. – 866 с.; Кн. 2. – Вільня – Нью-Ёрк – Менск – Прага: Printed in Lithuania, 1998. – 1721 с.

3. Аўтабіяграфія І. Дварчаніна // Скарыніч: Літ.-навук. гадавік. Вып. 5 / уклад. А. Каўка. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2002. – С. 157–160.

4. Бежанства 1915 года: Успаміны беларусаў, жыхароў Беласточчыны, якія ў 1915 г. пакінулі месца жыхарства і выехалі ў глыб Расіі. – Беласток : праграмная рада тыднёвіка “Ніва”, 2000. – 316 с.

5. Борьба трудящихся Западной Белоруссии за свое социальное и национальное освобождение и воссоединение с БССР: Документы и материалы: Сб.: В 2 томах; Т. 1. 1921–1929. – Минск: Госиздат БССР, 1962. – 620 с.; Т. 2. 1929–1939 гг. – Минск: Беларусь, 1972. – 560 с.

6. Брест в 1919–1939 гг. : документы и материалы / сост.: А. Г. Карапузова [и др.] ; гл. ред. Е. С. Розенблат. – Брест : Альтернатива, 2009. – 308 с.

7. В борьбе за счастье народное // Люди нарочанского края. – Минск : Беларусь, 1975. – С. 43–114;

8. Вильнюсское подполье: Воспоминания участников революционного движения в Вильнюсском крае (1920–1939 гг.): Сб. воспоминаний. – Вильнюс: Vaga, 1966. – 397 с.;

9. Годы испытаний и мужества : сб. воспоминаний / сост.: Н. С. Орехво, Н. С. Сташкевич ; под ред. Н. Ф. Капич [и др.]. – Минск : Беларусь, 1973. – 415 с.

10. Знешняя палітыка Беларусі : зб. дакум. і матэрыялаў : у 8 т. / Пастаян. каміс. Савета Рэсп. Нац. сходу Рэсп. Беларусь па міжнар. справах нац. бяспецы, М-ва замеж. спраў Рэсп. Беларусь, БДУ, БелНДІДАС ; склад.: У. М. Міхнюк [і інш.]. – Мінск : БелНДІДАС, 1997–2008. – Т. 1 : 1917–1922 гг. – 1997. – 398 с.; Т. 2 : 1923–1927 гг. –1999. – 461 с.; Т. 3 : 1928 – чэрвень 1941 г. – 2001. – 321 с.

11. История Беларуси в документах и материалах / авт.-сост. И. Н. Кузнецов, В. Г. Мазец. – Минск : Амалфея, 2000. – 672 с.

12. Інтэрпэляцыі беларускіх паслоў у польскі сейм. (1922–1926 гг.) / Камісія па вывучэньні Заходняе Беларусі. – Менск : Белдзяржвыдавецтва, 1927. – 496 с.

13. Кароткі нарыс беларускага пытання / рэд.: А. Пашкевіч, А. Вашкевіч, А. Чарнякевіч ; пер.: А. Вашкевіч, А. Пашкевіч. – Мінск : І.П. Логвінаў, 2009. – 395 с.

14. Коминтерн против фашизма : докум. – М. : Наука, 1999. – 505 с.

15. Они не стали на колени : сб. воспоминаний и документов о концлагере Береза-Картузская / Архивное управление при Совете Министров БССР. – Минск : Беларусь, 1966. – 347 с.

16. Политбюро ЦК РКП(б) – ВКП(б) и Коминтерн, 1919–1943 : документы / Федер. арх. служба России, Рос. гос. арх. соц.-полит. истории. – М. : Росспэн, 2004. – 958 с.

17. Польша – Беларусь (1921–1953) : сб. документов и материалов / сост. : А. Н. Вабищевич [и др.]. – Минск : Беларус. навука, 2012. – 423 с.

18. Революционное движение в Вильнюсском крае : докум. и материалы / Ин-т истории партии при ЦК КП Литвы, Ин-т истории партии при ЦК КП Белоруссии ; сост.: В. Канцявичюс [и др.] ; ред. коллегия: Р. Малюкявичюс [и др.]. – Вильнюс : Минтис, 1978. – 448 с.

19. Революционный авангард трудящейся молодёжи Западной Белоруссии (1921–1939 гг.) : докум. и материалы : сб. / сост.: М. А. Бобер [и др.] ; под ред. В. Н. Жигалова [и др.]. – Минск : БГУ, 1978. – 328 с.

20. Рижский мир в судьбе белорусского народа. 1921–1953 гг. В 2 кн. Кн. 1 / НАН Беларуси, Ин-т истории; редкол.: А. А. Коваленя [и др.]. – Минск: Беларус. навука, 2014. – 593 с.

21. Слуцкі збройны чын 1920 г. у дакумэнтах і ўспамінах / уклад., падрыхт. тэкстаў, іл., аўт. заўв., камэнт., паказ. А. Гесь, У. Ляхоўскага, У. Міхнюка ; прадм. У. Ляхоўскага. – Мінск : Медысонт, 2006. – 400 с.

22. Споведзь у надзеі застацца жывым : аўтабіяграфія Браніслава Тарашкевіча / А. І. Валахановіч, У. М. Міхнюк ; рэд. А.С. Ліс. – Мінск : БелНДІДАД, 1999. – 200 с.

23. Стагановіч, А. Л. Успаміны пасла / А. Стагановіч ; прадмова А. В. Пашкевіча ; каментарыі А. В. Пашкевіча, А. Э. Гардзіенкі. – Мінск : Лімарыус, 2011. – 268 с.

24. Станкевіч, А. З Богам да Беларусі : збор твораў / А. Станкевіч ; укл., навук. рэдактура, камэнт., прадм.: А. Пашкевіч, А. Вашкевіч. – Вільня : Ін-т беларусістыкі, 2008. – 1098 с.

25. Тамаш Грыб. На два франты! Галоўныя засады вызвольнай праграмы беларускага народу / публікацыя і заўвагі У. Ляхоўскага // Спадчына. – 1995. – № 4. – С. 88–120.

26. Тарашкевіч, Б. Выбранае: крытыка, публіцыстыка, пераклады / Б. Тарашкевіч ; уклад., уступ і камент. А. Ліса. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1991. – 319 с.

27. “Ты з Заходняй, я з Усходняй нашай Беларусі...”. Верасень 1939 г. – 1956 г. : дакументы і матэрыялы. У 2 кн. / Склад.: У. І. Адамушка [і інш.]. Кн. 1. Верасень 1939 г. – 1941 г. – Мінск : Беларус. навука, 2009. – 340 с.

# ПЛАНЫ СЕМІНАРСКІХ ЗАНЯТКАЎ

## Дзённае навучанне

### Тэма 1. Партызанскі рух у Заходняй Беларусі ў 1921–1925 гг.

1. Прычыны і характар партызанскай барацьбы.
2. Палітычныя партыі Заходняй Беларусі і партызанскі рух.
3. Баявыя дзеянні партызан.
4. Барацьба польскіх улад з партызанскім рухам і яго згортванне.

**Літаратура**

1. Ваупшасов, С.А. На разгневанной земле / С. А. Ваупшасов. – Минск: Беларусь, 1965. – 344 с.

2. Касцюк, М. П. Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі / М. П. Касцюк. – Мінск: Экаперспектыва, 2000. – 308 с.

3. Коўкель, І. І. Польска-літоўскі канфлікт і роля ў ім беларускіх палітычных партыяў і арганізацыяў / І. І. Коўкель // Беларусіка=Albaruthenica: Кн. 3. – Мінск : Навука і тэхніка, 1994. – С. 259–269.

4. Линдер, И. Красная паутина: тайны разведки Коминтерна. 1919–1943 / И. Линдер, С. Чуркин. – М. : РИПОЛ классик, 2005. – 686 с.

5. Савіч, А. А. Партызанскі рух у Заходняй Беларусі ў пачатку 1920-х гадоў: стан і перспектывы даследавання / А. А. Савіч // Весці НАН Беларусі. Сер.гуманітар. навук. – 2016. – № 4. – С. 45–54.

6. Стасевіч, Ю. Партызанка Заходняй Беларусі / Ю. Стасевіч // Пагоня. – 1995. – 17–23 сак.; 24–30 сак.

7. “Степень достоверности – достоверно...”: армія Булак-Балаховіча і антысавецкі “супраціў” 1921–1927 гадоў у дакументах ВЧК (АДПУ) / падрыхтаваў Алег Ліцкевіч // Беларус. думка. – 2008. – № 6. – С. 54–59; № 7. – С. 86–91.

8. Татаренко, А. Недозволенная память. Западная Беларусь в документах и фактах: 1921–1954-е годы / А. Татаренко. – СПб. : Архив АТ, 2006. – 808 с.

9. Фадзееў, Л. Кірыла Арлоўскі: герой ці бандыт? / Л. Фадзееў // Свабода. – 1994. – 13–19 снеж.

10. Хвірысюк, В. М. Арганізацыя партызанскай барацьбы ў Заходняй Беларусі супраць польскіх уладаў у 1921–1922 гг. / В. М. Хвірысюк // Берасцейскі хранограф. – 1999. – Вып. 2. – С. 92–100.

### Тэма 2. Камуністычная партыя Заходняй Беларусі

1. Прычыны стварэння КПЗБ. КСМЗБ.

2. Дыскусіі ў КПЗБ па пытаннях разгортвання рэвалюцыйнай барацьбы. “Сэцэсія”.

3. КПЗБ і БСРГ. Адносіны КПЗБ з нацыянальна-дэмакратычнымі партыямі. КПЗБ і ТБШ. Клуб “Змаганне”.

4. Праблема ўзаемаадносін КПЗБ з КП(б)Б, УКП(б), Камінтэрнам. Роспуск КПЗБ.

**Літаратура**


1. Вабищевич, А. Н. “Доллары пришлём через Соню…” / А. Н. Вабищевич // Родина. – 2009. – № 8. – С. 30–33.

2. Вашкевіч, А. Супрацоўніцтва паміж КПЗБ і БХД (верасень 1935 – восень 1936 гг.) / А. Вашкевіч // Беларус. гіст. часоп. – 2006. – № 10. – С. 19–24.

3. Даніловіч, В. В. Дзейнасць арганізацыі “Змаганне” ў Заходняй Беларусі (1927–1930 гг.) / В. В. Даніловіч. – Мінск : Беларус. навука, 2007. – 159 с.

4. Ладысеў, У. Іосіф Каэтанавіч Лагіновіч: нарыс жыцця і палітычнай дзейнасці / У. Ладысеў // Беларус. гіст. часоп. – 1996. – № 3. – С. 113–118 ; № 4. – С. 164–175.

5. Ладысеў, У. Цяжкі шлях выпрабаванняў / У. Ладысеў // Беларус. гіст. часоп. – 1994. – № 1. – С. 81–88.

6. Ласкович, В. П. Из племени непокоренных / В. П. Ласкович. – Брест : Упр. по делам печати Брест. облисполкома, 1999. – 382 с.

7. Ляхоўскі, У. Ад гоманаўцаў да гайсакоў. Чыннасць беларускіх маладзёвых арганізацый у 2-й палове 19 – першай трэці 20 ст. / У. Ляхоўскі. – Беласток : Беларус. гіст. т-ва ; Вільня : Ін-т беларусістыкі, 2012. – 484 с.

8. Мицкович, Н. С. Между истиной и выдумкой. Коммунистическое подполье Жабинковщины в 20–30-е годы XX ст. / Н. С. Мицкович. – Брест : Альтернатива, 2007. – 100 с.

9. Савіч, А. А. “Сэцэсія” ў КПЗБ у айчыннай гістарыяграфіі / А. А. Савіч // Весн. Брэсц. ун-та. Сер. гуманітар. і грамад. навук. Філасофія і логіка. Гісторыя. Псіхалогія. Права. Педагогіка. – 2007. – № 3 (30). – С. 23–31.


Тэма 3. **Беларуская сялянска-работніцкая Грамада. Арганізацыя “Змаганне”**

1. Беларускі пасольскі клуб і яго раскол.

2. Стварэнне БСРГ. Мэты і праграма партыі.

3. Уздым нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі ў сярэдзіне 1920-х гг. Ліквідацыя Грамады.

4. Дзейнасць арганізацыі “Змаганне”.

## Літаратура

1. Адамушка, У. ...І пачаць будаўніцтва дзяржавы нашай [Пра С. А. Рак-Міхайлоўскага] / У. Адамушка // Беларус. мінуўшчына. – 1996. – № 3. – С. 26–29.

2. Адамушка, У. Язэп Амяльянавіч Гаўрылік / У. Адамушка // Беларус. гіст. часоп. – 1995. – № 2. – С. 174–182.

3. Бергман, А. Слова пра Браніслава Тарашкевіча. Гістарычны жыццяпіс / А. Бергман. – Мінск : Маст. літ., 1996. – 192 с.

4. Вашкевіч, А. Да пытання аб ўзаемаадносінах Беларускай хрысціянскай дэмакратыі і Беларускай сялянска-работніцкай Грамады. 1925–1927 гг. / А. Вашкевіч // Гіст. альманах. Т. 12. – Гародня ; Беласток, 2006. – С. 37–50.

5. Герасімаў, Л. Хто знішчыў сялянскую “Грамаду”? / Л. Герасімаў // Беларус. мінуўшчына. – 1993. – № 2. – С. 42–44.

6. Даніловіч, В. В. Дзейнасць арганізацыі “Змаганне” ў Заходняй Беларусі (1927–1930 гг.) / В. В. Даніловіч. – Мінск : Беларус. навука, 2007. – 159 с.

7. Палуян, У. А. Беларуская сялянска-рабочая Грамада / У. А. Палуян. – Мінск : Навука і тэхніка, 1967. – 224 с.

8. Пашкевіч, А. Беларуская сялянска-работніцкая Грамада ў першае паўгоддзе існавання (чэрвень – снежань 1925 г.) / А. Пашкевіч // Гіст. альманах. Т. 12. – Гародня ; Беласток, 2006. – С. 23–36.

9. Пашкевіч, А. Тэрытарыяльная ці нацыянальная? Дыскусія аб Грамадзе на ІІІ канферэнцыі Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі / А. Пашкевіч // Гіст. альманах. Т. 12. – Гародня ; Беласток, 2006. – С. 163–170.

10. Сідарэвіч, А. Антон Луцкевіч і Беларуская Сялянска-Работніцкая Грамада / А. Сідарэвіч // ARCHE. Пачатак. – 2007. – № 9.

11. Хмара, С. Успаміны пра Грамаду / С. Хмара // Пагоня. – 1995. – 13–19 студз. – С. 5; 20–26 студз. – С. 5; 27 студз. – 2 лют. – С. 5.

12. Чарнякевіч, А. Беларускія паланафілы і Грамада. 1925 – пачатак 1927 г. / А. Чарнякевіч // Гіст. альманах. Т. 12. – Гародня ; Беласток, 2006. – С. 64–78.

## Тэма 4. Нацыянальна-дэмакратычныя партыі і арганізацыі

1. Беларуская партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў.

2. Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя. Беларуская партыя незалежных сацыялістаў.

3. Беларуская Хрысціянская дэмакратыя (БХД). Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры (БІГіК).

4. Беларускі сялянскі саюз.

5. “Беларуская санацыя”, Цэнтрасаюз.
6. Беларускія паланафілы.
7. Беларуская нацыянал-сацыялістычная партыя.

**Літаратура**


1. Адамушка, У. ...І пачаць будаўніцтва дзяржавы нашай [Пра С.А. Рак-Міхайлоўскага] / У. Адамушка // Бел. мінуўшчына. – 1996. – № 3. – С. 26–29.
2. Адамушка У. Ігнат Дварчанін – рэвалюцыянер, гісторык, паэт / У. Адамушка // Беларус. гіст. часоп. – 1993. – № 3. – С. 113–118.
3. Вашкевіч, А. Ф. БХД і КПЗБ: ад супрацьстаяння да супрацоўніцтва. 1935–1938 гг. / А. Ф. Вашкевіч // Берасцейскі хранограф. – 2004. – Вып. 4. – С. 110–117.
4. Вашкевіч, А. Грошы для партыі. Фінансаванне партыйнай дзейнасці Беларускай хрысціянскай дэмакратыі (1921–1939 гг.) / А. Вашкевіч // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – 2007. – № 28. – С. 69–81.
5. Вашкевіч, А. Прадбачаньні “Беларускага фронту” / А. Вашкевіч // ARCHE. Пачатак. – 2006. – № 10. – С. 88–98.
6. Горны, А. С. Беларускія паланафільскія арганізацыі на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд / А. С. Горны // Беларус. гіст. часоп. – 2015. – № 4. – С. 19–26.
7. Горны, А. С. Беларускія паланафільскія арганізацыі ў Заходняй Беларусі (1921–1937 гг.): арганізацыйная структура і праграмныя мэты / А. С. Горны // Весн. Брэсц. ўн. Сер. 2. Гісторыя. Эканоміка. Права. – 2015. – № 1. – С. 101–110.
8. Мазько, Э. Дзейнасць Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі ў 1926–1935 гг. / Э. Мазько // Культура Гродзенскага рэгіёну: праблемы развіцця ва ўмовах поліэтнічнага сумежжа : зб. навук. прац / адк. рэд. А.М. Пяткевіч. – Гродна : ГрДУ, 2003. – С. 144–150.
9. Мурашка, А. І. Роля БПС-Р у арганізацыі антыпольскага руху супраціўлення пасля падпісання Рыжскага дагавора 1921 г. / А. І. Мурашка // Праблемы ўз’яднання Заходняй Беларусі з БССР: Гісторыя і сучаснасць : матэрыялы Міжнар. навук.-тэарэт. канф., 17 верас. 1999 г. – Мінск, 2000. – С. 11–16.
10. Палуян, У. А. Беларуская сялянска-рабочая Грамада / У. А. Палуян. – Мінск : Навука і тэхніка, 1967. – 224 с.
11. Пашкевіч, А. Беларуская сялянска-работніцкая Грамада ў першае паўгоддзе існавання (чэрвень – снежань 1925 г.) / А. Пашкевіч // Гіст. альманах. – Т. 12. – Гародня – Беласток, 2006. – С. 23–36.
12. Пашкевіч, А. В. Атаман Дзяргач: невядомыя старонкі біяграфіі, ці да гісторыі палітычнага авантурызму ў беларускім

нацыянальным руху / А. В. Пашкевіч, А. М. Чарнякевіч // Берасцейскі хранограф. – 2004. – Вып. 4. – С. 314–334.

13. Разуванава, К. С. Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры ў Заходняй Беларусі (1926—1936 гг.) / К. С. Разуванава; навук. рэд. В. В. Даніловіч ; Нацы. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларус. навука, 2013. – 245 с.

14. Савіч, А. А. Нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі (1921–1939 гады): гістарыяграфія праблемы : манаграфія / А. А. Савіч ; навук. рэд. А. А. Каваленя ; Брэсц. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна. – Брэст : БрДУ, 2012. – 288 с.

15. Сідарэвіч, А. Самавызначэнне беларускай сацыял-дэмакратыі / А. Сідарэвіч // Беларус. гіст. часоп. – 1998. – № 2. – С. 24–33.

16. Чарнякевіч, А. Кароткі нарыс гісторыі ўзаемаадносін беларускага нацыянальнага руху і II аддзелу Галоўнага камандавання (Генеральнага штабу) Войска Польскага ў 1918–1923 гг. / А. Чарнякевіч, А. Пашкевіч // ARCHE. Пачатак. – 2009. – № 8. – С. 22–73.

## Тэма 5. Заходняя Беларусь у гады сусветнага эканамічнага крызісу

1. Эканоміка Заходняй Беларусі ў 1929–19393 гг. Крызісныя з’явы ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы.

2. Пашырэнне забастовачнай барацьбы. Антыўрадавыя сялянскія выступленні.

3. КПЗБ як праваднік лініі Камінтэрна ў нацыянальна-вызваленчым руху. Тэорыя “сацыял-фашызму”.

4. Рэпрэсіі ў Польшчы і СССР у адносінах да ўдзельнікаў нацыянальна-вызваленчага руху з Заходняй Беларусі.

### Літаратура

1. Кухарев, Б. Е. Сельское хозяйство Западной Белоруссии (1919–1939 гг.) / Б. Е. Кухарев. – Минск : Выш. шк, 1975. – 112 с.

2. Ладысеў, У. Іосіф Каэтанавіч Лагіновіч: нарыс жыцця і палітычнай дзейнасці / У. Ладысеў // Беларус. гіст. часоп. – 1996. – № 3. – С. 113–118 ; № 4. – С. 164–175.

3. Палуян, І. В. Рабочы рух у Заходняй Беларусі ў 1929–1931 гг. / І. В. Палуян // Вес. АН БССР. Сер. грамад. навук. – 1960. – № 1. – С. 44–55.

4. Палуян, І. В. Рэвалюцыйны рух рабочых лясных промыслаў Заходняй Беларусі ў 1932–1934 гг. / І. В. Палуян // Вес. АН БССР. Сер. грамад. навук. – 1959. – № 2. – С. 69–79.

5. Палуян, І. В. Сялянскі рух у Заходняй Беларусі ў 1932–1933 гадах / І. В. Палуян // Вес. АН БССР. Сер. грамад. навук. – 1960. – № 1. – С. 42–54.

6. Пашкевіч, А. Справа "Беларускага нацыянальнага цэнтру" паводле сведчанняў былых актывістаў Кампартыі Заходняй Беларусі / А. Пашкевіч // Спадчына. – 2006. – № 1. – С. 102–116.

7. Полуян, И. В. Западная Белоруссия в период экономического кризиса 1929–1933 гг. / И. В. Полуян. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – 205 с.

8. Сорокин, А.А. Аграрный вопрос в Западной Белоруссии (1920–1939 гг.) / А. А. Сорокин. – Минск : Наука и техника, 1968. – 201 с.

**Тэма 6. Заходняя Беларусь у 1934–1939 гг.**

1. Сацыяльна-эканамічнае становішча.
2. Узмацненне санацыйнага рэжыму. Бяроза-Картузскі канцэнтрацыйны лагер.
3. Праблема стварэння антыфашысцкага народнага фронту.
4. Рэпрэсіі ў БССР і заходнебеларускі нацыянальна-вызваленчы рух. Уплыў Камінтэрна на развіццё вызваленчага руху.

**Літаратура**

1. Адамушка, У. Справа № 233771: Беларускі нацыянальны цэнтр / У. Адамушка // Беларуская мінуўшчына. – 1993. – № 3–4. – С. 45–52 ; № 5–6. – С. 56–63.

2. Вашкевіч, А. Супрацоўніцтва паміж КПЗБ і БХД (верасень 1935 – восень 1936 гг.) / А. Вашкевіч // Беларус. гіст. часоп. – 2006. – № 10. – С. 19–24.

3. Кухарев, Б. Е. Сельское хозяйство Западной Белоруссии (1919–1939 гг.) / Б. Е. Кухарев. – Минск : Выш. шк., 1975. – 112 с.

4. Ладысеў, У. Іосіф Каэтанавіч Лагіновіч: нарыс жыцця і палітычнай дзейнасці / У. Ладысеў // Беларус. гіст. часоп. – 1996. – № 3. – С. 113–118 ; № 4. – С. 164–175.

5. Лицкевич, О. Концлагерь по-польски / О. Лицкевич // Беларуская думка. – 2010. – № 3. – С. 78–85.

6. Прысуд адменены : Зборнік / рэд. У. П. Самовіч. – Брэст : Брэсц. абл. аддз-не Беларус. фонду культуры, 1993. – 241 с.

7. Сорокин, А. А. Аграрный вопрос в Западной Белоруссии (1920–1939 гг.) / А.А. Сорокин. – Минск: Наука и техника, 1968. – 201 с.

8. Фирсов, Ф. И. Коминтерн и Коммунистическая партия Польши / Ф. И. Фирсов, И. С. Яжборовская // Вопр. истории КПСС. – 1988. – № 11. – С. 20–35 ; № 12. – С. 40–55.

**Тэма 7. Уз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР**

1. Польшча ў планах СССР і Германіі.
2. Уступленне Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь.
3. Стварэнне органаў савецкай улады. Народны сход Заходняй Беларусі.
4. Мерапрыемствы савецкай улады ў Заходняй Беларусі. 1939 г. у гісторыі Беларусі.

**Літаратура:**

1. Даніловіч, В. В, Уз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР і яго значэнне для беларускай дзяржаўнасці / В. В. Даніловіч // Полымя. – 2009. – № 9. – С. 159–166.
2. Доўнар, Т. І. Уз’яднанне Заходняй Беларусі з Беларускай ССР / Т. І. Доўнар // Юстыцыя Беларусі. – 2009. – № 4. – С. 74–77.
3. Западная Белоруссия и Западная Украина в 1939–1941 гг.: Люди, события, документы. – СПб. : Алетейя, 2011. – 424 с.
4. Іваноў, М. Праблема прыналежнасці Вільні і беларускае нацыянальнае пытанне ў 1939 г. // Беларус. гіст. часоп. 1994. – № 1. – С. 32–38.
5. Каваленя, А.А. Цярністы шлях уз’яднання / А.А. Каваленя [і інш.] // Беларус. думка. – 2009. – № 9. – С. 18–27.
6. Ладысеў, У. Ваенныя падзеі верасня 1939 года ў лёсе беларускага народа // Беларус. гіст. часоп. – 1999. – № 3. – С. 3–11.
7. Ладысеў, У. Ф. Аб’яднанне беларускай нацыі (да 65-годдзя ўз’яднання Заходняй Беларусі з БССР) // Беларус. гіст. часоп. – 2004. – № 9. – С. 3–13.
8. Паўлаў, Я. С. Драматычны лёс польскіх асаднікаў / Я. С. Паўлаў. // Беларус. мінуўшчына. – 1994. – № 4. – С. 47–54.
9. Фирсов, Ф. И. Коминтерн и Коммунистическая партия Польши / Ф. И. Фирсов, И. С. Яжборовская // Вопросы истории КПСС. – 1988. – № 11. – С. 20–35 ; № 12. – С. 40–55.
10. Хацкевіч, А. Арышты і дэпартацыі ў заходніх абласцях Беларусі (1939–1941 гг.) / А. Хацкевіч // Беларус. гіст. часоп. – 1994. – № 1. – С. 89–94 ; № 2. – С. 70–76.

# ПЛАНЫ СЕМІНАРСКІХ ЗАНЯТКАЎ

## Завочнае навучанне

### Тэма 1. Партызанскі рух у Заходняй Беларусі ў 1921–1925 гг.

1. Прычыны і характар партызанскай барацьбы.
2. Палітычныя партыі Заходняй Беларусі і партызанскі рух.
3. Баявыя дзеянні партызан.
4. Барацьба польскіх улад з партызанскім рухам і яго згортванне.

### Літаратура

11. Ваупшасов, С.А. На разгневанной земле / С. А. Ваупшасов. – Минск: Беларусь, 1965. – 344 с.

12. Касцюк, М. П. Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі / М. П. Касцюк. – Мінск: Экаперспектыва, 2000. – 308 с.

13. Коўкель, І. І. Польска-літоўскі канфлікт і роля ў ім беларускіх палітычных партыяў і арганізацыяў / І. І. Коўкель // Беларусіка=Albaruthenica: Кн. 3. – Мінск : Навука і тэхніка, 1994. – С. 259–269.

14. Линдер, И. Красная паутина: тайны разведки Коминтерна. 1919–1943 / И. Линдер, С. Чуркин. – М. : РИПОЛ классик, 2005. – 686 с.

15. Савіч, А. А. Партызанскі рух у Заходняй Беларусі ў пачатку 1920-х гадоў: стан і перспектывы даследавання / А. А. Савіч // Весці НАН Беларусі. Сер.гуманітар. навук. – 2016. – № 4. – С. 45–54.

16. Стасевіч, Ю. Партызанка Заходняй Беларусі / Ю. Стасевіч // Пагоня. – 1995. – 17–23 сак.; 24–30 сак.

17. “Степень достоверности – достоверно...”: армія Булак-Балаховіча і антысавецкі “супраціў” 1921–1927 гадоў у дакументах ВЧК (АДПУ) / падрыхтаваў Алег Ліцкевіч // Беларус. думка. – 2008. – № 6. – С. 54–59; № 7. – С. 86–91.

18. Татаренко, А. Недозволенная память. Западная Беларусь в документах и фактах: 1921–1954-е годы / А. Татаренко. – СПб. : Архив АТ, 2006. – 808 с.

19. Фадзееў, Л. Кірыла Арлоўскі: герой ці бандыт? / Л. Фадзееў // Свабода. – 1994. – 13–19 снеж.

20. Хвірысюк, В. М. Арганізацыя партызанскай барацьбы ў Заходняй Беларусі супраць польскіх уладаў у 1921–1922 гг. / В. М. Хвірысюк // Берасцейскі хранограф. – 1999. – Вып. 2. – С. 92–100.

### Тэма 7. Нацыянальна-вызваленчая барацьба ў Заходняй Беларусі. Уз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР

1. Беларускі пасольскі клуб.

2. Камуністычная партыя Заходняй Беларусі.

3. Беларуская сялянска-работніцкая Грамада. Арганізацыя “Змаганне”.

4. Нацыянальна-дэмакратычныя партыі і арганізацыі.

5. Уступленне Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь. Мерапрыемствы савецкай улады ў Заходняй Беларусі.

**Літаратура:**


1. Адамушка, У. Справа № 233771: Беларускі нацыянальны цэнтр / У. Адамушка // Беларуская мінуўшчына. – 1993. – № 3–4. – С. 45–52 ; № 5–6. – С. 56–63.

2. Бергман, А. Слова пра Браніслава Тарашкевіча. Гістарычны жыццяпіс / А. Бергман. – Мінск : Маст. літ., 1996. – 192 с.

3. Вабищевич, А. Н. “Доллары пришлём через Соню…” / А. Н. Вабищевич // Родина. – 2009. – № 8. – С. 30–33.

4. Вашкевіч, А. Грошы для партыі. Фінансаванне партыйнай дзейнасці Беларускай хрысціянскай дэмакратыі (1921–1939 гг.) / А. Вашкевіч // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – 2007. – № 28. – С. 69–81.

5. Вашкевіч, А. Супрацоўніцтва паміж КПЗБ і БХД (верасень 1935 – восень 1936 гг.) / А. Вашкевіч // Беларус. гіст. часоп. – 2006. – № 10. – С. 19–24.

6. Герасімаў, Л. Хто знішчыў сялянскую “Грамаду”? / Л. Герасімаў // Беларус. мінуўшчына. – 1993. – № 2. – С. 42–44.

7. Горны, А. С. Беларускія паланафільскія арганізацыі ў Заходняй Беларусі (1921–1937 гг.): арганізацыйная структура і праграмныя мэты / А. С. Горны // Весн. Брэсц. ўн. Сер. 2. Гісторыя. Эканоміка. Права. – 2015. – № 1. – С. 101–110.

8. Даніловіч, В. В. Дзейнасць арганізацыі “Змаганне” ў Заходняй Беларусі (1927–1930 гг.) / В. В. Даніловіч. – Мінск : Беларус. навука, 2007. – 159 с.

9. Доўнар, Т. І. Уз’яднанне Заходняй Беларусі з Беларускай ССР / Т. І. Доўнар // Юстыцыя Беларусі. – 2009. – № 4. – С. 74–77.

10. Іваноў, М. Праблема прыналежнасці Вільні і беларускае нацыянальнае пытанне ў 1939 г. // Беларус. гіст. часоп. 1994. – № 1. – С. 32–38.

11. Каваленя, А.А. Цярновы шлях уз’яднання Беларусі / А. А. Каваленя // Восень 1939 г. ў гістарычным лёсе Беларусі : матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 24 верас. 2009 г. / рэдкал.: А. А. Каваленя (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2010. – С. 5–36.

12. Ладысеў, У. Ваенныя падзеі верасня 1939 года ў лёсе беларускага народа // Беларус. гіст. часоп. – 1999. – № 3. – С. 3–11.

13. Ладысеў, У. Іосіф Каэтанавіч Лагіновіч: нарыс жыцця і палітычнай дзейнасці / У. Ладысеў // Беларус. гіст. часоп. – 1996. – № 3. – С. 113–118 ; № 4. – С. 164–175.

14. Ладысеў, У. Ф. Аб'яднанне беларускай нацыі (да 65-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР) // Беларус. гіст. часоп. – 2004. – № 9. – С. 3–13.

15. Ладысеў, У. Цяжкі шлях выпрабаванняў / У. Ладысеў // Беларус. гіст. часоп. – 1994. – № 1. – С. 81–88.

16. Мицкович, Н. С. Между истиной и выдумкой. Коммунистическое подполье Жабинковщины в 20–30-е годы ХХ ст. / Н. С. Мицкович. – Брест : Альтернатива, 2007. – 100 с.

17. Мурашка, А. І. Роля БПС-Р у арганізацыі антыпольскага руху супраціўлення пасля падпісання Рыжскага дагавора 1921 г. / А. І. Мурашка // Праблемы ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР: Гісторыя і сучаснасць : матэрыялы Міжнар. навук.-тэарэт. канф., 17 верас. 1999 г. – Мінск, 2000. – С. 11–16.

18. Палуян, У. А. Беларуская сялянска-рабочая Грамада / У. А. Палуян. – Мінск : Навука і тэхніка, 1967. – 224 с.

19. Пашкевіч, А. Беларуская сялянска-работніцкая Грамада ў першае паўгоддзе існавання (чэрвень – снежань 1925 г.) / А. Пашкевіч // Гіст. альманах. – Т. 12. – Гародня – Беласток, 2006. – С. 23–36.

20. Пашкевіч, А. В. Атаман Дзяргач: невядомыя старонкі біяграфіі, ці да гісторыі палітычнага авантурызму ў беларускім нацыянальным руху / А. В. Пашкевіч, А. М. Чарнякевіч // Берасцейскі хранограф. – 2004. – Вып. 4. – С. 314–334.

21. Прысуд адменены : Зборнік / рэд. У. П. Самовіч. – Брэст : Брэсц. абл. аддз-не Беларус. фонду культуры, 1993. – 241 с.

22. Разуванава, К. С. Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры ў Заходняй Беларусі (1926—1936 гг.) / К. С. Разуванава; навук. рэд. В. В. Даніловіч ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларус. навука, 2013. – 245 с.

23. Савіч, А. А. "Сэцэсія" ў КПЗБ у айчыннай гістарыяграфіі / А. А. Савіч // Весн. Брэсц. ун-та. Сер. гуманітар. і грамад. навук. Філасофія і логіка. Гісторыя. Псіхалогія. Права. Педагогіка. – 2007. – № 3 (30). – С. 23–31.

24. Сідарэвіч, А. Антон Луцкевіч і Беларуская Сялянска-Работніцкая Грамада / А. Сідарэвіч // ARCHE. Пачатак. – 2007. – № 9.

25. Сідарэвіч, А. Самавызначэнне беларускай сацыял-дэмакратыі / А. Сідарэвіч // Беларус. гіст. часоп. – 1998. – № 2. – С. 24–33.

26. Фирсов, Ф. И. Коминтерн и Коммунистическая партия Польши / Ф. И. Фирсов, И. С. Яжборовская // Вопросы истории КПСС. – 1988. – № 11. – С. 20–35 ; № 12. – С. 40–55.

27. Хацкевіч, А. Арышты і дэпартацыі ў заходніх абласцях Беларусі (1939–1941 гг.) / А. Хацкевіч // Беларус. гіст. часоп. – 1994. – № 1. – С. 89–94 ; № 2. – С. 70–76.

28. Чарнякевіч, А. Беларускія паланафілы і Грамада. 1925 – пачатак 1927 г. / А. Чарнякевіч // Гіст. альманах. Т. 12. – Гародня ; Беласток, 2006. – С. 64–78.

29. Чарнякевіч, А. Кароткі нарыс гісторыі ўзаемаадносін беларускага нацыянальнага руху і II аддзелу Галоўнага камандавання (Генеральнага штабу) Войска Польскага ў 1918–1923 гг. / А. Чарнякевіч, А. Пашкевіч // ARCHE. Пачатак. – 2009. – № 8. – С. 22–73.

## ПЫТАННІ ДЛЯ САМАКАНТРОЛЮ

1. Прадмет і задачы курса.
2. Гістарыяграфія гісторыі Заходняй Беларусі 1920-я – першай палове 1950-х гг.
3. Гістарыяграфія гісторыі Заходняй Беларусі ў другой палове 1950-х – 1980-х гг.
4. Гістарыяграфія гісторыі Заходняй Беларусі перыяду Рэспублікі Беларусь.
5. Крыніцазнаўства гісторыі Заходняй Беларусі.
6. Рыжскі мір і Беларусь.
7. Праблемы тэрыторыі і насельніцтва Заходняй Беларусі.
8. Палітыка Польшчы ў дачыненні да Заходняй Беларусі.
9. Сацыяльна-эканамічнае становішча Заходняй Беларусі ў складзе міжваеннай Польшчы. Аграрныя рэформы.
10. Прамысловасць, рамяство і гандаль.
11. Рабочы рух. Забастовачная барацьба рабочых Заходняй Беларусі.
12. Сялянскі рух, яго характар.
13. Партызанскі рух у Заходняй Беларусі ў 1921–1925 гг.
14. Нацыянальна-дэмакратычныя партыі і арганізацыі.
15. Беларускі пасольскі клуб.
16. Камуністычная партыя і камсамол Заходняй Беларусі.
17. Фракцыйная барацьба ў КПЗБ. “Сэцэсія”
18. Беларуская сялянска-работніцкая Грамада.
19. Дзейнасць арганізацыі “Змаганне”.
20. Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя.
21. Беларускі сялянскі саюз.
22. Цэнтрасаюз.
23. Беларускія паланафілы.
24. Заходняя Беларусь у гады сусветнага эканамічнага крызісу.
25. Заходняя Беларусь у 1934–1939 гг.
26. Праблема стварэння антыфашысцкага народнага фронту.
27. Рэпрэсіі ў БССР і заходнебеларускі нацыянальна-вызваленчы рух.
28. Уз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР.